ARCHE Зьмест № 5’06

1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE :: Галоўная
3. Міхась Тычына. Прачнуцца знакамітым.
4. Аляксей Мусорын. Пінская шляхта - 2.
5. Павал Усаў. Атланты і карыятыды лукашэнкаўскай прапаганды.
6. Павал Абрамовіч. Пра выradкаў і людзей.
7. Андрэй Хадановіч. Кожны чацьверты – прэзыдэнт, альбо Плошча Элегантнай Перамогі.
8. Го Кашына. Прэзэнтацыі беларускай мовы ў сучаснай беларускай літаратуры.
9. Барыс Дубін. Крывавая вайна і «вялікая» перамога.
10. Уладзіслаў Грыневіч. Міт вайны і вайна мітаў.
11. Пётра Рудкоўскі. Сіла і слабасьць «двайной прапіскі».
12. Рышард Капусьцінскі. Імпэратар.
13. Аляксандар Ірванец. Дзень Перамогі.
14. Да гісторыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады: агляд крыніцаў.
15. Мікола Нікалаеў. Папялушка выдавецтва «Беларусь».

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (45) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

5[image]-[image]**2006**

поствыбары • крытыка • эсэістыка • аналітыка • палеміка • літаратура • гісторыя • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

[image]

З ь м е с т

C o n t e n t s

ПОСТВЫБАРЫ

Ідэалёгія спажывецтва і палітычнага бандытызму.
Круглы стол у рэдакцыі «ARCHE»
ПЁТРА РУДКОЎСКІ Тры пасьлярэвалюцыйныя сындромы

КРЫТЫКА

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Апокрыф зьняверaных
МІХАСЬ ТЫЧЫНА Прачнуцца знакамітым
АЛЯКСЕЙ МУСОРЫН Пінская шляхта – 2
ПАВАЛ УСАЎ Атлянты і карыятыды лукашэнкаўскай прапаганды. Часопіс «Планета»: аналіз мэтадаў маніпулятыўнага ўзьдзеяньня
ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Пра вырадкаў і людзей

ЭСЭІСТЫКА

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ Кожны чацьверты – прэзыдэнт, альбо Плошча Элегантнай Перамогі
АНДРЭЙ БАРАНАЎ 3 дні, 3,5 ночы і 10 сутак, альбо Як я стаў

аптымістам
АРКАДЗЬ ЦЕПЛЯКОЎ «Лё Бэлярюс», або Cherchez la femme!

АНАЛІТЫКА

МІКОЛА КАЦУК Сацыялёгія беларускай ідэі: да сацыяльнай гісторыі моўнага пытаньня
ГО КАШЫНА Прэзэнтацыі беларускай мовы ў сучаснай беларускай літаратуры
БАРЫС ДУБІН Крывавая вайна і «вялікая» перамога. Пра канструяваньне і перадачу калектыўных уяўленьняў у Расеі 1970–2000 гадоў
УЛАДЗІСЛАЎ ГРЫНЕВІЧ Міт вайны і вайна мітаў

ПАЛЕМІКА

ПЁТРА РУДКОЎСКІ Сіла і слабасьць «двайной прапіскі»

ЛІТАРАТУРА

РЫШАРД КАПУСЬЦІНСКІ Імпэратар
АЛЯКСАНДАР ІРВАНЕЦ Дзень Перамогі

ГІСТОРЫЯ

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ Да гісторыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады:
агляд крыніцаў. Працяг рэцэнзіі

РЭЦЭНЗІІ

МІКОЛА НІКАЛАЕЎ Папялушка выдавецтва «Беларусь».
Яшчэ адзін крок да стварэньня нацыянальнага пантэону

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 5 (45) - 2006

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/15
[image]

Powered by phpBB © 2001, 2005 phpBB Group

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (45) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

крытыка [image]2006

"да Зьбары" **крытыка** • эсэістыка • аналітыка • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

Міхась Тычына Прачнуцца знакамітым

МІХАСЬ ТЫЧЫНА нарадзіўся 10 лютага 1943 году ў пасёлку Ленінскі Алданскага раёну (Якуцкая АССР) у сям’і ссыльнага. Скончыў філялягічны факультэт Берасьцейскага пэдагагічнага інстытуту (1964), асьпірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1970), дзе й працуе навуковым супрацоўнікам.

Наварыч, Алесь. *Літоўскі воўк*: Гістарычны раман. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2005. – 285 с.

Ці шмат пісьменьніку трэба, каб стаць знакамітым? Напісаць раман (бо што гэта за пісьменьнік, калі ў яго няма раману?), апублікаваць яго, няхай сабе і ў холдынгавай «Маладосці», і атрымаць спэцыяльную прэзыдэнцкую прэмію.

Алесь Наварыч, у цнатлівай маладосьці Трушко, ураджэнец палескай вёскі з прыгожай назвай Відзібор, што на Століншчыне, на рэдкасьць таленавіты, і гэта кінулася ў вочы ўжо ў яго першых публікацыях яшчэ ў далёкім, амаль дагістарычным 1984 годзе, пра што я з захапленьнем пісаў тады ў друку. У годзе, калі ня стала Ўладзімера Караткевіча, а вакол апусьцелага нерукатворнага помніка неўзабаве закружылася плойма падкараткевічаў. Наварыч доўга трымаў паўзу, нарэшце дачакаўся, калі патасная хваля адкрыцьця «невядомай Беларусі» спадзе, пачнуцца паўторы, кружэньне на месцы, а высокая гістарычная проза спыніцца на парозе толкіенаўскіх фэнтэзі аб сутнасьці і прыродзе ўлады ў разгубленасьці.

І надышоў час Алеся Наварыча, і зьявіўся раман «Літоўскі воўк». Не «Ўладар пярсьцёнкаў», вядома, але чытаецца ад адным дыханьні. І гэта ў час, калі чытач страціў здольнасьць зьдзіўляцца і наагул не чакае ад мастацкай літаратуры асаблівых узьлётаў. Чытач адразу апынаецца «ў краі пусты пярэваратняў». Можна дадаць – у краі нібыта бесталковых мужыкоў-палешукоў, якія нагадваюць «шылераўскіх разбойнікаў» і цярпліва чакаюць, калі надыдзе інсурэкцыя, яны нарэшце пацешацца ад душы зь яснавяльможных панкоў і падпанкаў, акупантаў і абскубантаў, а пакуль тое дзесьці-калісьці-хтосьці-кагосьці, прыкідваюцца блазнамі, дурнямі, дзівакамі, абы набіць сабе цану ды выйграць час.

Сябра Беларускага ПЭН-Цэнтру з 1989 году. Апошні лютасьць «ARCHE» – Прывід нікоў тэксту» (2006. №3).

У гэтым перакуленым сьвеце лясоў і балотаў, пушчаў і прошчаў, зьвяроў і пачвараў «усё наадварот», ня так, як у недалёкай Польшчы, а тым больш у вялізнай, страшнай і незразумелай Велікаросіі. На шчасьце, наратар добра ведае, *z małymi wyjątkami*, што ёсьць *bardzo konwencjonalna proza*, а яшчэ лепш ведае свайго рэцыпіента, не напружвае лішне яго: «Даўно гэта здарылася, да рэвалюцыі яшчэ, нават да японскай ды і да турэцкай войнаў. За колішнім польскім бунтам яно адбылося». Наратар наагул не дае чытачу адхіліцца ад працэсу ўспрыманьня тэксту і раз-пораз нагадвае таму пра заключаную зь першых радкоў канвэнцыю. «Пэўна, чытач зьдзіўлены вышэйнамаляванымі падзеямі», «але дзеля гэтага чытачу давядзецца прачытаць усю нашу гісторыю да канца», «так што мушу разьлічваць і на нецярплівых і тлумачыць, што да чаго», «Вось тут і ўвага, чытач! Менавіта тут і здарылася тое, што спатрэбіцца дзеля разуменьня першага разьдзелу», «(Чытач – увага!)», «Што далей? Далей будзе, не турбуйся, чытач», «(Вось, чытач, дарэчы, і першы напамін пра нашага шэрага героя, зь якім ты знаёмы зь першых старонак)», «Калі паважаны чытач лічыць вышэйапісаныя падзеі неверагоднымі, ён не памыляецца. Усе сумненьні, што гэта прыдумкі, нацяжкі, незацугляная фантазія аўтара, – абсалютна правільныя. Так не было і не магло быць. Усё было зусім па-іншаму».

Вось яно! Ва ўсім, што рабілася на геапалітычнай прасторы «Северо-Западного края», «усходніх крэсаў», ці Беларусі, калі «на мове хамаў», «па-ліцьвінску, ці па-русінску, або, як яшчэ

казалі, па-беларуску», словам, на гаворцы насельнікаў краю, які «распасьціраецца ад Прыпяцкіх балот да Дзьвіны і Вяльлі», бачылася «польская інтрыга» (на Піншчыне, дзе я настаўнічаў, нават пра вясновую паводку казалі: «З Польшчы вады наплыло»). Беларус-паляшук выдатна засвоіў гэтую навуку балянсаваньня на канаце супярэчнасьцяў, прагматычна ацэньваючы магчымасьці «бакоў», нярэдка балюча памыляючыся, але ўрэшце інстынкт выжываньня ўсё адно ратаваў, надзейна хаваючы ягоную самаідэнтычнасьць.

Чытач да апошняе старонкі ня ведае, хто ж знаходзіцца ў клетцы ў зьвярынцы: пан ці воўк, і хто каму – крываважэрны чалавечыска ці бедны воўк-пад'ярак – пагрыз лапу-руку. «І раптам, гледзячы на ваўка, зьвяругу, настаўнік убачыў зусім не ваўка, а чалавека… Самога сябе ўбачыў… Разьвёў рукі ў бакі, і той чалавек рукі адставіў… Сівы воўк зьнік, а чалавек застаўся». Гэта ўжо не адбітак у люстэрку, а куды больш складаная оптыка.

Паўлюкова-Багрымава «ў ваўкалака абярнуся», карнавальнае пераапрананьне (прынц іграе ролю жабрака, дурня карануюць на трон, перамога абарочваецца паразай), добра знаёмае з часоў Караткевічавага «Эвангельля ад Юды» (У. Караткевіч і тут умудрыўся апярэдзіць сэнсацыйнае адкрыцьцё нядаўняга часу), дакладней, раману «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (акторы, народ несамавіты, бліскуча граюць прышэсьце Хрыста і ягоных апосталаў у Беларусь), – сьвядома абраны стыль паводзінаў у сьвеце. Менавіта гэта манера трымацца пасярод чужакоў дапамагае пэрсанажам, недаверлівым беларусам-ліцьвінам, дэзарыентаваць «ворагаў беларушчыны», а ў зьвязку з гаворкаю пра раман заблытаць сюжэт. На вачах чытача, які з часоў пушкінскага «Дуброўскага» звык да падобнага роду дзівосаў, адбываецца працэс травэстацыі: выпісаны з Масквы настаўнік Арыстоклій Дастоеўскі ператвараецца ў кіраўніка паўстанцаў Артура Буевіча («З Буевічамі сілай лепш ня мерацца. Зь імі, шалёнымі, лепей ня зьвязвацца»), а «пазаўчарашні ангелец», «англамоўны ёлупень» – у *Kastusia Kalinowskiego* («На дне, на аселай пене было напісана – «Kastus». Сон як рукой зьняло, рэшткі хмелю імгненна выскачылі з галавы. Вось яно што!»).

Мадэлі пісаньня-чытаньня ў рамане «Літоўскі воўк» рэзка зьмяняюцца – акурат тое, чаго патрабуе сучасная постмадэрнісцкая эстэтыка, заснаваная на радыкальным пераасэнсаваньні традыцый, на чаканьні «навізны», на кантактаваньні з чытачом. Сьвядома заблытаны сюжэт нагадвае працэс зборкі-разборкі «канструктару», дзе ўсё ўзаемазьвязана, часткі выяўляюць цэлае, а цэлае знаходзіць свой працяг у частках. Усё ў рамане ўзаемазамяняльнае: левае – правае, мінулае – сучаснасьць, рэвалюцыя – эвалюцыя, сакральнае – прафаннае.

Пачатак тэксту, як выяўляецца, ёсьць яго канцом, а канец вяртае да пачатку. Гэткая стужка Мёбіюса, дзе пераход зьместу ў форму, а формы ў зьмест непрыметны нават пры «запаволеным чытаньні». Гэткае замкнёнае «гермэнэўтычнае кола», калі цэлае ўзьнікае з частак, а часткі могуць быць зразуметы з цэлага. Аўтар, фіксуючы ўвагу на асобных фрагмэнтах тэксту, вылучаючы з сыстэмы вобразаў то аднаго, то другога героя, стварае ўмовы для эмпатыі, упачуцьцёўленьня ў сьвет, створаны ягоным уяўленьнем. Кругі пашыраюцца, праяўляюцца падводныя плыні, і паступова адбываецца паглыбленьне ў сэнс.

«Прынцып натуры», які зводзіцца да фаталістычнага «пераначуем – болей пачуем», чым далей, тым часьцей заяўляе аб сабе. Пэрсанажы самараскрываюцца: адным спрыяе ў гэтым добрая кампанія (пан Ежы Ўрбановіч, расчуліўшыся, прызнаўся ў тым, што яго бацька Казімер быў у палку Панятоўскага, удзельнічаў у паходзе на Маскву і «загінуў за волю роднага краю»), шчодрыя напоі разьняволілі і заўзятага служаку капітана Фогеля, які панёс жахлівую ерась («Я – не масковец… калі мой дзед патрыёт, як вы дапускаеце, што я, іхні крэўны сваяк, не магу быць патрыётам?.. Я разумею, што мы далучаныя да расейскай кароны… Што мы – забраны край… Думаю толькі адно – мы не палякі»).

Някепска ўпісваецца ў гэты кантэкст і сцэна спатканьня пані Валеўскай з Кастусём Каліноўскім, у якой аўтарская іронія навідавоку («Маё сэрца належыць… другой… вы ніякая не патрыётка, не вандроўніца… Вы – звычайная расейская

шпіёнка». – «Як жа зваць вашу абраньніцу, пане Каліноўскі?» – «Беларусь, а як жа яшчэ…» – «Каханы, яшчэ не нарадзіўся мужчына, які мог бы ўстаяць супраць мяне… Давай забудзем пра ўсё…»).

Урэшце, мы робімся сьведкамі таго, як набывае рэальныя абрысы «эдыпаў бунт» аўтара, які паўстае супраць свайго літаратурнага «бацькі» Ўладзімера Караткевіча, і паводле псыхалёгіі ён надбаўляе крэшчэнда. «Бунт» гэты ня столькі асабісты, колькі пакаленчы, накіраваны таленавітымі «сынамі» супроць геніяльных «бацькоў». Вынікам можа быць інтэлектуальны і творчы заняпад, духоўна-маральнае спусташэньне, адсутнасьць пазытыўных ідэяў.

Літаратурныя алюзіі, апэляцыя да клясыкі, наагул літаратурнасьць – усё гэта аздабляе Наварычаў раман, павышае яго інтэлектуальны ўзровень. Шылер, Міцкевіч, Пушкін, Купер, Крашэўскі, Дастаеўскі, Ільф і Пятроў («Эўропа нам дапаможа»), Колас, Караткевіч, Акудовіч («Я – ёсьць») – гэтыя імёны ўвесь час нагадваюць чытачу, што ёсьць літаратура, а ёсьць яшчэ жывое жыцьцё, ёсьць сьвет фантазіі, а ёсьць рэальны сьвет. Наратар не стамляецца нагадваць чытачу пра гэтае фундамэнтальнае адрозьненьне: «Не, гэта ўжо недзе адбывалася. Здаецца, у адной з балядаў Міцкевіча… Цьху ты!», «Калі чытач думае, што ўсё: цікаваньне за пакаёўкай Ганнай, захоп яе, лупцаваньне – адбывалася так, як выкладзена вышэй, ён памыляецца. Такія жарсьці, а галоўнае – такім чынам, могуць адбывацца толькі ў раманах. Насамрэч усё было ня гэтак», «Наступіла хвіліна, як напісаў бы які пісацель, дамавіннай цішыні».

А як яно «ўсё» насамрэч? У рэальным сьвеце жывых людзей? Што бярэ верх – «зьвярынае» ці «людзкае»? Што такое «апантанасьць», «паляўнічы азарт», «збройнае рушаньне», «пагоня», «пачуцьцё самапавагі», «помста», «шлях на волю», «дарагі крышталь каханьня», «жаноцкія таямніцы-драбніцы»? Чалавечае вока ня поўнае. Чалавеку, каб самаадбыцца, патрэбна свабода. Свабода – занадта вялікая каштоўнасьць, каб на покліч да яе адмахнуцца. Парыў да волі нараджае герояў, а героі рухаюць гісторыю.

Але ці ўсе народжаныя быць героямі? І што рабіць у такіх варунках негероям? Артур Буевіч, «прафэсійны падбухторшчык», зрабіў свой маральны выбар: пра ягоную «каханку» мала што сказана, але, найхутчэй, гэта таксама, як і ў Кастуся Каліноўскага, Беларусь. Зрабіла свой выбар і Аксана Ўрбановіч, якая, ратуючы мужа, «здрадніка і калябаранта», якога яна ўсё ж кахае, ускладвае на сябе, «у імя любові да айчыны, добраахвотна і без прымусу», абавязкі паўстанцкага павятовага камісара.

Як быць ва ўмовах грамадзкага забурэньня такім натурам, як паляўнічы Ясь Кавалец, мараю якога было адшукаць таямнічую прошчу-неруш у пушчы («Тут зьвірына хаваецца») і які сьвядома бярэ на сябе адказнасьць за жыцьцё зьненавіджанага навакольным людам «літоўскага ваўка»? Як быць у гэтым жа кантэксьце Ежы Ўрбановічу, зь ягонаю «мілатою да Божага свету», зь ягоным «пагляджу, на чыім баку будзе сіла» і зь ягонаю паталягічнаю рэўнасьцю, якая змушае гэтага добрага гаспадарніка, «карсыканца» й «камісара на пяць хвілін», паводзіць сябе неадэкватна, парушаць кодэкс шляхецкасьці? Што рабіць пану Бароўскаму, птушатніку, які прачытаў жандарам цэлую арніталягічную лекцыю, каб даць час уцячы з пасткі паўстанцу-сыну, і які сам жыве, як эвангельская птушка: ня сее, ня жне, але заўсёды сыты? У вершы Натальлі Арсеньневай «Мэта жыцьця» сярод магчымых варыянтаў згадваецца і такі: «Мэта жыцьця – захаваці жыцьцё». А польскае – «жыць жэбы жыць»!..

У беларуса-ліцьвіна-палешука ёсьць улюбёны і апрабаваны спосаб, каб выйсьці зь нявыкрутнага становішча, геніяльна ўвасоблены ў многіх творах У. Караткевіча й таленавіта апісаны і разьдзеле «Апошні наезд», дзе шляхта і сяляне, кіруючыся спрадвечнай мудрасьцю «гуртам і бацьку добра біць» («адныя Пратасавіцкія за Буевіча, іншыя – за Дубойскага. Адныя – каталікі, другія – праваслаўныя, а трэція ўвогуле ў Бога ня вераць, а карчам пакланяюцца»), ратуюць кіраўніка паўстанцкага атраду Артура Буевіча з рук жандараў («Грэц вам! Тут вам не Масковія якая! Тут Эўропа»). Гэтак і жывуць браткі-беларусы век-вяком!

Гэтак і жывём! І будзем жыць! А можа, і мае рацыю Алесь Наварыч, згадваючы словы Георга Крысьціяна Ліхтэнбэрга, немца, які жыў напрыканцы XVIII стагодзьдзя, і ягонае мудраслоўе: «Больш чым золата зьмяніў сьвет сьвінец, і найболей – той, які ў друкарскіх літарах, чым той, які ў кулях…» У краіне, дзе заўжды славіўся подзьвіг («У жыцьці заўсёды ёсьць месца подзьвігам», «Героямі не нараджаюцца – героямі становяцца») і дзе чалавечая асоба асацыявалася зь «лягерным пылам», «гарматным мясам», «адзінкаю электарату», пропаведзь вацлава-гавэлаўскае ідэі «Сілы бясьсільных» актуальная як ніколі. Нашы продкі глядзяць на нас са старонак гістарычных раманаў, а мы глядзім на іх «праз затуманенае тоўстае шкло», расплюшчваючы, як дзеці, да болю нос, каб разгледзець нашу мінуўшчыну. Людзі несапраўдныя, але гісторыя сапраўдная.

[image]

[image]

№ 5 (45) - 2006

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/05/21

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (45) - 2006**

[image]

[image]

[image]

крытыка [image]2006
"дс Зьбаты • **крытыка** • эсэістыка • аналітыка • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

Аляксей Мусорын Пінская шляхта - 2

АЛЯКСЕЙ МУСОРЫН (нар. у 1963) – лінгвіст, паліглёт (піша на расейскай, ангельскай, кітайскай, польскай, баўгарскай, беларускай, эстонскай мовах, а таксама Эспэранта і лаціне). Скончыў гуманітарны факультэт Навасібірскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту (1986). Галоўны рэдактар часопісу «Сибирский лингвистический семинар».

Наварыч, Алесь. *Літоўскі воўк.* – Мінск: Мастацкая літаратура, 2005. – (Серыя «Беларуская проза XXI стагоддзя»).

Час ідзе па крузе, і пэрсанажы, якія, як нам здавалася яшчэ нядаўна, належаць літаратурнай мінуўшчыне, вяртаюцца, нават не мяняючы аблічча. І вяртаюцца яны не паасобку, а з усім сваім атачэньнем, зь сябрамі і ворагамі, з суседзямі, дзецьмі й старымі бацькамі... Са старонак раману Наварыча «Літоўскі воўк» да нас вяртаеца пінская шляхта. Ня верыце? Дарэмна. Дзея адбываецца ў тых самых мясьцінах – «паміж балотаў, у глушы Пінскага павету», а на тоеснасьць дзейных асобаў недвухсэнсоўна ўказваюць прозьвішчы другасных пэрсанажаў: Ліпскія (хаця й не Цюхай) і Пратасавіцкія. Дый агульная схема паводзінаў пінскай шляхты ў рамане тая ж, што і ў Дуніна-Марцінкевіча; толькі абставіны дзеі крыху іншыя: клясык XIX стагодзьдзя паказвае нам дробных шляхцюкоў у справах сямейных ды суседзкіх, а наш сучасьнік – у справах грамадзкіх, палітычных. І ў абодвух выпадках мы бачым людзей, якія ня вельмі добра разумеюць, што менавіта яны робяць і якія могуць быць вынікі іхных учынкаў.

У Дуніна-Марцінкевіча нашчадкі высакародных продкаў сварацца амаль беспрычынна, правакуюць нікому не патрэбную судовую справу, а потым даволі нехлямяжа выкручваюцца з

гэтага няёмкага становішча. А што мы бачым у Наварыча? Мясцовая шляхта зьбіраецца змагацца за незалежнасьць краіны, ня маючы аніякага ўяўленьня ані пра тое, як весьці вайну, ані пра тое, як арганізаваць уладу... не, нават не на абшары ўсёй краіны, а хаця б у межах уласнага павету. Яны нагадваюць дзяцей, якія гуляюць у дарослых, зусім не разумеючы, што гэта толькі гульня. Зь якім патрыятычным уздымам пад самаробнымі сьцягамі яны выпраўляюцца ў паход, і як хутка, пры першым сутыкненьні з дарослай рэчаіснасьцю, якая зьявілася ў выглядзе расейскіх казакоў, бягуць хавацца па лясных ды балотных сядзібах. А потым – вернападданьніцкі адрас на імя цара і хабар у кішэні мясцовага чынавенства. Ані пэрсанажы «Пінскай шляхты», ані «Літоўскага воўка» ня ведаюць лепшага за хабар сродку, каб пазбавіцца ад непрыемнасьцяў з боку прадстаўнікоў улады.

Пры гэтым найлепшыя з інсургентаў, як, напрыклад, Артур Буевіч, дужа нагадваюць неабачлівых расейскіх рэвалюцыянэраў-дзекабрыстаў, а дакладней тое, што пісаў пра гэтых няўдачлівых змагароў супраць самаўладзьдзя заснавальнік бальшавізму: «Жудасна далёкія яны ад народу». Таму ж Артуру Буевічу, калі ён пад выглядам маскоўца-настаўніка едзе ў родныя мясьціны, нават ня трэба граць ролю чужынца перад Цімахом, якога ён узяў за рамізьніка: Артур – сапраўды чужынец сярод палескай прыроды, сярод палескіх забабонаў, сярод людзей, якіх ён мае весьці да незалежнасьці. Мару пра асьвечаную эўрапейскую дзяржаву загубілі ня дзіды расейскіх казакоў, яе перадусім загубіла няздольнасьць пінскай шляхты думаць і дзейнічаць па-эўрапейску. Кароткае змаганьне за незалежнасьць засталося цалкам шляхецкай гульнёй, якая ніяк не закранула ані беларускіх сялянаў, ані купецтва, ані нават сьвятарскага стану... Ці не папярэджаньне гэта цяперашнім змагарам супраць «акупацыйнай улады»?

«Літоўскі воўк» у значнай ступені – гэта шмат у чым анты-Караткевіч. Калі ў гістарычнай прозе Караткевіча мы маем гераізацыю змагароў за незалежнасьць, а іх параза ўяўляецца ўзьнёслай трагедыяй, то ў рамане Наварыча – гэта ў горшым выпадку фарс, а ў лепшым – «звычайная гісторыя», толькі не расейскага двараніна, а беларускага шляхціца. Гэта

невыпадкова: Караткевіч – рамантык, Наварыч – рэаліст, і як рэаліст ня бачыць у балотных шарачках нічога гераічнага. «Пра іх камэдыю пісаць можна», – кажа жандарскі капітан Фогель, і ў гэтай рэпліцы чуецца голас самога аўтара раману, добра знаёмага са спадчынай гаспадара Люцінкі...
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/05/21
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (45) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

пра выбары • **крытыка** • эсэістыка • аналітыка • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

ПАВАЛ УСАЎ

Павал Усаў Атланты і карыятыды лукашэнкаўскай прапаганды Часопіс «Планета»: аналіз метадаў маніпулятыўнага ўздзеяння

палітоляг. Жыве ў Магілёве. Вымушаны быў пакінуць працу ва ўнівэрсытэце пад ціскам уладаў. Ягоная апошняя публікацыя ў «ARCHE» – «Паміж прэзыдэнтам і мэсіем» (2006. № 4).

З 2005 года ў інфармацыйна-прапагандысцкай батарэі, скіраванай супраць апазіцыі і яе саюзнікаў, з’явілася яшчэ адна друкаваная гармата, якая абстрэльвае ўсіх і ўсё, ня згоднае з кіраўніцтвам дзяржавы і яго ідэалогіяй. Назва гэтага новага друкаванага выдання – «Планета».

Перад тым як прааналізаваць змест гэтага часопіса, варта некалькі словаў сказаць пра фармальныя бакі, агульную структуру і канфігурацыю публікацый, якія ў ім размешчаны.

Апякуецца часопісам Адміністрацыя прэзідэнта, а яго галоўным рэдактарам выступае Усевалад Янчэўскі. Прывядзём кароткую біяграфічную даведку. У. Янчэўскі нарадзіўся 22 красавіка 1976 года ў Барысаве. Скончыў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1998). Першы сакратар

Цэнтральнага камітэта Беларускага патрыятычнага саюзу моладзі (БПСМ), сябар праўлення Фонда сацыяльнай аховы моладзі, а таксама калегіі Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі. Актывіст прэзідэнцкай кампаніі А. Лукашэнкі (1994), сябар выбарчага штабу С. Шушкевіча падчас выбараў у Вярхоўны Савет (1995). Быў сябром партыі Славянскі Сабор «Белая Русь». Дэпутат Палаты прадстаўнікоў другога склікання. Жанаты.

Ужо веданне таго, кім быў створаны часопіс, можа сведчыць пра яго змест і прызначэнне. Тым не менш, аналіз гэтага часопіса не можа не прыцягнуць увагі спецыялістаў у галіне палітычнай камунікацыі, інфармацыйных тэхналогіяў, НЛП і іншых методык палітычнага і сацыяльнага ўздзеяння, прызначаных для прамыўкі мазгоў чытачоў, якія стаяць па-за палітычнымі працэсамі. Унутраная канфігурацыя часопіса працягвае найлепшыя традыцыі савецкай прапаганды, тэксты і здымкі размешчаны такім чынам, каб паўплываць на свядомасць не толькі яўна, але і імпліцытна. Кожны нумар «Планеты» абавязкова складаецца з артыкулаў пра беларускую апазіцыю, ЗША, Памаранчавыя рэвалюцыі і тэрор. Прычым іх паслядоўнасць і ўзаемасувязь настолькі відавочныя, што складваецца ўражанне, быццам чытаеш не розныя публікацыі асобных аўтараў, а адну кнігу, падзеленую на часткі, а ці дэталёвую справаздачу КДБ. Трэба таксама адзначыць цікавы факт: многія публікацыі, пададзеныя ў часопісе, не падпісаныя. Відаць, рэдакцыі «Планеты» ёсць што хаваць. Да гэтага можна дадаць, што часам у межах аднаго артыкула прасочваецца несупадзенне стыляў напісання. Значыць, іх пісалі дзве ці больш асоб. Звычайна такія артыкулы складаюцца з дзвюх частак: аналітычнай і папулісцка-прапагандысцкай. Трэба сказаць, што аналітыка падабрана і падрыхтавана рупліва і складае важкую частку асобных артыкулаў, але яна падагнана пад пэўную ідэалагічную парадыгму. У сваю чаргу, папулісцка-ідэалагічны складнік вытрыманы ў духу афіцыйных беларускіх СМІ.

А цяпер пяройдзем непасрэдна да аналізу публікацый часопіса, кожны з нумароў якога па-свойму «цікавы». Сёння мы разбяром № 3 за ліпень 2005 года, і пачнём з ягонай вокладкі.

Калі тэатр пачынаецца з вешалкі, то часопіс заўсёды пачынаецца з вокладкі. Менавіта вокладка, дзякуючы сваім яскравым фотаздымкам, шакоўным загалоўкам, павінна прымусіць чытача калі не прачытаць часопіс, дык прынамсі ўзяць яго ў рукі і перагартаць. Што адразу прыцягвае ўвагу ў вокладцы гэтага нумару «Планеты»? Гэта каляровы фотаздымак ядзернага выбуху, на фоне якога змешчаныя прэзідэнт ЗША Дж. Буш-малодшы і трывожны загаловак: «Предчувствие Хиросимы». Побач са здымкам выбуху адзін пад адным змешчаны здымкі прэзідэнтаў Грузіі М. Саакашвілі і Польшчы А. Квасьнеўскага, а зараз жа пад імі – фатаграфія дзіцяці, якое памірае з голаду. Хаця гэтыя ўстаўкі павінны толькі скіраваць чытача да адпаведных артыкулаў у часопісе, тым не менш, яны, паводле задумы аўтараў, мусяць скласці адзіны вобраз рэчаіснасці і ўяўляюць сабой толькі прэлюдыю асноўных дзеянняў. Аналіз тэкстаў гэта пацвярджае.

Першы артыкул невядомага аўтара прысвечаны апісанню жорткага супрацьстаяння паміж ЗША і Паўночнай Карэяй. Менавіта ён і называецца «Предчувствие Хиросимы». Ролі, якія адведзены галоўным героям гэтага артыкула, ад пачатку зразумелыя. ЗША – агрэсар і ўвасабленне сусветнага зла. Яны імкнуцца да панавання над усім светам і знішчэння няскораных дзяржаў. У ролі няскоранага і непахіснага героя выступае Паўночная Карэя на чале з Кім Чэн Ірам. Натуральна, што артыкул накіраваны на апраўданне рэжыму і палітычнай пазіцыі Паўночнай Карэі, а таксама яе жадання працаваць над ядзернай праграмай. Хаця развіццё гэтай праграмы ўключае ў сябе ў тым ліку стварэнне ядзернай зброі, аўтар не бачыць у тым нічога дрэннага, бо толькі такая зброя можа спыніць прэтэнзіі ЗША і іх памкненні быць асноўным геапалітычным гульцом. Эскалацыя напружанасці ў азіяцкім рэгіёне – вынік няправільнай палітыкі ЗША, якія не жадаюць саступіць Паўночнай Карэі і зняць эканамічную і палітычную блакаду. Толькі такі канструктыўны падыход, на думку аўтара, мог бы прадухіліць пагрозу ядзернай вайны: «На шляху «мірнага сцэнару» па-ранейшаму старая перашкода – пазіцыя ЗША. Белы дом не хоча развязваць «ядзерны вузел» – ён хоча цалкам знішчыць і акупаваць Паўночную Карэю». Каб стварыць поўную карціну акупацыі, якая павінна быць блізкай сэрцу кожнага

«сапраўднага беларуса», у артыкуле змешчаны фотаздымак гітлераўца з агнямётам, які падпальвае сялянскую хату.

Стварыўшы негатыўны вобраз ЗША, складальнікі часопіса адразу скіроўваюць увагу чытача на тое, што адбываецца на мяжы Беларусі, пра што сведчыць наступны артыкул, таксама невядомага аўтара: «Пан пропал», или о том, как польские политики, решившие повоевать с Беларусью, «сели в лужу» на виду у всей Европы».

Сувязь паміж першым і другім артыкуламі відавочная: у абодвух гаворка ідзе пра пастаяннае ўмяшанне ЗША ў справы іншых дзяржаў і іх памкненне навязаць сваю палітыку іншым. Але ў артыкуле «Пан пропал» з'яўляецца новы актор, Польшча, якая, як і ЗША, выступае ў ролі агрэсара, але гэтым разам у дачыненні да Беларусі. Падыход да напісання гэтага артыкула немудрагелісты, бо яго задумвалася прымеркаваць да скандалу, што адбыўся з Саюзам палякаў Беларусі, і наступнай антыбеларускай кампаніі на Захадзе, у прыватнасці, у Польшчы. Тым не менш, варта разгледзець гэтую публікацыю вельмі ўважліва. Артыкул складаецца з двух узроўняў, першы – агульны, фонавы, а другі – схаваны, які мае яўна маніпулятыўны характар. Агульны ўзровень ахоплівае ўсю палітычную праблематыку, звязаную з Польшчай і польска-беларускімі дачыненнямі, і скіраваны на стварэнне негатыўнага вобраза Польшчы як дзяржавы. Трэба адзначыць, што зроблена гэта даволі пісьменна, з выкарыстаннем не толькі дыскурсу, які ўздзейнічае на эмоцыі, але і аналітычных звестак, якія робяць змест артыкула больш грунтоўным і факталагічным.

Структура агульнага ўзроўню наступная:

1. Як геапалітычны актор Польшча – не самастойная дзяржава, а «марыянетка» ЗША. Слова «марыянетка» паўтараецца неаднаразова, вядома, што ў палітычным дыскурсе яно мае негатыўны сэнс, гэтым з самага пачатку ў свядомасць чытача закладваецца агіднае стаўленне да Польшчы. Само сабой зразумела, што цесная сувязь з ЗША, якая падкрэсліваецца на працягу ўсяго артыкула, таксама ўносіць у вобраз Польшчы шмат негатывізму. Гэтаму павінны спрыяць закладзеныя праз

папярэдні артыкул «Предчувствие Хиросимы» патэрны. Больш за тое, дзеянні Польшчы падаюцца не толькі як антыбеларускія, але як антыеўрапейскія, што яшчэ больш павінна прынізіць яе статус. «Месца Польшчы на міжнароднай арэне можна вызначыць досыць проста – гэта «траянскі конь» ЗША ў Еўропе» (с. 21). Гэта зусім не азначае, што Еўрапейскі Саюз у вачах аўтараў ёсць пазітыўным палітычным акторам. Рэч у тым, што складальнікі часопіса жадаюць паказаць, што заходнія краіны спрачаюцца між сабой і не маюць адзінага плану дзеянняў на міжнароднай арэне, а малыя краіны Усходняй Еўропы выкарыстоўваюцца ў вялікай гульні.

2. Польскі імперыялізм і жаданне рэалізаваць свае памкненні на тэрыторыі Літвы, Украіны і Беларусі ў межах адраджэння Рэчы Паспалітай. Апісанне польскай замежнай палітыкі ў гэткім духу павінна ўзмацніць стары стэрэатып у беларускага насельніцтва, што Польшча заўсёды была і застаецца ворагам. «Польскія палітыкі хочуць павярнуць час назад. Прывід Рэчы Паспалітай не дае спокою афіцыйнай Варшаве» (с. 29).

3. Безнадзейны сацыяльна-эканамічны стан унутры самой Польшчы. Рост беспрацоўя, карупцыя, неэфектыўнасць сацыяльнай і гаспадарчай палітыкі, незадаволенасць простых грамадзянаў, банкруцтвы прадпрыемстваў, нізкі ўзровень дабрабыту. Насычанасць статыстычнымі звесткамі, якія гавораць пра няздольнасць польскіх палітыкаў вырашыць унутраныя праблемы, паказвае Польшчу як слабога геапалітычнага гульца. Гэтая хваля інфармацыі прыводзіць толькі да адной высновы: «У такой сітуацыі смешна чуць, што Польшча бярэцца зладзіць *«рэвалюцыю»* (вылучана ананімным аўтарам «Планеты». – **П.У.**) у Беларусі. Праўда ў іншым: Польшча, якую ўвесь час страсаюць забастоўкі і масавыя пратэсты, значна бліжэй стаіць да *рэвалюцыі*, чым спакойная, ціхая і мірная Беларусь» (с. 26–27).

4. Як вынік, Беларусь – мірная, светлая, квітнеючая і вольная ад унутраных канфліктаў, у тым ліку этнічных. Гарантам гэтай стабільнасці ёсць прэзідэнт Лукашэнка: «Палякі ў Беларусі – гэта нашыя грамадзяне, нашы беларускія палякі. Мы іх ніколі не дзялілі, як і ўсе астатнія народы Беларусі» (А. Р. Лукашэнка)

(с. 33).

Як ужо адзначалася, публікацыя нясе схаваную інфармацыйную нагрузку. Падтэкст артыкула змяшчае ў сабе маніпулятыўна-прапагандысцкі блок, скіраваны супраць беларускай апазіцыі і яе лідэраў. Дакладней, у гэтым артыкуле ўдар наносіцца па А. Мілінкевічу: «Мілінкевіч, які на працягу многіх гадоў акучваў урадлівую ніву размеркавання заходніх грантаў, цалкам кіруецца амерыканскімі і польскімі спецслужбамі. У Варшаве ўпэўненыя – у выпадку «прасоўвання» Мілінкевіча на пасаду прэзідэнта Беларусі Польшча атрымлівае поўны кантроль над нашай краінай» (с. 31). (Уся гэтая інфармацыя падаецца на фоне бел-чырвона-белага сцягу, таксама з мэтамі ўздзеяння на падсвядомасць.) Далей – болей. Аўтары быццам бы мімаходзь закранаюць праблемы тэрарызму, а потым паволі звязваюць яе вобраз з вобразам беларускай апазіцыі. Выбудоўваецца цікавая схема, якая ўвесь час выкарыстоўваецца ў артыкулах, скіраваных супраць беларускай апазіцыі і яе дзеячаў. Схема выглядае так:

[image]

Цынічна выкарыстоўваючы трагедыю ў Беслане, стваральнікі артыкула намякаюць на тое, што палякі (а разам з імі беларуская апазіцыя) апраўдваюць дзеянні тэрарыстаў, якія нібыта змагаюцца за незалежнасць ад Расіі. Між іншым, у артыкуле змешчаны каляровыя ўрэзкі з тэкстам і фотаздымкамі да іх. Так, на с. 28 мы знаходзім фота Басаева і Хатаба з каментаром: «Пра такіх саюзнікаў марыць нямоглая апазіцыя», або: «Нядаўна Зянон Пазьняк (вядомы прыхільнік Джахара Дудаева) на адной з сустрэчаў у Польшчы прапанаваў пайсці на саюз з чачэнскімі баевікамі дзеля звяржэння прэзідэнта Лукашэнкі. У выпадку прыходу да ўлады ў Беларусі Зянон Пазьняк абяцаў спрыяць выдзяленню Чачні са складу Расіі».

Падчас напісання артыкула аўтары свядома заклалі ў яго механізмы, якія павінны выразна ўбудаваць у свядомасць чытача наступны лагічны ланцуг:

→ ЗША і Польшча = акупанты, якія апраўдваюць, больш за тое – падтрымліваюць тэрарызм;

→ ЗША і Польшча = беларуская апазіцыя;

→ Беларуская апазіцыя = тэрарысты, а значыць, іх можна і трэба знішчаць.

Такім чынам, пасля гэтакіх камбінацый дэзарыентаваны чытач будзе ставіць беларускую апазіцыю нароўні з баевікамі, якія забівалі дзяцей і жанчын, а гэта значыць, што любая расправа над дзеячамі апазіцыі і актывістамі простымі абывацелямі будзе разглядацца як слушная і патрэбная.

У тую ж схему, гаворка пра якую была вышэй, цалкам упісваецца артыкул пад назвай «Царство Царя Михаила», прысвечаны аналізу сітуацыі ў Грузіі. Змест і сама сутнасць артыкула не нясуць у сабе асаблівай інтрыгі, ён проста апісвае сітуацыю ў Грузіі пасля рэвалюцыі, якая, нібыта, увесь час пагаршаецца. Беспрацоўе, карупцыя, нізкі ўзровень жыцця, холад у кватэрах і падрыхтоўка да захопніцкай вайны – усё гэта вынік «дэмакратызацыі Грузіі» амерыканцамі. Націск робіцца на вобразе Міхаіла Саакашвілі: «стаўленік ЗША, які імкнецца да пашырэння межаў асабістай улады – адным словам Цар, які даўно забыў, што такое дэмакратыя. Але Саакашвілі не верыць у свабоду, бо яго ідэал – сіла» (с. 41). У артыкуле навязваецца ўяўленне пра існаванне ўнутранага супрацьстаяння ў грузінскім грамадстве, асноўнай падставай для якога нібыта з'яўляюцца памкненні Саакашвілі ўмацаваць свой рэжым і схіліць яго да мілітарызацыі. Таксама ананімны аўтар прасочвае на землях Калхіды згасанне дэмакратыі і грамадзянскіх вольнасцяў. Як вынік, паводле меркавання гэтага аўтара, ствараюцца ўмовы, якія прывядуць да новай рэвалюцыі. «Саакашвілі разумее: недалёка той час, калі большасць народу зразумее – іх падманулі. Цар Міхаіл ведае свой народ – грузіны не даруюць здрады. І ён рыхтуецца загадзя» (с. 44).

Трэба звярнуць увагу на тое, што амаль у кожным артыкуле, звязаным з аналізам сітуацыі ўнутры беларускай апазіцыі, у дзяржавах, якія супрацьстаяць Беларусі, выкарыстоўваюцца матывы Другой сусьветнай вайны. Відавочна, што падобны элемент прапаганды павінен узмацніць негатыўныя эмоцыі ў адносінах тых, на каго скіраваная крытыка. Іншымі словамі,

параўнаць паводзіны асобных палітычных дзеячаў з палітыкай фашыстаў. Гэта тычыцца і М. Саакашвілі: «Прэзідэнт-ліберал цвёрда запомніў запавет рэйхсмаршала Герынга – «гарматы замест масла» (с. 37). Усе гэтыя каментары падаюцца на фоне разбітай ваеннай тэхнікі і забітых людзей.

Высновы напрошваюцца самі сабою. Рэвалюцыя ў Грузіі стала для яе праклёнам! А гэта значыць, што беларускае грамадства павінна зрабіць усё, каб не дапусціць падобнага ў сваёй краіне.

Як працяг антырэвалюцыйнай рыторыкі – наступны вялікі артыкул «Оранжевые революции: противопоказания к применению», прысвечаны аналізу стану беларускай апазіцыі. Падрыхтаваны чытач ужо добра ведае, як трэба ўспрымаць інфармацыю і ставіцца да беларускай апазіцыі. Матэрыял артыкула апісвае механізмы падрыхтоўкі апазіцыі да рэвалюцыі падчас выбараў прэзідэнта краіны ў 2001 годзе. Структура пабудовы дыскурсу вельмі простая. 1. Паказаць цесную сувязь беларускай апазіцыі з Захадам, перадусім з ЗША. 2. Падкрэсліць унутранае маральнае раскладанне, канфліктнасць і антынароднасць. 3. Нанесці прапагандысцкі ўдар па імаверных кандыдатах у прэзідэнты ў 2006 годзе. 4. Эпілогам становіцца ўзвышэнне ролі і значэння Лукашэнкі ў развіцці дзяржавы і беларускага грамадства.

Трэба падкрэсліць, што ў некаторых выпадках аўтары даволі дакладна даюць ацэнку шматлікім негатыўным з'явам, што сталі прычынай для аслаблення беларускай апазіцыі.

Галоўным чынам, націск робіцца на ўяўную антынароднасць і антыдэмакратычнасць апазіцыі. Рэч у тым, кажа аўтар, што велізарная частка кіраўнічага апарату апазіцыйных структур складаецца з былых чыноўнікаў, якія былі адхілены ад улады, другая частка апазіцыі цесна супрацоўнічае з ЗША. На думку аўтара, калі ўлада дастанецца першай частцы «апазіцыі», то дзяржава будзе раскрадзена, калі другой – будзе распрададзена: «Трэба разумець спецыфіку антылукашэнкаўскай апазіцыі. Яна ніколі не была палітычнай, а практычна заўсёды наменклатурна-чынавенскай (с. 52)… Хто такія Лябедзька, Домаш і да іх падобныя? Былыя камсамольскія і партыйныя работнікі, бальшавікі… А што гэта

дасць для народу Беларусі? Нічога» (В. Леванеўскі) (с. 49). На працягу ўсяго артыкула прасочваецца наступны матыў: «у апазіцыі няма ідэалогіі, у яе няма ідэяў, здольных хваляваць і абуджаць людзей, лідэраў, здольных ісці наперад і весці за сабой». Аўтар заяўляе: «супраць Лукашэнкі выступалі не народныя масы, а чыноўнікі, якія апынуліся ўбаку, [і гэта] наперад асудзіла ўсе сцэнары рэвалюцыі на няўдачу… Немагчыма яе зрабіць, калі «прафесійная рэвалюцыйная дзейнасць» даўно ператварылася ў бізнес» (с. 53).

Безідэйнасць заўсёды была падставай для ўнутраных канфліктаў у апазіцыі, што, з пункту гледжання аўтараў, характарызуе і сённяшнюю апазіцыю, «зараз «змаганне» разгортваецца паміж мала каму вядомым Лябедзькам і нікому не вядомым Мілінкевічам. Гэтак сама, як і ў 2001-м, у вачах ажно мітусяцца «пазасістэмныя» кандыдаты – Вайтовіч, Фралоў, Казулін, Ярашук, Колас» (с. 53). Аўтар дазваляе сабе гаварыць нават пра Кангрэс дэмакратычных сілаў Беларусі, хоць той у ліпені яшчэ не адбыўся, «яны не могуць набраць нават мінімуму прыхільнікаў – з 292 дэлегатаў «дэмакратычнага кангрэсу» сабраць удалося толькі 130» (с. 53). Што маецца на ўвазе – невядома. Магчыма, артыкул быў падрыхтаваны загадзя, магчыма, факты ў «Планеце» нікога зусім не цікавяць.

Гэтак сама ўмела абыгрываецца інфармацыя, якая датычыць фінансавых схемаў беларускай апазіцыі і заходніх «спонсараў», прычым для бамбардавання апазіцыі выкарыстоўваюцца выказванні некаторых вядомых яе дзеячаў: «…заходняе фінансаванне ў тым выглядзе, як яно склалася, дало штуршок маральнаму разняволенню апазіцыянераў. Патрыятычная свядомасць пачала асвойвацца з прадпрымальнасцю. Нечакана высветлілася, што ў каштарыс выдаткаў на барацьбу за сцверджанне ліберальна-дэмакратычных каштоўнасцяў можна ўключаць аплату асабістых патрыятычных намаганняў. Так нарадзілася карупцыя ў шэрагах беларускай апазіцыі» (В. Оргіш) (с. 55).

Такім чынам, падагульняе аўтар, спадзявацца на нейкія радыкальныя змены не трэба. Апазіцыя падрыхтаваная, каб

прайграць.

На фоне палітычных інтрыг ЗША, каляровых рэвалюцый і слабой апазіцыі малюецца стаічная фігура Прэзідэнта, чэснага, адкрытага і клапатлівага «бацькі», якому, як і Фідэлю Кастра, не страшная Амерыка і апазіцыя, бо ён абапіраецца выключна на волю свайго народу. «Звыклыя мець справу з рознага кшталту нягоднікамі ва ўладзе, амерыканцы проста не могуць дапусціць думкі, што сярод постсавецкай эліты ёсць Прэзідэнт, які не крадзе» (с. 57). Канец артыкула, як асноўны вынік – роля прэзідэнта ў гісторыі дзяржавы неацэнная, дзякуючы Лукашэнку Беларусь пайшла іншым, найбольш перспектыўным шляхам палітычнага, культурнага і цывілізацыйнага развіцця. «У Кіраўніка (падкрэслена аўтарам «Планеты». – **П. У.**) беларускай дзяржавы ёсць свой сацыяльна-палітычны праект. На сённяшні дзень сярод усіх былых савецкіх рэспублік ён самы паспяховы. Палітыка Прэзідэнта Лукашэнкі і яго асоба – вось галоўныя супрацьпаказанні для «аранжавай рэвалюцыі» ў Беларусі» (с. 57).

Слушнасць гэтай высновы «абгрунтоўвае» артыкул пра Міхаіла Хадаркоўскага «Чудо демократии не получилось…», дзе прыведзены вытрымкі з публікацыі М. Хадаркоўскага «Левы паварот». У ёй вядомы алігарх, зразумеўшы ўсю згубнасць крайняга лібералізму, прызнае, што Расія павінна ісці іншым, адметным шляхам. Хадаркоўскі лічыць, што ідэальнай мадэллю дзяржавы і грамадства мусіць стаць патэрналісцкая, якая задаволіць усе сацыяльныя запатрабаванні грамадства і дзяржавы, а таксама ўнясе стабільнасць у сацыяльную і палітычную сістэму. Але значна важнейшыя ў артыкуле «Планеты» не выказванні спадара Хадаркоўскага, а каментары невядомых беларускіх «журналістаў», якія, спасылаючыся на Хадаркоўскага, сцвярджаюць, што Беларусь ужо некалькі гадоў крочыць такім шляхам дзякуючы правадыру А. Р. Лукашэнку: «Некалі Беларусь папракалі, што яна, маўляў, адстала ад Расіі, якая далёка пайшла «шляхам рэформаў». Артыкул Хадаркоўскага ёсць прызнаннем адваротнага. Не Беларусь адстала ад Расіі, а, нааадварот, Расія адстала ад нас» (с. 73).

Аўтар падкрэслівае, што беларускаму народу зусім не патрэбна

заходняя мадэль сацыяльна-палітычнага развіцця, якая нібыта прывядзе да пагібелі ўсё постсавецкае грамадства: «Беларуская мадэль» выявілася жыццяздольнай таму, што не было ў ёй нічога штучнага – яна была цалкам творам здаровага сэнсу» (с. 73).

* * * Інфармацыя, змешчаная ў часопісе «Планета», канцэнтруецца вакол адной мэты: стварыць вобраз незаменнага прэзідэнта, без якога далейшы гістарычны лёс Беларусі немагчымы. Любыя змены ў грамадстве, асабліва змена кіраўніка, скончыцца для беларусаў бядой. А каб гэтага не адбылося, трэба аб'яднацца перад абліччам вонкавых і ўнутраных пагроз і падтрымаць справу А. Р. Лукашэнкі.

Чытанне і вывучэнне часопіса «Планета» можа быць рэкамендавана не толькі спецыялістам у галіне палітычных тэхналогій, але і тым, хто пакутуе на настальгію па СССР, у ім вы знойдзеце звыклыя вобразы ворагаў, гатовыя адказы і мудрага правадыра, які нясе цяжар клопату пра свой народ.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/07/14**
[image]

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ

Павал Абрамовіч крытык літаратуры. Рэгулярна друкуецца ў «ARCHE».

Глёбус, Адам. *сУчаснікі*. – Менск: Логвінаў, 2006. – 142 с.

«Мае самыя любімыя літаратурныя творы, – пісаў у «Словах пігмэя» Акутагава, – гэта тыя, у якіх адчуваецца, што аўтар – чалавек. Чалавек – з мозгам, сэрцам і сапраўднымі пачуццямі…»

Да пісьменьніка Адама Глёбуса можна ставіцца па-рознаму, аднак бясспрэчна адно: за ягонымі творамі, калі карыстацца яснымі ўзважанымі крытэрамі, прапанаванымі Акутагава, бачыцца чалавек. І гэта асабліва тычыцца кнігі «сУчасьнікі», адным з пэрсанажаў якой зьяўляецца сам аўтар. Ненапышлівыя словы «...перапэцканым у цыбулю нажом рэжу сваю правую нагу, каб кроў, каб праз боль спыніцца, і не парэзаць чужога» (навэля «Ядзя і мячык») прамоўлены чалавекам, які здольны спыніць зло, што сыходзіць ад яго самога. Непрыдуманае пачуцьцё, яркі мастацкі вобраз.

НЕМАГЧЫМАСЬЦЬ АДНОСІНАЎ ПАМІЖ ПІСЬМЕНЬНІКАМ І КРЫТЫКАМ

Калі Глёбус толькі-толькі пачаў друкаваць «сУчасьнікаў» у «Нашай Ніве», а было тое восемь-дзевяць гадоў таму, мне падалося, што гэтыя навэлі малавартасныя, і яны адцягваюць увагу Глёбуса, графіка-манумэнталіста па адукацыі, ад галоўнага: стварэньня раману пра сучасную Беларусь (такую місію я «навязаў» гэтаму пісьменьніку). Ня дзіва, што калі Глёбус пачаў з 2002 году выкладаць у Інтэрнэце «сУчасьнікаў», я абрынуўся на яго зь яшчэ большай крытыкай. Я няспынна агітаваў яго пісаць раман, пакінуўшы гэтае паскудзтва (маю на ўвазе «сУчасьнікаў»), іншым разам, confiteor, выходзячы за межы прыстойных паводзінаў, парушаючы прафэсійную этыку, але ў выніку заслужыў падзяку ад самога пісьменьніка: на сайце litara.net Глёбус згадвае маё прозьвішча ў ліку тых, хто дапамагаў яму будаваць «Дом».

Я пачаў успрымаць «сУчасьнікаў» як паўнавартасны мастацкі твор толькі пасьля таго, як у адным з эўрапейскіх раманаў прачытаў наступнае: «*...адносіны паміж людзьмі* (у сучасным грамадзтве. – **П. А.**) паступова робяцца немагчымымі, што вельмі спрыяе памяншэньню колькасьці гісторыяў і здарэньняў, якія ў суме складаюць чыёсьці жыцьцё... Жанр раману не прыстасаваны для таго, каб апісваць раўнадушша альбо пустэчу; трэба было вынайсьці нейкую іншую мадэль, больш роўную, больш ляканічную, больш маркотную» (Мішэль Уэльбэк. «Пашырэньне прасторы барацьбы»). Такім чынам, пакуль я заклінаў і заклікаў, у эўрапейскім рамане паглыбляўся крызіс. Першымі гэта заўважылі самі пісьменьнікі. Жыцьцё зноў аказалася складанейшым за літаратуру. Ці пачаў я пасьля гэтага пакрысе пагаджацца з тым, што Глёбус знайшоў адпаведную форму(лу) для свайго новага тэксту («больш ляканічную, больш маркотную», калі казаць словамі француза Ўэльбэка)? Магчыма.

О, ледзь не забыўся: Глёбус зрабіў мяне пэрсанажам «сУчасьнікаў» – выйшаў цудоўны вобраз блазнаватага крытыка-самавука. А што яшчэ застаецца рабіць у час, калі адносіны паміж пісьменьнікам і крытыкам паступова робяцца немагчымымі?

АЎТАР, КНІГА, ЧЫТАЧЫ: ХТО КАГО АДУЖАЕ?

Глёбус лічыць, што «сУчасьнікі» – гэта ня нон-фікшн, а менавіта мастацкі тэкст. «Таму, – кажа пісьменьнік, – пэўныя факты я наўмысна скажаю дзеля мастацкага вобразу. Часам трансфармую прозьвішчы герояў» (Народная воля. 2005. № 184). Як вядома, у слова «скажэньне» два значэньні. Пісьменьнік абраў адно, чытачы, якія сталі прататыпамі герояў кнігі, – другое. Вось і маем «этымалягічны канфлікт»: Глёбус упэўнены, што ў сваёй кнізе ён радыкальным чынам перапрацаваў, зьмяніў факты, а чытачы – што ў «сУчасьніках» інфармацыя пададзена лжыва, няправільна[1].

Сапраўды, успрыняцьце пісьменьнікам уласнай кнігі, з аднаго боку, і стаўленьне да ягонага твору чытачоў – з другога, амаль заўсёды не супадаюць. Да таго ж, як сьведчыць гісторыя сусьветнай літаратуры, пісьменьнік можа колькі заўгодна дэкляраваць нешта наконт сваёй кнігі, але насамрэчна ў улады над ёю – гэта можа яскрава выявіцца яшчэ ў часе працы над творам.

Аднак сёньня я ўжо ня схільны лічыць, што Глёбус, быццам альхімік, правёў няўдалы вопыт, і ў выніку атрымаў зусім не паслухмянага Галема, а стогаловую істоту, якая мае ўласную душу, няхай і перакрыўленую, скажоную, і якая сыпле праклёнамі на адрас свайго творцы. Уся справа ў інтэрпрэтацыях, прапанаваных чытачамі і крытыкамі. Глёбус жа ставіў перад сабою канкрэтныя задачы. Па-першае, ён імкнуўся «паказаць шэрасьць, абыякавасьць і нудоцтва» (Народная воля. 2005. № 184). Гэтыя словы многае вытлумачаюць, і шкада, што перакананьне, быццам трапіць у «сУчасьнікі» – тое модна, тое *cool*, якое я ніколі не падзяляў, да гэтага часу папулярнае ў калялітаратурных беларускіх колах.

Па-другое, да ліку галоўных мастацкіх праблемаў, якія Глёбус вырашаў у гэтай кнізе, можна аднесьці праблему крыўды і абразы, а таксама «гульні з крыўдаю». Ім прысьвечана «геапаэтычнае эсэ» «Крыўда», і тое, што яно зьмешчана ў «сУчасьніках» у якасьці аўтарскай прадмовы, зусім не выпадкова. «Пакрыўдзіць азначае паказаць крывое, адхіленьне ад нормы, навесьці крытыку ў карыкатурнай форме

[1] А аднак не спадабалася чытачам, што ў часе працы Глёбусавых «сУчасьнікаў» лёгка «прачытваюцца» прозьвішчы прататыпаў – пісьменьнік зьмяніў толькі адну-дзьве літары. Ці ж гэта мастацкая трансфармацыя? Давайце паглядзім на праблему зь іншага боку: у беларускай публіцыстыцы

і застацца пры ўсім пры тым праўдзівым», – аб гэтых словах Глёбуса трэба памятаць, калі чытаеш «сУчасьнікаў».

…У 1799 годзе «Дыярыё дэ Мадрыд» даў мудры камэнтар да сэрыі афортаў «Капрычас» Францішка Гоі, спрабуючы тым самым хоць часткова абараніць мастака і ягоную творчасьць ад нападак гледачоў і крытыкаў. «Няма патрэбы папярэджваць публіку, якая не зусім недасьведчаная ў мастацтве, тлумачыла выданьне, – што ў ніводнай кампазыцыі гэтай сэрыі мастак ня меў на мэце высьмеяць недахопы нейкай канкрэтнай асобы. Сапраўды, таленту было б занадта цесна ў рамках гэткай задачы...»

Сёньня Глёбусу прад'яўляюць тыя ж абвінавачваньні, што і Гоі калісьці. Многім цяжка паверыць, быццам у «сУчасьніках» Глёбус ня зводзіў рахункаў з сваімі ворагамі ў жыцьці і літаратуры, што ў кнізе ён вырашаў найперш мастацкія задачы, а таксама ўлічваў густы сваіх «ідэальных чытачоў» (выраз Умбэрта Эка)[2]. Аднак памятайма: пісьменьніка можна крытыкаваць зыходзячы толькі з тых крытэраў, якія ён сфармуляваў сам. «Кнігу перачытваюць, газэту – праглядаюць», – калісьці сказаў Глёбус.

Калі вы возьмецеся перачытваць «сУчасьнікаў», значыцца, гэта мастацкі твор.

«ЛЮДЗЬМІ ЗВАЦЦА»

Нягледзячы на тое, што кніга «сУчасьнікі» мае наклад 500 асобнікаў, яна выбухнула ў беларускай літаратурнай прасторы быццам бомба – у многім дзякуючы радыкальнаму абнаўленьню Глёбусам свайго «ваеннага арсэналу», то бок мастацкага мэтаду. Дамавікі-агенты, якія перасьледавалі беларусаў і падпільноўвалі іх ўсюды, дзе толькі можна, былі звольнены, бо пісьменьнік вырашыў паназіраць-пасачыць за паспалітымі людцамі самастойна. Глёбусу ўдалося – цяпер яму вядомы ўсе словы, учынкі, звычкі, правіны іншых людзей. «Хіба ж гэта людзі? – пярэчыць Глёбус. – Ведзьмакі лысагорскія гэта, а ня людзі, сУчасьнікі, адным словам»[3]. Трапная

літаратурна-мастацкай крытыцы яшчэ з савецкіх часоў укаранілася благая звычка не называць аніякіх прозьвішчаў наагул – толькі Н. і М. дый канструкцыі накшталт «адзін чалавек неяк мне сказаў». Да прыкладу, артыкул Людмілы Рублеўскай «Вышыні ніхто не скасоўваў» (Советская Белоруссия. 2005. № 212) густа «перасыпаны» выразамі «довелось услышать грустную фразу от коллеги-

характарыстыка, аднак у кнізе дзеюць ня толькі сУчасьнікі, якія ўвасабляюць пошласьць, мяшчанства і выродзтва, але і тыя, хто могуць па праву «людзьмі звацца». Іх аўтар вывеў на ўласнымі прозьвішчамі і «зьмясьціў» у асобнай главе «Настаўнікі».

Трапіць у «сУчасьнікі» лёгка. Крыўдаваць можна бясконца. А вось перастаць ілгаць самім сабе і іншым, зрабіцца шчырым і адказным, навучыцца саромецца і сьмяяцца, даравань і кахаць – тое навука. Кніга Глёбуса і пра гэта таксама. Пра пошукі самога сябе і свайго месца ў жыцьці. «Варта шукаць дастойныя заняткі і прысьвячаць ім сваё жыцьцё», – упэўнены ён (навэля «Вера Маркава і заняткі»).

«…и в чистейшей, как дождь, душе. А один из ведущих российских критик как-то честно мне признался…», «не так давно в Москве маститые критики разных жанров собирались на конференцию…», «как завершил свою статью один российский критик…» і інш. Вось такая тыпізацыя з боку журналістаў і крытыкаў. Што тычыцца беларускай літаратуры, то яна заўсёды была больш, чым літаратура. І таму я на баку Глёбуса

– ён зрабіў усё правільна і прафэсійна.

[2] Апошніх Глёбус ахарактарызаваў так у часе он-лайнавай канфэрэнцыі на радыё «Свабода», якая адбылася 6 ліпеня 2005 году: «Мае беларускія чытачы любяць крыўду, асабліва любяць назіраць, калі нехта некага крыўдзіць. Назіраюць і сьмехам душацца, гады. Для такіх чытачоў я і выдаю кнігу «сУчасьнікі».
[3] Постынг ад 05.10.2003, 16:08.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/14
[image]

Андрэй Хадановіч Кожны чацьверты – прэзыдэнт, альбо Плошча Элегантнай Перамогі

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ паэт. Апошняя кніжка вершаў – «From Belarus with Love» (Кіеў: Факт, 2005).

Памятаю, у маім раньнім дзяцінстве, што прыпала на гады савецкага застою, у Беларусі на ўзроўні афіцыйнай прапаганды была неймаверна папулярная тэма вайны. Колькасьць ваенных песень на тэлебачаньні й радыё проста не паддавалася падліку. Кінастудыю «Беларусьфільм» невядомыя дасьціпнікі тады перайменавалі ў «Партызанфільм», бо яна й напраўду выдавала вялікую колькасьць кінастужак з пазытыўнымі героямі, што хаваліся ў лясы, пускалі пад адхон цягнікі й стралялі значна лепей, чым беларускія біятляністы на апошняй алімпіядзе ў Турыне.

Вяршыняю гэтай ідэалягічнай працы зь беларускім насельніцтвам быў такі выхаваўчы момант: беларусам, асабліва дзеткам, рэгулярна, з нагоды й без нагоды, нагадвалася страшная лічба ваенных ахвяраў. Менавіта згадка пра ахвяры вайны станавілася найважнейшым момантам беларускай савецкай ініцыяцыі, якім было прыняцьце ў шэрагі піянэраў. Гэта найгоршых менскіх вучняў прымалі ў піянэры проста ў

школе, пад музыку горнаў і стук барабанаў. Найлепшых з гэтай мэтаю звычайна адвозілі ў Музэй Вялікай Айчыннай вайны, дзе зьведваньне заляў, прысьвечаных зьверствам нямецка-фашысцкіх захопнікаў, было неабходнай псыхалягічнаю прыступкай да ўрачыстага павязваньня піянэрскага гальштука. Відаць, менавіта пачуцьцё гневу й помсты павінна было стаць той моцнай адмоўнай эмоцыяй, якая на стадыі чытаньня дзіцячай «мантры» – клятвы піянэраў Савецкага Саюзу – павінна была сублімавацца ў цалкам стваральны энтузіязм юнага будаўніка камунізму.

Але саміх вялікіх «шчасьліўчыкаў» піянэрважатыя вывозілі ажно ў мэмарыяльны комплекс Хатынь. Гледзячы на вечны агонь, слухаючы набат хатынскіх званоў, узіраючыся ў бясконцыя могілкі беларускіх спаленых вёсак, піянэры мусілі памятаць галоўнае: у сьвеце па-ранейшаму цягнецца вечны бой дабра са злом, сьвятла зь цемраю, і яны, юныя піянэры, цяпер апынуліся зусім побач з гэтай лініяй фронту. (Такі сабе атэістычны аналяг несьмяротнага афарызму Ф. Дастаеўскага пра тое, што д'ябал з Богам змагаецца, а поле бітвы – душы людзей. Афарызму, які зноў стаўся ў нас папулярным і ўсё часьцей выкарыстоўваецца ў ідэалягічных праграмах беларускага тэлебачаньня.)

Але вернемся да хатынскай ініцыяцыі піянэраў. Найвышэйшай эмацыйнай кропкаю мэмарыялу мусілі быць нават не сымбалічныя дахі спаленых хатаў і ня помнікі ахвярам канцэнтрацыйных лягераў, а тры нявінныя бярозкі, якія, здавалася б, могуць выклікаць толькі самыя сьветлыя эмоцыі. Але ўвесь «фокус» стваральнікаў мэмарыялу ў тым, што іх мусіла быць чатыры. Падкрэсьлена адсутная ў правільным квадраце чацьвертая бярозка ўва ўсёй жахлівай матэрыяльнасьці сымбалізавала тое, чаго няма, – кожнага чацьвертага зьнішчанага ў вайне жыхара Беларусі (тады не казалі пра галакост і не ўдакладнялі нацыянальнасьці ахвяраў).

І не было ў гэтым сымбалі нічога выпадковага. Рэч у тым, што выраз «кожны чацьверты» зрабіўся самым частотным і важным слоганам савецкай ідэалёгіі на тэрыторыі БССР – так бы мовіць, з улікам нацыянальна-гістарычнай спэцыфікі. Фраза, тысячу

разоў увасобленая ў мэмарыяльных надпісах, тэкстах сумных дзіцячых песень і (таксама сумных) падручніках па гісторыі, зрабілася беларускім нацыянальным брэндам і ў даведзеным да аўтаматызму выглядзе ўвайшла ў нашую падсьвядомасьць. Таму ўжо любое ўжываньне словазлучэньня «кожны чацьверты» машынальна цягнула за сабой працяг – «беларус»… альбо «мёртвы», што ў гэтым кантэксьце, на жаль, успрымалася амаль як сынонімы.

І цяпер, праз чвэрць стагодзьдзя, знаёмы слоган па-ранейшаму раз-пораз гучыць у нас і па-ранейшаму выклікае акрэсьленае поле асацыяцыяў, першая зь якіх – савецкае дэжа вю й выразнае адчуваньне, што Вялікая Айчынная вайна так і ня скончылася ў галовах некаторых беларускіх палітыкаў. І гаворка нават не пра пампэзнае сьвяткаваньне ўладай чарговых угодкаў перамогі, і нават не пра тое, што вайна – незаменны фундамэнт, на якім робяцца ўсе спробы пабудаваць новую беларускую афіцыйную ідэалёгію. (Чаго варты хаця б абавязковы ўнівэрсытэцкі курс «Вялікая Айчынная вайна ў кантэксьце Другой сусьветнай» – страшны сон сёньняшніх беларускіх студэнтаў!) Гаворка пра тое, што да болю знаёмы слоган нечакана ўсплыў у сувязі з прэзыдэнцкімі выбарамі 19 сакавіка.

Упершыню пра Хатынь у гэтым кантэксьце мне нагадалі вынікі нібыта «аб'ектыўных» сацыялягічных электаральных дасьледаваньняў. Нам, шараговым гледачам беларускага тэлебачаньня, ня проста паведамілі, што, паводле папярэдніх зьвестак, каля 76 % беларускіх выбарцаў зьбіраюцца зноў прагаласаваць за А. Р. Лукашэнку. Для большага ўражаньня нам паказалі гэта на адпаведнай дыяграме. І тут ужо проста немагчыма было не згадаць пра тры хатынскія бярозкі. Вось яны – тры чвэрці электарату, якія «правільна» галасуюць, а вось астатняя чвэрць – незапоўненая насычаным колерам, а таму як бы пустая – гэта тыя, хто прагаласуюць за каго-небудзь яшчэ; у гэтым выпадку, ня важна за каго, важна – супраць каго. У сьвятле ўсяго сказанага вышэй у мяне ўзьнікаюць сумневы: «кожны чацьверты – супраць» – гэта безэмацыйная статыстыка альбо хутчэй прыхаваная пагроза? Каму ж са студэнтаў пасьля курсу «Вялікая Айчынная вайна» захочацца быць «кожным чацьвертым»?!

Атмасфэра страху, які прысутнічае ў Беларусі не як абстракцыя, а вельмі нават канкрэтна, становіцца найлепшай школаю палітычнага канфармізму. Так, зьвяртаюць на сябе ўвагу зьмены, што адбыліся з наймаладзейшым пакаленьнем, што ідзе галасаваць. Здаецца, у яго выразна паболела і абыякавасьці, і беспрынцыповасьці.

Ёсьць уражаньне, што вырасла першае, выбачайце за немілагучнасьць, *падлукашэнкаўскае* маладое пакаленьне, здольнае спакойна заплюшчваць вочы на тое, што абражала іх раўналеткаў дзесяць гадоў таму.

Ня так даўно я знайшоў для сябе два тэрміны ці, хутчэй, два вобразы, якія пазначаюць дзьве супрацьлеглыя грамадзкія зьявы: «паўзучы» канфармізм і волю да супраціву, – а таксама перагукваюцца зь менскаю тапаграфіяй. Першы такі вобраз – кантамінацыя плошчы Перамогі (што ў Менску лепей нагадвае пра Другую сусьветную?) і гучнай заявы прэзыдэнта пра сваю «элегантную перамогу». Выйшла *Плошча Элегантнай Перамогі*, прычым маецца наўвеце ня пляц, дзе б паставілі помнік Лукашэнку-пераможцу, а хутчэй геамэтрычны сэнс слова «плошча» – усё новыя й новыя плошчы, на якія пашыраецца й распаўзаецца згаданы вышэй канфармізм. Супрацьлеглы яму вобраз – *плошча Незалежнасьці*, з галоўным акцэнтам таксама на геамэтрычным сэнсе слова «плошча». Плошча Незалежнасьці як такая сабе «прастора свабоды», яшчэ (ці ўжо) не захопленая сындромам «элегантнай перамогі».

Але й наўпроставы тапаграфічны сэнс выразаў таксама істотны. Так, за апошнія гады я двойчы меў уражаньне, што ў Менску выразна паменела «тэрыторыі незалежнасьці». Упершыню ў час перайменаваньня станцыі мэтро «Плошча Незалежнасьці» назад у «Плошчу Леніна» – нібыта першы падрыхтоўчы этап да перайменаваньня на савецкі капыл і самой плошчы. І другі раз – калі, здавалася б, «незалежнасьці» паболела – прынамсі на менскіх будынках. Я пра цынічнае перайменаваньне праспэкту Скарыны ў праспэкт Незалежнасьці – падарунак на 60-я ўгодкі Перамогі, які сам сабе зрабіў прэзыдэнт Лукашэнка. Што й казаць, яшчэ адна «элегантная перамога», гэтым разам – над беларускай гісторыяй. Дарэчы, пра «паўзучы» канфармізм і

«элегантныя перамогі» мы крыху й пагаворым.

Сёньня толькі лянівы ў нас не сьмяецца з прадажнасьці беларускай эстрады, якая дзеля грошай і піяру ўдзельнічала ў прапагандысцкім туры па гарадах «За Беларусь!», сама назва якога надта ж перагукалася зь перадвыбарным лёзунгам прэзыдэнта. І няма чаго дзівіцца, бо артысты эстрады, мякка кажучы, ня тыя творцы, ад якіх чакаюць прынцыповасьці й крытычнасьці. Можна наракаць на такія канцэрты й адначасна радавацца, што там амаль не гучала беларускамоўных песень, можна цынічна жартаваць з выключнай безгустоўнасьці такіх імпрэзаў. Маўляў, найбольшую эфэктыўнасьць такія канцэрты «за бацьку!» маглі б мець у дзіцячых дамах, але маленькая публіка, якая б, у адрозьненьне ад артыстаў, шчыра крычала б «мы за бацьку!», а заадно й «мы за маці!», пакуль ня мае права галасаваць, а таму гэта ўсё даводзілася цярпець дарослым «сіротам».

Усякі сьмех заканчваецца, калі да выкарыстанай уладаю «папсы» далучаюцца маладыя рок-сьпевакі, калі лідэры не найгоршых маладых рок-камандаў ператвараліся ў вядоўцаў на ўжо згаданых канцэртах «За Беларусь!». Тут мне напраўду ўжо ня сьмешна, бо канфармізм пашыраецца на раней чужыя яму тэрыторыі.

Прыкладна такім самым чынам толькі лянівы ў нас не сьмяяўся са створанага рэжымам Саюзу пісьменьнікаў Беларусі (ня блытаць з Саюзам беларускіх пісьменьнікаў – гэта цяпер зусім розныя арганізацыі!). Так, касьцяк яго склалі графаманы й расейскамоўныя літаратары, якім, відаць, здавалася, быццам у законнай пісьменьніцкай арганізацыі іх недаацэньваюць. Цяпер у іх ёсьць шанец разьлічваць, як у савецкія часы, на льготы й узнагароды з боку ўлады – за верную службу. Але вось ужо ў марыянэткавы саюз паціхеньку папаўзьлі першыя маладыя небяздарныя паэты – у абмен на стыпэндыі ды іншыя (зрэшты, мізэрныя) спакусы. І тут яшчэ пакуль можна пасьмейвацца, згадваючы фаўстаўскую дамову з д'яблам, параўноўваючы ўмовы кантрактаў ды сумна іранізуючы з інфляцыі душаў, якія цяпер прадаюцца амаль што задарма.

Дзе мне перастае быць сьмешна, дык гэта калі навастворaны

саюз прысабечвае права называцца адзінаю сапраўднаю беларускай літаратурай. Калі наша Міністэрства адукацыі забараняе школам і ўнівэрсытэтам арганізоўваць сустрэчы з усімі літаратарамі, апроч сяброў згаданай арганізацыі. Калі ўсё ідзе да перагляду школьнай літаратурнай праграмы ўва ўсім, што датычыць жывых пісьменьнікаў, на падставе іх ляяльнасьці да рэжыму. Гаворка не пра погляды літаратараў ды іх уплыў на працэс школьнага выхаваньня. Гаворка пра тое, што замест адносна нядрэнных вершаў і прозы нашы школьнікі будуць вымушаны чытаць вельмі дрэнныя.

Але зусім ужо ня сьмешыць, здавалася б, супрацьлеглая зьява, калі самыя таленавітыя творцы з найбольш вядомымі імёнамі дазваляюць палітыцы выкарыстоўваць сябе больш вытанчаным чынам – калі рэдукуюць сваю творчасьць толькі да палітычнага супраціву, калі выказваюць не графаманскае падхалімства, як іх згаданыя калегі, а, наадварот, поўную меру сваёй глыбокай нянавісьці да прэзыдэнта і яго рэжыму. Я пра тонкіх лірыкаў, не абы-якіх мастакоў-жывапісцаў, якія замест мастацтва займаюцца палітычным кічам, больш за тое – неймавернымі высілкамі свайго таленту падымаюць гэты палітычны кіч амаль да ўзроўню мастацтва. Дарэчы, робячы гэта цалкам сьвядома. Пашыраная сярод такіх заангажаваных у палітыку творцаў думка: буду рады, калі ў Беларусі нарэшце настане такі момант, калі мае злабадзённыя творы перастануць быць актуальныя. Але маю падазрэньне, што палітычная злабадзённасьць – ня што іншае, як форма іншага, ужо мастацкага канфармізму. У выніку, некалькі пакаленьняў нашых не найгоршых мастакоў і літаратараў і напраўду будуць мець вялікія творчыя праблемы, як толькі палітычная сытуацыя ў краіне зьменіцца да лепшага. Будучым чытачам-гледачам-слухачам цяжка будзе патлумачыць, у чым была «фішка», у чым сакрэт колішняй папулярнасьці, у чым заслуга перад вечнасьцю таго ці іншага сьпевака-мастака-паэта. Сёньня мастацкая рызыка як крытэр эстэтычнай дасканаласьці падмяняецца ў нас рызыкаю ў прамым сэнсе – палітычнай рызыкаю пацярпець за свае перакананьні ў краіне з дэфіцытам свабоды слова. Але рызыкаваць жыцьцём, выступаючы супраць улады, у прынцыпе, можа й графаман, і сам факт рызыкі яшчэ ня робіць яго геніем.

Ёсьць нешта хваравіта перабольшанае ў тым, якое вялікае месца займае прэзыдэнт у сьвядомасьці абсалютна ўсіх, хто думае пра сёньняшнюю Беларусь – як у самой краіне, так і за яе межамі. Лукашэнка даўно зрабіўся такой сабе «беларускай нафтаю», адзіна магчымай у нас свабодна канвэртаванай валютай. Увесь палітычны дыскурс, усе інтэлектуальныя дыскусіі круцяцца наўкол яго. Больш за тое, усё, пра што ў Беларусі не гаворыцца адкрыта, таксама круціцца наўкол яго, бо шмат хто, маючы сваю ўнутраную цэнзуру, дакладна ведае, якіх пытаньняў лепей не чапаць, каб ня мець праблемаў. Перад намі пэрсона, якая «корміць» усіх палітыкаў, інтэлектуалаў, творцаў, незалежна ад іх каштоўнасьцяў і палітычнай ці мастацкай арыентацыі.

Ёсьць нешта нездаровае ўва ўсіх гэтых кухонных размовах пра пэрсанальную адказнасьць адной асобы за ўсё, што ў нас адбываецца; пра тое, «што Беларусь выратуе толькі снайпэр» і г. д. Ці не зашмат гонару для аднаго? Такая сабе форма псыхічнай залежнасьці ад Лукашэнкі, сама нянавісьць да якога часам мае падазрона інтымны характар. Так рамантычныя багаборцы замахваліся на Бога. Так цяжкія падлеткі бунтуюць супраць бацькі. (Дарэчы, само беларускае слова «бацька» ўсё шырэй ужываецца ў сьвеце безь перакладу – часам іранічна, а часам і на поўным сур'ёзе.)

Беларусь – гэта тая краіна, дзе фрайдызм нарэшце перамог, і нам ня варта недаацэньваць пэўных выкладак венскага доктара. Дзесяцігодзьдзямі нас ня толькі патрыятычна, але й эстэтычна прывучалі да мэтафары «краіна-маці», выхоўвалі кроўна-сыноўскае стаўленьне да антрапаморфнай Айчыны жаночага роду. Чаго дзівіцца, калі пасьля зьяўляецца прэзыдэнт-«бацька», які ставіць сымбалічнае цела краіны ўва ўсе магчымыя позы «Камасутры», а потым – «как чэсный чалавек!» – проста абавязаны зь ёй ажаніцца, прычым пажыцьцёва. Натуральна, і лютая нянавісьць да яго з боку патрыятычна скіраванай інтэлігенцыі будзе мець інтымна-сямейны характар. Мы маем клясычную нянавісьць-рэўнасьць сына да бацькі. Нянавісьць-рэўнасьць, якая шматкроць узмацняецца, бо дзеці пачуваюцца ня роднымі, а хутчэй пасынкамі.

Адным словам, Лукашэнка як галоўная інфармацыйная нагода Беларусі – у гэтым найперш была яго нязьменная «элегантная перамога». І ня так важна, хвалілі ці лаялі яго ў тралейбусах пасьля чарговага шматгадзіннага тэлевыступу. Важна, што згадвалі. Тут усё як у рэкляме. Брэнд фігуруе ў сьвядомасьці пакупнікоў і без праблемаў «перамагае», пакуль у сьвядомасьці не зьяўляюцца брэнды-канкурэнты. А як толькі яны зьяўляюцца, вечны аргумэнт сярэдняга беларускага абываталя «калі не Лукашэнка, дык хто?» ужо не выглядае такім непрабіўным.

Даўно заўважана, што мэдыі – гэта тое акенца, празь якое выглядае ў сьвет наш сярэднестатыстычны сучасьнік. Да нядаўняга часу дзяржаўныя мэдыі не пакідалі беларусам надта багатага выбару, так што сьвет у іхным люстэрку выглядаў альбо жахлівым (бясконцыя цунамі, паводкі, тэракты ў навінах з-за мяжы), альбо стабільным, але жахліва нецікавым (ход уборачных работаў, сьвяткаваньне дажынак і г. д. у навінах зь Беларусі). Выбары неймаверна ажывілі жыцьцё беларускага тэлегледача. Яшчэ ніколі яго так не палохалі жахлівым Захадам, масонскімі змовамі, міжнароднымі фінансавымі вараціламі-сатаністамі й Амэрыкай, што проста прадала душу д'яблу. Яшчэ ніколі цікаўны да ўсяго пікантнага абываталь ня чуў такіх выкрывальніцкіх матэрыялаў пра супрацоўнікаў варожых Беларусі пасольстваў, пра сэксуальную арыентацыю эўрапейскіх дэмакратаў, пра шкодніцкую дзейнасьць беларускай апазыцыі зь літаратарамі й рок-гуртамі ўключна. Яшчэ ніколі (прынамсі са сталінскіх часоў) не рабілася такой спробы нацкаваць увесь беларускі народ на інтэлігенцыю як слой. (Я маю наўвеце фільм «Духоўная вайна» з празрыстай аналёгіяй: ворагі Хрыста фарысэі – інтэлектуалы. Пасьля такога заставалася толькі абвесьціць Лукашэнку новым мэсіем і заклікаць беларускі электарат не ўкрыжоўваць яго 19 сакавіка.) Дзякуй ім, сьціплым тэлевізійным байцам ідэалягічнага фронту! Няпроста змагацца з усім сьветам, абараняючы адзін маленькі, але горды палітычны рэжым, калі ўся твая зброя – БТР (БелТэлеРадыё).

Але няма правілаў без выключэньняў. *Auditur et altera pars* – хай будзе выслуханы й іншы бок. І на хранічна нецікавым

Белтэлебачаньні (на жаль, на кароткі час) зьявілася сапраўды цікавая праграма – палітычныя выступы кандыдатаў у прэзыдэнты. Уражаньне выйшла калясальнае. Бацькі тэлефанавалі сваім дзецям і жыва абмяркоўвалі тое, што дзеялася проста ў іх на вачах. Некалькі дзён калегі й знаёмыя смакавалі кожнае слова з прамоўленага – перадусім, апазыцыйнымі кандыдатамі. Палітычны дыскурс пранік нават у даволі інтымныя сфэры беларусаў, што даўно ўжо так не хваляваліся зь перадвыбарнай нагоды. Напрыклад, мы з жонкаю атрымалі паштоўку са сьвяточным віншаваньнем, што канчалася заклікам: «Галасуйце за Мілінкевіча!».

Што да саміх апазыцыйных кандыдатаў (дазвольце ўжо, я буду так называць і Мілінкевіча, і Казуліна, хоць апазыцыйнасьць апошняга выглядае не такой бясспрэчнай), то яны адказна падышлі й грунтоўна падрыхтаваліся да зваротаў да нацыі. І калі першы паспрабаваў прэзэнтаваць уцямную палітычную праграму, то другі паказаў сапраўдную клаўнаду палітычнага папулізму, прычым папулізму экстра-клясы. Яскравы палітычны ход – паспрабаваць быць большым Лукашэнкам, чым сам Лукашэнка. Зрэшты, чаму й не. Ёсьць жа ў нас у Менску два праспэкты Машэрава – стары й новы, перайменаваны, якія, да таго ж, яшчэ й перакрыжоўваюцца, так што большасьць жыхароў у іх цяпер блытаецца. Яскравым палітычным ходам такога сабе Казуліна было б перайменаваньне кандыдата ў прэзыдэнты: маўляў, «шаноўныя грамадзяне, прашу лічыць мяне Лукашэнкам будучыні, а таго, старога, калі ласка, лічыце неактуальным!».

«Ці мела гэта ўсё хоць найменшы плён? Ці магчыма заіснаваць у масавай сьвядомасьці ўсяго за месяц агітацыі, калі супернік мае неабмежаваныя інфармацыйныя магчымасьці? Што рабіць зь непразрыстай працэдурай выбараў, фальсыфікацыя якіх, відаць, становіцца беларускім нацыянальным спортам? Ці здольнае беларускае грамадзтва на вуліцах адстойваць свой выбар і свае каштоўнасьці, як гэта здарылася ўва Ўкраіне й некаторых іншых краінах? І ці дастатковая для людзей матывацыя – бараніць другое месца свайго кандыдата?»

Такія й іншыя пытаньні маглі б выказаць і выказваюць

шматлікія скептыкі. І зноў прывід хатынскіх бярозак красамоўна паўстае перад вачыма. Ці ня будуць яны цяпер выклікаць асацыяцыі яшчэ і з найсімпатычнейшым удзельнікам чацьверкі прэтэндэнтаў, апазыцыйным кандыдатам, які так і не скарыстаўся магчымасьцю ператварыцца калі не ў прэзыдэнта, то прынамсі ў адну з найважнейшых і найаўтарытэтнейшых палітычных фігураў у Беларусі?

У адказ мне хочацца працытаваць мудрага правакатара Валянціна Акудовіча:

Свабоду нельга заваяваць – яе можна толькі дачакацца (ці не дачакацца). Але яе можна дачакацца адно ў тым разе, калі мы яе будзем чакаць, і чакаць менавіта як свабоду. Толькі ня трэба блытаць чаканьне з пасіўным перабываньнем у абыякавасьці. Калі мы моцна некага чакаем, дык рыхтуемся да сустрэчы. Чаканьне свабоды – гэта падрыхтоўка да сустрэчы з свабодай. Свабода ніколі не прыходзіць туды, дзе яе не чакаюць… І калі мы ў сваім мностве станем чакаць свабоду – яна Беларусі не праміне!

Пры канцы хачу падзяліцца адным назіраньнем. Неяк так сталася, што паўсюль, дзе я бываў, дзе бывалі мае сябры й калегі, зьявілася вялікая колькасьць каляндарыкаў з выявай Аляксандра Мілінкевіча. Здаецца, гэтых каляндарыкаў было вельмі шмат, болей, чым рэальна трэба для ўдакладненьня даты альбо дня тыдня. І я дазволіў сабе такую думку: вось жа, так ці іначай выбары прэзыдэнта адбудуцца, а каляндарыкі застануцца. Уявіце сабе, упершыню – вялікая колькасьць каляндарыкаў з прыстойным палітыкам, чый твар мае шанец запомніць вялікая колькасьць дагэтуль палітычна абыякавых людзей. Упершыню – палітычны каляндарык, якім ня сорамна карыстацца. Напрыклад, як закладкай у кніжцы. І гэта не іранічная зьнявага, а камплімэнт, калі ўлічыць, які інтымны працэс для чалавека – чытаньне. Калі ўлічыць, якім прыгожым і моцным сымбалем была, ёсьць і будзе закладка – разьдзяляльная лінія паміж мінулым і будучыняй.
[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/14
[image]

• крытыка • эсэістыка • **аналітыка** • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

ГО КАШЫНА (нар. у 1971 г.) спэцыялізуецца на дасьледаваньні беларускай літаратуры і расейскай літаратуры XIX ст. Бакалаўр (1994 г.), магістар (1996 г.) і доктар PhD (2002) Хакайдзкага ўнівэрсытэту. У 2001–2003 гг. працаваў у амбасадзе Японіі ў Менску.

Го Кашына

Прэзэнтацыі беларускай мовы ў сучаснай беларускай літаратуры

Агульнавядома, што беларусы вызначаюцца слабой нацыянальнай сьвядомасьцю і неразьвітай этналінгвістычнай ідэнтычнасьцю. І пытаньне пра тое, ёсьць этна-лінгвістычная нацыянальная сьвядомасьць або яе няма, рэдка дзе набывае гэткую велізарную геапалітычную значнасьць, як у Беларусі.

З моўнага гледзішча Беларусь – найбольш зрусіфікаваная сярод былых савецкіх рэспублік. У Менску на вулічных указальніках і рэклямных шчытох можна ўбачыць шмат беларускіх словаў, але ў гутарках чуваць толькі расейскую мову. У вялікіх кнігарнях, прыкладам, у «Доме кнігі», сэкцыі беларускай літаратуры адводзіцца ня менш месца, чым расейскай ці якой іншай замежнай літаратуры. Але на кніжных кірмашах, больш чуйных да патрабаваньняў рынку, цяжка знайсьці беларускамоўную кнігу. У Беларусі Барыс Акунін, Віктар Пялевін і Харукі Муракамі карыстаюцца гэткай жа папулярнасьцю, што і ў Расеі. Як сьцьвярджае моваznаўца Н. Б. Мячкоўская, галоўная функцыя беларускай мовы не камунікатыўная (быць сродкам зносінаў між людзьмі), а «этнічная» (выконваць ролю сымбалю, што яднае нацыю і

[1] Мечковская Н. Б. Языковая ситуация в Беларуси: этнические коллизии двуязычия // Русское языкознание. 1994. № 3. С. 308.
[2] McMillin Arnold. Belarusian Literature in the 1950s and 1960s. Koln, 1999. P. 139–171.

[3] Трусаў А. Месца і роля [1] адрузаў в. Месца і роля рускай мовы ў грамадскім жыцці Беларусі // Беларусіка. № 19. 2001. С. 244 – 247.

«АЎТАПЕРАКЛАД», АБО МОВА ЛІТАРАТУРНЫХ ГЕРОЯЎ

– Больш ніколі не танцуйце лебедзя, – глуха сказаў ён. – Вам нельга.

– Чаму?

– Вам нельга гінуць. Нават на сцэне. Вы поўная жыцьця, сонца, вы шчырая да гэтага неба і гэтых людзей. І я ня ведаю, ці прыходзяць калі-небудзь дрэнныя думкі ў вашу галоўку.

– Часам прыходзяць.

– Ня веру, – сказаў ён.

Уладзімер Караткевіч. «Маленькая балерына»

Гэта цытата зь беларускамоўнага твору У. Караткевіча «Маленькая балерына». Але дзеяньне адбываецца ў Маскве: Сталін вядзе рамантычную гутарку з галоўнай гераіняй. Нам даводзіцца ўяўляць, як насамрэч гучалі іх словы па-расейску. Калі падзеі ў літаратурным творы разгортваюцца за мяжою або сярод герояў зьяўляюцца іншаземцы, няма нічога дзіўнага, што аўтар перакладае іх рэплікі. Гэтую зьяву можна назваць «аўтаперакладам».

Калі Газавік са стажэрам выйшаў з кватэры, дык закурыў і сказаў:

– Адразу відаць, што ў хаце няма гаспадара.

– Лепш бы мы грошы і віно ўзялі, – у тон працягнуў стажэр.

– Сьлімак! – сказаў Газавік і ўдарыў стажэра кулаком у патыліцу.

Адам Глёбус. «Газавік» (з «Дамавікамэрону»)

Беларуская мова ўжываецца ў самой краіне досыць абмежавана. У гэтым дыялёгу выбар мовы здаецца ненатуральным ці, прынамсі, абсалютна нечаканым. Амаль ва ўсіх аповедах з «Дамавікамэрону» дзеяньне адбываецца ў горадзе. Немагчыма ўявіць, каб усе героі – выхадцы з розных сацыяльных групаў – у жыцьці гаварылі па-беларуску. Значыць, пэўная частка тэксту – «аўтапераклад» з расейскай (ці трасянкі) на беларускую.

Паколькі ў Беларусі ў штодзённым жыцьці пануе расейская мова або трасянка, аўтарам неяк цяжка – і псыхалягічна, і эстэтычна – пісаць толькі па-беларуску. Асабліва ненатуральна, быццам перакладзеныя з замежнай мовы, гучаць дыялёгі. У гэтым сэнсе «бясьпечныя» жанры, якія не парушаюць моўнага рэалізму, зводзяцца да: 1) гістарычнага раману, дзе беларуская мова выглядае больш натуральна;2) вясковай прозы, бо па-беларуску часьцей гавораць на вёсцы; 3) ваеннай прозы, бо гэты жанр спалучае рысы гістарычнага раману і вясковай прозы[2]. Большасьць беларускае прозы XX ст. створаная акурат у гэтых жанрах. Да прыкладу, у гістарычную прозу ўклаліся У. Караткевіч і У. Арлоў, вясковую – І. Пташнікаў і І. Мележ, ваенную – В. Быкаў і А. Адамовіч.

Каб сучасная гарадзкая літаратура стваралася выключна па-беларуску, усе яе героі павінны быць нацыянальна сьвядомымі беларускімі інтэлектуаламі. Іначай атрымліваецца ненатуральны «аўтапераклад», як у «Дамавікамэроне».

САЦЫЯЛЬНАЯ НЯРОЎНАСЬЦЬ ДЗЬВЮХ МОВАЎ, АБО КАЛІ Ў БЕЛАРУСКІ ТЭКСТ УСТАЎЛЯЮЦЦА РАСЕЙСКІЯ СЛОВЫ?

Накіроўваючы на нашу зямлю ўсё новыя і новыя войскі, цар наказваў ваяводам на сваім шляху ўсё паліць і разбураць, а каб болей панішчыць – назад ісьці іншымі мясьцінамі. Захаваліся пісаныя ў Маскву граматы ваяводы Трубяцкога, дзе ён паведамляў цару: «Вокруг Слуцка велели мы все выжечь, а идучи дорогою до Слонима, села, и деревни, и хлеб, и сено по обе стороны жгли, и людей побивали, и разоряли совсем без

остатку, а в Клецке в городе людей побили всех». *Сваімі рабункамі ворагі давялі народ да страшнага голаду.*

Уладзімер Арлоў. «Адкуль наш род?»

У кнізе для дзяцей «Адкуль наш род» Уладзімер Арлоў ужыў расейскую мову ўсяго аднойчы. Словы захопніка ў перакладзе не на беларускую, а на сучасную расейскую мову надаюць ёй адмоўнае гучаньне. Падчас вайны ў сярэдзіне XVII ст. беларускія землі страцілі вялікую частку свайго насельніцтва. Але гэтая цытата прымушае яшчэ глыбей адчуць жахі той вайны, бо перагукаецца з апісаньнямі ў савецкім гістарычным дыскурсе бясчынстваў нацыстаў – а тут іх дзейсьніць маскоўскае войска.

Крама была зачынена, на дзьвярах бялеўся аркуш паперы. «Сынок, зірні, што там напісана», – сказаў Сьцяпан сыну. Сяргейка спрытна пабег, замільгалі ногі ў старых чаравічках – валёнкі ён зьняў з радасьцю.

– Ма-га-зин закрыт на переучёт, – *гучна чытаў ён.*

«Няўжо закрылася наша крама назусім?» – сумна падумаў Сцяпан, павярнуў на мост цераз ручай. Сын дагнаў яго, пайшоў побач.

Леанід Левановіч. «Вяртаньне ў радыяцыю»

Нават тыя, хто ўвесь час гаворыць па-беларуску, ня могуць не сутыкацца з вышэйшай для Беларусі мовай – расейскай (або з трасянкай). У гэтым сэнсе беларуская мова знаходзіцца ў варожым іншамоўным атачэньні. Падзеі ў рамане «Вяртаньне ў радыяцыю» разгортваюцца ў радыяцыйна забруджанай вёсцы. Героі гавораць па-беларуску, але цыдулка на дзьвярох крамы напісаная па-расейску. Расейскія словы, нечакана ўзьніклыя ў беларускім тэксьце, нагадваюць пра іншы сьвет, дзе пануе чужая мова. Па-расейску можна перадаваць, напрыклад, непадуладную чалавеку вонкавую сілу (скажам, аварыю на атамнай станцыі). Але героі раману сапраўды ў жыцьці

гавораць па-беларуску, то бок тут няма «аўтаперакладу». Небеларускія цытаты надаюць сьвету беларускамоўных пэрсанажаў безабароннасьці і крохкасьці.

ЧАСТАЕ ЗГАДВАНЬНЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Яна была куды старэйшая за салдата, мела жвавы і востры позірк з-пад цёмных, непамаляваных броваў; на яе вуснах таксама не было прыкметна сьлядоў памады, і яны здаваліся ня надта выразнымі на худаватым твары. Вольная манера гаворкі і небеларуская мова давалі зразумець, *што жанчына нетутэйшая, – хутчэй за ўсё з гораду. Але як яна апынулася тут? Што ёй трэба?*

(…) – А сякеры няма? – папыталася жанчына (…).

Васіль Быкаў. «Ваўчыная яма»

Беларускамоўныя пісьменьнікі ў сваіх творах часта згадваюць саму беларускую мову. Васіль Быкаў у аповесьці «Ваўчыная яма» піша пра людзей, што жывуць у чарнобыльскай зоне, адкуль выселілі ўсіх жыхароў. У прыведзенай цытаце гаворыцца, што жанчына гаворыць не па-беларуску. Хоць з кантэксту зразумела, што кажа яна па-расейску, для аўтара больш істотна, што мова ейная – не беларуская. Значыць, калі яе словы падаюцца па-беларуску, гэта «аўтаперакпад» з расейскай. Паколькі беларускамоўных у Беларусі адносна мала, беларускія аўтары вымушаныя адзначаць, на якой мове гавораць іх пэрсанажы.

Няўжо і надалей беларус будзе думаць, што Бог пачуе толькі, як па-польску ці па-расейску да Яго зьвяртаюцца? Таму і надпісы на помніках і крыжах у нас адпаведныя: ці па-заходняму, ці па-ўсходняму. А па-тутэйшаму толькі ў паэтаў. *Вось і яшчэ адзін доказ, што беларус – паэт.*

Адам Глёбус. «Сьмерць – мужчына»

У гэтым урыўку апавядальнік таксама згадвае беларускую мову. Ён кажа, што беларусы – паэты, бо толькі паэты гавораць па-беларуску. Гэтую фразу можна разумець па-рознаму. Па-першае, аўтар піша пра вузкую сферу ўжыванння беларускай мовы ў іранічным сьвятле, а па-другое, харaство мовы, якую рэдка пачуеш, параўнальнае з паэзіяй.

РОК-М'ЮЗЫКАЛ «НАРОДНЫ АЛЬБОМ» І ЛІТАРАТУРНЫЯ МАГЧЫМАСЬЦІ ШМАТМОЎЯ

«Народны альбом» – рок-м'юзыкал, дзеяньне якога адбываецца ў Заходняй Беларусі падчас расейска-польскай вайны 1919–1920 гг. і за палякамі (1921–1939 гг.). Ён ніколі не выконваўся як тэатральная пастаноўка, але канцэрты і музычны альбом з удзелам многіх знакамітых рок-музыкаў, прыкладам, Лявона Вольскага, мелі вялікі посьпех. У параўнаньні зь літаратурай, кіно і іншымі відамі сучаснага беларускага мастацтва, беларускі рок карыстаецца большай папулярнасьцю, асабліва сярод моладзі.

Варта адзначыць, што, апроч 21 песьні па-беларуску, у «Народны альбом» уваходзяць дзьве – па-расейску, адна – па-польску, адна песьня на ідышы і нават дзьве на трасянцы. Гэтая моўная мяшанка паказвае, наколькі заблытанае нацыянальнае самавызначэньне беларусаў: адзін зь іх шпіёніць на Польшчу, другі чакае, калі прыйдуць савецкія танкі, трэці ідзе ваяваць за незалежнасьць іншага народу… Ніводзін беларускі герой «Народнага альбому» ня мае дакладна акрэсьленай нацыянальнай сьвядомасьці, але ў іх так і бруіць жыцьцёвая энэргія. І таму скрозь увесь м'юзыкал адчуваецца нейкі «вясёлы нігілізм».

Мабыць, вузкая сфэра ўжыванння беларускай мовы абмяжоўвае беларускамоўных аўтараў у выбары матэрыялу. Аднак адсюль вынікае што, калі беларуская літаратура будзе наўпрост, бяз «аўтаперакладу», апісваць шматмоўную рэчаіснасьць, гэта надасьць ёй новыя своеасаблівыя магчымасьці.

НЕЦЭНЗУРНЫ БЕЛАРУСКІ НАВАТВОРНЫ СЛЭНГ І МАГЧЫМАСЬЦІ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЬЦІ

«Што за жыцьцё, тваю маць… *Ні рабіць, ні адпачыць па-людзку нельга. Ні выпіць, ні закусіць. Ні бабу прылашчыць… Праклятый Чарнобыль! Жылі б мы зь Верай, як людзі. Свая хата, вёска родная. Бесядзь з малых гадоў любая. І рыбу лавіў, і грыбы зьбіраў. А цяперыцька нельга (…)».*

Леанід Левановіч. «Вяртаньне ў радыяцыю»

Некаторыя сьцьвярджаюць, што ў беларускай мове адпачатку не было нецэнзурнага слэнгу, а ў сучаснай беларускай ён пераважна запазычаны з расейскай. Старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў прапануе выключыць зь беларускай мовы ўвесь мат расейскага паходжаньня[3]. Але ў літаратурных творах па-беларуску актыўна прысутнічае нецэнзурная лексыка. Напрыклад, у прыведзенай вышэй цытаце лаянка «тваю маць» вельмі блізкая да аналягічнага расейскага выразу. Тым, хто ведае расейскі мат, ня цяжка здагадацца, што за слова хаваецца за шматкроп'ем у наступным непрыстойным вершыку:

У цыганкі хвартух новы,
А ў цыгана х… дубовы.
Хвартух новы не парвецца,
Х… дубовы *не сагнецца.*

Рыгор Барадулін. «Як беларусы сэксам займаюцца»

«Народная творчасьць» па-беларуску ня надта разьвітая, бо чытачы заўсёды ставіліся да яе як да «нізкага жанру», які пры жаданьні можна пачытаць па-расейску. У колах часопісу «ARCHE» некаторыя спрабуюць ствараць парнаграфію па-беларуску.

Праз акно спальнага пакою мне было цудоўна відаць мноства вашых палавых актаў. Мне спадабаўся сваім тэмпэрамэнтам

партнэр, і чэлес *у яго нармальных памераў.*

Адам Глёбус. «Дамавік-3» (з «Дамавікамэрону»)

Прыхільнікі стварэньня парнаграфіі па-беларуску актыўна карыстаюцца ўласнабеларускім слэнгам, не ўжываным большасьцю. Верагодна, гэтыя словы пераважна знойдзеныя сярод этналінгвістычных матэрыялаў. Прыкладам, «Забыты слэнг», кавалак зь якога падаецца ніжэй, сабраны ў 70-я гг. XX ст. па беларускіх вёсках.

Самы знакаміты аўтар гэтай школы – Адам Глёбус, якога часта называюць «бацькам беларускай парнаграфіі». Ён дарэчна выкарыстоўвае непрыстойную лексыку. У цытаваным ніжэй урыўку актор з акторкай быццам граюць каханкаў, але насамрэч рэдкаўжываныя словы ў іх рэпліках маюць абсалютна супрацьлеглае значэньне. Сьвядома ўстаўляючы ў тэкст малазнаёмы слэнг, аўтар кпіць з таго, што людзі, якім у побыце не патрэбная беларуская мова, не разумеюць п’есы па-беларуску.

– *Ты мая* далігойла, – *магнітафонным голасам сказаў актор і шырока раскінуў рукі.*

– *Ты мой* абізгал, – *акторка стала на дыбачкі і выструнілася.*

Адам Глёбус. «Масавік» (з «Дамавікамэрону»)

Часопіс «ARCHE» друкаваў эратычную літаратуру, да прыкладу, «Нябожчык» Жоржа Батая і «Камасутру» ў перакладзе на беларускую з ужываньнем гэтага «адроджанага» слэнгу. Падобныя нецэнзурныя «нэалягізмы» ствараюць нейкае ўражаньне штучнасьці тэксту, але даюць беларускай літаратуры магчымасьць засвойваць новыя абсягі.

Слова	**Тлумачэньне**
Абібок	Гультай, лайдак, лезабок
Абізгал	Боўдзіла, тупы чалавек
Анібыль	Чорт, шайтан
Апівош	П’яніца
Ашалотак	Ненармальны чалавек
Байсяліць	Казаць абы-што
Бздура	Дзівацтва, глупства

Любоў Шаталава, Уладзімер Каткоўскі.
«Забыты слэнг. Топ-100».

ПАСЬЛЯСЛОЎЕ

Цяжка было б сказаць, што беларускую мову і беларускую літаратуру чакае сьветлая будучыня. Улады праводзілі палітыку падтрымкі беларускай мовы толькі на пачатку 90-х гг. XX ст. Паволі зьніжаецца колькасьць патэнцыйных чытачоў беларускай літаратуры. Аднак нават калі беларускай мовай у побыце карыстаецца 5 % насельніцтва зь дзесяці мільёнаў, гэта досыць вялікая грамадзка-культурная супольнасьць.

На літаратурныя творы ўзьдзейнічае і накладае свае абмежаваньні мова, на якой яны напісаныя. Мова, у сваю чаргу, разьвіваецца і ўзбагачаецца літаратурай, на гэтай мове створанай. Магчыма, цікавае пісьмо прыцягне да беларускай літаратуры новых чытачоў. Будзем назіраць, як новыя літаратурныя тэндэнцыі, што заўважаюцца ў беларускім року і парнаграфіі Адама Глёбуса, паўплываюць на моўную сытуацыю сярод маладзейшага пакаленьня беларусаў.

Пераклаў у скароце з ангельскай мовы Н. Я. паводле: Emerging Meso-Areas in the Former Socialist Countries // Histories Revived or Improvised? No. 7. The Slavic Research Center, Hokkaido University, Japan, 2005.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/14
[image]

БАРЫС ДУБІН
сацыёляг, перакладчык. Супрацоўнік Лявада-Цэнтру. Апошнія кнігі – «Семантика, риторика и социальные функции «прошлого»: к социологии советского и постсоветского исторического романа» (2003), «Интеллектуальные группы и символические формы. Очерки социологии современной культуры» (2004).

Барыс Дубін
Крывавая вайна і «вялікая» перамога
Пра канструяваньне і перадачу калектыўных уяўленьняў у Расеі 1970–2000 гадоў

1

Тэма памяці пра падзеі, значныя для грамадзтва, «ключавыя», «паваротныя» для краіны, яе насельніцтва, тым больш – для калектыўнай гісторыі, усёй уяўленай гісторыі мінулага, натуральна, выходзіць далёка па-за межы псыхалягічных асаблівасьцяў і здольнасьцяў, ці то псыхалёгіі асобных людзей, ці то малых групаў (сям’я, супольнасьць людзей, кампанія, равесьнікаў). «Памяць» тут адэкватней разумець як мэтафару альбо гняздо мэтафараў, якія сымбалічна транскрыбуюць – азначаюць і пераазначаюць – больш ці менш устойлівую альбо, наадварот, няўстойлівую канструкцыю соцыюму і яго ных

базуюцца на ўспрыняцці і ацэнцы людзьмі падзей і фактаў
мінулага. Такія ўяўленні ствараюць
сацыяльны вопыт, які
перадаецца ад аднаго пакалення да іншага. Гэты вопыт
дазваляе
людзям арыентавацца ў
сацыяльным
свеце, ацэньваць
сучасныя
падзеі і
грамадскія
з'явы, а
таксама
прымаць
рашэнні.
Такія
ўяўленні
ствараюць
сацыяльны
вопыт, які
перадаецца
ад аднаго
пакалення
да іншага.
Гэты вопыт
дазваляе
людзям
арыентавацца
ў
сацыяльным
свеце,

Які асабіста для Вас сэнс гэтай вайны? (2002, N = 1600 чалавек.)[1]

Ужо паводле гэтых зьвестак можна бачыць, як адасабляюцца адзін ад аднаго два пляны ўяўленьняў пра вайну: адзін, бліжэйшы і значнейшы, зьвязаны са значэньнямі «свайго», «нас», іншы, больш аддалены і менш істотны – са значэньнямі «абагульненага іншага». Значэньні далейшага пляну ня першаступенныя, але важныя: у канчатковым выніку, вызваленьне Эўропы ад фашызму – ці не адзіны безумоўна пазытыўны ўнёсак Савецкага Саюзу ў сусьветную гісторыю, тым больш важны, што значнасьць рэвалюцыі, сацыялізму, СССР як такога ў гэтым сэнсе за 1990-я гады відавочна зьмяншаецца – як сярод насельніцтва, так і ў сьвеце наагул.

Пры гэтым у цяперашніх масавых уяўленьнях расейцаў пра вайну пераважаюць найбольш эмацыйныя характарыстыкі. Калектыўная сьвядомасьць рэагуе толькі на наймацнейшыя стымулы і, як заўсёды ў такіх выпадках, самым распаўсюджаным, можна сказаць – тыповым чынам (доля тых, хто абраў менш эмацыйныя ацэнкі, а асабліва тых, хто ўстрымаўся ад адказу на гэтую пэўнага кшталту каштоўнасную правакацыю, як можна бачыць, вельмі невялікая).

Вялікая	38
Крывавая	35
Трагічная	31
Жахлівая	28
Гераічная	25
Доўгая	12
Подлая	10
Забытая	4
Цяжка сказаць	1

Табліца 2. Якія словы Вам найперш прыходзяць да галавы, каб назваць вайну, пачатую нападам Нямеччыны на СССР 22 чэрвеня 1941 году?
(2003, N = 1600 чалавек, адказы градуяваныя, можна было адзначыць некалькі пазыцыяў.)

Дадам, што калі ў 1989 годзе прыналежнасьцю да вайсковага

пакаленьня ганарыліся яшчэ 7 % апытаных у Расеі, то ў 2003-м гэтая лічба склала ўжо толькі 1,8 %. На фоне падзеньня сымбалічнай значнасьці Кастрычніцкай рэвалюцыі, выцясьненьня з калектыўнай сьвядомасьці балючых успамінаў пра калектывізацыю і рэпрэсіі сталінскага часу агульная значнасьць перамогі ў вайне як вызначальнай падзеі XX стагодзьдзя на працягу апошніх 15 гадоў у Расеі расла.

Але справа тут ня толькі ў зьмяненьні лічбавых значэньняў таго ці іншага паказьніка дадзенай табліцы. За пятнаццаць гадоў трансфармавалася, наколькі можна меркаваць па прыведзеных лічбах, канструкцыя культурнага часу расейцаў, іначай кажучы – канструкцыя іх калектыўнай ідэнтычнасьці, «запісаная» мерамі і знакамі агульнага часу. Абазначыліся, і пры гэтым набылі прыблізна роўную важкасьць, ягоны «пачатак» (Кастрычніцкая рэвалюцыя) і «канец» (распад СССР і пасьля гэта катастрофа чачэнскай вайны, свайго кшталту «пакараньне» за адбытае). Яны склалі ўяўленыя межы калектыўнай ідэнтычнасьці («савецкага народу», «савецкага чалавека»), кропкай фокусу, сэнсавым цэнтрам усёй канструкцыі значэннага сьвету стала перамога ў Айчыннай вайне, а яе «рэхам», «двайніком» – перамога над космасам, палёт Гагарына. Пры гэтым адмоўныя значэньні падзеяў, што папярэднічалі вайне (калектывізацыя, голад, рэпрэсіі) прыкметна зьнізіліся, тады як сымбалі ўсяго нэгатыўнага, разбуральнага ці таго, што пагражае разбурэньнем, перанесьліся ў бліжэйшы храналягічны пэрыяд і сканцэнтраваліся ў яшчэ зусім ня даўняй, але ўжо сталай мінулым, «эпосе перабудовы», 1990-х гадах. Тым самым далёкія часовыя пляны ўяўленага цэлага гісторыі як бы высьветліліся, бліжэйшыя ж, наадварот, сталі яшчэ чарнейшымі. А паміж імі легла нейкая новая краіна Ўтопія – «пазалочаны век» брэжнеўскага пятнаццацігодзьдзя.

	1939	1969	1989	2009
	N = 1500	N = 3000	N = 2000	N = 1500
Першая сусьветная вайна	8	19	18	14
Кастрычнік	62	49	49	40

* У 1989 г. – увод савецкіх войскаў у Аўганістан.

2 Брежнев Л. И. Великая победа советского народа. – М.: Политиздат, 1965.

1917-га				
Калектывізацыя	10	8	6	6
Рэпрэсіі 1930-х гадоў	30	18	11	17
Перамога ў Вялікай айчыннай вайне	73	73	85	78
XX зьезд партыі	9	5	4	4
Палёт Гагарына ў космас	33	32	54	51
Вайна ў Аўганістане*	10	24	21	23
Пачатак перабудовы	24	16	16	20
Чарнобыльская катастрофа	36	34	32	35
Распад СССР	–	40	47	42
Вайна ў Чачні	–	–	24	31
Цяжка сказаць	4	10	3	3

Табліца 3. Якія зь пералічаных падзеяў Вы б назвалі найзначнейшымі для Расеі?
(Падаюцца толькі найбольш статыстычна значныя пазыцыі.)

Пры гэтым у міталягізаванай карціне таго часу самым рашучым чынам зьмякчаюцца, калі не наагул выключаюцца, тыя цяжка пераносныя сярэднім чалавекам, пагрозьлівыя для яго сваякоў значэньні прымусовасьці і безальтэрнатыўнасьці, татальных рэпрэсіяў, асабістай небясьпекі, якія былі шмат у чым зьвязаныя для масавай сьвядомасьці з вобразам сталінскай эпохі і горача, хаця і нядоўга, дэбатаваліся ў прэсе часоў перабудовы. Палітычна-ідэалягічная руціна і маральная двухсэнсоўнасьць брэжнеўскіх дзесяцігодзьдзяў, разам з сэмантыкай адноснай побытавай уладкаванасьці тых часоў, увайшлі цяпер у настальгічнае сэнсавае цэлае «эпохі стабільнасьці», «мірнага часу» (усеагульны дэфіцыт, перасьлед

іншадумцаў, спробы афіцыйнай рэабілітацыі Сталіна да ягонага стагодзьдзя ў 1979 годзе, пачатая тады ж аўганская вайна, рост маразму самога Брэжнева і ягонага кіраўніцтва, натуральна, выцесьненыя масавай сьвядомасьцю з ідэалягізаванай карціны той эпохі).

Калі мець на ўвазе падобную сэмантычную канструкцыю, то праблематыка «памяці пра вайну» пераводзіцца для дасьледніка ў іншую плоскасьць. З пляну рэальных арыенціраў, стымулаў паводзінаў удзельнікаў вайны і іх непасрэдных партнэраў па ўзаемадзеяньні яна павінна быць перанесеная ў плян уяўленай калектыўнай ідэнтыфікацыі, сымбаляў агульнадзяржаўнага і агульнанацыянальнага цэлага. Тады перад аналітыкам паўстаюць пытаньні: кім, калі, дзеля якіх задачаў, зь якога сымбалічнага матэрыялу і якім чынам быў сканструяваны вобраз вайны, празь якія каналы і мэханізмы ён далей трансьляваўся і адтвараўся? Акурат гэты, можна сказаць, інструмэнтальна-тэхнічны бок праблемы – мэханізмы фармаваньня сымбалічна-сэмантычных структураў, іх падтрыманьня, трансьляцыі, адаптацыі – і будзе мяне цяпер пераважна цікавіць.

2

Калі галоўнай падзеяй расейскай гісторыі XX стагодзьдзя, паводле масавых сацыялягічных апытаньняў канца 1980-х – пачатку 2000-х гадоў, падсумаваных вышэй, для расейцаў выступае перамога ў Вялікай айчыннай вайне, то найлепшым часам, у якім рэспандэнты жадалі б жыць, яны, прыблізна з 1993–1994 гадоў, пасьля пачатку гайдараўскіх рэформаў, прыватызацыі і г. д., абвяшчаюць брэжнеўскую эпоху – умоўна кажучы, пятнаццацігодзьдзе паміж канцом 1960-х і пачаткам 1980-х гадоў.

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі	4
пры Сталіну	4
пры Хрушчову	3
пры Брэжневу	49
пры Гарбачову	4
пры Ельцыну	2

пры Пуціну	22
Цяжка сказаць	12

Табліца 4. Калі такім людзям, як Вы, жылося ў нашай краіне лепш за ўсё? (2002, N = 4500 чалавек.)

У Расеі да 1917 г.	4
У гады сталінскіх пяцігодак	3
У час хрушчоўскай «адлігі»	3
У спакойныя брэжнеўскія гады	39
У час перабудовы і пачатку эканамічных рэформаў	3
Цяпер, пры прэзыдэнту Пуціну	23
Жыў бы ў іншай краіне	17
Цяжка сказаць	8

Табліца 5. Калі б можна было пачаць жыццё наноў, у які час вы б хацелі жыць? (2002, N = 1600 чалавек.)

На мой погляд, высокія цяперашнія ацэнкі ўжо дастаткова аддаленай у часе брэжнеўскай эпохі, да таго ж многім апытаным дзеля іх узросту папросту невядомай з уласнага досьведу, зьвязаныя ня толькі з уяўленьнямі пра тую сацыяльную стабільнасьць і параўнальны эканамічны дабрабыт – уяўленьнямі, якія выступаюць праекцыяй ураўняльных сацыяльных ідэалаў патэрналісцка арыентаванай большасьці. Адпаведна і сэнс той эпохі для сёньняшніх расейцаў не абмяжоўваецца толькі ўяўным кантрастам з больш блізкімі, вядомымі з уласнага досьведу часамі Гарбачова і Ельцына, што ўвасабляюць сёньня ў калектыўнай сьвядомасьці сацыяльны хаос, няўпэўненасьць у матэрыяльным становішчы і г. д. Пачуцьцё прыніжанасьці і перанос на мінулае, які разгружае сьвядомасьць большасьці расейцаў, вядома, існуе. Але ў гэтых ацэнках ёсьць, на маю думку, другі, сымбалічны плян.

Яны адсылаюць да ўяўнай эпохі адзінай і ўстойлівай калектыўнай ідэнтыфікацыі, стабільнага вобразу макрасацыяльнага цэлага, супольнага «мы». Прычым вышыня значнасьці і адзінае разуменьне гэтага «мы» забясьпечаны і падмацаваны тым – гранічным па сэнсавай нагрузцы – уяўленьнем аб «вялікай вайне», якое было сфармаванае ў брэжнеўскі пэрыяд.

Перш чым выказаць далейшыя меркаваньні, я б сказаў, што высокая пазытыўная ацэнка брэжнеўскіх гадоў належыць ня толькі *той* эпосе як такой і ня проста перанесеная, перададзеная, трансьляваныя ад старэйшых пакаленьняў да больш маладых. Гэты працэс, канечне, назіраецца, прычым часьцей за ўсё набывае своеасаблівую форму сьцьвярджэньня «ад адваротнага». Бацькі ня толькі хоцькі ці няхоцькі перадаюць дзецям уласныя ідылічныя ўспаміны аб міталягізаваным мінулым – дзеці самі маюць магчымасьць як бы параўнаць гэтыя бацькоўскія праекцыі зь цяперашнім фрустраваным станам старэйшых, іх невысокімі даходамі альбо пэнсіямі, нізкім сацыяльным статусам, адсутнасьцю рэальных дасягненьняў і ўзнагародаў за пражытае жыцьцё. Але падобнае становішча бацькоў (а значыць, ускосна і дзяцей) зьвязваецца ў сьвядомасьці тых і другіх ня з тым мінулым, 1960-мі і 1970-мі гадамі, а зь цяперашнім «сапраўдным», досьведам 1990-х.

Так што справа тут ня толькі ў пераносе «памяці» ад старэйшых пакаленьняў да маладзейшых. У ня меншай ступені брэжнеўскі час надзелены гэтай значнасьцю і ўзорнасьцю *рэтраспэкцыйна*, зь цяперашняга дня. Пунктам жа злучэньня тагачаснага і цяперашняга, кропкай апірышча для пераходу ў думках ад адной эпохі да іншай ёсьць сканструяваны на працягу, умоўна кажучы, 1970-х гадоў і жывы дагэтуль міт аб перамозе ў вайне. Як ні парадаксальна, яго можна назваць ня проста галоўнай падзеяй савецкай эпохі, але і цэнтральнай «падзеяй» брэжнеўскіх гадоў, калі ён быў створаны. Сэнс і апраўданьне (можна сказаць – самаабгрунтаваньне) брэжнеўскага пятнаццацігодзьдзя, як і ўсёй савецкай гісторыі ў цэлым – перамога ў вайне. Але пры гэтым самое значэньне вайны сканструяванае, зыходзячы з расстаноўкі сілаў, праблемаў і прыярытэтаў брэжнеўскіх гадоў, тагачасных сэнсавых рэсурсаў.

Іначай кажучы, я хачу сказаць, што прываблівасьць брэжнеўскай эпохі і «памяць» пра вайну як пра час цяжкіх выпрабаваньняў зь іх кульмінацыйным пунктам – перамогай над калектыўным ворагам, зьвязаныя паміж сабой. Гэтая канфігурацыя, па-першае, склалася ў брэжнеўскую эпоху, прыблізна паміж 1965 і 1980 гадамі, па-другое, яна стала асноўным элемэнтам у калектыўным самавызначэньні савецкіх

і постсавецкіх людзей, расейцаў праз ідэалягічную (у сэнсе К. Мангайма) адсылку да мінулага, да «гісторыі», і, па-трэцяе, такая сымбалічна-сэмантычная канфігурацыя злучыла ў сабе сэнсавыя лініі ўсёй канструкцыі абагульненага расейскага «мы». У гэтым пляне сёньняшнія дасьледнікі ўсё меней маюць справу з памяцьцю ўдзельнікаў як такой, выцесьненай больш складаным сэнсавым утварэньнем.

Гэтая канструкцыя аўтарытэтнай мінуўшчыны, больш значэннай, чым сучаснасьць, глыбока эшалянаваная. Яна разнародная складам, а яе часткі разнаплянавыя функцыямі. Сярод іншых яна мае элемэнты вышэйшай функцыянальнай нагрузкі: яны служаць як бы шыфрам сэнсавага «замка», паролем «на ўваходзе» – фільтрам, бар'ерам, спускавой прыладай, якая «ўключае» ў дзеяньне іншыя складовыя часткі канструкцыі, забясьпечваючы іх «доступ», актывізуючы ў калектыўнай сьвядомасьці увесь «ланцужок» уяўленьняў. Што да вайны і ўсёй уяўленай канструкцыі бліжэйшай мінуўшчыны, XX стагодзьдзя, ролю такога фільтру адыгрывае «брэжнеўская эпоха», ідэалізаванае ўяўленьне пра яе. Яна ж, сярод іншага, улучае ў якасьці праекцыі настальгічны вобраз «вялікага правадыра». У сваю чаргу, высокая і ўсё нарастальная ў Расеі апошніх гадоў значэннасьць дваістай, шмат у чым няпэўнай фігуры Сталіна падтрымана ягонай прызнанай прыблізна трацінай расейцаў аўтарытэтнасьцю ў якасьці ваеннага лідэра, безь якога СССР не перамог бы ў вайне. Складовыя часткі агульнай канструкцыі калектыўнага «мы» падтрымліваюць і індуктуюць значэннасьць адно аднаго.

3

Другую палову 1960-х і 1970-я гады ў гэтым канкрэтным выпадку прапануецца апісваць і разумець як час усталяваньня і адноснай – часткова сымуляцыйнай – стабілізацыі посттаталітарнага альбо аўтарытарнага палітычнага ладу. Сацыяльнай умовай (у іншай лёгіцы – цаной) падобнай стабілізацыі зьявілася тады зьмякчэньне рэпрэсіўных момантаў рэжыму і няпісаны пакт аб падзеле паўнамоцтваў улады і насельніцтва – іх неўмяшальніцтва ў справы адно аднаго на тле пэўнага росту агульнага дабрабыту, з аднаго боку, і

фармаваньня мноства адаптыўных мэханізмаў індывідуальнага і калектыўнага выжываньня («другая» эканоміка, «другая» сыстэма разьмеркаваньня, «другая» культура і г. д.), зь іншага.

	1998 N = 1600	1999 N = 1600	2003 N = 1600	2004 N = 1600
Сталін – мудры кіраўнік, які прывёў СССР да магутнасьці і росквіту	16	20	20	21
Сталін – жорсткі бесчалавечны тыран, вінаваты ў зьнішчэньні мільёнаў невінаватых людзей	27	32	27	31
Якія б памылкі і заганы ні прыпісваліся Сталіну, найважнейшае – што пад ягоным кіраўніцтвам народ выйшаў пераможцам у Айчыннай вайне	31	32	36	29
Палітыка Сталіна прывяла да таго, што	14	18	18	15

краіна аказалася непадрыхтаваная да вайны 1941 году				
Сталін працягнуў справу, пачатую Леніным і іншымі рэвалюцыянэрамі-бальшавікамі	6	6	5	8
Сталін перакруціў ідэі Леніна, стварыў лад, далёкі ад ідэалаў сацыялізму	10	8	8	9
Толькі жорсткі кіраўнік мог падтрымаць парадак у дзяржаве ў тых умовах вострай клясавай барацьбы і вонкавай пагрозы	15	20	20	16
Наш народ ніколі ня здолее абысьціся без кіраўніка такога кшталту, як	12	18	16	16

Сталін, раней ці пазьней ён прыйдзе і навядзе парадак				
Сталіна зласьліва ганяць людзі, якім чужыя інтарэсы расейскага народу і расейскай дзяржавы	4	5	6	5
Мы яшчэ ня ведаем усёй праўды пра Сталіна і ягоныя ўчынкі	27	30	27	33
Цяжка сказаць	10	8	6	5

Табліца 6. Зь якімі з наступных думак пра Сталіна Вы б хутчэй пагадзіліся?

Нагадаю, што да 1970-х гадоў у сацыяльнае жыцьцё СССР увайшло пакаленьне, якое нарадзілася пасьля 1945 году і якое (першае з савецкіх пакаленьняў) ня ведала ў сваім жыцьці вайны – ні з вонкавым ворагам, ні грамадзянскай, ні з ворагам «унутраным». Ад масавага зьнішчэньня, перасяленьня, дыскрымінацыі цэлых групаў і слаёў насельніцтва рэпрэсіўны апарат савецкай сыстэмы перайшоў цяпер да тактыкі больш адрасных, дакладных акцыяў. Акурат таму і якраз у тыя негераічныя гады мінулую «айчынную» («айчынную», але не «сусьветную» – «нашу», а не супольную для ўсяго сьвету!) вайну пачалі афіцыйна і ўсенародна гераізаваць. Гэты новы, адрэтушаваны і нацыяналізаваны яе вобраз задавальняў як вярхі, так і нізы соцыюму. Ад усясьветнага місіянэрства і

страшнай ваяўнічасьці часоў клясычнага сталінізму і халоднай вайны ўлада перайшла няхай да дэмагагічнай і палавіністай, але ўсё ж палітыкі распружаньня ў вонкавапалітычных стасунках. Ні абагаўленьнем альбо дэманізацыяй правадыроў, ні міталёгіяй «вялікіх зьдзяйсьненьняў» грамадзтва ўжо не жыло, затое і простай агрэсіі, жорсткага прымусу шараговага чалавека з боку дзяржавы стала, здавалася, меней.

Людзей, можна сказаць, пакінулі ў спакоі, альбо, як тады казалі, «далі дыхаць». Улада і насельніцтва нібыта прыстасаваліся адно да аднаго: разышліся па сваіх «кутох» і паладзілі на аснове ўзаемнай незацікаўленасьці. Максымалізм салжаніцынскага патрабаваньня «Ня жыць ілжой» (1973) ня стаў і ня мог стаць максымай масаў, якія гадамі звыклі *выжываць*.

Непажаданых дзяржава цяпер не забівала мільёнамі, а адзінкамі высылала сілком за мяжу альбо сотнямі паступова выцясьняла ў эміграцыю (з другой паловы 1970-х яна мералася ўжо на тысячы). Нават са сьвядомасьці тых, хто выжыў, ня кажучы ўжо пра больш маладыя пакаленьні, стаў сыходзіць заўсёдны страх за сябе і сваякоў. Ува ўмовах фактычнай і ідэалягічнай закрытасьці ад Захаду і адсечанасьці ад больш далёкай мінуўшчыны (ад супольнай ці хаця б сямейнай памяці 1920-х гадоў, дарэвалюцыйных эпох) зразумела, з чым мог параўнаць сваё жыцьцё звычайны чалавек, на якім людаедзкім фоне савецкага XX стагодзьдзя вымалёўваліся для яго гэтыя – канечне ж, вельмі адносныя, па сутнасьці і зусім жабрацкія – вартасьці паўтара-двух брэжнеўскіх дзесяцігодзьдзяў, і як яны па кантрасьце былі ацэненыя большасьцю, чыя сьпеласьць (трыццаці-саракагодзьдзе) прыпала на апісаныя гады. А падобнае параўнаньне кожны сярэдні чалавек, сям'я, мікрагрупа вялі, варта адзначыць, штодзённа. Яны ацэньвалі сваё становішча, абагулена кажучы, паводле дзьвюх восяў: супастаўляючы яго з сваёй бліжэйшай мінуўшчынай – пасьляваенным пэрыядам, канцом сталінскай эпохі, з аднаго боку, і жыцьцём сваіх бацькоў (у абсалютнай большасьці, жыхароў гвалтоўна раскулачанай, абабранай і бяспраўнай сталінскай жа вёскі), зь іншага. Мерай, крытэрам пры гэтым выступала становішча большасьці сучаснікаў – іншых, але

«такіх самых, як мы», новая норма, сацыяльны стабілізатар, які стрымліваў і нівэляваў узровень узьніклай агульнай звычкі, пэўнага аморфна-калектыўнага жыцьцёвага ўкладу. Брэжнеўскае пятнаццацігодзьдзе – час крышталізацыі савецкага ладу жыцьця і тыпу сьвядомасьці, пераважнай мадэлі адаптыўных паводзінаў. Афіцыйная ідэалёгія на свой суконны лад прадстаўляла гэтыя працэсы ў выглядзе формулаў «савецкі народ» і «савецкі чалавек», дапоўненых ідэалягічнымі фікцыямі «дружбы народаў», «самай начытанай краіны ў сьвеце» ды інш., але сам працэс крышталізацыі, фармаваньня дамінантнага стэрэатыпу, несумненна існаваў (дапаўняючыся, як ужо казалася, дэмпфіроўнымі і страхоўнымі сацыяльнымі формамі «другога» пляну).

Трэба ўлічыць і тое, што да канца 1960-х гадоў СССР стаў, у масе і сярэднім, адукаванай краінай – дакладней, пісьменнай на ўзроўні школы-дзесяцігодкі. У сярэднім жа і ў масе – краінай гарадзкой (дакладней, ужо не вясковай). Ізноў жа, краінай у сярэднім і адносна пасьпяховай, то бок якая мае ў кожнай тыповай сям'і пэўны, няхай вельмі сьціплы, дастатак (бяз колькі-небудзь значнага аб'ёму ўласнасьці і без надзейных стратэгічных рэсурсаў – эканамічных, фінансавых, культурных) і некаторы, няхай і вельмі абмежаваны, вольны час. Валоданьне хаця і невялікай, але асобнай кватэрай, ідэя «ладу і стылю жыцьця» для мноства сем'яў становяцца рэальнасьцю акурат у гэты пэрыяд. Насельніцтва ў сваёй большасьці калі і не пачало набіраць тлушч, але ўсё-ткі перастала зацягваць паясы: танны хлеб, знакамітыя кілбаса і гарэлка, прынамсі, у цэнтры, канечне, не вычэрпваюць агульную пасьпяховасьць той эпохі, але ўваходзяць у яе неадменна, а пра чэргі ў правінцыі і кілбасныя цягнікі ў Маскву тады калі і казалі, то далёка ня ўсе і толькі паміж сваімі, дый тое напаўголасу.

Больш за тое, Савецкі Саюз тых гадоў стаў краінай, якая адной нагой уступіла ў масавае грамадзтва – грамадзтва масавых камунікацыяў, друкаваных і аўдыёвізуальных (тэлевізар), грамадзтва побыту, цывілізаванасьці, моды, тэхнікі і нават «тэхнічнай эстэтыкі». Элемэнты імпарту ў тым гарадзкім і сталічным жыцьці, рэальныя і сымбалічныя адначасова (вопратка, абутак, мэбля, таршэры, бра, люстры замест

ранейшых аднолькавых голых лямпачак і аранжавых абажураў, касмэтыка і дзіцячыя тавары з Чэхіі, Вугоршчыны, ГДР, экзатычная кераміка і больш якасная радыётэхніка з Прыбалтыкі), – рэч невыпадковая. Яны, як і тыя крамы «Бярозка» ў найбуйнейшых гарадох, былі, канечне, толькі ўкрапінамі ўва ўнітарна-бедны савецкі побыт, але яны ўжо існавалі, былі ў рэальнасьці і ў сьвядомасьці людзей.

Пры гэтым у сукупнасьць множных, але аднатыпных «допускаў» узьніклага «вэгетарыянскага» (калі выкарыстоўваць выраз Анны Ахматавай) сацыяльна-палітычнага ладу ўваходзіла, апроч мноства іншага, магчымасьць для адукаваных слаёў, інтэлектуальных колаў і гурткоў альбо ўключыцца ў фармаваньне, падтрыманьне, абслугоўваньне параўнальна спрыяльнага, але ўжо не ваяўніча місіянэрскага вобразу новага рэжыму, альбо ў атамарным выглядзе існаваць на мяжы і па-за межамі агульнага соцыюму, у ягоных часовых запасьніках і адстойніках, не выходзячы, зрэшты, за межы прадпісанага і дазволенага. Адным з галоўных прадпрыемстваў па ідэалягічным канструяваньні абноўленай легенды ўлады (фактычная адмова ад утапічнай будучыні, рыторыка новай гістарычнай супольнасьці, акцэнт на наяўную дадзенасьць з паступовым перанясеньнем цэнтру цяжару на мінуўшчыну і г. д.) выступіла ў гэтыя гады фармаваньне ў калектыўнай сьвядомасьці новага вобразу Айчыннай вайны.

4

Пасьля прамовы Брэжнева да дваццацігадовага юбілею перамогі[2] новы, гераізаваны вобраз ці нават цэлая міталёгія Айчыннай вайны фармуюцца намаганьнямі прапагандысцкага апарату ўлады, работай мас-мэдыяў, літаратуры, візуальных мастацтваў, школаў, бібліятэк, усіх рэпрадуктыўных сыстэмаў савецкага грамадзтва. Унутраным адрасатам і разам з тым апірышчам новага міту выступае таксама фармаваная акурат у гэты пэрыяд ідэалягічная адукацыя: пакаленьне «вэтэранаў вайны» як захавальнікаў «непарушных устояў», «маральных узораў», «найлепшых якасьцяў савецкага чалавека» і іншае. Жывыя ўдзельнікі вайны (людзі пераважна 1910-х і самага пачатку 1920-х гадоў нараджэньня) у дадзены пэрыяд

набліжаюцца да верхняй мяжы сацыяльна-актыўнага ўзросту і, як можна меркаваць, маюць пільную патрэбу ў выніковым прызнаньні, сьцьвярджэньні, падтрыманьні калектыўнай значнасьці іх існаваньня. Інстытуцыянальная сыстэма сацыяльных узнагародаў і дабротаў і прывілеяў вэтэранаў, якая складваецца ў 1970-х гадах, з аднаго боку, і фармаваньне міталёгіі выпрабаваньня, подзьвігу і перамогі, зь іншага, у сукупнасьці працуюць на гэтую сацыяльную задачу, а яе выкананьне, у сваю чаргу, як бы слугуе сацыяльнаму абгрунтаваньню брэжнеўскага рэжыму, умацоўвае яго (як лічыць улада).

Новы вобраз вайны фармуецца пры дапамозе ўсё больш папулярных у той пэрыяд гістарычна-патрыятычных раманаў-эпапэяў – як паказваюць сацыялягічныя апытаньні 1970-х гадоў, «кнігі пра вайну» ўстойліва займаюць першыя месцы ў масавым чытаньні і бібліятэчным попыце. Такім жа шырокім інтарэсам, асабліва сярод чытачоў-мужчынаў, карыстаюцца мэмуары савецкіх военачальнікаў (Георгія Жукава, Аляксандра Васілеўскага, Сяргея Штэменкі і інш.), якія акурат тады пачалі выдавацца і перавыдавацца масавымі накладамі. Новая панарамная оптыка вайны была візуальна прадстаўленая кіна- і тэлесэрыяламі пра вайну: гераічна-трыюмфальнымі эпапэямі («Вызваленьне» Юр'я Бондарава – Юр'я Озерава, 1970–1972), з аднаго боку, і востраскжэтнымі фільмамі пра савецкіх контравыведнікаў («Шчыт і меч» Вадзіма Кажэўнікава – Уладзімера Басава, 1968; «Сямнаццаць імгненьняў вясны» Юліяна Сямёнава – Тацяны Ліёзнавай, 1973), зь іншага; да іх трэба дадаць шматразовы паўтор на кінаэкранах і па тэлебачаньні экранізацыі тых жа раманаў-эпапэяў Анатоля Іванова («Вечны кліч»), Пятра Праскурына і іншых.

Калі казаць вельмі абагульнена, у вобразе вайны пры гэтым злучаліся два сэнсавыя моманты. Па-першае, дзейнай асобай падзеяў – у традыцыях расейскай гістарычна-эпічнай прозы, рамку якой задаў у свой час «Вайной і мірам» Леў Талстой, – выступаў «народ». Гэтая ідэалягічная канструкцыя XIX стагодзьдзя стала рэанімавацца ў савецкай Расеі ваенных гадоў і адразу пасьля іх, калі ўлада, найперш у вусных і друкаваных выступах Сталіна, стала падводзіць вынікі і задаваць крытэры

ацэнкі таго, што адбылося. Ува ўмовах 1970-х гадоў падобная фікцыя была ізноў актуалізаваная афіцыйнай прапагандай і стала адным з ідэалягічных інструмэнтаў маскаваньня і стрымліваньня пачаткаў сацыяльнай і культурнай дыфэрэнцыяцыі, росту адрозьненьняў ладаў жыцьця ў савецкім грамадзтве 1960-х гадоў, асобных прыкметаў індувідуалістычнай, спажывецкай арыентацыі ў субкультуры гарадзкой моладзі тых гадоў і іншае.

Другая сэнсавая вось, на якой будаваўся вобраз Айчыннай вайны – дэфіцыт дзеяньня, самастойнага ўчынку, а значыць, і аўтаномнасьці індывіда ў савецкім грамадзтве брэжнеўскага пэрыяду зь яго парадна-дэманстрацыйным калектывізмам, з аднаго боку, і падвойнымі стандартамі жыцьця і маралі, выпрацаванымі ўва ўмовах і дзеля мэтаў выжываньня малых групаў, нефармальных калектываў (сям'я, кампанія сяброў і іншае), з другога. У афіцыйнай культуры гэты дэфіцыт фігураваў пад назвай «актыўная жыцьцёвая пазыцыя». Парадаксальная форма, якую прымала гэтая вострая тэма ў літаратурнай, выяўленчай, тэле- і кінапрадукцыі, што працавалі тады на фармаваньне новай карціны выпрабаваньняў, гераізму і перамогі народу, палягала ў наступным. Аўтарамі альбо гіпэртрафаваўся момант добраахвотнага самаахвяраваньня пэрсанажаў, іх адмова ад саміх сябе ў імя калектыўнага цэлага («радзімы»), альбо дзеяньні герояў вызначаліся кампэтэнцыямі дзяржаўнай службы, на якой яны працавалі. Такі літаратурны і асабліва экранны вобраз палкаводца Георгія Жукава, па функцыі – бязьлітаснага дыктатара, што дубляваў у гэтым сэнсе малюнак міталягізаванага вобразу Сталіна; «індывідуальныя» рысы палкаводцу надаваліся акторам Міхаілам Ульянавым альбо ў рамках гэтага суперніцтва з правадыром (спробы службовага непаслушэнства і г. д.), альбо праз учынкі і жэсты бескантрольнага самадура. Парадычным, у тэрміналёгіі Юр'я Тынянава, выглядалі тут паводзіны экранных контравыведнікаў накшталт Штырліца, якія рукамі актора Вячаслава Ціханава рабілі адно, думалі – голасам актора Яфіма Капеляна – іншае, а атрымлівалася зь іх дзеяньняў нешта трэцяе, што павінны былі сынтэзаваць у сваёй сьвядомасьці ўжо «мы», гледачы. Паралюш самастойнага дзеяньня і падвойнае існаваньне

тайнага агента мэтафарычна адтваралі звыклую атмасфэру брэжнеўскай эпохі, што ўдзячна пазнавалася глядацкай большасцю і спараджала «чорныя» показкі ў асяродку як бы адстароненай меншасьці (тэму «дулі ў кішэні» цяпер не абмяркоўваю).

Сярод іншых задачаў гэтай літаратурнай і кінэматаграфічнай прадукцыі была актуальная неабходнасьць перахапіць ініцыятыву, заглушыць і выцясьніць з грамадзкай сьвядомасьці канкурэнтныя – дэгераізуючыя, стаічныя альбо нават камэдыйна-сатырычныя – уяўленьні пра вайну і найноўшую гісторыю Расеі ў цэлым. Альтэрнатыўныя вэрсіі нацыянальнай гісторыі, разам з ключавымі падзеямі XX стагодзьдзя, высоўваліся ў другой палове 1960-х – сярэдзіне 1970-х у сам- і тамвыдаце, дысыдэнцкай літаратуры. У іх уздымаліся пытаньні пра падзеі 1920–1930-х гадоў, што прывялі да вайны і шмат у чым вызначылі яе ход, выказваліся меркаваньні пра непамерную сацыяльную і чалавечую цану перамогі, назначаліся хады да бесстароньняга гістарычнага дасьледаваньня гэтага кола праблемаў і парэвалюцыйнай гісторыі краіны ў цэлым.

5

Афіцыйнае фармаваньне новага «ядравага» ладу калектыўнай ідэнтыфікацыі савецкіх людзей у 1970-х гадах суправаджалася ці нават забясьпечвалася дзеяньнем характэрнага сацыяльнага мэханізму. Гаворка вядзецца пра ўнутраны раскол адукаванага пакаленьня, умоўна кажучы, пакаленьня шасьцідзясятнікаў, і пра сымбалічнае выцясьненьне адной часткі сіламі другой з апірышчам на думку «народу», увасобленую ў міталягічна гераізаванай фігуры «вэтэрана». У гэтым выпадку гаворка ідзе нават ня столькі пра канкрэтных людзей, што займалі тады тую ці іншую пазыцыю (хаця, зразумела, і пра іх), колькі пра тыповыя ролі. У гэтым сэнсе падваеньне і здача могуць быць «унутраным» момантам самавызначэньня адной асобы, – такі, напрыклад, выпадак Юр'я Бондарава.

Фракцыя, якая «перамагла» ў гэтым эпізодзе барацьбы (і ў падобным супрацьстаяньні як такім, а яно, як я думаю, тыповае

для гісторыі інтэлектуальных слаёў у Расеі), прымае і ўзаконьвае аморфную думку большасьці. У выніку яна ў далейшым становіцца элемэнтам стабілізацыі, дакладней, кансэрвацыі сыстэмнага цэлага, якому пагражае распад. Акурат такое прыняцьце і ўзаконеньне выступае чарговым крокам існаваньня – альбо раскладу – савецкай сыстэмы наагул, функцыянальна замяняючы ў ім рэальную зьмену элітаў у структурах улады і «культуры», якая яе абслугоўвае.

Падкрэсьлю, што гаворка ідзе не пра сутыкненьне сьветаглядаў двух розных пакаленьняў, «бацькоў» і «дзяцей», а пра сьветаглядны раскол унутры аднаго пакаленьня; хутчэй, гаворка можа ісьці пра нешта накшталт разьдзяленьня на «сучасьнікаў» і «сынхраністаў», у старой тэрміналёгіі Віктара Шклоўскага. У меру ж зьмены пакаленьняў зрушваецца толькі ключавы пункт, вакол якога крышталізуюцца сымбалі калектыўнай ідэнтыфікацыі, – вузлавы пункт «перадачы», дакладней, трансфармацыі, пераасэнсаваньня вобразаў калектыўнага «я = мы».

У такім разе аналітык, верагодна, мог бы падоўжыць гэтую траекторыю зрухаў альбо пераломаў на крок у мінуўшчыну (калі, прыблізна паміж 1925–1940 гадамі, фармавалася «новая» памяць вакол Кастрычніцкай рэвалюцыі), таксама як і ў будучыню. Сёньня, паміж 1995–2005 гадамі, калі пакаленьне вэтэранаў у Расеі, як ужо казалася, фізычна амаль сышло, на нашых вачох у сродках масавай камунікацыі, кіна- і тэлесэрыялах, падручніках гісторыі, папулярнай гістарычнай славеснасьці і інш. складваецца «новы» вобраз вайны і ўсяго папярэдняга стагодзьдзя. Гэта сыстэмная работа, якая павінна ў выніку задаць фокус калектыўнай ідэнтыфікацыі для бліжэйшых пакаленьняў расейцаў ужо XXI стагодзьдзя, становіцца, праз палітыку дзяржаўнай падтрымкі і простай замовы, усё больш інтэнсіўная, больш за тое – ударная. Інкрустацыя гэтага вобразу адносна «новымі» элемэнтамі (сымбалямі вялікадзяржаўнасьці і праваслаўя, з аднаго боку, прыёмамі галівудзкай паэтыкі і піратэхнікі, зь іншага) не закранае прынцыповых і дастаткова ўстойлівых у часе момантаў канструкцыі «ключавой падзеі» і «гісторыі» наагул, разам з тым забясьпечвае ім пазнавальную масавымі чытачамі,

гледачамі, слухачамі адаптацыю да цяперашняга дня. Іначай кажучы, справа тут і ўва ўсіх падобных выпадках ня проста ў ідэалёгіі самой зь сябе (яна можа ў пэўных межах зьмяняцца) і не ў сымбалічных структурах як такіх (яны, насуперак пашыраным банальнасьцям, ніколі не «лунаюць у паветры» і ня «ўсмоктваюцца з малаком маці»), а ў мэтанакіраванай працы інстытуцыянальных мэханізмаў сацыяльнай сыстэмы.

Сувязь паміж уяўленьнямі пра найлепшы час стагодзьдзя і галоўную падзею стагодзьдзя (роля перамогі ў вайне становіцца ў гэтым апошнім сэнсе, як ужо згадвалася, усё больш значэннай) указвае на тое, што вобразы калектыўнай ідэнтычнасьці і носьбіты іх – ядравыя структуры – для Расеі канца стагодзьдзя пераважна склаліся, відаць, у параўнальна мірную, спрыяльную для масаў брэжнеўскую эпоху. Далей яны дастаткова спрыяльна перажылі крах савецкай сыстэмы і ўтрымалі сваё значэньне ў працэсах яе раскладу і распаду. Яны дэмпфіруюць самыя хваравітыя наступствы гэтага распаду для індывідуальнай і калектыўнай сьвядомасьці. Але справа гэтым не абмяжоўваецца: устойлівасьць названых сымбалічных структураў забясьпечваецца іх функцыянальна-цэнтральным становішчам у сыстэмах калектыўнай ідэнтыфікацыі расейцаў. Іншых такіх жа актуальных, такіх жа дадатных і такіх жа агульных сымбаляў для насельніцтва Расеі сёньня няма («Захад» – утварэньне такое ж агульнае, але сэмантычна дваістае, і нэгатыўныя значэньні ў ягонай ідэалягізаванай калектыўнай сэмантыцы на працягу 1990-х гадоў растуць, а цяпер і пераважаюць). У сваю чаргу, гэтыя ўстойлівыя ядравыя структуры значна тармозяць разьвіцьцё новых фокусаў індывідуальнай і калектыўнай ідэнтыфікацыі ў Расеі, сучасных і незалежных ад дзяржавы арыенціраў паводзінаў, самастойных крытэраў ацэнкі сябе і іншых – як на масавым узроўні, так і ў протаэлітных фракцыях расейскага соцыюму, у друку і візуальных мэдыях, большасьць зь якіх сёньня прымусова адзяржаўлена, ува ўсёй бюракратычнай і па-ранейшаму не рэфармаванай рэпрадуктыўнай сыстэме постсавецкага грамадзтва.

Гераізацыя вайны, манумэнталізацыя яе калектыўнага вобразу – зусім ня сьведчаньне памяці, а ўказаньне на месца забыцьця,

амнэзычны сьлед ці «шнар», які ўласна і дэманструецца рэспандэнтамі пры апытаньнях, з навязьлівасьцю тыражуецца сродкамі масавай інфармацыі і іншае. Перад намі кенатаф, надгробак над адсутнай у гэтым «месцы» сьвядомасьцю – над нязьдзейсьненым усьведамленьнем: помнік, а ня памяць. А гэта значыць, што траўматычная падзея Другой сусьветнай вайны ў Расеі – у адрозьненьне, напрыклад, ад Нямеччыны – рэальна не перажытая (да ліку разьлівых адрозьненьняў тут належыць, у прыватнасьці, і той кардынальны факт, што нацызм, вайна ў савецкай і постсавецкай Расеі не зьвязаныя з галакостам, якога ў калектыўнай сьвядомасьці расейцаў наагул няма і як бы не было). Не зразуметыя прычыны таго, што адбылося, ход падзеяў і рухальныя сілы, сэнс і наступствы. З вайны, з «работы жалобы» ўсьлед ёй, вакол яе і з нагоды яе не атрыманы досьвед, які б зрабіў немагчымым у далейшым тое разьвіцьцё грамадзтва, якое прывяло да вайны. Насельніцтву Расеі, яе ўладным і іншым «элітам», не прышчэплены на будучыню імунітэт да таталітарызму, дзяржаўніцтва, ксэнафобіі, да сацыяльнай пасіўнасьці і ізаляцыянізму, зайздрасьці і інфантыльнасьці, на якія заўсёды абапіраліся і сёньня абапіраюцца недэмакратычныя рэжымы.

Перакладзена зь нязначнымі скаротамі з расейскай паводле: Отечественные записки. 2004. № 5. С. 68–84 – з ласкавай згоды аўтара.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (45) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]2006

ДА ЗВАРОТУ

• крытыка • эсэістыка • **аналітыка** • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

УЛАДЗІСЛАЎ ГРЫНЕВІЧ
старшы навуковы супрацоўнік Інстытуту палітычных і этнанацыянальных дасьледаваньняў НАН Украіны.

Уладзіслаў Грыневіч

Міт вайны і вайна мітаў

Украіна мала чым розьніцца ад большасьці краінаў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, у якіх пасьля краху камуністычных рэжымаў пачалося кардынальнае пераасэнсаваньне гістарычнага мінулага. Тэма «Вялікай Айчыннай вайны» ад абвяшчэньня ў жніўні 1991 г. незалежнасьці ўкраінскай дзяржавы й дагэтуль перабывае ў цэнтры палкіх грамадзкіх дыскусіяў і палітычнай барацьбы, досыць яскрава адлюстроўваючы ня толькі нявырашанасьць праблемы новай «украінскай ідэі», але й вызначэньне стратэгічных арыентацыяў у сыстэме каардынатаў Захад–Усход. Уласна, Другая сусьветная вайна застаецца водападзелам у гістарычнай памяці ўкраінцаў, расколваючы іх палітычна, ідэалягічна і сьветапоглядна.

АД СТАЛІНА ДА ХРУШЧОВА: МІТ ПРА ВАЙНУ ЯК ЛЕГІТЫМІЗАЦЫЯ РЭЖЫМУ

У міжваенны пэрыяд бальшавікам так і не ўдалося сфармаваць ува УССР гамагеннае грамадзтва з адзінай савецкай ідэнтычнасьцю. Ані пэрманэнтныя чысткі ворагаў, ані фармаваньне нацыянальна падфарбаванага савецкага патрыятызму ня мелі вялікага посьпеху. Пераважна сялянская

паводле сацыяльнага складу Ўкраіна, што перажыла ў 1930-я гг. калясальную ў сваіх маштабах і наступствах гуманітарную катастрофу – галадамор, ахвярамі якога сталі ня менш за 3,5 мільёны асобаў, заставалася ў сталінскай імпэрыі патэнцыйна «слабым зьвяном». Далучэньне Заходняй Украіны да СССР напярэдадні нямецкага ўварваньня толькі дадало савецкай уладзе новых праблемаў.

Нацысцкая акупацыя 1941–1944 гг. рэзка аддзяліла Ўкраіну ад Расеі як палітычна, так і мэнтальна, вывеўшы яе на некалькі гадоў з-пад уплыву савецкай ідэалёгіі і прапаганды. Узровень ляяльнасьці ўкраінскага насельніцтва да сталінскай улады выявіўся невысокім: гэта яскрава засьведчыла і масавая здача чырвонаармейцаў у палон на пачатковым этапе вайны, і тое, што больш за 90 % насельніцтва (зь іх 5,6 мільёна – вайсковаабавязаныя) засталіся на акупаванай немцамі тэрыторыі, і надзвычай нізкі ўзровень супраціву новаму акупанту. Масавай зьявай зрабіўся і нацыянальна-вызвольны рух у заходніх рэгіёнах, пік якога прыпаў якраз на пэрыяд аднаўленьня сталінскай улады ўва Ўкраіне.

Аднак перамога ў вайне з гітлераўскай Нямеччынай стварыла новыя ўмовы для легітымізацыі камуністычнага рэжыму. Вайна зь яе шматлікімі рэальнымі й мітычнымі праявамі гераізму й ахвярнасьці была цудоўным матэрыялам для стварэньня патрыятычных сымбаляў і ўзораў калектыўнай памяці. Больш за тое, барацьба савецкіх народаў з ворагам давала магчымасьць, не ігнаруючы мясцовай спэцыфікі, а, хутчэй, наадварот, акцэнтуючы на ёй увагу, стварыць мадэль супольнага патрыятызму – супольнай савецкай ідэнтычнасьці. Такім чынам, міт пра Вялікую Айчынную вайну, што стаяў на ідэалягемах пра маральна-палітычнае адзінства савецкага грамадзтва, кіроўную ролю кампартыі, адзінства партыі й народу, фронту і тылу, пра палымяны савецкі патрыятызм і масавы гераізм, дружбу народаў СССР і г. д. мусіў адыграць істотную ролю ў кансалідацыі савецкага грамадзтва.

Скіраваны на кансалідацыю ўсяго насельніцтва СССР у адзіны савецкі народ, міт вайны фармаваў уяўленьне пра супольных ворагаў і супольных герояў, аднак кожная нацыянальная

рэспубліка і кожны савецкі этнас стваралі свой малы міт, які мусіў арганічна дапаўняць гэтую калясальную ідэалягічна-прапагандысцкую пабудову.

Стварацъ украінскі савецкі міт кіраўніцтва рэспублікі распачало яшчэ ў часе вайны, выкарыстоўваючы для гэтага ўсе складнікі, уласьцівыя афіцыйнай культуры памяці пра вайну: адпаведную інтэрпрэтацыю гісторыі, узьвядзеньне пантэонаў і мэмарыялаў, прызначэньне новых сьвятаў і памятных датаў. Першы камуніст рэспублікі Мікіта Хрушчоў ня толькі выклаў у прамовах ідэйныя ўстаноўкі, што тычыліся ролі й месца Ўкраіны і яе кампартыі ў Вялікай Айчыннай вайне, але й заклаў падваліны для мэмарыяльнага ўвекавечаньня памяці пра вайну. На просьбу Хрушчова і з асабістага дазволу Сталіна ў Кіеве, у нядоўгім часе пасьля вызваленьня гораду, былі пахаваныя героі абароны ўкраінскай сталіцы: генэралы Кірпанос, Патапаў, Тупікоў (у 1957 г. іх перапахавалі ў Парку славы, спраектаваным для гэтага як рытуальнае месца пакланеньня зь Вечным агнём і Магілай невядомага салдата). Крыху пазьней у Кіеве пахавалі й героя яго вызваленьня Мікалая Ватуціна, які загінуў увесну 1944 г. ад ранаў, атрыманых у сутычцы з украінскімі нацыяналістамі (да распаду СССР прычыны сьмерці начальніка І Украінскага фронту ня дужа афішавалі, а цяпер надпіс на помніку «Генэралу Ватуціну ад украінскага народу» праварадыкалы часам інтэрпрэтуюць недвухсэнсоўна).

Увосень 1943 г. да дня вызваленьня Кіева, а потым увосень 1944 г. да даты канчатковага вызваленьня Ўкраіны ад немцаў у ЦК Камуністычнай партыі Ўкраіны (КПУ) быў складзены маштабны плян узьвядзеньня манумэнтаў вызваліцелям: «пантэону героям Айчыннай вайны», бюстаў генэралам, што бралі ўдзел у вызваленьні ўкраінскіх гарадоў, асобных манумэнтаў «Слава» і «Перамога», а таксама помнікаў героям партызанскай вайны ў шматлікіх населеных пунктах Сумскай, Чарнігаўскай, Сталінскай і Варашылаўградзкай вобласьцяў. У Кіеве меліся збудаваць манумэнт «Перамога», які б увасабляў «барацьбу ўкраінскага народу супраць іншаземных захопнікаў і дапамогу расейскага народу, іншых народаў СССР і Вялікага Сталіна ўкраінскаму народу ў вызваленьні тэрыторыі Савецкай

Украіны». Хоць далёка ня ўсё з заплянаванага тады зьдзейсьнілі, але ўжо на 1 лістапада 1947 г. у рэспубліцы было ўпарадкавана 31 688 брацкіх і 64 670 асобных магілаў савецкіх воінаў, узьведзена 2 613 помнікаў, 9 861 надмагільле, усталявана 52 549 магільных знакаў. Усе гэтыя магілы й помнікі з часам будуць ператвораныя ў рытуальныя месцы пакланеньня.

У гады вайны Хрушчоў таксама ініцыяваў увядзеньне «агульнанародных нацыянальна-дзяржаўных сьвятаў украінскага народу»: Дня вызваленьня Кіева (6 кастрычніка) і дня вызваленьня Ўкраіны (14 лістапада), якія дзяржава сьвяткуе і дагэтуль. Заснаваць да гэтых сьвятаў спэцыяльны нагрудны знак «За вызваленьне Кіева» і мэдаль «За вызваленьне Ўкраіны» Сталін не дазволіў, але вартая ўвагі тая акалічнасьць, што сярод нерасейцаў толькі для ўкраінцаў зрабілі выключэньне, заснаваўшы «нацыянальны» «Ордэн Багдана Хмяльніцкага». (Эстонцам, якія прасілі, на ўкраінскі ўзор, заснаваць ордэн у гонар свайго нацыянальнага героя Лембіта, адмовілі.)

Ужо стаўшы першым сакратаром ЦК КПСС, Мікіта Хрушчоў у 1961 г. дабіўся для Кіева званьня гораду-героя. Гэтае пачэснае званьне заснавалі ў 1945 г. і прысвоілі «за гераічную абарону ў Вялікай Айчыннай вайне» толькі Ленінграду, Севастопалю, Валгаграду-Сталінграду і Адэсе. Гэты крок даўся Хрушчову не бяз пэўных ускладненьняў, бо ў колішніх сталінскіх маршалаў абарона Кіева асацыявалася з наймаштабнейшым за ўсю вайну акружэньнем і паразай савецкага войска, калі ў палон трапіла больш за паўмільёна салдатаў. Паколькі немцы практычна не бамбілі і не абстрэльвалі Кіеў цяжкой артылерыяй, места амаль не зазнала руйнаваньня. Тысячы месьцічаў выйшлі паглядзець на ваяроў вэрмахту, калі тыя ўваходзілі ў горад, і нямала кіяўлянаў танцавала і сьпявала, цешачыся з падзеньня сталінскага рэжыму. Багата дзе насельніцтва сустракала нямецкіх салдатаў хлебам-сольлю, і, іроніяй лёсу, адным з такіх месцаў была будучая Плошча Славы. Дарэчы, непрыемнае ўражаньне пакідала і тое, што абаронай украінскай сталіцы кіраваў генэрал Андрэй Уласаў, які ў хуткім часе стаў здраднікам № 1 у сталінскай імпэрыі.

Маскву ўзнагародзілі званьнем гораду-героя толькі ў часы Брэжнева – у 1965 г. Тады сама, да дваццацігодзьдзя перамогі, пачэснае званьне крэпасьці-героя было нададзена Берасьцю. Сам жа горад Берасьце, дзе ў першыя дні вайны адбылося некалькі антысавецкіх выступленьняў, вядома, такой пашаноты не дачакаўся.

Прэтэнзію партыі на кіроўную ролю ў грамадзтве істотна падтачыла катастрофа 1941 г., што і абумовіла асаблівую табуяванасьць падзеяў пачатковага пэрыяду ў афіцыйнай культуры памяці пра вайну. Паэтам Канстанціну Сіманаву і Яўгенію Далматоўскаму яшчэ падчас вайны адмовілі ў просьбе зьняць фільм пра 1941 г. Усё зьвязанае з гэтай тэмай старанна правяралі. Таксама ўвосень 1945 г. намесьнік упаўнаважанага Саўнаркаму СССР у справе захаваньня вайсковай таямніцы спыніў друкаваньне № 4–5 часопісу «Українська література». Пасьля праверкі зь яго вынялі аповесьць Зіновія Цецерука «Запіскі ваеннапалоннага». У аповесьці вялося пра пакуты былога камандзіра Чырвонай арміі, які добраахвотна здаўся ў палон і згадзіўся разьміноўваць мінныя палі. Пасьля шматлікіх уцёкаў з канцлягераў і трынаццаці месяцаў блуканьня па акупаванай тэрыторыі герой аповесьці перайшоў лінію фронту і вярнуўся «да сваіх». Бядой аўтара стала «занадта праўдзівае» апісаньне пачатковага пэрыяду вайны. Сцэны добраахвотнай здачы чырвонаармейцаў у палон, лібэральнага стаўленьня немцаў да ваеннапалонных-украінцаў, якіх масава адпускалі дадому, адсутнасьць прыкладаў «гераічнай барацьбы савецкага народу і Чырвонай арміі з фашысцкімі захопнікамі» і нават самога намёку на партызанаў – герой аповесьці так і ня змог іх адшукаць – выклікалі абурэньне ў цэнзараў. Яны прызналі публікацыю «сур'ёзнай памылкай рэдакцыі і палітычна шкодным творам».

У пасьляваенны пэрыяд катастрофу 1941 г. улада прыхоўвала яшчэ больш старанна. Напрыклад, у 1948 г., перагледзеўшы першую сэрыю фільму «Маладая гвардыя», Сталін прапанаваў рэжысэру Сяргею Герасімаву выдаліць найбольш удалыя, на думку творцы, сцэны, зьвязаныя з правалам партыйнага падпольля і панічнага адступленьня савецкіх войскаў. «Адступалі, – казаў Сталін, – толькі на папярэдне

падрыхтаваныя пазыцыі й плянамерна».

Гэтая тэма заставалася забароненай і пасьля сьмерці Сталіна. Хоць у першай комплекснай гістарычнай працы з гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, напісанай ува УССР у 1956 г., гісторык Мікола Супруненка і спрабаваў дасьледаваць прычыны паразаў на пачатку вайны, ён амаль усё зьвёў да памылак самога Сталіна. У кніжцы аб'ёмам 27 друкаваных аркушаў пачатковаму пэрыяду вайны было прысьвечана толькі 20 старонак.

Для відавочна катастрафічнага 1941 г. савецкія гісторыкі знайшлі ўдалы эўфэмізм – «пэрыяд часовых няўдачаў», і чым далей, тым ахвотней тлумачылі савецкія паразы «вераломнасьцю нямецкага нападу на міралюбную савецкую краіну» і колькаснай перавагай ворага.

Ідэалягічныя цэрбэры ўвесь час сачылі, каб вялікая таямніца камуністычнага рэжыму ня выйшла на сьвятло. Так, на пачатку 1970-х Галоўліт прызнаў «палітычна нясьпелым» і забараніў друкаваць верш «Памяць», у якім паэт ад імя салдата-франтавіка кажа, што яму сорамна насіць узнагароды, калі ён згадвае пра 1941 г.; тады герой запытвае сябе, хто ж вінаваты ў ахвярах 1941 г.? А пасьля таго, як у 1971 г. часопіс «Вітчизна» (№ 11–12) зьмясьціў аповесьць пісьменьніка-партызана Юр'я Збанацкага «Мы зь легенды», двойчы герой Савецкага Саюзу партызан Аляксей Фёдараў наладзіў аўтару сапраўднае шальмаваньне за тое, што той наважыўся паставіць пад сумнеў масавасьць партызанскага руху і спрабаваў апісаць складанасьці яго станаўленьня ў 1941 г.

Істотным момантам зьяўляецца тое, што менавіта маштабная савецкая параза на пачатковым этапе вайны, а таксама неляяльнасьць да сталінскага рэжыму, якую выявіла значная частка мясцовага насельніцтва, надалей сталі важкай прычынай пэрманэнтнай гіпэрбалізацыі партызанскай тэмы ўва ўкраінскай савецкай гістарыяграфіі. Жаданьне партыйных гісторыкаў пераканаць у існаваньні магутнага народнага супраціву нямецкай акупацыі ўва Ўкраіне часам патыхала «перасолам». Напрыклад, у 1957 г. дзеля «памылак у асьвятленьні гістарычных падзеяў і зьяваў» Галоўліт не

дапусьціў да друку працу «Народная барацьба ўва Ўкраіне ў гады Вялікай Айчыннай вайны», падрыхтаваную АН УССР. Акрамя шэрагу заўваг, зьвязаных з залічэньнем да «кіраўнікоў і арганізатараў партызанскай барацьбы сумнеўных асобаў», істотнай заганай быў прызнаны дакладны паказ руйнаваньня фабрык і заводаў, нібыта зыніцыяванага партызанамі. Выходзіла, што народныя мсьціўцы вывелі з ладу больш за 1600 заводаў, фабрык, электрастанцыяў і г. д. «Складалася такое ўражаньне, – зазначалі цэнзары, – нібыта ня гітлераўцы зьнішчылі прамысловасьць Украіны, а партызаны».

Увогуле, і сталінскія генэралы, і партакраты як падчас вайны, так і пасьля яе сканчэньня, ставіліся да партызанаў безь вялікага піетэту. У нейкай меры гэта тлумачылася пэўнай падазронасьцю да іх праз сталае знаходжаньне на акупаванай тэрыторыі, часткова – празь зьняважлівае стаўленьне да «народных мсьціўцаў» як да напаўбандытаў, у атрадах якіх пануе дух «партызаншчыны» – гэты своеасаблівы антыпод вайсковай і партыйнай дысцыпліны. І за сваю глярыфікацыю партызанскі рух зноў-такі мусіць дзякаваць Хрушчову, які намагаўся ўзмацніць украінскі савецкі патрыятызм, адначасова шукаючы падтрымкі рэспубліканскай партыйнай эліты, верхаводамі якой сталі прадстаўнікі партызанскіх кланаў.

Супольнымі намаганьнямі ўкраінскай улады і «творчай інтэлігенцыі» партызанская тэма перарасла ў сапраўдны міт пра «ўсенародную барацьбу ў тыле нямецкіх войскаў на акупаванай тэрыторыі Ўкраіны». Мэмуары і раманы ўдзельнікаў партызанскага руху ўва Ўкраіне – Сідара Каўпака, Аляксея Фёдарава, Пятра Вяршыгары ды іншых, што зьявіліся ўжо ў першыя паваенныя гады, перавыдаваліся ў рэспубліцы ўсё большымі й большымі накладамі. Адначасова расла й колькасьць украінскіх партызанаў. Лічба ў 220 тысяч удзельнікаў партызанскага руху, якую Мікіта Хрушчоў апрылюдніў на XVI зьезьдзе кампартыі Ўкраіны, неўзабаве перастала задавальняць новых кіраўнікоў, бо, у параўнаньні зь Беларусьсю, дзе партызанаў налічылі ўдвая болей, рэспубліка паўставала ў невыгодным сьвятле. І напярэдадні дваццатай гадавіны Перамогі кіеўская філія Інстытуту гісторыі партыі пачала зьбіраць у вобласьцях сьведчаньні пра ўдзел

грамадзянаў Украіны ў партызанскім руху і падпольлі. Аднак зьвесткі, што прыйшлі з абласных архіваў, выклікалі ў Кіеве зьбянтэжанасьць. Напрыклад, у Запароскай вобласьці здолелі адшукаць толькі 337 партызанаў і 44 падпольшчыкі, а таксама 285 асобаў, якія спрыялі ім у гады вайны. Дырэктар інстытуту Іван Назарэнка ня змог схаваць расчараваньня і раздражнёна напісаў на дакумэнце: «Няўжо так было?»

У Запарожжа паслалі супрацоўніка інстытуту, які «растлумачыў заданьне ЦК» мясцоваму кіраўніцтву. Пералічылі і… знайшлі яшчэ 192 056 удзельнікаў усенароднай барацьбы 1941 г., многія зь якіх, як сьцьвярджалася, пасьля сталі партызанамі і падпольшчыкамі. Дзякуючы такой альхіміі была выведзеная новая, абсалютна фантастычная лічба: адпаведна 501 тысяча ўкраінскіх партызанаў і 100 тысячаў падпольшчыкаў.

Памнажаючы ўкраінскіх партызанаў, улада адначасова намагалася не засяроджваць увагу на іх нацыянальным складзе, паколькі этнічныя ўкраінцы складалі тут прапарцыйна значна меншую частку, чым іх наагул было ў рэспубліцы. Украінцы, якія складалі да 72 % насельніцтва УССР, нават на завяршальным этапе вайны паводле колькасьці ў партызанскіх атрадах рэдка дацягвалі да 50 %. Напрыклад, у злучэньні Міколы Папудранкі было 43 % расейцаў, 41 % украінцаў і 10 % беларусаў. У злучэньнях Сідара Каўпака і Фёдара Ўшакова ўкраінцы таксама саступалі ў колькасьці расейцам. Адпаведна, і сялянаў, зь якіх на 2/3 складалася насельніцтва Ўкраіны, у партызанскіх атрадах было недзе 50 %.

Затушоўваньне нацыянальнага моманту было тыповай праявай псэўдаінтэрнацыяналісцкай гістарычна-ідэалягічнай канцэпцыі «дружбы народаў», прызначанай фармаваць адзіную савецкую ідэнтычнасьць, што пачала стварацца ў Савецкім Саюзе яшчэ ў 1930-я. Характэрны выпадак здарыўся ў гады вайны з Аляксандрам Даўжэнкам. У 1942 г. ён перадаў у рэдакцыю часопісу «Знамя» аповесьць «Перамога», у якой ішлося пра гераічныя дзеяньні адной вайсковай часткі, што амаль цалкам складалася з украінцаў. Зважаючы на поўную акупацыю УССР і значнае зьмяншэньне колькасьці ўкраінцаў у Чырвонай арміі, Даўжэнка, мабыць, хацеў узьняць баявы дух мільёнам сваіх

суграмадзянаў, якія апынуліся за межамі бацькаўшчыны. Але тагачасны кіраўнік Агітпрапу Георгі Аляксандраў раскрытыкаваў твор «за штучны адрыў барацьбы ўкраінскага народу ад расейскага і іншых народаў СССР» і забараніў яго, «як палітычна памылковы і шкодны».

Пасьля вайны быў сфармаваны велічны міт пра «дружбу народаў СССР як адзін з складнікаў перамогі». Паводле колькасьці публікацыяў гэты сюжэт ня меў сабе роўных. У межах адной толькі тэмы «партыйнае кіраўніцтва над узмацненьнем дружбы народаў і супрацоўніцтва савецкіх народаў у пэрыяд Вялікай Айчыннай вайны» за сорак пасьляваенных гадоў пабачыла сьвет 90 манаграфіяў і брашураў, 95 артыкулаў, 210 гістарычна-партыйных і агульнагістарычных публікацыяў. Над стварэньнем міту працавалі цэлыя інстытуты. Напрыклад, у Інстытуце гісторыі Ўкраіны, апроч аддзелу Вялікай Айчыннай вайны, існаваў яшчэ спэцыяльны аддзел дружбы народаў. Дзякуючы іх «плённай працы», аж да пачатку перабудовы так і не ўдалося дакладна вызначыць, колькі ж украінцаў было ў шэрагах Чырвонай арміі на розных этапах вайны; якім быў нацыянальны склад савецкіх франтоў, што біліся ўва Ўкраіне; колькі грамадзянаў УССР налічвалася ў генэралітэце і афіцэрскім корпусе, ня кажучы ўжо пра этнічны кантэкст людзкіх стратаў, палону, калябарацыі і г. д.

Яшчэ адзін аспэкт праблемы быў у жаданьні старых камуністычных гісторыкаў пазьбегнуць разгляду «нясвоечасовых пытаньняў». Звыклыя да ідэалягічнай каньюнктуры, гэтыя гісторыкі кіраваліся тэзай, што ісьціна, якая не адпавядае партыйным інтарэсам, нікому не патрэбная, прынамсі, нясвоечасовая. Калі ў 1994 г. аўтару давялося абараняць дысэртацыю «Нацыянальныя праблемы ў Чырвонай арміі ў гады вызваленьня Ўкраіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», адзін з такіх навукоўцаў, доктар гістарычных навук Іван Хмель, абураны адсутнасьцю ў тэксьце панятку «Вялікая Айчынная вайна», заклікаў маладых дасьледнікаў: «Дайце нам спачатку памерці, а ўжо потым пішыце, як вам захочацца».

Табуяваная была і праблема міжнацыянальных адносінаў ды нацыянальных меншасьцяў у гады вайны. Дэпартацыі крымскіх татараў і немцаў Украіны, украінска-польская разьня на Валыні заставаліся таямніцаю за сямю пячаткамі, – як, зрэшты, і трагедыя галакосту. Увогуле, выцясьненьне памяці пра катастрофу габрэйства было вельмі прыкметным момантам афіцыйнай гісторыі вайны. Толькі ў 1966 г. пабачыў сьвет раман кіеўскага пісьменьніка Анатоля Кузьняцова «Бабін Яр», які асьвятляў тэму, але ў хуткім часе яго забаранілі, і аўтар мусіў эмігравaць. Не ў апошнюю чаргу такое замоўчваньне было выклікана нежаданьнем улады прызнаваць габрэяў галоўнай ахвярай нацысцкай акупацыі – не ў апошнюю чаргу й таму, што гэта магло, на думку партыйных ідэолягаў, прынізіць міт Вялікай Айчыннай вайны, аднавіўшы ў сьвядомасьці масаў даўнейшыя антысэміцкія стэрэатыпы пра «саветы як габрэйскую ўладу», тым больш што нацысцкая прапаганда ўпарта насаджвала ўяўленьне пра «жыдабальшавізм», ад якога немцы, маўляў, прыйшлі вызваліць украінцаў. Таму ўлада лічыла за лепшае называць шматлікія пахаваньні габрэяў магіламі «мірных савецкіх грамадзянаў – ахвяраў гітлераўскага акупацыйнага рэжыму». Ува ўхваленай у 1945 г. пастанове Саўнаркаму УССР усталяваць манумэнт у памяць пра ахвяраў Бабінага Яру пра габрэяў няма ні слова, а калі ў 1976 г. помнік нарэшце быў узьведзены, нацыянальная прыналежнасьць ста тысячаў забітых наагул ня згадвалася. Толькі ў часы перабудовы й галоснасьці пра галакост загаварылі на ўвесь голас. Тады сама высьветлілася, што ў адной магіле з габрэямі ў Бабіным Яры ляжаць сотні ўкраінскіх нацыяналістаў, расстраляных немцамі.

Асаблівасьць украінскай гістарычнай памяці вайны была ў тым, што яна ад пачатку дваілася: на афіцыйна-савецкую і прыхавана-нацыяналістычную. Нацыянальна-вызвольны рух, які за часамі нямецкай акупацыі ахапіў заходнія вобласьці Ўкраіны і дасягнуў апагею пасьля вяртаньня сталінскага рэжыму, стварыў за гады вайны цэлую сыстэму мітаў з уласнымі героямі й сымбалямі, пантэонамі й сьвятамі, што грунтаваліся на ідэі ахвярнай барацьбы ўкраінскага народу «супраць двух імпэрыялізмаў – сталінскага і гітлераўскага – за незалежную ўкраінскую дзяржаву». Нездарма савецкая ўлада,

вярнуўшыся ўва Ўкраіну, адразу падбала пра зьнішчэньне ўсяго, што нагадвала б пра гэтую барацьбу. Напрыклад, усё той жа Хрушчоў прапанаваў ператварыць курганы, якія насыпалі сваім героям украінскія паўстанцы, у помнікі савецкім салдатам, зьбіваючы для гэтага з магілаў крыжы і трызубы і мантуючы на іх месца пірамідкі з чырвонымі зоркамі.

Тэма ворагаў і здраднікаў займала асаблівае месца ўва ўкраінскім савецкім міце. Зрэшты, калі савецкая гістарыяграфія і акцэнтавала ўвагу на нечым нацыянальным, дык гэта былі «нацыянальныя ворагі». Да іх, апроч уласна краінаў-агрэсараў (гітлераўскай Нямеччыны і яе сатэлітаў), былі залічаныя ўсе нацыянальныя рухі часоў Другой сусьветнай вайны, што мелі выразна антыімпэрскі, антысавецкі характар і высоўвалі лёзунг разьвіцьця сваіх нацыяў па-за межамі сталінскай імпэрыі. Не аналізуючы палітычна-ідэалягічных прычынаў пашырэньня ў гады вайны ўплыву ўкраінскага нацыяналізму, савецкая гістарыяграфія падавала гэты маштабны народны рух як дзеяньні вартай жалю жменькі здраднікаў радзімы, калябарантаў і крымінальнікаў. Цягам амаль 50 гадоў камуністычная прапаганда зь лёгкага пяра партыйнага функцыянэра Дзьмітрыя Мануільскага фармавала ўва Ўкраіне вобраз «украінска-нямецкага буржуазнага нацыяналіста, што дапамагаў фашыстам» (таму зусім не выпадкова ў савецкай Украіне ўрадавая прэмія для гісторыкаў была названая ў гонар менавіта гэтага партыйнага прыстасаванца і прафэсійнага фальсыфікатара гісторыі). Дзейнасьць Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў (АУН) і створанай пры яе ўдзеле Ўкраінскай паўстанцкай арміі (УПА) іншых характарыстык, апроч «антынародная, крывавая, злачынная», ня мелі. Прыдуманыя ў савецкай публіцыстыцы штампы кшталту «жоўта-блакітныя вурдалакі», «штатныя юды», «пазначаныя пячаткаю праклёну», «саюз трызуба і свастыкі» і г. д. меліся затаўраваць і ўкрыць вечнай ганьбай украінскі вызвольны рух.

Жахлівыя і крывавыя старонкі працяглай барацьбы сталінскай імпэрыі з гэтым рухам, зьвесткі пра сотні тысячаў забітых, закатаваных, дэпартаваных мусілі навек застацца засакрэчанымі. Вядома, што інфармацыя пра пляны Сталіна дэпартаваць усіх (!) украінцаў за неляяльнасьць, якая

ўпершыню прагучала ў сакрэтным дакладзе Хрушчова на XX зьезьдзе КПСС, так і засталася без адпаведнага аналізу і камэнтароў.

АД НЭАСТАЛІНІЗМУ ДА ПЕРАБУДОВЫ: МІТ ПРА ВАЙНУ – «СЬВЯТАРНАЯ КАРОВА» КАМУНІСТЫЧНАЙ ІДЭАЛЁГІІ

Насуперак таму, што культ памяці вайны зарадзіўся яшчэ ў сталінскія часы, тады ён не набыў сапраўднага пашырэньня. Сталін выкарыстоўваў памяць вайны выключна для пашырэньня ўласнага культу вайскова-палітычнага генія, і ён ня меў патрэбы ні ў разгортваньні ў грамадзтве магчымых дыскусіяў вакол памылак пачатковага этапу Другой сусьветнай і нямецка-савецкай войнаў, ні ў параўнаньні з папулярнымі палкаводцамі й героямі Вялікай Айчыннай. Таму амаль да самай сьмерці тырана вайну ў Савецкім Саюзе актыўна не эксплюатавалі ані літаратура, ані кінэматограф, ані навука. Прыкладам, ужо ў 1949 г. была распушчаная спэцыяльная Камісія дзеля вывучэньня Айчыннай вайны, створаная ў 1942 г. пры АН УССР, а выставу-музэй «Партызаны Ўкраіны ў Вялікай Айчыннай вайне», што займалася зьбіраньнем дакумэнтаў і ўспамінаў, – зачынілі.

Што да сьвята перамогі, дык зь ім спачатку таксама ня склалася. Як вядома, саюзьнікі першымі падпісалі капітуляцыю зь немцамі – 7 траўня 1945 г. у штаб-кватэры генэрала Эйзэнгаўэра. І толькі на наступны дзень аналягічны акт быў укладзены ў савецкай стаўцы ў Бэрлін-Карлгосьце ў прысутнасьці маршала Жукава. Сталін загадаў ладзіць сьвяткаваньне 9 траўня як «дня перамогі савецкага народу», але ўжо ў 1948 г. яго пазбавілі статусу выходнага.

Пік стварэньня міту вайны прыпаў на брэжнеўскі пэрыяд, калі пасьля «адлігі» да ўлады прыйшлі нэасталіністы – вэтэраны Вялікай Айчыннай, якія запраўлялі палітычным жыцьцём краіны цягам 1970 – 1980-х гг. Менавіта ў пэрыяд застою памяць пра вайну ператварылі ў сапраўдны культ. У якасьці спосабу падтрымкі й легітымізацыі міту пра перавагі

камуністычнай сыстэмы «Вялікая Айчынная вайна» пацясьніла нават «Вялікую Кастрычніцкую Сацыялістычную рэвалюцыю». Як трапна заўважыла адна нямецкая дасьледніца, «міт вайны нёс у сабе ідэнтыфікацыйны і дысцыплінарны ўплыў на зусім не гамагеннае і наагул апалітычнае савецкае грамадзтва».

Угрунтаванае на героіцы вайны выхаваньне ў моладзі савецкага патрыятызму суправаджалі маўклівы скептыцызм жывых сьведкаў Другой сусьветнай і амаль поўная блякада ад «варожых інфармацыйных уплываў». Паступова пад ціскам магутнай прапагандысцкай машыны грамадзтва апынулася ў палоне гэтага давершанага міту. Актыўнымі чыньнікамі й адначасова інструмэнтам фальсыфікацыі volens nolens зрабіліся савецкія вэтэраны, якія разам зь вяртаньнем у 1965 г. сьвяткаваньняў «Вялікай Перамогі» аднавілі прызабытую з часоў разьвянчаньня культу асобы традыцыю насіць ордэны і мэдалі. Вэтэраны, якіх за часамі Хрушчова грамадзтва зусім занядбала, адчулі эўфарыю ад магутнай дозы падкрэсьленай пашаны і грамадзкага прызнаньня. Але ўрэшце само грамадзтва заплаціла за гэтую ўяўную і штучную «рэабілітацыю памяці» яшчэ больш жорсткай забаронай на праўду.

Хоць на момант распаду СССР ніводная іншая гістарычная тэма не магла параўнацца з тэмай Вялікай Айчыннай вайны колькасьцю публікацыяў – 20 тысячаў бібліяграфічных пазыцыяў агульным накладам адзін мільярд асобнікаў, – сярод гэтых стосаў друкаванай прадукцыі дарэмна было шукаць нешта пра горкую праўду вайны. Любыя спробы адысьці ад афіцыйнай інтэрпрэтацыі караліся. Дасьледнікі ўва Ўкраіне, напалоханыя пэрспэктываю сесьці ў лужыну праз «страту палітычнай пільнасьці», як чорт ладану баяліся хоць якіх «наватарскіх» публікацыяў на тэму вайны.

Але з найбольшай нагляднасьцю моц манумэнтальнага савецкага міту вайны прадэманстравалі падзеі эпохі перабудовы. Пераўтварэньні, што адбываліся ў краіне, на думку іх ініцыятараў, ня мусілі зачапіць самых падвалінаў савецкага ладу, а асабліва яго падставовых мітаў. Крытыка сталінізму й таталітарызму была дазволеная, аднак без замаху на інтэграцыйныя каштоўнасьці савецкай гісторыі. 21 сьнежня

1988 г., на піку гарбачоўскай галоснасьці, калі старонкі савецкай прэсы былі перапоўненыя сэнсацыйнымі матэрыяламі пра так званыя «белыя плямы» айчыннай гісторыі, Галоўліт СССР пастанавіў унесьці істотныя дадаткі ў наяўны «Пералік ведамасьцяў, забароненых для адкрытай публікацыі». Згодна з гэтым дакумэнтам, да сакрэтных былі залічаныя практычна ўсе ценевыя й непрывабныя старонкі з гісторыі вайны – пра страты асабовага складу, ацэнкі маральна-псыхалягічнага стану савецкіх войскаў (матэрыялы асаблівых аддзелаў і судова-сьледчых органаў), дзейнасьць заградатрадаў і штрафных батальёнаў і г. д.

Дасьледнікі, якім давялося працаваць тады ў архіве Мінабароны СССР у падмаскоўным Падольску, мусяць добра памятаць таўшчэзныя фаліянты з старанна расьпісанымі шматлікімі забаронамі на выкарыстаньне тамтэйшых дакумэнтаў. Найперш немагчыма было выкарыстоўваць тыя, што маглі хоць трохі «дыскрэдытаваць Чырвоную армію». Характэрны прыклад: працаўнікі архіву выдалілі з сшытка аднаго дасьледніка выпіскі пра тое, што закарпацкія ўкраінцы, якіх мабілізавалі палявыя ваенкаматы, ішлі на зборны пункт басанож па сьнезе. Менавіта ў гэтым факце (хіба армія ня мела ботаў?!), а не ў незаконнасьці такой «добраахвотнай» мабілізацыі грамадзянаў іншай дзяржавы, архіўныя працаўнікі бачылі «дыскрэдытацыйны момант».

Зразумела, што, не дасьледаваўшы ўсіх гэтых пытаньняў, не было як нават і марыць пра стварэньне хоць нейкай навуковай карціны мінулай вайны. Аднак пра гэта ў Савецкім Саюзе, насуперак усёй перабудове і галоснасьці, не ішлося. Наадварот: пабачыўшы руйнаваньне немалой колькасьці савецкіх мітаў і кардынальныя зрухі ў грамадзкай сьвядомасьці, якія яно выклікала, усё яшчэ ўладная Кампартыя рабіла адчайныя спробы захаваць адну з наймацнейшых ідэалягічных фартэцыяў – міт пра «Вялікую Айчынную вайну». Лёгіка была простая. На фоне шквалу выкрывальных матэрыялаў пра злачынствы камуністычнай сыстэмы «вялікая перамога партыі й народу ў Вялікай Айчыннай вайне Савецкага Саюзу» здавалася ці не адзіным аргумэнтам на карысьць старой ідэалёгіі і сыстэмы ўлады.

Украінская кампартыя была ў тыя часы адным з самых рэтраградных атрадаў КПСС, нават без намёку на дэмакратызацыю. Больш за тое, адчуваючы небясьпечныя вятры пераменаў, украінскія камуністы намагаліся засьцерагчыся ад якіх-небудзь магчымых зьменаў, закансэрваваўшы свой статус-кво. У 1985 г., на пачатку перабудовы, дырэктар Інстытуту гісторыі Ўкраіны Юры Кандуфор і загаднік аддзелу «Вялікай Айчыннай вайны» колішні партызан Усевалад Клакоў выступілі ў «Весьніку АН УССР» з праграмным мэтадалягічным артыкулам, абгрунтоўваючы тэзу пра тое, што гісторыя Ўкраінскай ССР ваеннага часу мусіць заставацца «неад'емнай часткай гісторыі СССР, а выдзяленьне нацыянальнага сюжэту ў супрацьвагу палажэньню пра непарыўнасьць і ўзаемазалежнасьць гістарычнага працэсу разьвіцьця кожнай рэспублікі Савецкага Саюзу ў цэлым была б памылковай».

Аднак грамадзкія працэсы, што адбываліся ў краіне, грунтоўна прайшліся па такой пазыцыі «мудрага печкура». Дэмакратызацыя і галоснасьць адыгралі вырашальную ролю ў актывізацыі гістарычнай памяці ў нацыянальных рэспубліках, у прыватнасьці ўва Ўкраіне. Пасьля скасаваньня ў 1987 г. сумнавядомага артыкулу 58/10-11 (пра «антысавецкую дзейнасьць»), а ў 1990-м – 6-га артыкулу Канстытуцыі СССР (пра вядучую і накіроўваючую ролю Камуністычнай партыі) у краіне ўзьніклі сотні іншых новых альтэрнатыўных, у тым ліку антысавецкіх выданьняў. Плынь непадкантрольнай інфармацыі, найперш той, што тычылася нядаўняга мінулага, зрабілаў сапраўдны пераварот у палітычнай і гістарычнай сьвядомасьці грамадзтва. Чым вастрэйшай рабілася палітычная барацьба між камуністамі і дэмакратамі, тым часьцей у гэтае супрацьстаяньне была ўцягнутая і тэма Другой сусьветнай вайны. Асаблівая роля тут належала публіцыстам, журналістам, пісьменьнікам і тым гісторыкам, якія адгукнуліся на выклік часу. Дзьве асноўныя тэндэнцыі вызначалі ўкраінскую спэцыфіку гэтага пэрыяду. Па-першае, галоўную ўвагу пачалі надаваць месцу Ўкраіны і ўкраінцаў у вайне. Спачатку гэтую тэму краналі выключна ў кантэксьце крытыкі сталінізму, аднак паступова яна ўпісвалася ў кола незалежніцкіх тэндэнцый, што нарасталі ў краіне. Напрыклад, публікацыі пра стварэньне ў 1944 г. на загад Сталіна

Наркамату абароны УССР нагадалі грамадзкасьці пра эфэмэрны і фіктыўны статус украінскай савецкай дзяржаўнасьці, а таксама былі сугучныя з заклікамі пэўных палітычных сілаў пра неабходнасьць фармаваньня ўласных рэспубліканскіх узброеных сілаў.

«Архіўная рэвалюцыя» – вывядзеньне з спэцсховішчаў значнага масіву раней засакрэчаных дакумэнтаў – дала магчымасьць зазірнуць у гэтыя «ікс-файлы» і пабачыць зусім іншую карціну мінулай вайны, істотна паспрыяўшы дэвальвацыі старых савецкіх мітаў. Напрыклад, зашмальцаваная тэза пра «авангардную ролю камуністаў ува ўсенароднай барацьбе на акупаванай тэрыторыі» лопнула як мыльная бурбалка, калі выявілася, што амаль чвэрць колішніх сяброў КП(б)У – 142 134 чалавекі – засталася на захопленай ворагам тэрыторыі, а большасьць зь іх – 113 890 чалавек – спакойна перабыла нямецкую акупацыю. У адным толькі пралетарскім Варашылаўградзе паводле стану на 15 красавіка 1943 г. легальна, пасьля рэгістрацыі ў гестапа, жыло 750 былых камуністаў і 350 камсамольцаў.

Калі гаворка ідзе пра руйнаваньне савецкай мадэлі гісторыі, нельга абысьці яшчэ адной надзвычай важнай тэмы – пачатку Другой сусьветнай вайны, 1939–1940 гг. Савецкія ідэолягі засакрэчвалі яго ня менш за падзеі 1941 г., і гэта невыпадкова. Гэты пэрыяд у СССР традыцыйна разглядалі як перадваенны – пярэдадзень «Вялікай Айчыннай вайны», калі міралюбны СССР у варожым капіталістычным атачэньні старанна рыхтаваўся да будучых грозных выпрабаваньняў, нарошчваючы вайскова-эканамічную магутнасьць і ўзмацняючы свае заходнія межы ў «вызвольных паходах» Чырвонай арміі ў Заходнюю Ўкраіну і Заходнюю Беларусь, Паўночную Букавіну, Бэсарабію, Прыбалтыку і Фінляндыю.

Наўмыснае перанясеньне акцэнту на савецка-нямецкую вайну парушала цэльнасьць гістарычнага працэсу, затое ўдала ўпісвалася ў палітычна-ідэалягічны кантэкст савецкай мітатворчасьці. Яно мела на мэце схаваць відавочную датычнасьць сталінскага рэжыму да разьдзьмухваньня Другой сусьветнай вайны, якая да чэрвеня 1941 г. мела выразна

захопніцкі, несправядлівы і імпэрыялістычны характар, і непасрэдны ўдзел у ёй СССР. (Падобна, не выпадкова ў часы Брэжнева назву «Другая сусьветная вайна» пачалі пісаць усю з малой літары, затое ў назьве «Вялікая Айчынная вайна» два словы – зь вялікай). Сканструяваная савецкімі ідэолягамі гістарычная схема імгненна страціла б прывабнасьць, калі б з «сталінскай шафы» выцягнулі старанна схаваны «шкілет»: дакумэнты пра таемнае пагадненьне 1939 г. між Сталіным і Гітлерам, што тычыліся падзелу Эўропы. Цалкам усьведамляючы гэта, савецкае кіраўніцтва ня толькі часоў сталінізму ці брэжневізму, але й эпохі гарбачоўскай галоснасьці старанна хавала гэтыя матэрыялы, вызначальныя для разуменьня мэханізму ўзьнікненьня вайны ў Эўропе. Узьняць заслону над таямніцай пакту Рыбэнтропа–Молатава не наважыўся і сам Гарбачоў. Арыгіналы сакрэтных пратаколаў, што пацьвярджалі існаваньне такой змовы, грамадзкасьць атрымала ўжо ў незалежнай Расеі. Такім чынам, падзеі канца 1930-х гісторыкі пачалі разглядаць зусім у іншым ракурсе: два тыраны – Гітлер і Сталін, – злачынна змовіўшыся, фактычна распалілі ў Эўропе пажар вайны, што зрабілася сусьветнай. Ні савецкія падштурхоўваньні нацыстаў да агрэсіі, ні агрэсіўныя дзеяньні самога СССР на пачатку Другой сусьветнай вайны зусім не былі вымушанымі абароннымі захадамі. Іх вызначыла сама прырода камуністычнага рэжыму, які заўжды ахвотна выкарыстоўваў пэрыяды палітычнай нестабільнасьці, каб пашырыць «фронт сацыялізму».

Апроч «дружбы з Гітлерам», гісторыя пачатковага пэрыяду Другой сусьветнай вайны і без таго поўная непрывабных і палітычна нязручных для савецкай прапаганды сюжэтаў. Да іх належала і супраца райхсвэру з Чырвонай арміяй цягам 1920-х – пачатку 1930-х гг., і баявое ўзаемадзеяньне Вэрмахту і Чырвонай арміі падчас разгрому Польшчы ў 1939 г. Зусім ня ўпісваліся ў карціну «трыюмфальнага шэсьця» савецкай улады ў далучаных заходніх рэгіёнах масавыя рэпрэсіі й дэпартацыі палітычна нядобранадзейных элемэнтаў, што ахапілі да аднаго мільёна асобаў. У мясарэзку сталінскіх рэпрэсіяў трапілі й 22 тысячы польскіх палонных афіцэраў, нялюдзка закатаваных у савецкіх турмах: энкавэдысцкія каты ў скураных фартухах уначы забівалі стрэлам у патыліцу палякаў, зьвязаных калючым

дротам, а потым скідалі трупы ў таемныя магілы. Сымбалем гэтай трагедыі стала Катынь – месца пад Смаленскам, дзе загінулі 4 тысячы чалавек. Дакумэнты пра гэтае злачынства сталінізму супраць чалавецтва былі старанна схаваныя й пабачылі сьвятло толькі ў 1996 г. Нарэшце, зусім не ўрачысты выгляд мела вайна зь Фінляндыяй 1939–1940 гг., якую СССР разьвязаў пасьля правакацыі савецкіх спэцслужбаў у памежным мястэчку Майніла – амаль такой самай, якую зрабілі нацысты ў Гляйвіцы напярэдадні ўварваньня ў Польшчу. Міжнародная супольнасьць справядліва расцаніла «Зімовую вайну» як агрэсію, і калі савецкая авіяцыя разбамбіла 20 фінскіх гарадоў (тады загінулі і былі параненыя амаль 3000 цывільных асобаў), СССР з ганьбай выгналі зь Лігі нацыяў. Даволі супярэчлівай і цалкам адрознай ад савецкай схемы выявілася і так званая «вызвольная місія Чырвонай арміі ў Эўропе». Падзеі фінальнага пэрыяду вайны, калі адначасова з вызваленьнем ад нацызму аднавілася жорсткае сталінскае заваяваньне Эўропы, нярэдка суправаджалі маштабныя савецкія злачынствы.

Дый афіцыйныя мэтады пашырэньня савецкага ўплыву былі разнастайнымі: ад эканамічнай дапамогі прамаскоўскім «урадам народнай дэмакратыі» да зьнішчэньня ўзброенай апазыцыі й дэпартацыі патэнцыйна неляяльных сацыяльных і нацыянальных групаў, кшталту немцаў Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы.

Адначасова камуністычны міт вайны, які паступова падточвала зь сярэдзіны чым далей, тым мацнейшая савецкая альтэрнатыўная гісторыя, руйнаваўся і звонку, пад ціскам іншай, адкрыта антысавецкай і нацыяналістычнай тэндэнцыі, непасрэдна зьвязанай з актуалізацыяй тэмы АУН-УПА. У Заходняй Украіне, як і ў рэспубліках Балтыі, Чырвоную армію публічна вінавацілі ў акупацыі. У лютым 1990 г. пад будынкам Вярхоўнай Рады ў Кіеве правыя палітычныя аб'яднаньні й партыі зладзілі несанкцыянаваны мітынг, удзельнікі якога называлі савецкае войска акупацыйным, бо яно «выхоўвае ў сваіх шэрагах манкуртаў», і заклікалі стварыць уласныя ўкраінскія ўзброеныя сілы, спасылаючыся на досьвед украінскай вайсковай гісторыі княжага і казацкага пэрыядаў, а таксама Ўкраінскай паўстанцкай арміі часоў Другой

сусьветнай вайны.

Зазначым, што асаблівую ролю ў папулярызацыі АУН-УПА адыграла ўкраінская дыяспара, адкуль, запаўняючы інфармацыйны вакуўм, у край хлынулі эміграцыйныя выданьні, напісаныя пераважна ў часы «халоднай вайны». Праўда, сярод патоку тае літаратуры былі і цалкам акадэмічныя найноўшыя працы – напрыклад, сынтэз канадзкага прафэсара ўкраінскага паходжаньня Арэста Субтэльнага, у якім гісторыя Другой сусьветнай вайны падавалася ў незвычайным «украінацэнтрычным ракурсе». Кніга Субтэльнага выйшла ў Кіеве ўжо ў першы год украінскай незалежнасьці і, з прычыны адсутнасьці найноўшай канцэпцыі ўкраінскай гісторыі, некалькі гадоў была ледзьве не адзіным дапаможнікам для студэнтаў і школьнікаў новай Украіны.

Зафарбоўваньне «белых плямаў» украінскай гісторыі ўрэшце выклікала істотныя трансфармацыі ў грамадзкай сьвядомасьці й падарвала давер да камуністычнага рэжыму. Дынаміка зьменаў палітычных настрояў ад крытыкі сталінізму да крытыкі савецкай сыстэмы агулам і далей – да ўсьведамленьня ідэі незалежнай Украіны і нават да ўкраінскага нацыяналізму як альтэрнатывы старой камуністычнай ідэалёгіі – выявілася надта імклівай і нечаканай для ўлады.

Затое цалкам прагназавана ўзрастала папулярнасьць тэмы АУН-УПА. На захадзе Ўкраіны шматлікія мітынгі з заклікамі адрадзіць нацыянальную сымболіку і прызнаць Украінскую паўстанцкую армію ўдзельніцай Другой сусьветнай вайны пачаліся яшчэ ў часы перабудовы. У Кіеве на Майдане Незалежнасьці (тады яшчэ плошчы Кастрычніцкай рэвалюцыі) жвава гандлявалі нацыяналістычнай літаратурай, сьцяжкамі, значкамі з бандэраўскай і аунаўскай сымболікай. Пра тое, што ў грамадзтве насьпявае раскол, красамоўна сьведчыла рэзкае завастрэньне пры канцы 1980-х – на пачатку 1990-х гг. спрэчак адносна АУН і УПА. Усьведамляючы ўсю выбуховасьць гэтага працэсу, КПУ зрабіла шэраг легальных і нелегальных спробаў даць адпор «антысавецкай і бандэраўскай прапагандзе». Абкамам было загадана забясьпечыць публікацыю контрапагандысцкіх артыкулаў у прэсе, выступы навукоўцаў на

тэлебачаньні і, нягледзячы на дэфіцыт паперы, выдаць сэрыю кніжак «Праўда пра АУН-УПА», «Кніга памяці ахвяраў АУН-УПА», зборнік аповедаў «Сумленьне», што выкрываў бандэраўцаў і г. д.

НЕЗАЛЕЖНАЯ ЎКРАІНА: МІТ ВАЙНЫ І ВАЙНА МІТАЎ

Абвешчаная ў жніўні 1991 г. незалежнасьць Украіны не зьняла з парадку дня праблему АУН-УПА, наадварот, яе абмеркаваньне перарасло ў адкрытае палітычнае супрацьстаяньне. Каменем спатыкненьня засталося пытаньне пра афіцыйнае прызнаньне АУН і УПА. У грамадзтве разгарнулася дыскусія пра тое, чыя барацьба была галоўнай і вызначальнай у гісторыі змаганьня за ўкраінскую дзяржаўнасьць – тых украінцаў, якія ваявалі пад чырвонымі сьцягамі, ці тых, каго натхнялі на барацьбу жоўта-блакітныя.

Палярнасьць ацэнак адбівалася ўва ўзаемных лексычных штампах, якія актыўна ўводзіліся: савецкіх вэтэранаў кляймілі як «акупантаў», «страчанае пакаленьне», «ворагаў украінскай незалежнасьці»; затое ўдзельнікаў АУН-УПА – як «калябарантаў», «здраднікаў украінскага народу», «фашысцкіх паслугачоў». У 1992 г., напярэдадні і падчас сьвяткаваньня 50-годзьдзя стварэньня УПА, некалькі заходнеўкраінскіх абласных і раённых радаў зьвярнуліся да Вярхоўнай рады з просьбай афіцыйна прызнаць удзельнікаў нацыянальна-вызвольнай барацьбы 1920-х –1950-х гг. У адказ кіраўніцтва Саюзу вэтэранаў Украіны даслала ў Вярхоўную раду сэрыю пратэстных лістоў супраць «бандэрызацыі Ўкраіны».

Нязгода пануе і ў самім вэтэранскім руху. Адкрыта прак амуністычная арыентацыя кіраўніцтва Саюзу вэтэранаў Украіны, для якога барацьба за памяць пра вайну азначае барацьбу за камуністычныя каштоўнасьці й аднаўленьне чагосьці накшталт СССР, выклікала раскол. У кастрычніку 1996 г. у Кіеве адбыўся ўстаноўчы зьезд Усеўкраінскага аб'яднаньня вэтэранаў Другой сусьветнай вайны, на якім было абвешчана пра жаданьне «адмежавацца ад праімпэрскіх дзеяньняў і намераў адрадзіць Савецкі Саюз вэтэранскай арганізацыі, якую

ўзначальвае таварыш Герасімаў», а таксама «аб'яднаць намаганьні ўсіх вэтэранаў, якія вызнаюць і падтрымліваюць Канстытуцыю Ўкраіны і яе незалежнасьць і тым самым спрыяюць кансалідацыі ўкраінскага грамадзтва».

Увогуле для сучаснай Украіны, якая дэкляруе вернасьць дэмакратычным прынцыпам, характэрная плюралістычная гістарыяграфія. Што праўда, тут таксама адчуваецца палярызацыя ня столькі навуковых думак, колькі палітычных пазыцыяў. З аднаго боку, відавочныя спробы перамадэляваць з пункту гледжаньня «ўкраінацэнтрызму» старую савецкую схему «Вялікай Айчыннай вайны» і нават яе базавы міт. Скажам, у падручніку для старшаклясьнікаў і абітурыентаў «Гісторыя Ўкраіны» (Кіеў, 1999) яго аўтары А. Чайкоўскі і В. Шаўчэнка сьцьвярджаюць, што «народ назваў вайну Вялікай Айчыннай вайною, бо бараніў у ёй сваю айчыну-Ўкраіну». Мітычнай можна лічыць і трактоўку выхаду УССР на міжнародную арэну (то бок уступленьне ў ААН, што адбылося найперш дзякуючы кулюарным гульням Сталіна, а ня ў выніку «прызнаньня ўкладу ўкраінскага народу ў барацьбу з фашызмам» і г. д.).

Зь іншага боку, такому падыходу супрацьстаіць інтэгральная нацыяналістычная канцэпцыя, прыхільнікі якой намагаюцца выкінуць з памяці вайны ўсё савецкае, замяніўшы яго героікай АУН і УПА. Прыхільнікі пэўнай прамежкавай мадэлі намагаюцца замірыць правых і левых, акцэнтуючы ўвагу на «гераізьме і ахвярнасьці» ўсіх украінцаў, што біліся зь нямецкімі захопнікамі ў гады вайны і ў шэрагах Чырвонай арміі, і ўва УПА, у выніку чаго ў гістарычнай пэрспэктыве паўстала магчымасьць стварыць незалежную Ўкраіну. Зрэшты, на зьмену старому савецкаму міту вайны прыйшлі новыя постсавецкія і нацыяналістычныя міты.

Гульня на двух палёх гістарычнай памяці сталася звыклай справай для ўкраінскіх уладцаў, якія аднолькава аддавалі належнае і нацыяналістычным, і савецкім юбілеям і датам. Больш за тое, улада навучылася дастасоўваць гэтыя сьвяты да сваіх каньюнктурных інтарэсаў. Скажам, адзначаючы гадавіну абвяшчэньня Карпацкай Украіны, прэзыдэнт Кучма прысвоіў званьне Героя Ўкраіны яе першаму прэзыдэнту Аўгустыну

Валошыну, што загінуў у 1945 г. у катоўнях маскоўскага НКВД. Адначасова такое ж званьне атрымаў і кіраўнік Саюзу вэтэранаў генэрал Іван Герасімаў. Акрамя таго, Кучма рашуча зацьвердзіў новае сьвята, Дзень партызанскай славы, насуперак савецкай традыцыі не падзяляць ваяроў Чырвонай арміі і партызанаў. У гэтым выпадку сьвяткаваньне ў сучаснай Украіне 22 верасьня Дня партызанскай славы стала чарговай саступкай леваму электарату, бо яно дэ-факта процістаўляла савецкіх партызанаў паўстанцам УПА, якія сьвяткуюць свой дзень на тры тыдні пазьней. Тагачасны прэзыдэнт падбаў і пра падпольшчыкаў. 18 літага 2002 г. ён аддаў распараджэньне «Пра сьвяткаваньне 60-годзьдзя стварэньня падпольнай моладзевай арганізацыі «Маладая гвардыя» і асабіста ўзяў удзел ува ўрачыстасьцях. А 60-годзьдзе УПА, якое на ўзроўні грамадзкіх арганізацыяў сьвяткавалі ў тым самым 2002 г., праігнараваў.

У часе другога прэзыдэнцкага тэрміну і асабліва пасьля «касэтнага скандалу» Кучмаў рэжым апынуўся ў міжнароднай ізаляцыі. Гэтая акалічнасьць значна паспрыяла ўзмацненьню арыентацыі найвышэйшай улады Ўкраіны на Расею. Акцэнт на тэмах расейска-ўкраінскага баявога братэрства ў гады вайны, а таксама супольнага савецкага мінулага стаў звычайнай справай. Аднаўленьне ўва Ўкраіне колішняга Дня савецкай арміі, 23 лютага, які ў новай глянцавай абгортцы выявіўся Днём абаронцы айчыны, назіральнікі расцанілі ня толькі як унутранапалітычную піяр-акцыю да прэзыдэнцкіх выбараў 1999 г., але і як жэст, зьвернуты да паўночнага суседа. Кульмінацыяй гэтае палітыкі стаў прыезд у Кіеў увосень 2004 г. расейскага прэзыдэнта Ўладзімера Пуціна на сьвяткаваньне 60-годзьдзя вызваленьня Ўкраіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у самы разгар прэзыдэнцкіх выбараў.

Насуперак усяму, прыхільнікі савецкіх мітаў ужо прайгралі бітву за гістарычную памяць новага пакаленьня. Яшчэ на досьвітку незалежнасьці, дбаньнем тагачаснага Міністэрства адукацыі з праграмаў і падручнікаў для сярэдняй і вышэйшай школы былі выкінутыя старыя савецкія схемы, таксама была легітымізаваная тэма АУН-УПА. Варта адзначыць, што якраз на тых падручніках была выхаваная цэлая генэрацыя ўдзельнікаў

Памаранчавай рэвалюцыі. Адным з галоўных складнікаў украінскай мадэлі Другой сусьветнай вайны стала перанясеньне націску з 22 чэрвеня 1941 г. на 17 верасьня 1939 г. – дзень уступленьня СССР (і Ўкраіны) у Другую сусьветную вайну. Гэтаму пэрыяду надаецца значная ўвага і ў асьвятленьні праблемы далучэньня заходнеўкраінскіх земляў, і ў асуджэньні жорсткай саветызацыі гэтага краю, масавых рэпрэсіяў супраць мірнага насельніцтва. Сталін і Гітлер падаюцца ў адной цеснай зьвязцы: як таталітарныя дыктатары, аднолькава адказныя за распальваньне вайны. У большасьці падручнікаў для сярэдняй і вышэйшай школы назва «Вялікая Айчынная вайна» замененая на нэўтральныя і менш эмацыйныя – «Другая сусьветная» ці «нямецка-савецкая» вайна. Адыход ад савецкай мадэлі памяці пра вайну назіраем і ў замене старых герояў-сымбляў новымі. Клясычныя савецкія героі – Гастэла, Матросаў, Касмадзям'янская, героі-панфілаўцы і г. д. – на старонках украінскіх падручнікаў саступілі месца героям нацыянальна-вызвольнай барацьбы. (Некаторыя – як «легендарны савецкі разьведчык» Мікалай Кузьняцоў, забіты за тое, што правакаваў нямецкія рэпрэсіі супраць украінскіх нацыяналістаў у Роўне, – ператварыліся ў антыгерояў.) У многіх школьных падручніках зьмешчаныя партрэты начальніка УПА Рамана Шухевіча і лідэра АУН Сьцяпана Бандэры.

У кантэксьце гістарычнай памяці пра вайну нельга абысьці датычную да яе тэму сталіншчыны. Калектыўная і індывідуальная памяць украінцаў цесна зьвязвае з Сталінам галадамор 1933 г., а некаторыя гісторыкі называюць людзкія страты, якія прынёс Украіне сталінскі рэжым, большымі за яе ахвяры ў Другой сусьветнай вайне. У адрозьненьне ад Расеі, дзе дзейнасьць Сталіна пазытыўна ацэньвае амаль палова насельніцтва, ува Ўкраіне роля «стваральніка вялікай Перамогі», якая прыпісвалася «правадыру народаў», не дадае яму вагі. Дастаткова згадаць, які выбух абурэньня выклікала ўва Ўкраіне паведамленьне пра тое, што ўрад Крыму хоча ў гонар 60-годзьдзя Ялцінскай канфэрэнцыі за грошы расейскіх бізнэсоўцаў паставіць у Лівадыі помнік Вялікай тройцы работы адыёзнага маскоўскага скульптара Зураба Цэрэтэлі. Адна толькі думка пра тое, што ў іх незалежнай краіне можа зьявіцца помнік Сталіну, падалася ўкраінцам блюзьнерскай.

Палітычны і цывілізацыйны раскол украінскага грамадства, у прыватнасьці ў пытаньні памяці пра вайну, чарговы раз прадэманстравалі нядаўнія прэзыдэнцкія выбары. Згадаем, як, маніпулюючы настроямі русіфікаванага ўсходу, праўладныя сілы для дыскрэдытацыі выбарчага блёку «Наша Ўкраіна» вынайшлі налепку «нашызму» і зьвярнуліся да ўжываньня фашысцкай сымболікі, калі на вуліцах Данецку былі разьвешаныя плякаты з выявай Юшчанкі ў эсэсаўскай форме, а відэакліп з кадрамі Вялікай Айчыннай і песьняй Ёсіфа Кабзона прарочыў Украіне пасьля Юшчанкавай перамогі грамадзянскую вайну. У сваю чаргу, «Наша Ўкраіна» ў рэклямным роліку абяцала ачысьціць Украіну ад бандытаў, як яе ачысьцілі ад фашысцкіх зграй дзяды і бацькі.

Насуперак прагнозам, падзелу нацыі на «бандэраўцаў» і «чырвоных» не адбылося. Як мэтафарычна выказаўся Зьбігнеў Бжэзінскі, на Майдане Незалежнасьці «нацыяналізм абняўся з дэмакратыяй». Майдан аб'яднаў усіх прыхільнікаў незалежнай і дэмакратычнай Украіны. Мой сябар – гісторык зь Нямеччыны, які працаваў ува Ўкраіне ў разгар Памаранчавай рэвалюцыі й натхнёна мітынгаваў на Майдане, – на пытаньне, чаму ён тут апынуўся, адказваў напаўжартам: «Бо я ўкраінска-нямецкі буржуазны нацыяналіст!»

Новае кіраўніцтва Ўкраіны заяўляе пра сваю рашучасьць парваць з старым міталягізаваным мінулым і савецкімі традыцыямі, што тычацца ідэалягічнага расколу грамадзтва на сваіх і чужых. У інаўгурацыйнай прамове прэзыдэнт Юшчанка паставіў у адзін зьместавы кантэкст ГУЛАГ і Аўшвіц, галадамор і галакост, раўназначна асудзіўшы злачынствы як сталінскага, так і гітлераўскага рэжымаў.

Зь перамогай рэвалюцыі на парадку дня паўстала пытаньне пра нацыянальнае прымірэньне, прынамсі на гістарычным грунце. Каменем спатыкненьня тут і надалей застаецца праблема прызнаньня АУН-УПА. Зразумела, што сёньняшні склад Вярхоўнай Рады (ды яшчэ зважаючы на блізкасьць парлямэнцкіх выбараў) наўрад ці яе вырашыць. Зразумела таксама, што замірыць вэтэранаў УПА і Чырвонай арміі адны толькі прэзыдэнцкія ўказы, відавочна, ня здатныя. Нядаўняе

сьвяткаваньне 60-годзьдзя перамогі прадэманстравала, якім складаным будзе шлях грамадзтва да згоды. Што тут казаць пра неканструктыўную і правакацыйную пазыцыю камуністаў, калі нават ува ўладных вярхах няма еднасьці: варта згадаць толькі намер міністра адукацыі (сацыяліста) увесьці адзіны падручнік па гісторыі й вярнуць у школьны курс «Вялікую Айчынную вайну». Відаць, атрымаем такога сабе памаранчавага «траянскага каня» з усімі адпаведнымі наступствамі. Але ня маем іншага шляху, апроч як пераглядаць замшэлыя канцэпцыі і ствараць уласную візію ўкраінскай гісторыі. Годзе ўжо глядзець маскоўскімі вачыма, гэта, зрэшты, ня толькі палітычна немэтазгодна, але й ненавукова – і пэрыпэтыі ўкраінскага міту вайны даводзяць гэта найбольш яскрава.

З украінскай пераклаў Андрэй Скурко

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 5 (45) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/07/14**
[image]

«У канфлікце і шляхам канфлікту нараджаецца пэўная форма кансэнсусу», – цытуе ў сваім артыкуле «Прыгоды двайной прапіскі ў ансамблі дылемаў» Янаў Палескі выказваньне францускага мысьляра П’ера Бурд’ё. Гэтую, без сумневу канструктыўную зацемку варта, аднак, трохі мадыфікаваць: у канфлікце і шляхам канфлікту *можа* нарадзіцца пэўная форма кансэнсусу. Устаўка мадальнага дзеяслова тут важная, бо канфлікт можа быць таксама пусты і безвыніковы альбо нават дэструктыўны. А тое, ці паўстане якісь кансэнсус у працэсе «канфліктаваньня», залежыць перадусім ад таго, наколькі «чытэльнай» будзе пазыцыя бакоў, што канфліктуюць (=дыскутуюць).

Нішто так не перашкаджае паўставаньню кансэнсусу, як *сэмантычныя фальсыфікацыі*, якія палягаюць у падмене значэньняў ужываных у ходзе дыскусіі словаў і тэрмінаў. Гэтыя фальсыфікацыі ня мусяць чыніцца сьвядома і ня мусіць стаяць за імі злая воля (хоць магчымы і такія выпадкі). Часьцяком за «фальсыфікацыі» адказны *аб’ект*, а *не суб’ект* дыскусіі! Справа ў тым, што такія «аб’екты», як *ідэнтычнасьць, дэмакратыя, салідарнасьць, культурны дыялёг, права, дабро* заўжды явяцца як «вадкія» рэчывы: яны ўвесь час цякуць, расьцякаюцца,

пераліваюцца адно ў адно, мяшаюцца адно з адным. Магчыма, маючы наўвеце такія «аб'екты», Мішэль дэ Мантэнь сказаў калісьці: «Шукаць праўду – гэта ўсё роўна, што імкнуцца ваду зацiснуць у кулаку». Таму, імкнучыся дасягнуць «кансэнсус шляхам канфлікту», згодна з інтэнцыяй Бурд'ё і Палескага, будзем асабліва ўважлівыя на небясьпеку розных магчымых «сэмантычных фальсыфікацыяў».

* * *

Тэкст Палескага «Прыгоды...» буду інтэрпрэтаваць праз прызму дзьвюх ягоных тэзаў, выказаных у артыкуле на *belintellectuals* «Цяжар гістарычнай творчасьці»:

1. *«Лічу, што зьмены ў Беларусі могуць адбыцца, калі нам удасца цягам адносна кароткага прамежку часу сфармаваць нацыю»;*

2. *«Няма неабходнасьці вышукваць якія-кольвечы агульныя крытэры дзеля выяўленьня геному «беларускасьці» – нацыя павінна быць зроблена не на аснове чагосьці супольнага, усім уласьцівага, а наадварот – сканструявана з сукупнасьці адрозьненьняў».*

Хоць «Цяжар...» напісаны храналягічна пазьней, чым «Прыгоды...», дапускаю, што пералічаныя тэзы (1), (2) вызнаваліся Палескім таксама ў часе напісаньня першага тэксту, таму могуць быць выкарыстаны для яго інтэрпрэтацыі. А ў гэтым тэксьце маю намер узяць пад разгляд катэгорыі *strong sovereignty* (SS) і *weak sovereignty* (WS) і канструктывісцкую канцэпцыю ідэнтычнасьці, а затым запрапанаваць супастаўленьне гэтых ідэяў з маёй ідэяй «саборнасьці».

1

Палескі адзначае наяўнасьць не аднаго, а некалькіх нацыянальных праектаў і выдзяляе ў якасьці рэпрэзэнтатыўных «афіцыёзны» і альтэрнатыўны яму праект КХП БНФ. Чаму тут абрана менавіта ідэалёгія КХП БНФ, а не, скажам, праграма

Мілінкевіча ці ідэалёгія якой-кольвек партыі з дэмакратычнай кааліцыі, невядома. Рэканструяваньне «альтэрнатыўнага» праекту на базе ідэйнага букету кааліцыі было б тым больш апраўданая, што яна зьяўляецца больш рэальнай сілай на палітычнай сцэне Беларусі, чым КХП БНФ.

Узяўшы пад разгляд «афіцыёзную» (выпадак I) і правакансэрватыўную ідэалёгію (выпадак II), Палескі заўважае ў абодвух выпадках адзін і той жа «фантазм» – «Масква». У першым выпадку ён явіцца як рэпрэзэнтант радыкальнага культурна-палітычнага *недахопу*, у другім выпадку – *лішку*. Абедзьве ідэалёгіі Палескі называе «ізаляцыянісцкімі», а іх галоўным складнікам ёсьць установка на SS.

Калі абмінуць праблему рэпрэзэнтатыўнасьці ідэалёгіі хрысьціянскіх кансэрватараў, то трэба прызнаць, што оптыка Палескага мае сваю вартасьць. Катэгорыя «моцнай сувэрэннасьці» няблага апісвае як галоўны мэсыдж белдзяржыдэалёгіі, так і ідэалёгіі КХП БНФ. Аднак выясьняльная вартасьць Палескавай мадэлі ўсё ж абмежаваная. Яна ігнаруе наяўнасьць даволі глыбокай асымэтрыі паміж разуменьнем і абгрунтаваньнем SS у выпадку I і выпадку II. У выпадку белдзяржыдэалёгіі «моц» беларускага сувэрэнітэту засноўваецца ў канчатковым пляне на вернасьці Лідэру, герархізацыі грамадзтва і татальным кантролі над сацыяльна-палітычнымі, эканамічнымі і культурнымі працэсамі. Нават «фантазм Масквы» мае тут хутчэй інструмэнтальнае, чым асноватворнае значэньне. Лукашэнка не будуе моцную вэртыкаль для таго, каб зрабіць больш эфэктыўнай інтэграцыю з Расеяй, а наадварот, ажыцьцяўляе інтэграцыю з Расеяй, каб магчы будаваць моцную вэртыкаль. Чаму лягчэй ажыцьцяўляць аўтарытарнае кіраваньне пры дапамозе Расеі, а не Эўропы, думаю, нікому ня трэба тлумачыць.

У выпадку КХП БНФ «моц» беларускага сувэрэнітэту засноўваецца на гістарычнай памяці. Ідэалізаваныя вобразы ВКЛ, БНР і адраджэньня пачатку 1990-х, драматургічны спосаб апавяданьня беларускай гісторыі і візія культурна ўніфікаванай Беларусі ў будучым – вось фундамэнты беларускага сувэрэнітэту ў правакансэрватыўным выданьні. Канечне ж,

можна тут зрабіць спробу штучна «ўпадобніць» выпадак II да выпадку I, заявіўшы, што пад нацыянальнай мэтафізыкай КХП БНФ хаваецца славутая «прага ўлады» альбо што, з другога боку, афіцыёзная ідэалёгія таксама месьціць у сабе свае ідэалізаваныя вобразы мінуўшчыны (зазвычай савецкай), таксама культывуе драматургічны спосаб апавяданьня гісторыі і таксама мае сваю ўласную візію ўніфікацыі беларускага грамадзтва. Думаю ўсё ж, што такая спроба будзе занадта штучная і непераканаўчая. Тлумачэньне ўсяго пры дапамозе катэгорыі «прага ўлады» вельмі ўжо нагадвае ня дужа высакародную звычку прыхільнікаў Лукашэнкі тлумачыць усякія дзеяньні апазыцыі пры дапамозе катэгорыі «заходніх грошай».

Таксама ў аспэкце «ізаляцыянізму» КХП БНФ адрозьніваецца ад паноўнага рэжыму. У гэтым другім выпадку правільней было б гаварыць пра «сэміізаляцыянізм», бо Беларусь тут явіцца не як востраў, а хутчэй як паўвостраў, які разам з расейскім мацерыком утварае арганічнае цэлае. КХП БНФ прадугледжвае іншыя крытэры і іншыя прынцыпы адмежаваньня. Гэта праўда, што тэндэнцыя да ізаляцыі ад «Масквы» ў гэтым выпадку лёгка прасочваецца (яскравы сындром «лішку»), але яна мае ўсё ж такі ўмоўны характар. Ізаляцыя ад «Масквы» абумоўлена пэўнай інтэрпрэтацыяй расейскай рэчаіснасьці, а менавіта, прыпісваньнем Расеі «імпэрскай» сутнасьці. Ува ўяўленьні беларускіх кансэрватараў «Масква» нібы адпачатна «запраграмавана», каб паглынаць сваіх суседзяў (беларусаў, украінцаў, літоўцаў). Але станься Расея нармальнай дзяржавай, і яна перастае быць «дэманам». Праблема, аднак, у тым, што нацыянал-кансэрватары насамрэч не прадугледжваюць іншага спосабу дэімпэрыялізацыі Расеі, як толькі шляхам яе распаду.

Што тычыцца заходняй пэрспэктывы, то тут кансэрватары явяцца ня столькі як «ізалятары», колькі як памяркоўныя эўраскептыкі. Яны прызнаюць вагу эўрапейскай інтэграцыі, але заклікаюць тут да крайняй асьцярожнасьці. Лібэралізм з космапалітычным адценьнем, які так моцна прыжыўся ў заходнеэўрапейскай культуры, ня дужа даспадобы носьбітам міту пра спрадвечную веліч беларускага народу. Аднак гэта не вынікуе яўленьня Беларусі як востраваальбо нават

паўвострава, бо правыя кансэрватары моцна акцэнтуюць неабходнасьць блізка-лякальнай, усходнесярэднеэўрапейскай інтэграцыі (ідэя Балтыйска-Чарнаморскага Зьвязу).

2

Незалежна ад таго, наколькі трапным ці нятрапным ёсьць апісаньне Палескім двух альтэрнатыўных нацыянальных праектаў пры дапамозе катэгорыі SS, вартай увагі застаецца яго ідэя «слабой сувэрэннасьці» (WS), якая характарызуецца гэткім чынам: «Дзяржаўны сувэрэнітэт, у выніку, разглядаецца як адпачатна стыгматызаваны дэфіцытам, які не патрабуе дапаўненьня за кошт элемэнтаў накшталт «Масквы». На базе гэтай характарыстыкі можна меркаваць, што WS азначае паслабленьне альбо нават зьняцьце ідэалягічных і культурных «фільтраў», якія абмяжоўваюць свабодную цыркуляцыю ўнутры Беларусі розных ідэяў і дыскурсаў. У той час, як устаноўка на «моцную сувэрэннасьць» азначала б «арыштоўваньне» такой ідэі, якая пагражае «моцы» і «цэльнасьці» дзяржавы-нацыі, «слабая сувэрэннасьць» была б настроена на інтэграваньне гэтай ідэі ўва ўнівэрсум дыскурсаў, што ўжо функцыянуюць у дадзенай прасторы.

Пры гэтым трохі зьдзіўляе, аднак, наступная выснова Палескага: «Няцяжка заўважыць, што ў такой пэрспэктыве сама нацыянальная ідэя губляе сваё выключнае становішча і займае сваё месца сярод іншых ідэяў». Гэтая выснова нейк дзіўна суадносіцца з тэзай (1). Фармаваньне нацыі, на якое Палескі ўскладае надзеі, – гэта ўсё ж такі *ўсёабдымны* працэс. А цяпер: як гэты ўсёабдымны працэс будзе магчымы, калі *нацыянальная ідэя* зводзіцца да ролі *адной з*? Гэта значыць, што альбо існуюць спосабы фармаваньня нацыі *без нацыянальнай ідэі*, альбо само фармаваньне нацыі мусіць мець «прыватны» характар. Другое зусім не карэспандуе з мэсыджам тэзы (1), а першае патрабавала б дадатковых тлумачэньняў, бо ідэя фармаваньня нацыі без нацыянальнай ідэі занадта «нечаканая».

Як ні дзіўна, але ідэя WS Палескага больш кагерэнтная з Дыньковай канцэпцыяй нацыі, чым з вышэйпрыведзенай

высновай самога Палескага. Маю на ўвазе погляд Андрэя Дынька, выкладзены ім падчас он-лайн-канфэрэнцыі на «Свабодзе», што адбылася 31 студзеня гэтага году:

Што беларусы розныя – у тым ліку расейскага, украінскага, польскага, габрэйскага ці от я ведаю пару беларусаў габрэйскага паходжаньня – выдатна. Гэта сьведчыць аб прывабнасьці беларускае культуры і дынаміцы нацыятварэньня. Важна, каб яны, набываючы беларускую тоеснасьць, умацоўвалі і сваю паралельную ідэнтычнасьць, сваю польскасьць, бэрбэрскасьць і г. д. (…) Я веру, што Беларусь для нармальнага разьвіцьця патрабуе палітычнага плюралізму, грамадзянскіх свабодаў і свабоды для беларускай мовы і культуры.

У зьвязку з гэтым можна паспрабаваць выправіць выснову Палескага і заявіць, што пэрспэктыва WS азначае не дэградацыю нацыянальнай ідэі да ролі *адной з*, а нешта іншае. Азначае папросту, што разам з «сувэрэннасьцю» і сама ідэя паддаецца «паслабленьню», застаючыся пры гэтым вярхоўнай. А «паслабленьне» ў гэтым выпадку азначала б дапушчэньне яе розных вэрсіяў і афармленьняў. Мадыфікацыя нацыдэі можа адбывацца водле моўнага прызнаку (беларускамоўная, расейскамоўная, білінгвістычная вэрсіі), паводле аксіялёгіі, спосабу апавяданьня гісторыі, культурніцкіх канцэпцыяў, канцэпцыі суадносінаў дзяржавы і нацыі і інш. Вэрсіі нацыдэі могуць розьніцца таксама водле ступені акцэнтаваньня паасобных яе аспэктаў: для адных сутнасны можа быць моўны аспэкт, для іншых – гістарычны ці аксіялягічны і г. д.

«Паслабленая нацыянальная ідэя» выконвала б, такім чынам, такую ж функцыю, якую ў многіх сучасных эпістэмалёгіях выконвае «праўда». Усе пагаджаюцца, што *ня ведаюць праўды*, але адначасна прызнаюць вартасьць праўды як *рэгулятарнай ідэі*. Ідэя аб'ектыўнае праўды накіроўвае інтэлектуальныя пошукі і дазваляе стасаваць працэдуры «праўдаўпадабненьня». Аналягічную функцыю (функцыю рэгулятарнай ідэі) можа выконваць і нацыянальная ідэя.

Аднак, якая-кольвек спроба інтранізацыі нацыянальнай ідэі,

хай сабе і ў паслабленай вэрсіі, выклікае даволі энэргічны пратэст з боку прыхільнікаў лібэральнага космапалітызму (хай будзе дазволена гэтак умоўна акрэсьліць пазыцыю інтэлектуалаў, якія прэзэнтуюць Ru-супольнасьць), аналягічна як «праўда» выклікае пратэст з боку постмадэрністаў.

Мы змагаемся зь белым тэрорам праўды (...), *бо насамрэч жа ня ведаем, што такое праўда і ніколі ведаць ня будзем. Ведаем толькі тое, што гэта зброя параноі ўлады, ілюзія таталізаванай цэльнасьці ў прасторы словаў, вяртаньне тэрору,* – пісаў у векапомным «Condition postmoderne» Ж.-Ф. Ліятар.

Абодва гэтыя пратэсты маюць такую ж самую прыроду: бунт супраць «праўды» постмадэрністаў і бунт супраць «нацыянальнай ідэі» як нацыязлучальнага фактару космалібэралаў мае хутчэй эмацыйны характар, чым рацыянальны. Тым часам «тэрор праўды» ня больш пагрозьлівы, чым «тэрор рэлятывізму», а «тэрор нацыянальнай ідэі» ня больш страшны, чым «тэрор космапалітызму».

Эмацыйны крытыцызм постмадэрнізму, магчыма, меў сваю вартасьць, але яго патэнцыял, здаецца, ужо вычарпаўся. Некаторыя кажуць пра надыход пост-постмадэрнізму, хоць такое акрэсьленьне занадта няўцямнае, каб магчы ім апэратыўна карыстацца. Магчыма, актуальную інтэлектуальную атмасфэру трэба назваць «сынтэтычным мадэрнізмам». Гэта атмасфэра «супакаеньня», якая дазваляе праяўляцца як энэргіі «старога» мадэрнізму (Вялікага Авангарду і вялікага рацыяналістычнага праекту першай пал. XX ст.), так і энэргіі эры контрамастацтва і контрафілязофіі другой пал. XX ст. Такім чынам, інтэлектуальны *condition* пасьля-постмадэрну (што мы назвалі *сынтэтычным мадэрнізмам*) пазначаны ўзаемапраніканьнем дзьвюх свабодаў: свабоды будаваньня *рацыянальнага* сьвету (дамэну «старога» мадэрнізму) і свабоды *дэканструкцыі* гэтае будовы (дамэну постмадэрнізму). У эры «сынтэтычнага мадэрнізму» няма ўжо фанатычнай веры ў Розум і Навуку, але няма таксама – з другога боку – той жарсьці, зь якой некаторыя выкрывалі «таталітарную сутнасьць» праўды і ўстаноўленага на праўду

розуму. Сёньняшнія экс-постмадэрністы практыкуюць «дэканструкцыю» хутчэй як *адзін з* магчымых мэтадаў гермэнэўтыкі, а не – як у Дэрыды – як «усё і нішто» ўсяе філязофіі.

Што значыць, што патэнцыял постмадэрнізму «вычарпаўся»? Гэта ня значыць, што трэба цяпер цалкам адкінуць усе вакабулярыі і інтэрпрэтацыйныя звароты, выпрацаваныя мысьлярамі генэрацыі постмадэрністаў, а значыць толькі тое, што будаваньне грамадзка-палітычных канцэпцыяў *выключна* з постмадэрнісцкай «сыравіны» (без папярэдняй апрацоўкі) зьяўляецца малапрадуктыўным заняткам. Філязафічная постмадэрна 1980-х гг. – гэта эра сэмантычных гульняў і... сэмантычных фальсыфікацыяў! Варта зазначыць, што ўсякія гульні, а нават фальсыфікацыі *могуць* мець эўрыстычную вартасьць, г. зн. могуць стымуляваць да новых адкрыццяў і новых, арыгінальных спосабаў сьветаапісаньня, але дрэнна, калі хтосьці пачынае ўспрымаць іх як адпаведны (часам як адзіны!) кантэкст інтэрпрэтацыі грамадзка-палітычнай рэчаіснасьці.

3

Ігнаруючы небясьпеку пасьпешлівай генэралізацыі, зацемім, што прадстаўнікі Ru-супольнасьці ў сваёй практыцы дэканструяваньня ды дэградаваньня нацыянальнай ідэі папросту бескрытычна пераймаюць практыку колішніх постмадэрністаў у дэканструяваньні праўды. Гэтак, як постмадэрністы стасавалі пры гэтым міт пра «таталітарны характар» «лёгацэнтрычнага» (моцнага) розуму, так беларускія лібэральныя космапаліты дэканструююць нацыянальную ідэю пры дапамозе раўнаньня: «нацыянальнае = таталітарнае» альбо (каб было больш арыгінальна) «нацыянальнае = паталягічнае». Як тыя, так і гэтыя робяць гэта бязладна, таму нялёгка прасачыць іх аргумэнтацыйную лінію, а калі сустракаюцца са спробай праясьніць і літаралізаваць стасаваныя імі тэрміны і паняцьці, закідаюць крытыкам, што гэтыя апошнія «надалей застаюцца вязьнямі лёгацэнтрычнага мысьленьня» (так казалі постмадэрністы 1980-х гг.) альбо што

«недаацэньваюць ролю мэтафараў у сучаснай гуманітарнай ведзе» (так кажуць сёньняшнія лібэральныя космапаліты ў Беларусі).

Калі ўжо можна характарызаваць тыпы мысьленьня пры дапамозе «інтэлектуальнага гадзіньніка», то інтэлектуалаў – прадстаўнікоў Ru-супольнасьці (хоць, магчыма, ня ўсіх), трэба аднесьці да 1980-х гг. эўрапейскае думкі. Жангляваньне паняткамі, узятымі з постмадэрнісцкага слоўніка, магчыма, дае ім суб'ектыўнае адчуваньне «прагрэсіўнасьці», большай інтэлектуальнай прасунутасьці ў стасунку да «нацыябудаўнікоў», якія чамусьці асацыююцца імі з рамантызмам XIX ст. Тым часам самі лібэральныя космапаліты не заўважаюць, што апэруюць занадта спрошчанай мадэллю кантэкстуалізацыі нацыянальнай ідэі. Ім здаецца, што калі для ідэі *I* знойдзена кантэкстуалізацыя *K*, то гэта раз і назаўсёды раскрывае «сутнасьць» гэтай ідэі. Так ёсьць і ў выпадку нацыянальнай ідэі: рамантызм XIX ст. утварае для яе адзіную магчымую кантэкстуалізацыю (так найчасьцей вынікае з разважаньняў расейскіх інтэлектуалаў). Часам, спрабуючы «даакрэсьліць» сутнасьць нацыянальнага пачуцьця, яны згадваюць пра Сараева ці польска-ўкраінскія войны ў 1940-х гг., не задаючыся пытаньнем, *якога тыпу* гэта былі нацыяналізмы.

Але калі прымем больш крытычную і лепш распрацаваную мадэль кантэкстуалізацыі, згодна зь якой: $I \rightarrow K\text{-}1 \vee K\text{-}2 \vee K\text{-}3 \ldots \vee K\text{-}n$ (паасобная ідэя можа мець *некалькі* кантэкстуалізацыяў), то адкрыюцца перад намі дадатковыя магчымасьці: нацыянальная ідэя можа фармавацца ня толькі на подзе рамантызму XIX ст., але гэтаксама добра на подзе постмадэрнізму, як і рамантызму або нават сярэднявечнага манархізму. Кантэкстуалізацыяй нацыянальнай ідэі можа быць і кансэрватызм, і лібэралізм, можа быць камунізм і фашызм, можа быць – урэшце – постмадэрнізм і «сынтэтычны мадэрнізм». Магчыма, Сьвятлана Алексіевіч і мае рацыю, кажучы, што «мы – запозьненая нацыя», але тут трэба адзначыць, што гэта запозьненасьць спрычынена не прывязанасьцю да нацыянальнай ідэі і не культывацыяй нацыянальнага дыскурсу, а хутчэй *нізкім узроўнем* гэтага дыскурсу, аналягічна як нельга ўскладаць адказнасьць за

запозьненасьць на наяўнасьць лібэральна-космапалітычнага дыскурсу, а, магчыма, на яго *нізкі ўзровень*.

Заганай беларускіх космапалітаў ёсьць ня іхны космапалітызм ці расейскамоўе (быць космапалітамі і гаварыць па-расейску застаецца іх неад'емным правам), а тое, што яны занадта хутка паверылі ў аб'ектыўную вышэйшасьць іхнай інтэлектуальнай опцыі ў стасунку да опцыі нацыянальных праектантаў. Расейскамоўныя інтэлектуалы пачалі выкрываць (трапна ці нятрапна) эсэнцыялізм ды халізм у беларускамоўных, самі застаючыся пры гэтым эсэнцыялістамі, халістамі і гістарыцыстамі ў мэтадалягічным пляне. У іх разважаньнях адчуваецца «сырасьць» постмадэрнізму 1980-х гг., які ў многім ужо дэзактуалізаваўся. Іранічны скепсіс, які лёгка заўважаецца ў словазлучэньнях тыпу *«паталёгія нацыянальнага пачуцьця»*, альбо тэза-загадка тыпу *«нацыя (...) мае быць сканструявана з адрозьненьняў»* сьведчыаажна жывуць духам неперапрацаванага, «сырога» постмадэрнізму, кормяцца счарсьцьвелым і сьцьвілым хлебам эўрапейскай філязофіі 1980-х гг. і гэтай ня дужа якаснай ежай хочуць карміць беларускія эліты.

Аднак, гэтаксама, як філязафічны постмадэрнізм 1980-х гг. можа стацца добрым матэрыялам для перапрацоўкі, так і разважаньні яго рэпрэзэнтантаў у сёньняшняй Беларусі могуць стацца добрым філязафічным топасам для беларускай філязофіі. Таму прыгледзьмася пільней да характарыстыкі «трэцяе сілы» Палескага.

4

Палескі заяўляе, што «трэцяя сіла», апазыцыйная як да дыскурсу беларускамоўных інтэлектулаў, так і ў стасунку да дзяржыдэалёгіі «ў большай ступені будзе апэляваць да «салідарнасьці» – у супрацьвагу адзінству – у чым большай ступені яе прадстаўнікі прытрымліваюцца гэтак званай *канструктывісцкай* мадэлі ідэнтычнасьці альбо наадварот – наагул ніяк не турбуюцца гэтай ідэнтычнасьцю». Далей Палескі прапануе рэвізію радыкальнай прапановы Ролза, зьместам якой ёсьць адмова ад якіх-кольвечы ўяўленьняў пра асобу і,

грунтуючыся на разважаньннях Рычарда Рорці, заяўляе:

Асоба (personhood) – гэта канглямэрат перакананьняў і жаданьняў (некаторыя зь іх канструююцца грамадзтвам, паколькі асоба не ізаляваная ад яго), але і гэта прынцыповы момант – безь якога-любя пакладзенага ў яе аснову ядра (няма ніякага субстрату па той бок атрыбутаў), за кошт якога можна было б абгрунтаваць агульную сыстэму вераваньняў і перакананьняў. Іншымі словамі, не існуе аніякай (калектыўнай) ідэнтычнасьці.

Такім чынам, «салідарнасьць» «трэцяй сілы» грунтуецца на перакананьні, што *не існуе аніякай (калектыўнай) ідэнтычнасьці*. Такая пастаноўка справы здаецца быць сугучная з маёй прапановай, выкладзенай у артыкуле «Ад ідэнтычнасьці да саборнасьці». Калі прызнаем у якасьці вярхоўнай каштоўнасьць *свабоды*, то мусім усур'ёз перагледзець розныя магчымыя дыскурсы ідэнтычнасьці. Устаноўка на тоеснасьць (асабліва на «моцную тоеснасьць») можа стацца блякадай у пабудове адкрытага і салідарнага грамадзтва. Бо салідарнасьць – гэта ня што іншае, як здольнасьць увесь час «пашыраць» межы ўзаемадапамогі і ўзаемападтрымкі. А дыскурс тоеснасьці зазвычай зьмяшчае ў сабе стратэгіі выключэньня па-за абсяг нашай салідарнасьці ўсіх тых, хто ня ўпісваецца ў зададзеную намі тоеснасьць.

Падаецца, што ў гэтым пункце я і Палескі выразілі – хоць па-рознаму – адну і тую ж ідэю. Але ў ходзе разьвіваньня гэтай ідэі пачынаем ужо рэальна разыходзіцца. Калі вышэйсказанае Палескім зынтэрпрэтуем пры дапамозе тэзы (2) («нацыя павінна быць зроблена не на аснове чагосьці супольнага, усім уласьцівага, а наадварот – сканструявана з сукупнасьці адрозьненьняў»), то заўважым праблематычнасьць Палескавага канструктывізму. Справа ў тым, што «адрозьненьне», гэтаксама як і «падобнасьць», ёсьць рэляцыйным паняткам. «Адрозьненьні» не існуюць per se, ёсьць толькі адрозьненьні *з увагі на нешта*. Нацыю немагчыма *сканструяваць з* адрозьненьняў, гэтаксама як немагчыма ўстаць і зьвярнуцца да групы людзей: таварышы, давайце будзем адрозьнівацца! Катэгорыю «адрозьненьняў» Палескі трактуе амаль гэтаксама,

як артадаксальныя постмадэрністы трактавалі катэгорыю «рознасьці» (*différance*), г. зн. як мэтафізычны прынцып. Праблема, аднак, у тым, што субстантывізаваныя «рознасьць» і «адрозьненьні» нічога, апрача ўражаньня загадкавасьці, не даюць. «Адрозьненьні», як і «рознасьць» – безьзьмястоўныя самі па сабе паняткі, яны набываюць сэнс толькі ў адпаведным кантэксьце: *з увагі на што* розныя, *у якім аспэкце* адрозьніваемся? Ну, а нават калі хтось і складзе каталёг аспэктаў, у якіх мы адрозьніваемся (або: *павінны* адрозьнівацца), то тады паўстане пытаньне: а чаму дзеля пабудовы нацыі мы павінны адрозьнівацца менавіта ў аспэкце *X, Y, Z*, а не, скажам, *L, M, N*? Абгрунтоўваньне гэтага патрабавала б альбо спасылкі на *ўжо* дасягнуты кансэнсус, альбо прынамсі пастуляваньне такога кансэнсусу. А ў абодвух выпадках гэта азначала б увядзеньне катэгорыі *агульнасьці* (нацыянальнай ідэі?), якое космалібэралы так старанна пазьбягаюць.

5

Містыка рознасьці наўрад ці ўратуе сытуацыю. У такім выпадку прапаную яшчэ раз прыгледзецца да ідэі *саборнасьці*, якая зьявілася ў мяне ў выніку дэканструкцыі тоеснасьці. Дзеля праясьненьня гэтай ідэі выкарыстаю два дадатковыя гермэнэўтычныя кантэксты – багаслоўскі і эпістэмалягічны. У першым выпадку саборнасьць значыць няспыннае набліжэньне да Бога. Але – «Бога ніхто ніколі ня бачыў», і таму кожны можа мець *сваё ўласнае* ўяўленьне пра Бога. «Сваё ўласнае ўяўленьне» можа стацца разьядноўвальным фактарам і вынікаваць бясконцыя расколы і множаньне сэктаў. Можна, аднак, правесьці апэрацыю *рэлятывізацыі* свайго ўласнага ўяўленьня, г. зн. мэнтальна аддзяліць сваё *ўяўленьне пра Бога* ад *Бога-ў-сабе*. Затым можна прызнаць, што кожнае з нашых уяўленьняў пра Бога па-свойму набліжае нас да Яго і тым самым «зьбірае» нас, «набліжае» адзін да аднаго.

Падобны «мэханізм» задзейнічаны і ў выпадку сучаснай эпістэмалёгіі, калі яна пастулюе «праўду» як рэгулятарную ідэю (а не як канчатковую і поўную веду), аб чым была гаворка

вышэй. Такі ж самы «мэханізм» можна запусьціць і ў выпадку «нацыятварэньня». Можам зыходзіць з таго, што *ніхто з нас «ня бачыў» нацыянальнай ідэі.* Але яе існаваньне як рэгулятарнай ідэі мае нацыязлучальнае значэньне. Усякія спробы артыкуляваць яе («наблізіцца» да гэтай ідэі) будуць нас набліжаць адзін да аднаго. Гэтае пэрманэнтнае ўзаемнабліжэньне дзякуючы сумеснаму руху ў кірунку трансцэндэнтнай нацыянальнай ідэі можа адбывацца таксама шляхам «канфлікту», пра які гаворыць Палескі, але не абавязкова. «Канфлікт», гэтаксама як і «рознасьць», трэба вызваліць ад згаданых сэмантычных фальсыфікацыяў і прызнаць, што гэта могуць быць усяго толькі *моманты*, прычым драматычныя моманты, зь якімі варта пагадзіцца ў імя прынцыпу «бо такое жыцьцё», а не ператвараць яго ў магічны сродак будаваньня кансэнсусу. Для таго, каб канфлікт закончыўся якім-небудзь кансэнсусам, павінен суправаджацца моцнай воляй яго пераадоленьня. А такое пераадоленьне будзе, хутчэй за ўсё, немагчымым, калі ня будзе трансцэндэнтнай ідэі, якая надасьць *сэнс* нашаму *кансэнсусу*.

Існаваньне нацыянальнай ідэі, «якой ніхто ніколі ня бачыў», зробіць магчымым паўставаньне «прамежкавых», часовых кансэнсусаў, такіх, якія будуць рэлятывізаваны да пэўнага гістарычнага моманту. Сёньня можа паўстаць вэрсія *Х* кансэнсусу наконт нацыянальнай ідэі, заўтра – *вэрсія У*. Але сьвядомасьць таго, што ніякі кансэнсус ня можа быць дагматызаваны і абсалютызаваны, зробіць таксама прастору для «дыссэнсу»: крытычнай ацэнкі гэтага кансэнсусу і магчымасьці высоўваньня якойсьці новай, магчыма, лепшай яго вэрсіі.

Сёньня паўставаньне кансэнсусу наконт нацыянальнай ідэі ў значнай ступені прадыктавана *воляй свабоды ад аўтарытарызму*, але ў нейкі бліжэй невядомы час, калі наступіць дэмакратызацыя, сёньняшні кансэнсус можа дэзактуалізавацца, але ў выніку новых спробаў новага «набліжэньня» да нацыянальнай ідэі паўстане якісь новы кансэнсус, які будзе прадыктаваны, да прыкладу, ідэяй беларусізацыі, альбо ідэяй глябалізацыі, альбо нейкім спалучэньнем аднаго і другога ці нечым іншым. «Нацыянальная

ідэя» – гэта свайго роду пункт Щ, які «прыцягвае» і «кансалідуе», не зьнішчаючы адрозьненьняў.

Прапанова «саборнай нацыянальнай ідэі» прадугледжвае такасама – як бы жудасна гэта ні гучала – «мэханізмы дыскрымінацыі». Але гэта зусім не звычайны тып «дыскрымінацыі». Мы прывыклі да таго, што *моцны* дыскрымінуе *слабога*, а той, хто мае ўладу, дыскрымінуе *таго, хто яе ня мае* і г. д. Вось жа «саборная нацыянальная ідэя» дапускае дыскрымінацыю толькі такіх вэрсіяў нацыянальнай ідэі, якія парушаюць «прынцып трансцэндэнцыі». Прынцып трансцэндэнцыі парушае сёньняшняя дзяржаўная ідэалёгія, якая ня толькі абсалютызуе саму сябе, але і блякуе эмансыпацыю якіх-кольвечы альтэрнатыўных вэрсіяў нацыянальнай ідэі.

Калі гаворым пра «дыскрымінацыю» ў такім даволі нетыповым кантэксьце, то мусім лепш растлумачыць яго ідэю. Вядома ж, справа тут не ідзецца пра нейкія сілавыя мэханізмы маргіналізацыі занадта «прэтэнцыёзнага» дыскурсу, але пра мэтадычную і салідарную дэмаскацыю і кантэстацыю такога дыскурсу. Заганнасьць афіцыйнага дыскурсу палягае не ў яго зьмесьце (бо ў аспэкце зьместу ён мае права на існаваньне ў беларускай прасторы як *адзін з магчымых* выражальнікаў нацыянальнай ідэі), а ў парушэньні прынцыпу трансцэндэнцыі нацыянальнай ідэі, яе прыватызацыі і самаабсалютызацыі.

Такая ідэя «дыскрымінацыі» можа падацца трохі наіўнай ці занадта ідэалістычнай. Але насамрэч яна мае практычнае значэньне. Справа ў тым, што, *па-першае*, абаронцы «абсалютнага дыскурсу», на самай справе, ня ўсёмагутныя. Нарастаньне крытыцызму да ўладнага дыскурсу прадказвае яго капітуляцыю ў далёкай ці блізкай пэрспэктыве. Так было ў 1980-х у выпадку савецка-камуністычнай ідэалёгіі.

Па-другое, ідэя «дыскрымінацыі» мае на мэце паказаць, што ў дачыненьні да «абсалютнага дыскурсу» інакш дзейнічае прынцып талеранцыі. Вельмі часта ворагі прынцыпаў дэмакратыі і плюралізму любяць спасылацца на гэтыя прынцыпы, калі хтосьці іх востра скрытыкуе ці здэмаскуе. *Чаму*

я не магу быць фашыстам, калі ў нас – плюралізм і кожны мае права вызнаваць свае погляды? Мы нярэдка паддаёмся такой аргумэнтацыі, але гэта бярэцца з пэўнай фундамэнтальнай памылкі, з чарговай «сэмантычнай фальсыфікацыі». Справа ў тым, што «дэмакратыя», «плюралізм», «талеранцыя» ня маюць самастойнага існаваньня, іхнае быцьцё мае *вытворны* характар, яно грунтуецца на сьвядомых актах паасобных людзей. Такім чынам, *абсяг дэмакратыі ці талеранцыі заканчваецца там, дзе заканчваецца сьвядомая падтрымка гэтых ідэяў*. Таму прынцып дэмакратычнага плюралізму не распасьціраецца на фашыстаў, не павінен таксама распасьціравацца на камуністаў сталінскага гарту і не павінен распасьціравацца на апалягетаў таталітарнага дыскурсу (якой ёсьць дыскурс беларускай прапаганды).

* * *

«Прапіска» можа быць двайной, трайной ці нават чацьвярной. Гэта не перашкодзіць канструяваньню нацыі і будаваньню дому, пра што кажа Палескі. Перашкодзіць гэтаму можа толькі «двайная мараль», няшчырасьць да самога сябе і да іншых, непразрыстасьць у сваіх пазыцыях і непасьлядоўнасьць у паводзінах. Зьняцьце такіх перашкодаў і ёсьць першай і галоўнай умовай нацыябудаваньня.

Другая ўмова – паразумецца наконт статусу «супольнага». Гаворка не ідзецца пра супольны зьмест нацыянальнага дыскурсу (бо гэта немагчыма і непатрэбна), а пра саму ідэю супольнасьці. Думаю, што расейскамоўныя (якія выяўляюць часьцей лібэральна-космапалітычную арыентацыю) мусяць *зьняць табу на агульнасьць*, зразумець, што ня кожны, хто прадугледжвае якуюсь вэрсію агульнага дабра, прапагуе несправядлівую дыскрымінацыю ці мае нячыстыя намеры здабыць выключную дамінацыю ў грамадзтве. Але беларускамоўныя (часьцяком кансэрватыўна-нацыянальнай або лібэральна-нацыянальнай арыентацыі) мусяць рэлятывізаваць свае вэрсіі агульнага дабра і прызнаць прынцып трансцэндэнцыі нацыянальнай ідэі.

Трэцяя ўмова – прызнаць дынаміку і адкрытасьць

нацыянальнага праекту. Ужо сёньня можам назіраць некаторыя зьявы, якія могуць мадыфікаваць нашы нацыянальныя праекты. Напрыклад, у выніку падзеяў на Кастрычніцкай плошчы з вуснаў расейскамоўных стала чуваць: *«Эххх, Россия, теперь ты наш враг, однозначно»*. З другога боку, многія беларускамоўныя маглі стацца сьведкамі таго, як некаторыя расейцы салідарна змагаліся за свабоду разам зь імі. Нацыянальны дыскурс павінен «увабіраць» у сябе тое *поνит*, якім будзе ўвесь час пазначана беларуская рэчаіснасьць. Ён павінен таксама валодаць добра распрацаванымі інтэрпрэтацыйнымі тропамі, дзякуючы якім, напрыклад, аўтарка цытаванага выказваньня зможа зынтэрпрэтаваць свае эмоцыі, якія выявіліся ў звароце *«Расея – вораг»*. Калі яна натрапіць на такі нацыянальны дыскурс, які будзе зьмяшчаць інтэрпрэтацыйны троп кшталту: *Расея – наш адвечны вораг*, то яе «нацыянальны характар» пачне фармавацца на базе русафобіі, а гэта хутчэй толькі перашкодзіць нацыябудаваньню (то бок, паўставаньню кансэнсусу). Найлепей, калі нацыянальны дыскурс дапаможа ёй адрозьніць Расею ад актуальнай улады ў Расеі і зразумець, што гэтая ўлада, а не Расея, як такая, нясе адказнасьць за падтрымку брутальнай несправядлівасьці ў Беларусі.

* * *

Застацца самім сабой (г. зн. *тоесным*) ёсьць вялікай вартасьцю. Але застацца самім сабой можна толькі ў атмасфэры свабоды. Існуе асаблівы від несвабоды, які палягае ў тым, што чалавек зьяўляецца *зьняволены жаданьнем абмяжоўваць іншых*. Каб акцэптаваць існаваньне побач розных поглядаў і візіяў грамадзкага ладу, патрэбна ўнутраная свабода, вызваленьне ад заганнага жаданьня навязваць іншым сваю волю. А гэтую праблему – унутранай свабоды – ня вырашаць ніякія дыскурсы. Кожны сам для сябе павінен яе вырашыць.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 5 (45) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (45) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]2006

[image]

літаратура

[image] [image] [image]

Рышард Капусьцінскі Імпэратар

РЫШАРД КАПУСЬЦІНСКІ жывая легенда польскай журналістыкі, сёлетні намінант на Нобэлеўскую прэмію па літаратуры, адзін з самых пасьпяховых польскіх рэпартэраў, чалавек, адораны ўнікальным пачуцьцем інфармацыі, клімату і падзеяў. Наш суродзіч – нарадзіўся 4 сакавіка 1932 году ў Пінску. Скончыў

Забудзь мяне,
Бо згасла ўсё.

Цыганскае танга

Ой, нэгусаў нэгус,
Ратуй Абісынію,
Бо пад пагрозай
Паўднёвыя лініі,
А на поўнач ад Макале,
Ой, зусім нядобра стала.
Нэгус, нэгус,
Дай мне кулі, порах дай.

Даваенная варшаўская песьня

Назіраючы паводзіны паасобных курэй у куратніку, можна пераканацца, што ніжэйшых рангам курэй дзяўбуць і што яны саступаюць месца вышэйшым рангам. У ідэальным выпадку маем адналінейны герархічны шэраг, на пачатку якога стаіць звышкурыца, якая дзяўбе ўсіх астатніх, тыя ж куры, якія стаяць усярэдзіне шэрагу, дзяўбуць ніжэйшых рангам, але паважаюць вышэйшых. У канцы шэрагу знаходзіцца курыца-папялушка,

якая мусіць саступаць усім астатнім.

Адольф Рэманэ.
«Адмысловыя шляхі хрыбетных»

Чалавек прызвычайваецца да ўсяго, калі толькі дасягне належнай ступені пакоры.

К. Г. Юнг

Дэльфін, калі хоча заснуць, плавае па паверхні вады, задрамаўшы, паволі апускаецца на марское дно, там, абуджаны ўдарам цела аб дно, зноў выплывае на паверхню, выплыўшы, засынае, а зноў апусьціўшыся на дно, у той жа спосаб прачынаецца і так у руху адпачывае.

Бэнэдыкт Хмялёўскі. «Новыя Атэны, альбо Поўная акадэмія ўсякай навукі»

Вечарамі я слухаў тых, хто ведаў двор імпэратара. Калісьці яны былі людзьмі палацу альбо мелі права ўваходу туды. Цяпер засталося няшмат. Частка загінула, расстраляная ці зьнішчаная ў аддзеламі. Іншыя ўцяклі за мяжу альбо сядзяць у вязьніцах, якія знаходзіцца ў лёхах таго ж самага палацу: з салёнаў іх ператварылі ў сутарэньні. Былі таксама й тыя, што схаваліся ў гарадзе і жывуць у кляштарах, пераапранутыя ў манахаў. Кожны з іх стараецца выжыць па-свойму, па меры даступных яму магчымасьцяў. Толькі жменька засталася ў Адыс-Абэбе, дзе адна высьвятляецца – найлягчэй падмануць чуйнасьць улады.

Я наведваў іх, калі было ўжо цёмна. Даводзілася мяняць машыны і вопратку. Этыёпы – вельмі недаверлівыя людзі, і яны не хацелі верыць у шчырасьць маіх намераў: я хацеў знайсьці сьвет, які быў зьменены аўтаматамі Чацьвертай дывізіі. Гэтыя аўтаматы ўсталяваныя на амэрыканскіх джыпах, побач зь сядзеньнем кіроўцы. Іх абслугоўваюць стралкі, прафэсія якіх – забіваць. Ззаду сядзіць салдат, які прымае праз радыёстанцыю загады. Джып адкрыты, і таму кіроўцу, стралка і радыста бароняць ад пылу цёмныя матацыклетныя акуляры, якія зьверху прыкрывае косы зялёны брызэнтавы дах. Калі ты ідзеш, іх хуткае дваццаціхвілінае *старонкі* *мяне* *на* *мосце,* *сядзяць.* *Гэтыя* *тройкі* *ў* *джыпах* *так*

гістарычны факультэт Варшаўскага ўнівэрсытэту. Яго апошняя кніжка мае назву «Аўтапартрэт рэпартэра» (2003).

Раман «Імпэратар», які гэтта прапануецца ўвазе чытачоў «ARCHE», быў напісаны ў 1978. Гэты твор, які найбольш поўна адлюстраваў Капусьцінскага як майстра, быў перакладзены на 30 моваў, у тым ліку японскую і партугальскую. Пераклад друкуецца з ласкавай згоды аўтара.

Ściągnięto z http://rcin.org.pl

звыклыя да сьмерці, што іх кіроўцы водзяць машыны, як самагубцы, на найвышэйшай хуткасьці ўваходзяць у крутыя павароты, езьдзяць вуліцамі супраць руху, усё разьлятаецца ў бакі, калі набліжаецца такая ракета. Лепей не трапляцца ім у поле абстрэлу. З радыёстанцыі, якую трымае на каленях салдат ззаду, праз трэск і піск гучаць нэрвовыя галасы і крыкі. Невядома, ці ня ёсьць якісьці ўрывак з гэтага хрыплага булькатаньня загадам адкрыць агонь. Лепей зьнікнуць. Лепей збочыць у завулак і перачакаць.

Цяпер я ўнураўся ў зьвілістыя і поўныя бруду завулкі, заходзячы ў дамы, якія звонку рабілі ўражаньне кінутых, здавалася, што ніхто ў іх не жыве. Я баяўся: калі за гэтымі дамамі назіралі, мяне маглі забраць разам зь іх жыхарамі. Гэта зусім магчыма, бо яны часта прачэсваюць якісь завулак ці нават цэлыя кварталы гораду ў пошуках зброі, падрыўных улётак і людзей старога рэжыму. Усе дамы цяпер пільнуюць адно аднаго, падглядаюць, падслухоўваюць. Гэта вайна дамоў, так яна выглядае. Я сядаю пры акне, а мне адразу: калі ласка, зьмяніце месца, вас відаць з вуліцы, так у вас лёгка трапіць. Праяжджае машына, спыняецца, чуваць стрэлы. Хто гэта быў – тыя ці гэныя? А хто цяпер тыя, а хто ня-тыя, іншыя, якія супраць тых, бо за гэных? Машына ад'яжджае, брэшуць сабакі, усю ноч у Адыс-Абэбе брэшуць сабакі, гэта сабачае места, поўнае пародных і зьдзічэлых, скаўтунелых, зьедзеных паразытамі і малярыяй сабак.

Без патрэбы паўтараюць, каб я зважаў: ніякіх адрасоў ці прозьвішчаў, не апісваць нават твараў, ані што высокі, што нізкі, што худы, што лоб гэткі, што рукі ў яго такія, што позірк тое, што ногі гэтае, што калені, ужо няма перад кім на калені.

Ф.:

Гэта быў маленькі сабачка японскай пароды. Яго звалі Лулу. Ён меў права спаць у імпэратарскай пасьцелі. Падчас розных цырымоніяў ён уцякаў з каленяў імпэратара і сікаў саноўнікам на боты. Спадарам саноўнікам нельга было ані здрыгануцца, ані зрабіць ніякага жэсту, калі яны адчувалі, што ў боце мокра. Маёй функцыяй было хадзіць сярод шэрагаў саноўнікаў і

выціраць сікуны з ботаў. Для гэтага служыла анучына з атлясу. Гэта было маім заняткам дзесяць гадоў.

Л. К.:

Імпэратар спаў у ложку са сьветлага арэху, вельмі вялікім. Ён быў такі дробны і кволы, што яго ледзь было відаць, ён губляўся ў пасьцелі. Пад старасьць ён стаў яшчэ меншы, важыў пяцьдзясят кіляў. Ён усё менш еў і ніколі ня піў алькаголю. У яго не згіналіся калені, і калі ён быў адзін, ён валачыў ногі і перавальваўся з боку на бок, нібы ідучы на хадулях, але калі ён ведаў, што хтосьці на яго глядзіць, ён найвялікшымі высілкамі змушаў цягліцы да пэўнай элястычнасьці, каб ягоны рух быў годным і каб імпэратарская постаць, наколькі магчыма, трымалася беззаганна вэртыкальна. Кожны крок быў змаганьнем паміж валачэньнем і годнасьцю, паміж нахілам і вэртыкальлю. Дастойны гаспадар ніколі не забываўся пра свой старэчы дэфэкт, якога ён не хацеў паказваць, каб не аслабіць прэстыжу і павагі да Караля Каралёў. Але мы, служба спальні, маглі за ім падглядаць і ведалі, колькі высілкаў каштуюць яму гэтыя стараньні. Ён меў звычку спаць мала і рана ўставаць, калі на дварэ яшчэ было цёмна. Увогуле, сон ён уважаў за крайнасьць, якая толькі дарма забірала ў яго час, які ён ахвотней аддаў бы на выкананьне кіроўных і прадстаўнічых абавязкаў. Сон быў прыватным, камэрным умяшаньнем у жыцьцё, якое мела цячы сярод дэкарацыяў і агнёў. Таму ён прачынаўся як бы незадаволены тым, што спаў, раздражнёны самім фактам сну, і толькі далейшыя справы дня вярталі яму ўнутраную раўнавагу. Дадам, аднак, што імпэратар ніколі не паказваў ані найменшага раздражненьня, гневу, злосьці ці фрустрацыі. Магло б падацца, што ён ніколі не зазнае такіх станаў, што яго нэрвы халодныя і мёртвыя, як сталь, альбо што іх няма ўвогуле. Гэта была прыроджаная рыса, якую гаспадар наш здолеў разьвіць і ўдасканаліць згодна з прынцыпам, што ў палітыцы нэрвы – гэта прыкмета слабасьці, якая заахвочвае супраціўнікаў і дае падуладным сьмеласьць дасьціпнічаць па закутках. А гаспадар ведаў, што досьціп – гэта небясьпечная форма апазыцыі, і таму трымаў сваю псыхіку ў беззаганнай норме. Ён уставаў а чацьвертай, а пятай, а калі выяжджаў за

мяжу – нават а трэцяй ночы. Пазьней, калі становішча ў краіне рабілася ўсё горшым, ён усё часьцей выяжджаў, увесь палац займаўся толькі падрыхтоўкай імпэратара да новых падарожжаў. Абудзіўшыся, ён націскаў званок пры начным століку – гэтага гуку чакала ўжо чуйная служба. У палацы запальвалі сьвятло. Гэта быў сыгнал для імпэрыі, што найдастойнейшы гаспадар распачаў новы дзень.

I. M.:

Імпэратар распачынаў дзень праслухоўваньнем даносаў. Ноч – небясьпечны час змоваў, і Хайле Сэлас'е ведаў, што тое, што адбываецца ўначы, важнейшае за тое, што адбываецца ўдзень, удзень усе былі ў яго на воку, а ўначы гэта было немагчыма. З гэтай прычыны ён надаваў ранішнім даносам вялікае значэньне. Тут трэба патлумачыць адну рэч: шаноўны гаспадар ня меў звычкі чытаць. Для яго не існавала напісанага і друкаванага слова, усё яму трэба было дакладаць вусна. Гаспадар наш не наведваў школаў, яго адзіным настаўнікам – і тое толькі ў дзяцінстве – быў французскі езуіт мансэньёр Жэром, пазьнейшы біскуп Харэру і сябра паэта Арцюра Рэмбо. Гэты сьвятар ня здолеў прышчапіць імпэратару навыку чытаньня, што, зрэшты, было тым цяжэйшае, што Хайле Сэлас'е ўжо ад хлапечых гадоў займаў кіраўнічыя пасады і ня меў часу на сыстэматычныя заняткі. Але мне падаецца, што рэч была ня толькі ў браку часу і навыкаў. Звычай вуснай справаздачы меў тую перавагу, што ў выпадку патрэбы імпэратар мог заявіць, што саноўнік такі й такі паведаміў яму штосьці зусім іншае, чым гэта мела месца ў рэчаіснасьці, а той ня мог абараніцца, ня маючы ніякіх пісьмовых доказаў. Вось жа, імпэратар прымаў ад сваіх падуладных ня тое, што яны яму казалі, але тое, што, на ягоную думку, мусіла быць сказана. Шаноўны гаспадар меў сваю канцэпцыю і да яе дапасоўваў усе сыгналы, якія выходзілі з атачэньня. Падобна было і зь пісаньнем, бо манарх наш ня толькі не карыстаўся ўменьнем чытаць, але таксама й нічога не пісаў і нічога ўласнаручна не падпісваў. Хоць ён валадарыў паўстагодзьдзя, нават найбліжэйшыя асобы ня ведаюць, як выглядаў яго подпіс. У гадзіны выкананьня кіроўных абавязкаў пры імпэратару заўсёды быў міністар пяра, які запісваў усе

ягоныя загады і даручэньні. Тут я мушу патлумачыць, што падчас рабочых аўдыенцыяў дастойны гаспадар гаварыў вельмі ціха, ледзь варушачы вуснамі. Міністар пяра, стоячы за паўкроку ад трона, быў вымушаны набліжаць вуха да імпэратарскіх вуснаў, каб пачуць і запісаць рашэньне імпэратара. Апроч таго, словы імпэратара былі, як правіла, няясныя і двухзначныя, асабліва тады, калі ён не хацеў займаць выразнай пазыцыі, а сытуацыя вымагала, каб ён выказаў сваё меркаваньне. Можна было захапляцца спрытнасьцю манарха. На запыт якогась саноўніка аб імпэратарскім рашэньні ён не адказваў наўпрост, але гаварыў так ціха, што голас яго дасягаў толькі падсунутага блізка, як мікрафон, вуха міністра пяра. Гэны запісваў скупыя і цьмяныя мурканьні ўладара. Рэшта была ўжо толькі пытаньнем інтэрпрэтацыі, а гэта была справа міністра, які надаваў рашэньню пісьмовую форму і перадаваў яго ніжэй. Той, хто кіраваў міністэрствам пяра, быў найбліжэйшай даверанай асобай імпэратара і меў вялізную ўладу. З таемнай кабалы манаршых словаў ён мог складаць адвольныя рашэньні. Калі імпэратарскі ход асьляпляў усіх трапнасьцю і мудрасьцю, ён быў чарговым пацьверджаньнем беспамылковасьці абранца Бога. Калі ж адкульсьці з паветра, зь якіхсьці куткоў да манарха пачынаў дабягаць шолах нараканьня, дастойны гаспадар усё мог зваліць на галаву міністра. Апошні быў найбольш зьненавіджанай асобай двара, бо грамадзкая думка, перакананая ў мудрасьці і дабрыні шаноўнага гаспадара, менавіта міністра абвінавачвала ў зласьлівых і бяздумных рашэньнях, якіх было безьліч. Што праўда, служкі шапталіся, чаму Хайле Сэлас'е ня зьменіць міністра, але ў палацы пытаньні можна было задаваць толькі зьверху ўніз, ні ў якім разе не ў адваротным кірунку. Уласна кажучы, калі ўпершыню было ўголас прамоўленае пытаньне ў іншым, чым дагэтуль, кірунку, гэта было сыгналам, што выбухнула рэвалюцыя. Але я забягаю ў будучыню, тым часам як мушу вярнуцца да той ранішняй хвілі, калі на прыступках палацу зьяўляецца імпэратар і рушыць на раньні шпацыр. Уваходзіць у парк. У гэты самы момант да яго набліжаецца шэф палацавай выведкі – Салямон Кедыр – і складае свае данясеньні. Імпэратар ідзе прысадамі, а крок за ім – Кедыр, які гаворыць і гаворыць. Хто з кім сустракаўся, дзе гэта было, пра што яны размаўлялі. Супраць каго інтрыгуюць. Ці можна гэта

ўважаць за змову. Кедыр паведамляе таксама пра працу аддзелу вайсковых шыфраў. Гэты аддзел, які належыць да ўстановы Кедыра, расшыфроўвае шыфраваныя размовы, якія вядуць міжсобку дывізіі: варта ведаць, ці не высьпявае там думка аб перавароце. Дастойны гаспадар ні пра што не пытаецца, нічога не камэнтуе, ідзе і слухае. Часам спыніцца перад клеткай з ільвамі, каб кінуць ім пададзеную прыслужнікам цялячую нагу. Глядзіць на львіную драпежнасьць і ўсьміхаецца. Пасьля набліжаецца да прывязаных за ланцуг леапардаў і дае ім ялавічных рэбраў. Тут гаспадар мусіць зважаць, бо падыходзіць блізка да драпежнікаў, якія могуць быць непрадказальнымі. Урэшце ідзе далей, а за ім ідзе Кедыр, працягваючы сваю справаздачу. У пэўны момант гаспадар ківае галавой, і гэта ёсьць знакам Кедыру: той мае ісьці. Кедыр кланяецца і зьнікае ў прысадах, адступаючы такім чынам, каб не павярнуцца сьпінай да манарха. Дакладна ў гэтую хвілю, дачакаўшыся сваёй чаргі, з-пад дрэва выходзіць міністар прамысловасьці і гандлю – Маканэн Хабтэ-Вальд. Ён набліжаецца да манарха, які працягвае свой шпацыр, і складае яму данясеньні, ідучы за крок ад яго. Хабтэ-Вальд мае прыватную сетку інфарматараў, якую ён утрымлівае з прычыны страсьці да інтрыганства, якая зжырае яго, а таксама каб выслужыцца перад шаноўным гаспадаром. Цяпер ён на падставе сваёй інфармацыі апавядае імпэратару, як прайшла мінулая ноч. Наш гаспадар зноў ні пра што не пытаецца і нічога не камэнтуе, проста ідзе і слухае са складзенымі ззаду рукамі. Бывае, наблізіцца да чарады флямінга, але палахлівыя гэтыя птушкі адразу ўцякаюць, і імпэратар усьміхаецца пры паглядзе на істотаў, якія адмаўляюць яму ў пакоры. Урэшце, ідучы далей, ён ківае, Хабтэ-Вальд замаўкае і, адступаючы задам, зьнікае ў прысадах. І тут жа як з-пад зямлі вырастае згорбленая постаць адданага даносчыка Ашы Вальдэ-Мікаэля. Гэты саноўнік ажыцьцяўляе нагляд над урадавай палітычнай паліцыяй, якая спаборнічае з палацавай выведкай Салямона Кедыра і вядзе вострую канкурэнтную барацьбу з прыватнымі сеткамі даносчыкаў накшталт той, якой валодае Маканэн Хабтэ-Вальд. Занятак, якому аддаваліся гэтыя людзі, быў цяжкім і небясьпечным. Яны жылі ў страху не данесьці чагосьці ў пару і трапіць у няласку, альбо што канкурэнт данясе лепей, і тады імпэратар падумае: чаму Салямон падаў мне сёньня

столькі прысмакаў, а Маканэн прынёс адно пустазельле? Не сказаў, бо ня ведае, ці маўчаў, бо ён сам у змове? Ці дастойны гаспадар мала спазнаў на ўласнай скуры такіх выпадкаў, калі яму здраджвалі найбліжэйшыя і найбольш даверaныя людзі? І таму імпэратар караў за маўчаньне. Але, зь іншага боку, бязладныя плыні словаў нудзілі і раздражнялі імпэратарскае вуха, таму нэрвовая балбатня таксама не была добрым выйсьцем. Ужо сам выгляд гэтых людзей выдаваў, у якой небясьпецы яны жывуць. Нявыспаныя, змучаныя, яны дзейнічалі ў сталым напяцьці, у гарачцы, у пагоні за ахвярай, у духаце нянавісьці і страху, якая атачала іх паўсюль. Адзінай іх астояй быў імпэратар, але імпэратар мог прыкончыць іх адным жэстам рукі. О так, літасьцівы гаспадар не аблягчаў ім жыцьця. Як я ўжо згадваў, падчас ранішняга шпацыру Хайле Сэлас'е, слухаючы данясеньні аб стане змоваў у імпэрыі, ніколі не задаваў пытаньняў і не камэнтаваў атрыманай інфармацыі. Цяпер скажу, што ён ведаў, што робіць. Гаспадар хацеў атрымаць данос у чыстым стане, гэта значыць, праўдзівы данос, а калі б ён пытаўся ці выказваў сваё меркаваньне, даносчык пачаў бы паслужліва зьмяняць факты, каб яны адпавядалі ўяўленьням імпэратара, і тады ўсё даносчыцтва зрабілася б такім адвольным і суб'ектыўным, што манарх ня мог бы даведацца, што ж насамрэч адбываецца ў дзяржаве і ў палацы. Ужо пад канец шпацыру імпэратар выслухоўвае тое, што апошняй ночы прынесьлі людзі Ашы. Корміць сабак і чорную пантэру, пасьля дзівіцца на атрыманага нядаўна мурашкаеда – падарунак прэзыдэнта Ўганды. Схіляе галаву, і Аша сыходзіць – скурчаны, няпэўны, ці ён сказаў больш, ці менш, чымся данесьлі сёньня яго найбольш зацятыя ворагі – Салямон, вораг Маканэна і Ашы, і Маканэн, вораг Ашы і Салямона. Апошняе кола шпацыру Хайле Сэлас'е робіць ужо ў адзіноце. У парку віднее, чэзьне туман, у траве запальваюцца сонечныя агеньчыкі. Імпэратар разважае, гэта час складаньня тактыкі і стратэгіі, разьвязаньня асабовых галаваломак і падрыхтоўкі наступнага ходу на шахматнай дошцы ўлады. Ён абдумвае зьмест паведамленьняў, атрыманых ад даносчыкаў. Мала важных рэчаў, яны найчасьцей даносяць адзін на аднаго. У нашага гаспадара ўсё пазначанае ў галаве, ягоны розум – гэта кампутар, які захоўвае кожную дэталь, запамінае найменшыя дробязі. У палацы не было ніякага аддзелу кадраў, ні папак, ні

анкет. Усё гэта імпэратар насіў у сваіх мазгах, усю найпатаемнейшую картатэку людзей эліты. Як цяпер яго бачу, як ён ідзе, спыняецца, падымае твар угару, нібы занураючыся ў малітву. О Божа, збаў мяне ад тых, хто, поўзаючы на каленях, хавае нож, які хацеў бы ўбіць мне ў сьпіну. Але як пан Бог можа дапамагчы? Усе людзі, якія атачаюць імпэратара, менавіта такія: на каленях і з нажом. На вяршыні ніколі не бывае цёпла. Там дзьмуць халодныя вятры, кожны стаіць скурчаны і мусіць пільнаваць, каб сусед ня скінуў яго ў бездань.

Т. К.-Б.:

Дарагі сябра, ясна, што памятаю. Гэта ж было амаль учора. Амаль учора, век таму назад. У гэтым горадзе, але ўжо на іншай плянэце, якая аддалілася. Як усё мяшаецца – часы, месцы, сьвет разьляцеўся на кавалкі, якіх ужо ня склеіць. Толькі ўспаміны, гэта адзінае, што ацалела, адзінае, што застаецца з жыцьця. Я шмат часу праводзіў пры імпэратару, як чыноўнік міністэрства пяра. Мы пачыналі працу а восьмай, каб усё было гатова да дзявятай, калі прыедзе манарх. Гаспадар наш жыў у новым палацы, насупраць «Афрыка-Холу», а афіцыйныя працэдуры праводзіў у старым палацы, збудаваным імпэратарам Мэнэлікам, які стаяў на суседнім узгорку. Нашая ўстанова была ў гэтым старым палацы, дзе месьцілася бальшыня імпэратарскіх установаў, бо Хайле Сэлас'е хацеў усё мець пад рукой. Ён прыяжджаў на адным з дваццаці сямі аўтамабіляў, якія складалі ягоны прыватны парк. Ён любіў машыны, найбольш цаніў «ролс-ройсы» з прычыны іх паважных і годных ліній, але дзеля разнастайнасьці карыстаўся таксама «мэрсэдэсамі» і «лінкольн-кантынэнталямі». Нагадаю, гаспадар наш першым увёз машыны ў Этыёпію і заўжды зычліва ставіўся да энтузіястаў тэхнічнага прагрэсу, на якіх наш традыцыйны народ, на жаль, паглядаў падазрона. Ды што там, імпэратар ледзь ня страціў улады і нават жыцьця, калі ў дваццатых гадах прывёз з Эўропы першы самалёт! Просты аэраплян тады палічылі творам шатана, і па магнацкіх дварах пачалі плесьціся змовы супраць гэткага шалёнага манарха, ледзь не кабаліста і чарнакніжніка. Ад таго часу шаноўны гаспадар мусіў асьцярожней даваць выйсьце сваім піянэрскім амбіцыям,

пакуль, з прычыны непрыязнасьці, якую ўсякая навіна будзіць у пажылым чалавеку, не пакінуў гэтых пачынаньняў амаль цалкам. Вось жа, а дзясятай раніцы ён прыяжджаў у стары палац. Перад брамай яго чакаў натоўп падданых, якія намагаліся ўручыць імпэратару пэтыцыі. Тэарэтычна гэта быў найкарацейшы шлях пошуку справядлівасьці і дабрыні ў імпэрыі. Народ у нас непісьменны, а справядлівасьці шукае, як правіла, бедната, дык гэтыя людзі на гады ўлазілі ў даўгі, каб заплаціць канцылярысту, які запісаў бы іх скаргі і просьбы. Апроч таго, быў клопат з пратаколам, бо звычай загадваў маленькім людзям кленчыць перад імпэратарам тварам да зямлі, а як з гэтай пазыцыі падаць канвэрт у лімузін, які праяжджаў паўзь іх? Праблема разьвязвалася наступным чынам: імпэратарскі аўтамабіль запавольваў хаду, за акном паказваўся поўны дабрыні твар манарха, а ахова, якая ехала ў наступнай машыне, забірала частку канвэртаў з рук, якія выцягвала грамада, частку, бо гэтых рук быў лес. Калі натоўп падпаўзаў занадта блізка да імпэратарскага картэжу, гвардыя мусіла адштурхоўваць і праганяць нахабнікаў, бо меркаваньні бясьпекі, а таксама веліч ягамосьця вымагалі, каб праезд адбываўся плаўна і без пазаплянавага замаруджаньня. Тады машыны ўяжджалі на прысады, якія беглі ўгару, і спыняліся на дзядзінцы палацу. Тут імпэратара таксама чакаў натоўп, але зусім іншы, чым тая галота перад брамай, якую бязьлітасна разганялі адборныя гвардзейцы з Імпэратарскай гвардыі. Гэты натоўп, які вітаў манарха на дзядзінцы, складалі людзі з імпэратарскага атачэньня. Мы ўсе зьбіраліся тут раней, каб не спазьніцца да прыезду імпэратара, бо гэтая хвіліна мела для нас асаблівае значэньне. Кожны хацеў абавязкова паказацца, бо спадзяваўся быць заўважаным імпэратарам. Не, пра нейкае адмысловае заўважаньне нават і ня марылі: шаноўны гаспадар заўважыў, падыходзіць і пачынае размову. Не, аж такое не! Скажу адкрыта – мы прагнулі хоць мінімальнага заўважаньня, папросту найменшага, абсалютна абы-якога, зусім другаснага, нязначнага, якое не накладала на імпэратара ніякіх забавязаньняў, мімалётнага, як доля сэкунды, але ўсё ж такога, каб пасьля адчуць унутранае ўзрушаньне і каб трыюмфальная думка апанавала нас: я быў заўважаны! Якой моцы гэта пасьля дадавала! Якія неабмежаваныя магчымасьці гэта стварала! Бо, прыпусьцім, вока дастойнага гаспадара прасьлізнула па твары,

толькі прасьлізнула! Уласна кажучы, можна было б падумаць, што нічога не было, але зь іншага боку – як жа не было, калі прасьлізнула! Адразу ж адчуваеш, як падвышаецца тэмпэратура твара, кроў ідзе ў галаву, сэрца б'ецца мацней. Гэта найлепшыя доказы таго, што нас даткнулася вока заступніка, але што там, у гэтую хвілю доказы ня маюць значэньня. Важнейшым ёсьць працэс, які мог адбыцца ў памяці нашага гаспадара. Вось жа, было вядома, што гаспадар, дзякуючы таму, што ён не карыстаўся ўменьнем чытаць і пісаць, меў фэнамэнальна разьвітую зрокавую памяць. І на гэтым дары прыроды мог будаваць надзеі ўладальнік твара, па якім прабегла імпэратарская зрэнка, бо ўжо можна было лічыць, што якісьці мімалётны сьлед, хаця б толькі невыразны цень, адбіўся ў імпэратарскай памяці. Цяпер трэба было цярпліва і рашуча так манэўраваць у натоўпе, так прасьлізгваць і праціскацца, так прабівацца і праштурхоўвацца, каб шораз падсоўваць свой твар, манэўруючы і маніпулюючы ім такім чынам, каб імпэратарскі позірк, нават мімаволі і несьвядома, заўважаў, заўважаў і заўважаў. Пасьля трэба было чакаць, пакуль прыйдзе такі момант, калі імпэратар падумае: зараз, зараз, твар знаёмы, а прозьвішча ня ведаю. І, скажам, спытае пра прозьвішча. Толькі пра прозьвішча, але гэтага дастаткова! Цяпер твар і прозьвішча злучацца, і паўстане асоба, гатовы кандыдат на прызначэньне. Бо адзін твар – гэта ананім, адно прозьвішча – гэта абстракцыя, а тут трэба матэрыялізавацца і канкрэтызавацца, набыць кшталт, форму, здабыць асаблівасьць. О, гэтага лёсу найбольш чакалі, але як жа цяжка было яго зьдзейсьніць. Бо на тым дзядзінцы, дзе атачэньне вітала імпэратара, ахвотных падсунуць свой твар былі дзясяткі і – безь перабольшаньня – сотні, твар цёрся аб твар, вышэйшыя цясьнілі ніжэйшых, цямнейшыя прыцямнялі сьвятлейшых, твар пагарджаў тварам, старэйшыя высоўваліся папарадзе маладзейшых, слабейшыя саступалі мацнейшым, твар ненавідзеў твар, паспалітыя сутыкаліся з шляхетнымі, драпежныя з кволымі, твар душыў твар, але нават прыніжаныя, адштурхоўваныя, трэцярадныя і пераможаныя, нават яны, у пэўным аддаленьні, што праўда, накінутым правам герархіі, але прасоўваліся наперад, высоўваючыся то тут, то там з-за твараў першарадных і тытулаваных, хоць бы толькі краёчкам, вухам ці кавалкам скроні, шчакой ці сківіцай, абы бліжэй да

імпэратарскай зрэнкі! Калі б літасьцівы гаспадар захацеў агарнуць паглядам усю сцэну, якая адкрывалася перад ім пасьля выйсьця з аўтамабіля, ён убачыў бы, што ня толькі цягнецца да яго пакорная і заразом разгарачаная ставусная магма, але і што за гэтай цэнтральнай і высока тытулаванай групай, направа і налева, перад ім і за ім, далей і зусім далёка, у дзьвярах, у вокнах, пад дзьвярыма і на сьцежках цэлыя масы лёкаяў, кухоннай прыслугі, прыбіральнікаў, садоўнікаў і паліцыянтаў таксама падсоўваюць свае твары пад яго позірк. І гаспадар наш на ўсё гэта глядзіць. Ці ён дзівіцца? Сумняюся. Ён таксама калісьці быў часткай ставуснай магмы. Ці ня мусіў ён падсоўваць свой твар, каб ува ўзросьце ўсяго дваццаці чатырох гадоў стаць пераемнікам трона? А канкурэнцыя была пякельная! Цэлае зборышча дасьведчаных натабляў дабівалася кароны. Але яны сьпяшаліся, адзін перад адным, скакалі сабе, аж трымцелі з ног да галавы, нецярпліўцы, каб хутчэй, хутчэй на трон! Найасаблівейшы гаспадар умеў чакаць. А гэта архіважная здольнасьць. Бяз гэтага ўменьня чакаць, цярплівай, нават пакорнай згоды на тое, што шанец можа зьявіцца толькі праз гады, няма палітыка. Дастойны гаспадар чакаў дзесяць гадоў, каб здабыць права пераемніка трона, а пасьля чатырнаццаць гадоў, каб стаць імпэратарам. У суме – амаль чвэрць стагодзьдзя асьцярожных, але энэргічных крокаў да кароны. Я кажу – асьцярожных, бо гаспадара адзначала скрытнасьць, далікатнасьць і маўклівасьць. Ён ведаў палац, ведаў, што кожная сьцяна мае вушы, што з-за фіранак за ім уважліва сочаць невідочныя вочы. Таму ён мусіў быць спрытным і хітрым. Перадусім нельга было заўчасна адкрыцца, выявіць прагнае імкненьне да ўлады, бо гэта адразу яднае канкурэнтаў і мабілізуе іх на барацьбу. Яны ўдараць і зьнішчаць таго, хто высунуўся наперад. Не, гадамі трэба ісьці ў шэрагу, сачыць, каб ніхто ня высунуўся наперад, і пільна чакаць зручнага моманту. У трыццатым годзе гэтая гульня прынесла гаспадару карону, якую ён захоўваў наступныя сорак чатыры гады.

Калі я паказаў прыяцелю тое, што пішу пра Хайле Сэлас'е – а хутчэй, твор пра імпэратарскі двор і яго заняпад – ён спытаўся, ці адзін я наведваў гэтых людзей, якія хваліся. Адзін? Гэта

было б немагчыма! Белы чалавек, замежнік – ніхто зь іх не ўпусьціў бы мяне за парог бяз важкіх рэкамэндацыяў. І ўжо ні ў якім разе ніхто не захацеў бы дзяліцца са мной сваімі гісторыямі (увогуле этыёпаў цяжка схіліць да шчырасьці, яны ўмеюць маўчаць, як кітайцы). Адкуль бы я ведаў, дзе іх шукаць, дзе яны, кім былі, што могуць расказаць?

Не, я быў не адзін, у мяне быў праваднік.

Цяпер, калі ён ужо не жыве, я магу назваць яго імя: Тэфэра Гебрэвольд. Я прыехаў у Адыс-Абэбу ў сярэдзіне траўня тысяча дзевяцьсот шэсьцьдзесят трэцяга. Праз колькі дзён тут мелі сабрацца прэзыдэнты незалежнай Афрыкі, і імпэратар рыхтаваў горад да гэтай сустрэчы. Адыс-Абэба тады была вялікай, на колькі соцень тысячаў жыхароў, вёскай, якая ляжала на ўзгорках, сярод эўкаліптавых гаёў. На траўніках пры галоўнай вуліцы Чэрчыль-Роўд пасьвіліся статкі кароў і коз, і машыны мусілі спыняцца, калі качэўнікі пераганялі цераз дарогу грамады спалоханых вярблюдаў. Ішоў дождж, і ў бакавых вуліцах машыны буксавалі ў клейкай брунатнай гразі, вязнучы шораз больш і ўрэшце складаючы калёны ўтопленых, нерухомых аўтамабіляў.

Імпэратар разумеў, што сталіца Афрыкі мусіць выглядаць значна пышней, і загадаў пабудаваць колькі сучасных гмахаў, а таксама ўпарадкаваць найважнейшыя вуліцы. На жаль, будаваньне расьцягнулася да бясконцасьці, і калі я аглядаў рыштаваньні, што стаялі ў розных месцах гораду, і людзей, якія на іх працавалі, мне ўспомнілася сцэна, якую апісаў Іўлін Ўо, калі ў тысяча дзевяцьсот трыццатым годзе прыехаў у Адыс-Абэбу паглядзець на каранацыю імпэратара:

«Здавалася, што горад пачалі будаваць толькі цяпер. На кожным рагу стаялі напалову скончаныя будынкі. Некаторыя ўжо былі кінутыя, пры іншых працавалі грамады абарваных тубыльцаў. Аднойчы папаўдні я бачыў дваццаць ці трыццаць такіх людзей, якія пад кіраўніцтвам майстра-армяніна прыбіралі купы друзу і каменьня, якімі быў завалены двор перад галоўным уездам у палац. Праца палягала ў тым, што яны мусілі напоўніць друзам драўляныя насілкі і пасьля высыпаць яго на кучу, якая знаходзілася за пяцьдзясят ярдаў далей. Майстар кружляў між

людзей, трымаючы ў руках даўгі кій. Калі ён мусіў адысьціся на хвілю, усё адразу ж спынялася. Гэта не азначала, што людзі пачыналі сядаць, размаўляць, класьціся на зямлю, не, яны папросту замірaлі на тым месцы, дзе знаходзіліся, яны нерухомелі, як каровы на пашы, часам упадалі ў летаргію, трымаючы ў руках цагліну. Урэшце зьяўляўся майстар, і тады яны зноў пачыналі рухацца, але вельмі марудна, як постаці ў запаволеным фільме. Калі майстар біў іх кіем, яны не прасілі літасьці, не пратэставалі, толькі трохі прысьпешвалі свае рухі. Удары спыняліся, і тады яны вярталіся да павольнага тэмпу, а калі майстар зноў сыходзіў, адразу нерухомелі і замірaлі».

Гэтым разам вялікі рух панаваў пры галоўных вуліцах. Па баках вуліцаў рухаліся гіганцкія бульдозэры, якія бурылі найбліжэйшыя мазанкі, ужо апусьцелыя, бо напярэдадні паліцыя выгнала іх жыхароў з гораду. Пасьля брыгады муляраў будавалі высокі мур, каб закрыць ім пазасталыя мазанкі. Іншыя брыгады фарбавалі мур у нацыянальныя ўзоры. Места пахла сьвежым бэтонам і фарбай, стыгнучым асфальтам і водарам пальмавага лісьця, якім аздаблялі прывітальныя брамы.

З нагоды сустрэчы прэзыдэнтаў імпэратар даў уражальны прыём. На гэты прыём спэцыяльныя самалёты прывезьлі з Эўропы віны і ікру. За 25 тысячаў даляраў з Галівуду запрасілі Мірыям Макэбу, каб яна пры канцы бяседы прасьпявала правадырам песьні племені зулу. Былі запрошаныя больш за тры тысячы асобаў, герархічна падзеленых на колькі вышэйшых і ніжэйшых катэгорыяў, кожнай катэгорыі адпавядаў асобны колер запрашэньня і прызначалася асобнае мэню.

Прыём адбываўся ў старым палацы імпэратара. Госьці ішлі паўз доўгія шэрагі Імпэратарскай гвардыі, узброенай шаблямі і алебардамі. Асьветленыя пражэктарамі трубачы гралі на вежах імпэратарскі гейнал. На ўнутраных галерэях тэатральныя трупы прадстаўлялі гістарычныя сцэны з жыцьця памерлых імпэратараў. З бальконаў дзяўчаты ў народных строях абсыпалі гасьцей кветкамі. Неба выбухала букетамі фаервэркаў.

Калі ў Вялікай залі госьці ўжо ўселіся пры сталах, зайгралі фанфары, і ўвайшоў імпэратар, маючы па правую руку Насэра. Гэта была незвычайная пара: Насэр – высокі, масіўны, уладны

мужчына, з пасунутай наперад галавой, з усьмешкай на шырокіх шчаках, і побач дробная, нават чэзлая і ўжо аслабленая гадамі постаць Хайле Сэлас'е, яго худы, выразны твар, вялікія, бліскучыя, праніклівыя вочы. За імі парамі ўвайшлі засталыя кіраўнікі. Заля ўстала, усе пляскалі ў далоні. Гучалі авацыі ў гонар еднасьці і імпэратара. Пасьля пачалася ўласна бяседа. Адзін цемнаскуры афіцыянт прыпадаў на чатырох гасьцей (у афіцыянтаў ад хваляваньня і стрэсу ўсё ляцела з рук). Сэрвіз быў срэбны, у даўнім харарскім стылі, на сталах ляжала колькі тонаў каштоўнага антычнага срэбра. Некаторыя хавалі прыборы ў кішэні, адзін браў лыжку, іншы – відэлец.

Нагрувашчаныя горы мяса і садавіны, рыбы і сыроў уздымаліся на сталах. Шматпавярховыя торты сплывалі салодкай стракатай глязурай. Вытанчаныя віны расьсейвалі каляровы бліск і асьвяжальны пах. Музыка грала, выстраеныя блазны куляліся на радасьць разьвяселеным бяседнікам. Час мінаў за размовамі, сьмехам і спажываньнем.

Файна было.

Падчас гэтай імпрэзы я хацеў знайсьці спакойнае месца і ня ведаў, дзе яго шукаць. Я выйшаў зь Вялікай залі на двор праз бакавыя дзьверы. Была цёмная ноч, імжэў дробны дождж, травеньскі, але халодны. Ад гэтых дзьвярэй пачынаўся лагодны схіл, а колькі дзясяткаў мэтраў ніжэй стаяў дрэнна асьветлены барак, бязь сьценаў. Ад бакавых дзьвярэй, зь якіх я выйшаў, да самага бараку стаяў шэраг афіцыянтаў, якія перадавалі адзін аднаму талеркі з адкідамі зь бяседнага стала. На гэтых талерках у бок бараку плылі косткі, агрызкі, рэшткі салатаў, рыбіныя галовы і мясныя недаедкі. Я пайшоў у бок бараку, пасьлізгваючыся ў гразі і раскіданых рэштках ежы.

Каля самога бараку я заўважыў, што цемра за ім варушыцца, што штосьці ў гэтай цемры рухаецца, буркоча і булькае, уздыхае і чвякае. Я зайшоў за барак.

У гушчыні ночы, у гразі і дажджы стаяў цесны натоўп басаногіх жабракоў. Мыйшчыкі посуду, якія працавалі ў бараку, кідалі ім рэшткі з талерак. Я глядзеў на натоўп, які працавіта і засяроджана еў агрызкі, косткі і рыбіныя галовы. У гэтай

бяседзе была ўважлівая, руплівая канцэнтрацыя, трохі гвалтоўная і запамінальная біялёгія, голад, які спаталяўся ў напяцьці, у напрузе, у экстазе.

Афіцыянты часам мелі пярэрвы, плынь талерак перапынялася, і натоўп на хвілю супакойваўся, цягліцы разьнявольваліся, нібы камандзір даваў каманду «спаволь». Людзі выціралі мокрыя твары і прыводзілі да ладу закарузлыя ад дажджу і бруду лахманы. Але плынь талерак зноў пачыналася – бо там, наверсе, таксама трывала вялікае жаваньне, чваканьне й сёрбаньне – і натоўп зноў браўся за блаславёную і руплівую працу спажываньня.

Я змок і таму вярнуўся ў Вялікую залю, на імпэратарскі прыём. Паглядзеў на срэбра і золата, на аксаміт і пурпур, на прэзыдэнта Касавубу, на свайго суседа, нейкага Ае Мамлае, удыхнуў пах кадзілаў і руж, паслухаў пераканальную песьню племені зулу, якую сьпявала Мірыям Макэба, пакланіўся імпэратару (гэта было прынцыповае патрабаваньне пратаколу) і пайшоў дадому.

Па ад'езьдзе прэзыдэнтаў (а ад'езд гэты адбываўся пасьпешліва, бо доўгае знаходжаньне за мяжой часам сканчалася стратай пасады) імпэратар запрасіў нас – гэта значыць групу замежных карэспандэнтаў, якая прыехала сюды з нагоды першай канфэрэнцыі кіраўнікоў дзяржаваў Афрыкі – на сьняданак. Гэтую навіну і запрашэньні нам прывёз у «Афрыка-Хол», дзе мы бавілі дні і ночы ў безнадзейным і нэрвовым чаканьні сувязі з нашымі сталіцамі, мясцовы апякун, начальнік зь Міністэрства інфармацыі – гэта і быў Тэфэра Гебрэвольд, высокі статны амгара, звычайна маўклівы і замкнёны. Але гэтым разам ён быў узрушаны, усхваляваны. Я зьвярнуў увагу на тое, што вымаўляючы імя Хайле Сэлас'е, ён кожны раз урачыста схіляў галаву. «Гэта цудоўна! – гукнуў грэка-турка-кіпра-мальтыец Іва Сварзыні, які афіцыйна працаваў на няісную агенцыю МІВ, а фактычна на выведку італьянскага нафтавага канцэрну ENI, – будзе магчымасьць паскардзіцца чуваку, як нам тут арганізавалі сувязь». Я мушу дадаць, што асяродак такіх карэспандэнтаў, якія дасьледуюць найдалейшыя закуткі сьвету, складаецца зь людзей цынічных і жорсткіх, якія ўсё бачылі, усё перажылі, якія,

каб выконваць сваю справу, мусяць увесь час змагацца з тысячай перашкодаў, пра якія бальшыня людзей мае слабае ўяўленьне, і таму нішто ня можа іх устурбаваць ці ўзрушыць, а даведзеныя да вычарпаньня і злосныя, яны насамрэч былі гатовыя наскардзіцца імпэратару на ганебныя варункі працы і сапраўды марную дапамогу мясцовых уладаў. Але нават такія людзі час ад часу мусяць задумвацца над сваімі ўчынкамі. І якраз такі момант надышоў цяпер, калі пасьля словаў Сварзыні мы заўважылі, што Тэфэра зьбялеў, схіліўся і пачаў нэрвова і няскладна штосьці казаць, з чаго – урэшце – удалося зразумець, што калі мы данясём на яго, імпэратар загадае адсячы яму галаву. Ён паўтараў і паўтараў гэта. У нашай групе меркаваньні падзяліліся. Я агітаваў за тое, каб пакінуць яго ў спакоі і ня браць жыцьцё чалавека на сваё сумленьне. Бальшыня была такой жа думкі, і ўрэшце мы вырашылі, што ў размове з імпэратарам абмінём гэтую тэму. Тэфэра прыслухоўваўся да дыскусіі, і яе вынік павінен быў яго ўсьцешыць, але, як кожны амгара, ён таксама быў натуры недаверлівай і скептычнай – а гэтыя рысы выяўляліся асабліва ў дачыненьні да замежнікаў, – і пайшоў ён ад нас прыгнечаны і роспачны. І вось наступнага дня мы выходзім ад імпэратара, адораныя срэбнымі мэдальёнамі зь ягоным гербам. Цырымоніймайстар праводзіць нас доўгім калідорам да парадных дзьвярэй. Пры сьцяне стаіць Тэфэра ў такой паставе, у якой падсудны прымае цяжкі вырак суду, пот на змарнелым твары. «Тэфэра! – крычыць разьвяселены Сварзыні, – мы цябе вельмі хвалілі. (Што было праўдай.) Атрымаеш павышэньне!» – і ляпае яго ў дрыготкія плечы.

Пасьля, пакуль ён быў жывы, я наведваў яго кожны раз, калі прыяжджаў у Адыс-Абэбу. Ужо пасьля зрыненьня імпэратара ён пэўны час працаваў, бо – на шчасьце для яго – яго выкінулі з палацу ў апошнія месяцы панаваньня Хайле Сэлас'е. Але ён ведаў усіх людзей з атачэньня імпэратара, некаторыя зь іх былі ягонымі сваякамі. Як амгара, якія цэняць шляхетнасьць, ён умеў выказаць удзячнасьць і ўсімі спосабамі стараўся адплаціць за тое, што ў свой час мы ўратавалі яму галаву. Неўзабаве пасьля дэтранізацыі я спаткаўся з Тэфэрам у гатэлі «Рас», у сваім пакоі. Места перажывала эўфарыю першых месяцаў рэвалюцыі. Вуліцамі цягнуліся шумныя маніфэстацыі, адныя падтрымлівалі вайсковы ўрад, іншыя дамагаліся яго адстаўкі, былі

дэманстрацыі за аграрную рэформу, і дэманстрацыі за тое, каб аддаць старую каманду пад суд, і дэманстрацыі, якія заклікалі раздаць бедным маёмасьць імпэратара, ад самага ранку вуліцы запаўняліся разгарачаным тлумам, выбухалі сутычкі, канфлікты, лёталі камяні. Тады, у пакоі, я сказаў яму, што хацеў бы знайсьці людзей імпэратара. Тэфэра быў зьдзіўлены, але згадзіўся ўзяць гэта на сябе. Пачаліся нашыя падазроныя вандроўкі. Мы былі парай калекцыянэраў, якія прагнулі знайсьці вырачаныя на зьнішчэньне карціны, каб зрабіць зь іх выставу даўняга мастацтва ўладараньня.

Прыкладна ў гэты час выбухнула шаленства фэташы, якое пазьней разраслося да нечуваных у сьвеце памераў, а яго ахвярай сталі мы ўсе – жывыя людзі, незалежна ад колеру скуры, узросту, полу і стану. Фэташа – гэта амгарскае слова, якое азначае рэвізію. Раптам усе пачалі абшукваць адно аднаго. Ад рана да ночы, нават ад рана да рана, паўсюль, безь перадыху. Рэвалюцыя падзяліла людзей на лягеры, і пачалася барацьба. Не было ані барыкад, ані акопаў, ані іншых выразных ліній падзелу, і таму кожны сустрэты чалавек мог быць ворагам. Гэтую атмасфэру агульнай пагрозы ўзмацняла яшчэ і хваравітая падазронасьць, якую кожны амгара жывіць у дачыненьні да іншага чалавека (таксама і да другога амгары), якому ніколі ня можна давяраць, верыць на слова, разьлічваць на яго, бо намеры людзей злыя і падступныя, людзі – гэта змоўцы. Філязофія амгараў пэсымістычная, сумная, таму іх пагляды сумныя і пры гэтым чуйныя і пільныя, твары іх сур'ёзныя, рысы напятыя, ім рэдка надараецца ўсьміхацца.

Усе маюць зброю, закаханыя ў зброю. Багатыры мелі на дварах цэлыя арсэналы і ўласныя, прыватныя арміі. У кватэрах афіцэраў таксама можна ўбачыць арсэналы: аўтаматы, калекцыі пісталетаў, скрыні гранатаў. Яшчэ колькі гадоў таму рэвальвэры купляліся ў крамах, як любы іншы тавар – дастаткова было заплаціць, ніхто ні пра што не пытаўся. Зброя плебсу горшая і часта вельмі старая – розныя крэмневыя стрэльбы, паляўнічыя ружжы, флінты, дубальтоўкі, цэлы музэй на сьпінах. Бальшыня з гэтага антыкварыяту не прыдатная для ўжытку, бо ніхто ўжо не вырабляе для іх боепрыпасаў. Таму на рынку набой часам даражэйшы за вінтоўку, набоі –

найкаштоўнейшая валюта на рынку, больш жаданая, чым даляры. Бо што даляр? Даляр – гэта папера, а набой можа ўратаваць жыццё. Дзякуючы набоям нашая зброя набывае сэнс, а мы набіраем вагі.

Жыццё чалавека – якую яно мае вартасьць? Іншы чалавек існуе настолькі, наколькі ўяўляе сабой перашкоду на нашым шляху. Жыццё няшмат значыць, хоць лепей пазбавіць яго ворага, перш чым той пасьпее ўдарыць па нас. Кожнае ночы страляніна (а таксама і на працягу дня), пасьля на вуліцы ляжаць забітыя. «Нэгусе, – кажу я нашаму кіроўцу, – зашмат страляюць. Гэта нядобра». Але ён маўчыць, нічога не адказвае, я ня ведаю, што ён думае. Яны спрактыкаваныя ў тым, каб бяз дай прычыны выцягнуць пісталет і стрэліць.

Забіць.

А можа, можна было б іначай, можа, можна было б бяз гэтага? Але яны ў гэты спосаб ня думаюць, іх думка не ідзе ў кірунку жыцьця, толькі ў кірунку сьмерці. Сьпярша спакойна размаўляюць, пасьля пачынаецца спрэчка, бойка, а ўрэшце чуваць стрэлы. Адкуль столькі зацятасьці, агрэсіі, нянавісьці? І ўсё без рэфлексіі, бяз хвілі роздуму, без тармазоў, на злом галавы.

Вось жа, каб авалодаць сытуацыяй і раззброіць апазыцыю, улады абвясьцілі ўсеагульную фэташу. Нас увесь час, бесьперапынна абшукваюць. На вуліцы, у машыне, перад домам (і ў доме), перад крамай, перад поштай, перад уваходам у бюро, у рэдакцыю, у царкву, у кіно. Перад банкам, перад рэстаранам, на рынку, у парку. Кожны можа нас абшукаць, бо мы ня ведаем, хто мае на гэта права, а хто не, і лепей не пытацца, бо гэта пагаршае справу, лепей паддацца. Увесь час нас хтосьці абшуквае, нейкія абарваныя хлопцы, з кіямі, нічога ня кажуць, толькі затрымліваюць нас і разводзяць рукі ў бакі, паказваючы, што мы таксама маем разьвесьці рукі ў бакі – гэта значыць, стаць у пазыцыю для асабістага надгляду, і тады яны пачынаюць даставаць усё з торбы, з кішэні, аглядаць, дзівіцца, моршчыць ілбы, ківаць галовамі, раіцца, пасьля абмацваюць нам сьпіны, жываты, ногі, боты, ну і што? і нічога – мы можам ісьці далей, да наступнага разьвядзеньня рук, да наступнай фэташы. Адзіна што гэтая наступная фэташа можа быць ужо праз колькі

крокаў, і тады ўсё пачынаецца ад пачатку, бо фэташы не сумуюцца ў адно генэральнае раз-назаўсёды-ачышчэньне, апраўданьне, дараваньне, мы мусім шораз, штопарумэтраў, штоколькіхвілінаў, зноў а зноў ачышчацца, апраўдвацца, атрымліваць дараваньне. Найбольш нясьцерпныя фэташы на дарогах, калі мы едзем аўтобусам. Дзясяткі затрыманьняў, усе выходзяць, увесь багаж адчыняюць, разрываюць, раскладаюць, разгортваюць, перакопваюць. Нас абшукваюць, абмацваюць, аблапваюць, ціскаюць. Пасьля ў аўтобусе ўтоптваньне багажа, які разбух, як цеста ў дзежцы, а пры чарговай фэташы вывальваньне ўсяго, выбіваньне нагамі на дарогу барахла, кошыкаў, памідораў, збаноў (выглядае гэта як спантанна і хаатычна раскладзены прыдарожны кірмаш), і шуканьне, і цісканьне, і шнараньне. Фэташы так спаскуджваюць язду, што на палове дарогі мы ўжо хацелі б вярнуцца, але як вярнуцца, застацца ў чыстым полі, у небасяжных гарах, каб стаць лёгкай здабычай разбойнікаў? Часам фэташы ахопліваюць цэлыя кварталы, і тады гэта паважная справа. Такія фэташы робіць войска, якое шукае сховішчы зброі, таемныя друкарні і анархістаў. Падчас такой апэрацыі чуваць стрэлы, а пасьля відаць забітых. Калі хтосьці няўважлівы – і хай ён нават сама нявіннасьць – патрапіць пад такую акцыю, яму забясьпечаны цяжкія хвіліны. Людзі ідуць павольна, з паднятымі ўгару рукамі, ад адной рулі да іншай, чакаючы на вырак. Але найчасьцей маем справу з фэташай аматарскай, зь якой можна асвоіцца і прызвычаіцца. Шмат людзей са сваёй ініцыятывы робяць іншым фэташу, то бок абшуканку-абмацанку, гэта фэташысты-самотнікі, якія дзейнічаюць па адным, па-за агульным плянам арганізаванай фэташы. Мы ідзём вуліцай, і раптам нас спыняе нейкі незнаёмы чалавек і разводзіць рукі. Няма рады – мы таксама мусім разьвесьці рукі – гэта значыць, прыняць пазыцыю для рэвізіі. Тады ён нас абмацвае, абскубвае, абцісквае, а пасьля ківае галавой, маўляў, мы вольныя. Відаць, хвілю таму ён падазраваў у нас ворага, а цяпер пазбыўся падазрэньня і пакінуў нас у спакоі. Можна ісьці далей, забыўшы пра гэтае банальнае здарэньне. У маім гатэлі адзін з вартаўнікоў вельмі любіў мяне абшукваць. Часам, сьпяшаючыся, я хутка ўбягаў у фае і мчаў на свой паверх, у пакой, тады ён гнаўся за мной, і перш чым я пасьпяваў павярнуць ключ у замку, уціскваўся ўсярэдзіну і там рабіў мне фэташу. Я сьніў фэташы. Мяне аблапвала мноства

цёмных, брудных, прагных, паўзучых рук, якія танчылі, капаліся, ціскалі, скубалі, казыталі, за горла хапалі, аж пакуль я не абуджаўся мокры ад поту і ня мог заснуць да раніцы.

Але нягледзячы на гэтыя перашкоды я надалей хадзіў па хатах, якія мне адчыняў Тэфэра, і слухаў аповеды пра імпэратара, якія паходзілі ўжо нібы зь іншага сьвету.

А. М.-М.:

Як лёкай трох дзьвярэй я быў найважнейшым зь лёкаяў, якія працавалі ў Залі аўдыенцыі. Гэтая заля мела тры пары дзьвярэй, і былі тры лёкаі, якія адчынялі і зачынялі іх, але я меў першую пазыцыю, бо праз мае дзьверы праходзіў імпэратар. Калі найасаблівейшы гаспадар пакідаў Залю, я адчыняў дзьверы. Мой прафэсіяналізм палягаў у тым, каб адчыніць дзьверы ў належную хвілю, каб злавіць патрэбны момант. Калі б я адчыніў дзьверы заўчасна, гэта магло б выклікаць абуральнае ўражаньне, што я прашу імпэратара пакінуць Залю. Калі б, зноў жа, я адчыніў дзьверы запозна, найасаблівейшаму гаспадару давялося б запаволіць хаду, а можа, нават спыніцца, што было б прыніжэньнем годнасьці гаспадара, якая вымагае, каб рух першай асобы быў роўны і не спатыкаў ніякіх перашкодаў.

Г. С.-Д.:

Час паміж дзявятай і дзясятай гадзінай раніцы наш гаспадар бавіў у Залі аўдыенцыі, раздаючы прызначэньні, і таму гэты час называўся гадзінай прызначэньняў. Імпэратар уваходзіў у Залю, у якой яго ўжо чакалі чыноўнікі, якія прыйшлі на вышэйшае распараджэньне, яны стаялі ў шэраг і пакорна кланяліся. Наш гаспадар сядаў на трон, і калі ён ужо быў сеўшы, я падсоўваў яму падушку пад ногі. Гэтае дзеяньне павінна было выконвацца маланкава хутка, каб ня ўзьнікла моманту, у які ногі дастойнага манарха завісьлі б у паветры. Мы ўсе ведаем, што наш гаспадар меў нізкую паставу, тады як займанае ім становішча вымагала, каб ён захоўваў вышэйшасьць за сваіх падданых таксама і ў проста фізычным

сэнсе, і таму троны гаспадара мелі высокія ножкі і высока пастаўленыя сядзеньні, асабліва тыя, якія засталіся па імпэратару Мэнэліку, які быў мужчынам надзвычайнага росту. Вось жа, паўставала супярэчнасьць паміж неабходнай вышынёй трона і фігурай шаноўнага гаспадара, супярэчнасьць найбольш раздражняльная і клапатлівая якраз у раёне ног, бо ня можна ж было падумаць, каб належную годнасьць захавала асоба, у якой ногі боўтаюцца ў паветры, як у малога дзіцяці! Якраз падушка і разьвязвала гэтую далікатную і гэтак важную праблему. Я быў падушкавым найшляхетнейшага гаспадара на працягу дваццаці шасьці гадоў. Я суправаджаў імпэратара ў падарожжах па сьвеце, і, уласна кажучы, – скажу гэта з гордасьцю – гаспадар наш нікуды ня мог вырушыць безь мяне, бо ягоная годнасьць вымагала, каб ён увесь час сядзеў на троне, а ён ня мог сядзець на троне без падушкі, а падушкавым быў я. Я авалодаў адмысловым пратаколам у гэтай справе і нават меў надзвычай карысныя веды што да вышыні паасобных экзэмпляраў трона, якія дазвалялі мне хутка і трапна падбіраць падушкі адпаведнага памеру, каб ня здарылася абуральнай недарэчнасьці: паміж падушкай і нагамі імпэратара такі засталася шчыліна! На маім складзе было пяцьдзясят дзьве падушкі рознага фармату, таўшчыні, матэрыі і колеру. Я сам даглядаў варункі, у якіх яны захоўваліся, каб там не завяліся блохі – дакучлівая бяда нашага краю, – бо наступствы такой нядбаласьці маглі б скончыцца прыкрым скандалам.

Т. Л.:

My dear brother, гадзіна прызначэньняў наводзіла дрыжыкі на ўвесь палац! Для адных гэта было дрыжаньне ад радасьці і глыбока пачуцьцёвай асалоды, для іншых – дрыжаньне ад страху і катастрофы, бо ў гэтую гадзіну шаноўны гаспадар ня толькі ўзнагароджваў, абдорваў і прызначаў, але таксама й ганіў, здымаў і паніжаў. Дрэнна я кажу! Насамрэч не было падзелу на ўзрадаваных і спалоханых; радасьць і страх адначасна напаўнялі сэрца кожнага выкліканага ў Залю аўдыенцыі, бо ён ня ведаў, што менавіта яго чакае. У тым палягала найглыбейшая мудрасьць нашага гаспадара, што ніхто ня ведаў свайго дня, свайго прызначэньня. Гэтая

няпэўнасьць і няяснасьць намераў манарха прыводзілі да таго, што палац бесьперапынна пляткарыў і губляўся ў здагадках. Палац дзяліўся на фракцыі і групоўкі, якія вялі міжсобку бязьлітасныя войны, узаемна паслабляючы і зьнішчаючы адна адну. А якраз гэта і было трэба нашаму дастойнаму гаспадару. Гэтая раўнавага, якая забясьпечвала яму сьвяты спакой. Калі якаясьці групоўка брала верх, гаспадар неўзабаве абдорваў ласкай процілеглую групоўку і зноў вяртаў стан раўнавагі, які паралізоўваў узурпатараў. Гаспадар наш націскаў клявішы – то белую, то чорную – і здабываў з фортэпіяна гарманічную мэлёдыю, якая супакойвала яго вуха. А ўсе паддаваліся гэтаму націсканьню, бо адзіным сэнсам іх існаваньня была імпэратарская ўхвала, і калі б імпэратар адмовіў у ёй, яны яшчэ тым жа самым днём зьніклі б з палацу бязь сьледу. Так, яны не былі кімсьці самі па сабе. Яны былі відочныя для люду толькі датуль, дакуль іх асьвятляў бліск манаршай кароны. Хайле Сэлас'е быў канстытуцыйным абраньнікам Бога і дзеля гэтай вышыні ня мог зьвязаць сябе зь якойсьці фракцыяй, хоць паслугоўваўся то адной, то другой больш, чымся іншымі, але калі адна з падтрымліваных груповак надта далёка заходзіла ў сваёй звышстараннасьці, тады імпэратар ганіў яе і мог нават фармальна асудзіць. Гэта асабліва датычыла фракцыяў ястрабаў, якія гаспадар наш прызначаў для падтрыманьня парадку. Бо прамовы імпэратара былі лагодныя, сардэчныя і цешылі народ, які ніколі ня чуў, каб з вуснаў гаспадара зьляталі гнеўныя словы. А сардэчнасьць ня спосаб кіраваць імпэрыяй, хтосьці мусіць утаймоўваць апазыцыю і дбаць пра найвышэйшыя інтарэсы імпэратара, палацу і дзяржавы. Гэта і рабілі фракцыі ястрабаў, аднак, не разумеючы тонкіх намераў імпэратара, грузьлі ў памылках, а дакладней – у памылцы згушчэньня фарбаў. Прагнучы здабыць ухвалу гаспадара, рупліўцы хацелі навесьці абсалютны парадак, тады як дастойнаму гаспадару патрэбны быў парадак у прынцыпе, гэта значыць – парадак, але з пэўным маргінэсам непарадку, на якім магла б выяўляцца манаршая лагоднасьць і паблажлівасьць. Вось таму, калі групоўка ястрабаў пачынала наступаць ужо на гэты маргінэс, яна спатыкала няўхвальны позірк уладара. У палацы былі тры асноўныя фракцыі: арыстакратаў, бюракратаў і так званых асабістых людзей. Крайне кансэрватыўная фракцыя арыстакратаў, якая складалася з буйных

земляўласьнікаў, канцэнтравалася, галоўным чынам, у Кароннай радзе, а яе лідэрам быў расстраляны ўжо князь Каса. Фракцыя бюракратаў, найбольш схільная да зьменаў і найбольш адукаваная, бо частка яе прадстаўнікоў мела вышэйшую адукацыю, запаўняла міністэрствы і імпэратарскія ўстановы. Нарэшце, фракцыя асабістых людзей была асаблівасьцю нашай улады, спароджанай самім імпэратарам. Дастойны гаспадар, прыхільнік моцнай дзяржавы і цэнтральнай улады, мусіў весьці хітрую і спрытную барацьбу з групоўкай арыстакратаў, якая хацела кіраваць правінцыямі і мець слабага, павольнага імпэратара. Але ён ня мог змагацца з арыстакратыяй яе ўласнымі рукамі, і таму ўвесь час набіраў у сваё атачэньне ў якасьці асабістых прызначэнцаў і абраньнікаў людзей з народу, маладых і хуткіх, але найніжэйшага паходжаньня, ну, кагосьці з найапошнейшага плебсу, часта выбіранага як першы-лепшы з натоўпу, які зьбіраўся, калі гаспадар наш сустракаўся з народам. Гэтыя асабістыя людзі імпэратара, выцягнутыя наўпрост з нашай роспачнай і мізэрнай правінцыі ў салёны найвышэйшага двара, сустракаючыся тут з натуральнай нянавісьцю і варожасьцю даўніх арыстакратаў і хутка пакаштаваўшы смак раскошы палацу і яўнага абаяньня імпэратара, зь нечуванай папросту гарачнасьцю і нават страсьцю служылі імпэратару, ведаючы, што яны сядзяць тут і не ў адзінкавых выпадках займаюць найвышэйшыя дзяржаўныя пасады толькі і вылучна з волі дастойнага гаспадара. Менавіта ім імпэратар давяраў пасады, якія вымагалі найбольшай ляяльнасьці. У Міністэрстве пяра, Імпэратарскай палітычнай паліцыі, Адміністрацыі палацу працавалі гэтыя людзі. Яны выкрывалі ўсе змовы і падкопы, зьнішчалі саманадзейную і зласьлівую апазыцыю. Заўваж, журналісту, што імпэратар ня толькі сам прымаў рашэньні аб усіх прызначэньнях, але калісьці кожнаму асабіста паведамляў аб іх. Ён, толькі ён! Ён прызначаў людзей на вяршыні герархіі, але таксама і на сярэднія і нізкія ўзроўні, ён прызначаў начальнікаў поштаў, дырэктараў школаў, кіраўнікоў паліцыйных пастарункаў, усіх найзвычайнейшых чыноўнікаў, загадчыкаў, дырэктараў броварaў, шпіталяў, гатэляў, яшчэ раз паўтару – усіх, ён, асабіста. Іх выклікалі ў Залю аўдыенцыі на гадзіны прызначэньняў, і тут, пашыхтаваныя ў бясконцы шэраг – бо гэта была маса, маса людзей! – яны чакалі прыбыцьця

імпэратара. Пасьля кожны па чарзе падыходзіў да трона, выслухоўваў, усхваляваны і схілены ў паклоне, на якую пасаду імпэратар яго прызначае, цалаваў дабрадзея ў руку і, адступаючы задам, кланяючыся, сыходзіў. Нават самае нязначнае прызначэньне мела імпэратарскае аўтарства, і гэта таму, што крыніцай усялякай улады была не дзяржава і ніякая іншая ўстанова, а толькі найасабісьцейшы дастойны гаспадар. Як жа бязьмерна важнае гэтае права! Бо з таго моманту побач з імпэратарам, калі ён абвяшчаў прызначэньне і даваў сваё блаславеньне, нараджалася агульная міжлюдзкая повязь, што праўда, рэглямэнтаваная правіламі герархіі, але ўсё-ткі повязь, а зь яе вынікаў адзін прынцып, якім кіраваўся наш гаспадар, узвышаючы ці скідаючы людзей: прынцып ляяльнасьці. Дружа мой, можна было б скласьці бібліятэку даносаў, якія гадамі плылі да імпэратарскага вуха, супраць найбліжэй да яго пастаўленай асобы, міністра пяра – Вальдэ Гіёргіса. Гэта была найбольш крывадушная, агідная і карумпаваная постаць, якую калі-кольвек насілі паркеты нашага палацу. Само складаньне даносу на гэтага чалавека пагражала крайне сумнымі наступствамі. Як жа ж мусіла быць дрэнна, калі нягледзячы на гэта – даносілі. Але вуха гаспадара заўжды было закрытае. Вальдэ Гіёргіс мог рабіць, што хацеў, а разбэшчанасьць яго ня мела межаў. Аднак асьлеплены ўласнай пыхай і беспакаранасьцю, аднаго разу ён узяў удзел у сходзе фракцыі змоўнікаў, аб чым палацавая выведка паведаміла шаноўнаму гаспадару. Гаспадар чакаў, пакуль Вальдэ Гіёргіс сам раскажа яму пра свой учынак, але той не згадаў пра гэтую справу ані словам, альбо – іначай кажучы – парушыў прынцып ляяльнасьці. І наступнага дня гаспадар пачаў гадзіну прызначэньняў са свайго ўласнага міністра пяра, чалавека, які амаль дзяліў уладу з дастойным гаспадаром: з пазыцыі другой асобы ў дзяржаве Вальдэ Гіёргіс зьляцеў на пасаду малога чыноўніка ў глухой правінцыі поўдня. Выслухаўшы прызначэньне – а ўявім сабе, як ён мусіў у той момант душыць зьдзіўленьне і жах, – ён згодна са звычаем пацалаваў дабрадзея ў руку і, адступаючы задам, кланяючыся, пакінуў палац раз і назаўсёды. А возьмем такую постаць, як князь Імру. Гэта была, магчыма, найвыбітнейшая індывідуальнасьць у эліце, чалавек, варты найвышэйшых ушанаваньняў і пасадаў. І што з таго, калі – як я згадваў – ласкавы гаспадар ніколі не кіраваўся

прынцыпам здольнасьцяў, але заўсёды і выключна прынцыпам лояльнасьці. Вось жа, невядома адкуль і чаму князь Імру раптам пачаў пахнуць рэформай і, не пытаючы імпэратара пра згоду, раздаў сялянам частку сваёй зямлі. А гэта значыць, змаўчаўшы аб чымсьці перад імпэратарам і зрабіўшы штосьці на ўласную руку, раздражняльным і проста абуральным чынам парушыў прынцып лояльнасьці. І вось літасьцівы гаспадар, які рыхтаваў быў для князя высокапачэсную пасаду, мусіў выкінуць яго з краіны і трымаў яго на чужыне дваццаць гадоў. Зазначу тут, што гаспадар наш ня быў супраць рэформаў, наадварот – ён заўсёды з сымпатыяй ставіўся да прагрэсу і паляпшэньняў, але ён ня мог сьцярпець, каб хтосьці браўся за рэформы на ўласную руку, бо гэта, па-першае, стварала пагрозу адвольнасьці і анархіі, а па-другое – магло выклікаць уражаньне, што ў імпэрыі існуюць якіясь іншыя дабрадзеі, апроч дастойнага гаспадара. З гэтай жа прычыны, калі ўмелы і разумны міністар хацеў правесьці ў сваім абсягу хоць найменшую рэформу, ён мусіў так абставіць справу, так прэзэнтаваць яе імпэратару, так асьвятліць і сфармуляваць, каб у агульнапрызнаны, неаспрэчны і відавочны спосаб вынікала, што ласкавым і руплівым ініцыятарам, творцам і змагаром за рэформу ёсьць асабіста яго імпэратарская мосьць, нават калі б насамрэч гаспадар наш ня надта арыентаваўся, пра што дакладна ідзецца. Але ж ня ўсе міністры мелі розум! Трапляліся людзі маладыя, не знаёмыя з традыцыяй палацу, і такія, кіруючыся ўласнымі амбіцыямі, а таксама прагнучы здабыць прызнаньне народу – як быццам імпэратарскае прызнаньне не было адзіным, якога варта дамагацца! – самавольна спрабавалі тую ці іншую дробязь рэфармаваць. Як быццам яны ня ведалі, што такім чынам парушаюць прынцып лояльнасьці і хаваюць ня толькі сябе, але і саму рэформу, якая, ня маючы імпэратарскага аўтарства, ніколі ня мела шанцаў на ажыцьцяўленьне. Скажу адкрыта, што літасьцівы гаспадар больш любіў дрэнных міністраў. А больш таму, што гаспадар наш любіў выгадна вылучацца. А як жа ён мог бы выгадна вылучацца, калі б яго атачалі добрыя міністры? Народ страціў бы арыентацыю, у каго шукаць дапамогі, на чыю дабрыню і мудрасьць спадзявацца. Усе былі б добрыя і мудрыя. Які ж балаган усчаўся б тады ў імпэрыі! Заміж аднаго сонца сьвяціла б пяцьдзясят, і кожны складаў бы ўшанаваньні прыватна

абранай плянэце. О не, дарагі дружа, няможна паддаваць народ такой згубнай адвольнасьці! Сонца павінна быць адно, такім ёсьць парадак прыроды, а ўсе іншыя тэорыі – толькі безадказная і супраціўная Богу ерась. Але можаш быць пэўны, што гаспадар наш вылучаўся, і вельмі прывабна і добра вылучаўся, і таму народ ня блытаў, хто ёсьць сонцам, а хто – ценем.

З. Т.:

Гаспадар наш у момант прызначэньня бачыў перад сабой схіленую галаву таго, каго ставіў на высокую пасаду. Але нават далёкасяжны пагляд найсьвятлейшага гаспадара ня мог убачыць, што далей рабілася з гэтай галавой. Тым часам галава, якая ў Залі аўдыенцыі выконвала рухі ўніз-уверх, за дзьвярыма хутка мяняла пазыцыю, уздымалася ўгару, застывала і набывала моцны і рашучы выгляд. Так, дружа, дзіўнай была магутнасьць імпэратарскага прызначэньня! Бо тая звычайная галава, якая дагэтуль рухалася так натуральна і свабодна, такая гнуткая і нескаваная, так схільная да паваротаў, паклонаў, схілаў і згінаў, цяпер, памазаная прызначэньнем, зазнавала надта дзіўную рэдукцыю, рухаючыся адгэтуль толькі ў двух кірунках: вэртыкальна ўніз у прысутнасьці дастойнага гаспадара і вэртыкальна ўгару – прысутнасьці засталых. Пастаўленая на гэтую адзіную вось «зямля–неба» галава не магла паварочвацца адвольна, і калі б вы падышлі да яе ззаду і зьнянацку гукнулі: – Гэй, чалавеча! – ён ня мог бы павярнуць галавы ў ваш бок, але мусіў бы годна спыніцца і толькі разам з усім целам навесьці галаву ў кірунак вашага голасу. Увогуле, працуючы чыноўнікам пратаколу ў Залі аўдыенцыі, я зьвярнуў увагу, што прызначэньні выклікаюць фізычныя зьмены ў чалавеку, і прычым зьмены прынцыповыя, і так мяне гэта зацікавіла, што я пачаў бліжэй да гэтага прыглядацца. Перадусім зьмяняецца фігура чалавека. Даўней худая і тонкая, цяпер яна пачынае зьмяняцца ў бок квадрата, у бок квадратнага сылюэту. Гэта масіўны, салідны квадрат – сымбаль павагі і цяжару ўлады. Ужо з сылюэту відаць, што гэта не абы- хто, а ўвасабленьне годнасьці і адказнасьці. Гэтай зьмене фігуры спадарожнічае агульнае

запаволеньне рухаў. Чалавек, адзначаны імпэратарам, ужо ня будзе скакаць, бегаць, дрыгацца, сваволіць. Не, крок паважны, ногі цьвёрда ставяцца на зямлю, лёгкі нахіл цела наперад, які азначае гатовасьць супрацьстаяць перашкодам, рухі рук разьмераныя, вольныя ад нэрвовай і бязладнай жэстыкуляцыі. Рысы твару таксама робяцца паважнейшымі і нібыта застываюць, твар стаецца заклапочаны і замкнёны, аднак захоўвае здольнасьць да часовага пераключэньня да ўхвалы і аптымізму, але наагул неяк так складзены і пастаўлены, што не стварае магчымасьці псыхалягічнага кантакту, няможна пры ім разьняволіцца, уздыхнуць спакойна. Зьмяняецца таксама й позірк. Іншая стае яго даўжыня і іншы вугал падзеньня. Позірк гэты цяпер падаўжаецца да якогасьці зусім недасяжнага для нас пункту, і таму, размаўляючы з прызначэнцам, паводле агульнавядомых правілаў оптыкі мы ня будзем ім заўважаныя, бо фокус ягонага зроку будзе знаходзіцца дзесьці там, за намі. Мы таксама ня можам быць ім успрыманыя, бо кут падзеньня ягонага зроку вельмі разгорнуты, і падчас размовы позірк яго праходзіць дзесьці па-над нашай галавой, і тут выяўляецца дзіўны прынцып пэрыскопа, бо нават калі ён ніжэйшага росту, усё адно ён паглядае па-над нашай галавой, у бясконцую далечыню, альбо перасьледуе якуюсьці асаблівую думку. У кожным разе, мы адчуваем, што нават калі ягоныя думкі не глыбейшыя, яны напэўна важнейшыя і больш адказныя, і мы здаем сабе справу з таго, што ў такой сытуацыі спроба перадачы нашых думак была б бессэнсоўнай і дробязнай. Таму мы змаўкаем. Але імпэратарскі фаварыт таксама ня схільны да размовы, бо адной з праяваў прызначэньня ёсьць зьмена спосабу маўленьня, месца поўных і ясных сказаў цяпер займаюць разнастайныя аднаскладовыя рэплікі, мармытаньні, пакашліваньні, раптоўныя змаўканьні, шматзначныя паўзы, цьмяныя словы і такая рэакцыя на ўсё, нібы ён гэта даўно і лепей ведаў. Вось жа, мы пачуваемся збыткоўнымі і сыходзім, а ягоная галава ў жэсьце разьвітаньня перасоўваеца па восі ў кірунку вэртыкальна ўгару. Здаралася, аднак, што літасьцівы гаспадар ня толькі павышаў, але таксама – выявіўшы неляяльнасьць – і паніжаў, на жаль, альбо – прабач мне, дружа, прастамоўе – з трэскам выкідаў на брук. І тады можна было ўбачыць, што брук мае пэўную цікавую ўласьцівасьць, а менавіта, што пад уплывам сутыкненьня з брукам праявы

прызначэньня адступалі, зьнікалі фізычныя зьмены, выкінуты на брук вяртаўся да нормы, і ў ім нават зьяўлялася нэрвовая і, можа, трохі перабольшана выказваная схільнасьць да братаньня, нібы ён хацеў затушаваць усю справу, нібы ён хацеў махнуць рукой і сказаць, ах, забудзем пра гэта, нібы гэта датычыла нявартай згадкі хваробы.

М.:

Ты пытаесься, дружа, чаму ў апошні пэрыяд улады імпэратара гэны Аклілу, які ня меў ніякіх функцыяў і паходзіў з плебсу, меў больш улады, чым князь Маканэн, які кіраваў урадам і быў выбітным арыстакратам? Бо ступені ўлады ў палацы вызначаліся не паводле герархіі пасадаў, але паводле колькасьці допускаў да найсьвятлейшага гаспадара. Такі быў наш лад унутры палацу. Казалі: важнейшы той, хто часьцей мае імпэратарскае вуха. Часьцей і даўжэй. За гэтае вуха розныя групоўкі вялі найбольш зацятыя бойкі, вуха было найвышэйшай стаўкай у гульні. Дастаткова было – але гэта было нялёгка! – прысунуцца да магутнага вуха і шапнуць. Шапнуць і ўсё – усяго толькі. Хай яно кудысьці западзе, хай там будзе, хоць як мімалётнае ўражаньне, як дробнае зярнятка. Але прыйдзе час, калі ўражаньне ўтрываліцца, а зернейка прарасьце, і тады мы зьбяром ураджай. Гэта былі вельмі далікатныя захады, якія вымагалі чуцьця, бо гаспадар наш, нягледзячы на сваю невычэрпную, надзвычайную энэргію і трываласьць, усё ж заставаўся людзкой істотай з натуральна абмежаванай ёмістасьцю вуха, якое нельга было празьмерна расьцягваць і перагружаць, не раздражняючы гаспадара і не выклікаючы ў яго адмоўных рэакцыяў. Таму колькасьць допускаў была абмежаваная, і таму няспынным было змаганьне за падзел імпэратарскага вуха. Хада гэтага змаганьня была адной з найжывейшых тэмаў палацавых плётак, а таксама адбівалася хцівым рэхам у горадзе. Вось быў такі Абэе Дэбалк, нізкі чыноўнік Міністэрства інфармацыі, дык ён ацэньваўся на чатыры допускі штотыдзень, а ягоны шэф ня мог разьлічваць больш як на два допускі. Імпэратар меў даверaных людзей, часта пастаўленых на вельмі пасрэдныя пасады, але надзвычай магутных дзеля вялікай колькасьці допускаў, пра якую не маглі

марыць іх міністры і нават чальцы Кароннай рады. Захапляльныя вяліся войны. Заслужаны генэрал Абіе Абэбэ меў тры допускі штотыдзень, а ягоны супраціўнік – генэрал Кебэдэ Гебрэ (абодва цяпер расстраляныя) – толькі адзін. Але групоўка Гебрэ так павяла справу, так падкопвала выбітную, але марнеючую ўжо групоўку Абэбэ, што той апусьціўся сьпярша да двух, а пасьля толькі да аднаго допуску, а Гебрэ, які выслужыўся ў Конга і меў высокія міжнародныя адзнакі, падскочыў аж да чатырох допускаў. Я, дружа мой, у найлепшыя часы мог разьлічваць на адзін допуск штомесяц, хоць мяне памылкова ацэньвалі нават вышэй, але і гэта была значная пазыцыя, бо пад беспасярэднімі, найкаштоўнейшымі допускамі складалася герархія пасярэдніх, друга-, трэце- і далейрадных допускаў, а там таксама былі звадкі, кіпцюры, захады, падкопы. О, калі пра кагосьці было вядома, што ў яго ёсьць вялікая колькасьць беспасярэдніх допускаў, дык такому ўсе ў пас кланяліся, нават калі ён ня быў міністрам. А той, у каго колькасьць допускаў падала, ужо ведаў, што літасьцівы гаспадар перасоўвае яго па нахіленай лініі. Дадам, што ў дачыненьні да сваёй някідкай фігуры і адпаведнай прапарцыйнай галавы шаноўны гаспадар меў вушы вялікага памеру.

І. Б.:

Я быў капшуковым Абы Ганы Емы – богабаязнага скарбніка і спавядальніка імпэратара. Абодва шляхетныя паны былі аднолькавага веку, а таксама мелі падобны рост і выгляд. Выказваньне пра якое-кольвек падабенства да шаноўнага гаспадара, абранца Бога, гучыць як годная кары дзёрзкасьць, але ў выпадку Абы Ганы магу сабе дазволіць гэтую сьмеласьць, бо імпэратар адорваў майго гаспадара глыбокім даверам, і доказам нават пэўнай інтымнасьці іх адносінаў быў той факт, што Аба Гана меў неабмежаваную колькасьць допускаў да трона, меў папросту, можна так сказаць, бесьперапынны допуск. Будучы адначасна вартаўніком касы і спавядальнікам незабыўнага гаспадара, Аба меў доступ і да душы, і да кішэні імпэратара, гэта значыць, мог назіраць царственную асобу ў яе поўнай і годнай цэласьці. Як капшуковы я заўсёды

спадарожнічаў Абе падчас выкананьня ягоных фіскальных абавязкаў, несучы за сваім гаспадаром капшук з найлепшай ягнячай скуры, які бунтаўнікі пазьней выставілі напаказ вуліцы. Я апекаваўся таксама іншым, вялікім мехам, які напаўнялі дробнымі манэтамі напярэдадні нацыянальных сьвятаў, якімі былі: дзень народзінаў імпэратара, дзень яго каранацыі і, урэшце, дзень яго вяртаньня з выгнаньня. З гэтых нагодаў састарэлы наш уладар вырушаў у найбольш ажыўлены і людны квартал Адыс-Абэбы, які завецца Мэрката, дзе на спэцыяльна збудаваным памосьце я ставіў гэты мех, які было цяжка цягаць і які выдаваў мэталічныя гукі. Найлітасьцівейшы гаспадар чэрпаў зь яго жмені медзякоў і кідаў іх у зборышча жабракоў ды іншай прагнай галоты. Аднак хцівы натоўп усчынаў такі гармідар, што гэты акт міласэрнасьці заўсёды сканчаўся градам паліцыйных дручкоў на галовы распаленага напіраючага плебсу, і тады засмучаны гаспадар пакідаў памост, часта не апаражніўшы мяха нават да паловы.

В. А.-Н.:

...дык вось, скончыўшы пункт прызначэньняў, наш нястомны гаспадар пераходзіў у Залатую залю і пачынаў там гадзіну касы. Гэтая гадзіна прыпадала паміж дзясятай і адзінаццатай раніцы. У гэты час дастойнаму гаспадару таварышаваў набожны Аба Гана, а яму, у сваю чаргу, дапамагаў яго капшуковы, які ад яго не адыходзіў. Калі хтосьці меў добры нюх і чуйны слых, дык мог чуць, як палац наш пахне і шамоча грашыма. Але тут патрэбная была надзвычайная чульлівасьць, нават уява, бо грошы ў сваёй матэрыяльнай форме не ляжалі стосамі па кутах салёнаў, дый міласьцівы гаспадар ня быў схільны адорваць фаварытаў пачкамі даляраў. Не, гаспадар наш ня меў ніякіх такога кшталту схільнасьцяў! Хоць, дарагі дружа, табе гэта можа падацца незразумелым, нават капшук Абы Ганы ня быў скарбонкай бяз дна, і цырымоніймайстры мусілі ўжываць розныя захады, каб імпэратар не трапляў у няёмкія сытуацыі зь фінансавых прычынаў. Вось жа, памятаю, як па сканчэньні будовы імпэратарскага палацу, які называўся Генэтэ Леўл, гаспадар наш выплаціў заробкі замежным інжынэрам, але не палічыў патрэбным заплаціць нашым

мулярам. Гэтыя бедакі сабраліся перад фасадам збудаванага імі палацу і пачалі прасіць, каб і ім выплацілі належнае. Тады на бальконе зьявіўся галоўны майстар палацавага цырыманіялу і заклікаў іх перайсьці на задні бок палацу, дзе літасьцівы гаспадар рассыпле ім грошы. Усьцешаны натоўп перайшоў на загаданае месца, што дазволіла дастойнаму гаспадару безь непрыстойных перашкодаў выйсьці празь пярэднюю браму і паехаць у стары палац, дзе яго ўжо пакорна чакаў увесь двор. Паўсюль, куды б ні рушыў наш гаспадар, народ паказваў сваю разбэшчаную і ненаедную хцівасьць, просячы то хлеба, то ботаў, то быдла, то ахвяраваньня на будову дарогі. А гаспадар наш любіў наведваць правінцыі, любіў дапускаць да сябе простых людзей, уведваць іх клопаты, цешыць іх абяцаньнямі, хваліць пакорлівых і працавітых, ганіць лянівых і непаслухмяных уладам. Але гэтая схільнасьць літасьцівага гаспадара вышчэрблівала скарбніцу, бо правінцыі трэба было сьпярша падрыхтаваць, падмесьці, пафарбаваць, закапаць сьмецьце, патруціць мух, збудаваць школу і даць дзятве форму, аднавіць муніцыпальны будынак, пашыць сьцягі і намаляваць партрэты шаноўнага манарха. Было б нягодна, калі б наш гаспадар зьяўляўся дзесьці неспадзявана, вылазіў бы з-пад зямлі, не раўнуючы мізэрны зборшчык падаткаў, от, дакрануўся б да жыцьця, якім яно ёсьць. Можна было б уявіць сабе зьдзіўленьне й пярэпалах мясцовых натабляў! Іх дрыжыкі, іх страх! А ўлада ж ня можа працаваць у атмасфэры небясьпекі, улада – гэта пэўная ўмоўнасьць, абапертая на ўсталяваныя правілы. Уяві сабе, дарагі дружа, што асаблівы гаспадар меў бы звычку рабіць неспадзяванкі. Скажам, манарх ляціць на поўнач, дзе ўсё ўжо падрыхтаванае, пратакол вытрыманы, цырыманіял адпрацаваны, правінцыя блішчыць, як люстра, і тут раптам, у самалёце, шаноўны гаспадар кліча пілёта і кажа яму: сыне, паварочвай машыну, ляцім на поўдзень. А на поўдні няма нічога! Нічога гатовага! Поўдзень развалены, запэцканы, абадраны, чорны ад мух. Губэрнатар паехаў у сталіцу, натаблі сьпяць, паліцыя распаўзлася па вёсках і рабуе сялянаў. Як жа прыкра было б літасьціваму гаспадару! І якое зьняслаўленьне яго годнасьці! І нават – асьмелімся сказаць – нават папросту сьмех! У нас ёсьць такія правінцыі, дзе народ гнятліва дзікі, голы і паганскі і без настаўленьняў паліцыі мог бы дапусьціцца да абразы яго вялікасьці. Ёсьць іншыя правінцыі, дзе

неачэсанае сялянства, убачыўшы манарха, уцякло б са страху. І падумай, дружа, вось зацны гаспадар выйшаў з самалёта, а наўкола пустэча, ціша, чыстае поле, як вокам скінуць – ні жывой душы. Няма да каго зьвярнуцца, пагутарыць, пацешыць, няма прывітальнае брамы, няма нават аўтамабіля. Што рабіць, як сябе паводзіць? Паставіць трон і разаслаць дыван? Атрымаецца яшчэ горш, бо сьмяшней. Трон дадае годнасьці, але толькі праз кантраст з пакорай, якая яго атачае, менавіта пакорлівасьць падуладных стварае магутнасьць трона і надае ёй сэнс, безь яе трон – толькі дэкарацыя, нязручны фатэль з выцертым плюшам і скрыўленымі спружынамі. Трон у бязьлюднай пустэльні – гэта кампрамэтацыя. Сесьці на яго? Чакаць, што будзе? Спадзявацца, што хтосьці зьявіцца і ўзьнясе хвалу? Да таго ж няма нават машыны, каб дабрацца да найбліжэйшай сялібы і знайсьці свайго намесьніка. Шаноўны гаспадар ведае, хто ягоны намесьнік, але як яго так раптоўна знайсьці? Дык што ж застаецца нашаму гаспадару? Агледзецца наўкола, сесьці ў самалёт і такі паляцець на поўнач, дзе ўсё чакае ўва ўзбуджанай і нецярплівай гатовасьці: і пратакол, і цырыманіял, і правінцыя як люстра. Ці выпадае дзівіцца, што ў гэтай сытуацыі літасьцівы гаспадар не рабіў неспадзяванак? Хай бы, скажам, агаломшыў то адных, то другіх, то тут, то там. Сёньня агаломшыў правінцыю Бале, праз тыдзень агаломшыў правінцыю Тыгрэ. Бачыць: усё разваленае, бруднае, чорнае ад мух. Выклікае натабляў правінцыяў у Адыс-Абэбу, на гадзіну прызначэньняў, ганіць іх і зьнімае. Вестка пра гэта разыходзіцца па ўсёй імпэрыі. І які вынік? А такі, што натаблі па ўсёй дзяржаве перастаюць што-кольвек рабіць і толькі глядзяць у неба, ці не падлятае дастойны гаспадар. Люд марнее, правінцыя занепадае, але гэта ўсё дробязі ў параўнаньні са страхам перад гневам гаспадара. І што яшчэ горш, адчуваючы няпэўнасьць і пагрозу, ня ведаючы цяпер ні дня, ні гадзіны, злучаныя супольнымі непарадкамі і страхам, пачынаюць наракаць, крывіцца, вохкаць, пляткарыць пра здароўе міласьцівага гаспадара, а ўрэшце змаўляцца, пад'юджваць да бунтаў, баламуціць і рабіць падкопы пад, на іх погляд, неласкавы трон, які – о, якія ж дзёрзкія гэтыя думкі – жыць ім не дае. Таму, каб запабегчы хваляваньням у імпэрыі і ўнікнуць паралюшу ўлады, гаспадар наш прыняў гэтак плённы кампраміс, які даваў падвойны спакой – яму і натаблям. Цяпер

усе бунтаўнікі супраць манаршай улады закідаюць найсьвятлейшаму гаспадару, што ён у кожнай правінцыі меў прынамсі адзін палац, які заўсёды быў гатовы прыняць імпэратара. Праўда, можа, была ў гэтым пэўная надмернасьць, бо – скажам – у сэрцы пустыні Агадэну быў збудаваны раскошны палац, які ўтрымліваўся больш за дзесяць гадоў, заўсёды з прыслугай і запасам сьвежых харчоў, а нястомны гаспадар прабавіў там толькі адзін дзень. Але прыпусьцім, што маршрут вандроўкі дастойнага гаспадара калі-небудзь пралёг бы так, што яму выпала б начаваць у сэрцы пустыні. Ці тады неабходнасьць гэтага палацу не была б відавочнай? На жаль, наш неасьвечаны люд ніколі не зразумее права найвышэйшых рацыяў, а менавіта яно кіруе дзеяньнямі манархаў.

Э.:

Залатая заля, спадару Капучыцкі, гадзіна касы. Побач з імпэратарам стаіць сталага ўжо веку Аба Гана, а за ім яго капшуковы. У другім канцы залі таўкуцца людзі, нібыта бязладна, але кожны памятае сваё месца ў чарзе. Можна сказаць, натоўп, бо ласкавы гаспадар штодня прымаў безьліч падуладных, калі быў у Адыс-Абэбе, палац быў перапоўнены, віраваў бурлівым – хоць і падпарадкаваным натуральнай герархіі – жыцьцём, паўзь дзядзінец працякалі плыні машынаў, у калідорах таўкліся дэлегацыі, у пачакальнях балбаталі амбасадары, чыноўнікі цырыманіялу гойсалі з гарачкай уваччу, зьмяняліся варты, прыбягалі ганцы з папкамі дакумэнтаў, уваходзілі міністры, неяк так папросту і сьціпла, нібы гэта былі звычайныя людзі, сотні падданых спрабавалі ўсунуць саноўнікам то пэтыцыю, то данос, відаць было генэралітэт, чальцоў Кароннай рады, аканомаў імпэратарскіх маёнткаў, намесьнікаў, ну, словам, натоўп, усхваляваны, узбуджаны натоўп. Усё гэта зьнікала ў адзін момант, калі дастойны гаспадар пакідаў сталіцу і вырушаў з замежным візытам альбо выяжджаў у правінцыю закладаць камень, адкрываць дарогу ці пазнаваць клопаты люду, цешыць і заахвочваць. Палац умомант пусьцеў і замяняўся ў макет палацу, у рэквізыт, дваровая прыслуга прала і разьвешвала на вяроўках бялізну, дваровыя дзеці пасьвілі на газонах козы, чыноўнікі цырыманіялу сядзелі

па гарадзкіх барах, вартаўнікі завязвалі брамы ланцугамі і спалі пад дрэвамі. Гаспадар вяртаўся, грымелі фанфары, і палац зноў ажываў. У Залатой залі ў паветры заўсёды адчувалася электрычнасьць. Адчуваўся ток, які праходзіў праз скроні выкліканых і наводзіў на іх дрыготку, а крыніцай гэтага току быў відочны кожнаму капшук з найлепшай ягнячай скуры. Людзі па чарзе падыходзілі да шчодрага гаспадара, кажучы, для якой мэты ім патрэбныя грошы. Гаспадар наш слухаў, а пасьля задаваў дадатковыя пытаньні. Тут прызнаю, што міласьцівы гаспадар быў надзвычай дробязны ў фінансавых справах. Любыя выдаткі ў імпэрыі, якія перавышалі суму дзесяць даляраў, вымагалі яго асабістай згоды, а міністар, які прыходзіў да імпэратара па згоду на выданьне нават аднаго даляра, мог разьлічваць толькі на ўхвалу. Аддаць міністэрскую машыну на рамонт – трэба згода імпэратара. Замяніць у горадзе трубу, якая працякае, – трэба згода імпэратара. Купіць прасьцірадлы ў гатэль – павінна быць згода імпэратара. Дружа, як жа ты, мусіць, дзівіься проста надзвычайнай працавітасьці і гаспадарлівасьці састарэлага гаспадара, які бальшыню свайго манаршага часу праводзіў за вывучэньнем рахункаў, праслухоўваньнем каштарысаў, адкіданьнем прапановаў, роздумамі аб людзкой хцівасьці, хітрасьці, навязьлівасьці. Аднак гаспадар наш у гэтых справах ніколі не выяўляў ні нуды, ні стомы. Заўсёды ўспадала на вока яго жывая цікаўнасьць, дапытлівасьць і ўзорная ашчаднасьць. Ён меў нейкую асаблівую цягу да фінансаў, і ягоны міністар фінансаў, Елма Дэрэса, належаў да групы людзей з найбольшай колькасьцю допускаў да імпэратара. Аднак тым, хто быў у патрэбе, гаспадар наш працягваў шчодрую руку. Выслухаўшы адказы на дадатковыя пытаньні, літасьцівы гаспадар паведамляў просьбіту, што разьвяжа яго фінансавыя цяжкасьці. Ашчасьліўлены чалавек складаў найглыбейшы паклон. Тады шчодры гаспадар паварочваў галаву ў бок Абы Ганы і шэптам называў яму суму грошай, якую набожны саноўнік меў дастаць з капшука. Аба Гана засоўваў руку ў капшук, даставаў грошы, укладаў іх у канвэрт і падаваў узрушанаму шчасьліўцу, які – паклон за паклонам, задам, задам, спатыкаючыся, шоргаючы – выходзіў. А пасьля, спадару Капучыцкі, на жаль, чуваць было плач гэтых мізэрных няўдзячнікаў. Бо ў канвэрце знаходзілася толькі малая частка той сумы, якую – як прысягалі гэтыя ненаедныя

рвачы – абяцаў ім шчодры гаспадар. Але што рабіць – вярнуцца? Складаць пэтыцыю? Абвінаваціць найбліжэйшага імпэратарскаму сэрцу саноўніка? Нічога падобнага не было магчымае. О, якая ж тады нянавісьць атачала богабаязнага скарбніка і спавядальніка! Бо, не адважваючыся запляміць годнасьць нашага гаспадара, грамадзкая думка вінаваціла яго – Абу Гану – у сквапнасьці і ашуканстве, у тым, што ён так плытка сягаў у капшук, што так доўга ў ім перабіраў, прасяваў грошы праз пальцы, якія ўтваралі густое сіта, і што ўвогуле з такой неахвотай засоўваў туды руку, нібыта капшук быў поўны ядавітых гадаў, а пасьля хутка і нават ня гледзячы, бо ён меў адчуваньне вагі манэт і памераў банкнот, уручаў канвэрт і даваў знак да паклонна-назад-скіраванага аддаленьня. Таму, калі яго расстралялі, думаю, ніхто не аплакваў яго, апроч міласьцівага гаспадара. Пусты канвэрт! Спадару Капучыцкі, ці вы ведаеце, што значаць грошы ў беднай краіне? Грошы ў беднай краіне і грошы ў багатай краіне – гэта дзьве розныя рэчы! Грошы ў багатай краіне ёсьць каштоўнымі паперамі, за якія вы на рынку купляеце тавары. Вы папросту пакупнік, нават мільянэр ёсьць толькі пакупніком. Ён можа купляць больш, але ён застаецца адным з тых, хто купляе, і толькі. А ў беднай краіне? У такой краіне грошы – гэта цудоўны, густы, дурманны, усыпаны вечным цьветам жываплот, якім можна адгарадзіцца ад усяго. Праз гэты жываплот вы ня бачыце паўзучай беднасьці, ня чуеце смуроду нэндзы, ня чуеце галасоў, якія гучаць зь людзкога дна. Але адначасна вы ведаеце, што ўсё гэта існуе, і вы адчуваеце гордасьць за свой жываплот. Калі ў вас ёсьць грошы, гэта значыць, у вас ёсьць крылы. Вы райская птушка, якая выклікае подзіў. Ці можаце вы сабе ўявіць, каб у Галяндыі натоўп людзей сабраўся паглядзець на багатага галяндца? Ці ў Швэцыі, ці ў Аўстраліі? А ў нас – так. У нас, калі зьявіцца князь, людзі пабягуць, каб пабачыць яго. Пабягуць, каб пабачыць мільянэра, і пасьля будуць доўга хадзіць і казаць – я бачыў мільянэра. Грошы ператвараюць для вас уласную краіну ў экзатычную зямлю. Усё пачынае зьдзіўляць вас – тое, як людзі жывуць, тое, пра што яны турбуюцца, і вы будзеце казаць: не, гэта немагчыма. Бо вы ўжо будзеце належаць да іншай цывілізацыі, а вы ж ведаеце закон культуры: дзьве цывілізацыі ня здолеюць добра пазнаць і зразумець адна адну. Вы пачняце глухнуць і сьлепнуць. Вы будзеце добра пачувацца ў сваёй

аточанай жываплотам цывілізацыі, але сыгналы другой цывілізацыі будуць для вас такімі незразумелымі, як быццам бы іх высылалі жыхары Вэнэры. Калі вам захочацца, вы зможаце стаць адкрывальнікам у сваёй уласнай краіне. Вы можаце стаць Калюмбам, Магелянам, Лівінгстанам. Але я сумняюся, каб вам гэтага захацелася. Такія вандроўкі небясьпечныя, а вы ж не вар'ят. Вы ўжо чалавек сваёй цывілізацыі, вы будзеце яе бараніць і змагацца за яе. Вы будзеце паліваць свой жываплот. Вы ўжо дакладна такі садоўнік, які трэба імпэратару. Вы ня хочаце страціць пер'я, а імпэратару патрэбныя людзі, якім шмат чаго ёсьць губляць. Наш літасьцівы манарх раскідваў беднаце медзякі, але людзей палацу адорваў багатымі дарамі. Ён даваў ім маёнткі, землі, сялянаў, зь якіх яны маглі зьбіраць падаткі, даваў золата, тытулы, капітал. І хоць кожны, давёўшы сваю лаяльнасьць, мог разьлічваць на шчодрыя падарункі, усё адно ўвесь час былі сваркі паміж групоўкамі, сталае змаганьне за прывілеі, сталае зьдзірства і рвацтва, і ўсё з прычыны гэтай патрэбы райскай птушкі, якая апаноўвае кожнага чалавека. Найасаблівейшы наш уладар з задавальненьнем глядзеў на гэтую штурханіну. Ён любіў, каб людзі двара памнажалі сваю маёмасьць, каб расьлі іх рахункі і распухалі кашалькі. Я ня памятаю выпадку, каб шчодры манарх зьняў кагосьці з пасады і прыціснуў яго галаву да бруку з прычыны карупцыі. Хай сабе карупцыя, абы толькі быў лаяльны! Манарх наш, дзякуючы сваёй унікальнай памяці, а таксама бясконцай плыні даносаў, дакладна ведаў, хто колькі мае, але бухгальтэрыю гэтую пакідаў для сябе, ніколі яе не ўжываючы, калі падуладны паводзіў сябе лаяльна. Але калі ён адчуваў хоць бы цень нелаяльнасьці, адразу ўсё канфіскоўваў; адбіраў у здрадніка райскую птушку! Дзякуючы гэтай бухгальтэрыі кароль каралёў трымаў усіх у сваіх руках, і ўсе пра гэта ведалі. Быў, аднак, у палацы і такі выпадак: адзін з найбольш шляхетных нашых патрыётаў, вялікі партызанскі правадыр у гады вайны з Мусаліні – Тэкеле Вольда Гаварыят, несымпатычны імпэратару, адмаўляўся прымаць наймілаьсьцівейшыя падарункі, адкідаў прывілеі і ніколі не выяўляў схільнасьці да карупцыі. Гэтага на загад міласьцівага гаспадара гады трымалі ў вязьніцы, а пасьля сьцялі яму галаву.

Г. Х.-М.:

Нягледзячы на тое, што я быў высокім чыноўнікам цырыманіялу, завушна мяне называлі зязюляй дастойнага гаспадара. Гэта пайшло стуль, што ў імпэратарскім кабінэце стаяў швайцарскі гадзіньнік, зь якога выскоквала зязюля, паведамляючы пра надыход чарговай гадзіны. Вось жа, я меў гонар выконваць падобную ролю, калі гаспадар наш прысьвячаў сябе імпэратарскім абавязкам. Калі надыходзіў час, калі згодна з усталяваным пратаколам імпэратар павінен быў перайсьці ад адной дзейнасьці да наступнай, я падыходзіў да яго, некалькі разоў кланяючыся. Гэта быў сыгнал для ўдумлівага гаспадара, што адна гадзіна сканчаецца і надыходзіць час распачаць наступную. Насьмешнікі, якія ў любым палацы ахвотна кпяць зь ніжэйшых за сябе, дасьціпна казалі, што паклоны ёсьць маім адзіным заняткам і нават сэнсам існаваньня. Бо я насамрэч ня меў іншага абавязку апроч таго, што ў пэўную хвілю павінен быў скласьці паклон перад шаноўным гаспадаром. Так, гэта праўда. Але я мог бы адказаць ім – калі б займаны мною ўзровень даваў права на такую сьмеласьць, – што мае паклоны мелі функцыянальны і рацыяналізацыйны характар, што яны служылі агульнай, дзяржаўнай, то бок найвышэйшай мэце, тады як двор быў поўны саноўнікаў, якія старанна кланяліся без усялякага часавага парадку, абы толькі здарылася нагода, і да гэтай гнуткасьці карка іх падштурхоўвала не вышэйшая патрэба, але толькі падхалімства, лісьлівасьць і надзея на павышэньне ці падарунак. Я нават мусіў зважаць, каб у гэтым масавым і няспынным паклоньніцтве не згубіўся мой інфармацыйны і рабочы паклон, каб настырныя падхалімы не адапхнулі мяне назад, бо літасьцівы гаспадар, не атрымаўшы ў пару ўсталяванага сыгналу, мог бы згубіць арыентацыю і зацягнуць адну дзейнасьць на шкоду іншаму, ня менш важнаму занятку. Але, на жаль! Мая добрасумленнасьць у выкананьні абавязку давала невялікі плён, калі ішлося пра заканчэньне гадзіны касы і пачатак гадзіны міністраў. Гадзіна міністраў была прысьвечаная справам імпэрыі, але якія там справы імпэрыі, калі тут куфэрак адкрыты, а вакол яго таўчэцца безьліч фаварытаў і абраньнікаў! Ніхто ня хоча пайсьці з пустымі рукамі, пайсьці без падарунку, без канвэрта, не атрымаўшы, ня ўзяўшы. Часам гаспадар наш рэагаваў на гэтую пажадлівасьць нязлоснай лаянкай, але ніколі не ўпадаў у гнеў, бо ведаў, што

дзякуючы адкрытаму куфэрку яны мацней вакол яго яднаюцца і пакорней яму служаць. Гаспадар наш ведаў, што сыты будзе бараніць сытасьць, а дзе ж можна было насыціцца лепей, чым у палацы? Але і сам манарх вызнаваў сытасьць, аб якой сёньня столькі галасу ўздымаюць разбуральнікі імпэрыі. І скажу табе, дружа, чым далей, тым горай. Бо чым больш разбураліся падваліны імпэрыі, тым больш заўзята абраньнікі перлі да куфэрка. Чым нахабней бунтаўнікі ўздымалі галовы, з тым большай стараннасьцю фаварыты набівалі кішэні. Чым бліжэй было да канца, тым страшнейшае рвацтва і нічым не гамаванае зьдзірства. Заміж, дружа, брацца за стырно ды ветразі, бо відаць, што карабель тоне, кожны з нашых вяльможаў напакоўвае свой кашэль і аглядаецца ў пошуку прыстойнай шлюпкі. І такая ўжо ў палацы ўсчалася гарачка, такая ішла атака на куфэрак, што нават калі хто ня мкнуўся да багацьця, іншыя яго ўцягвалі, падбухторвалі і так напіралі, што і ён урэшце для спакою і прыстойнасьці таксама штосьці паклаў у кішэнь. Бо неяк так, дарагі дружа, павярнулася, што прыстойным было браць, а ганьбай – ня браць, што ў тым, хто ня браў, бачылі якуюсьці ўбогасьць, якуюсьці млявасьць, якуюсьці жаласную і вартую шкадаваньня імпатэнцыю. А той, хто меў, зноў жа, хадзіў з такой мінай, нібы хацеў рысануцца сваёй мужчынскай сілай і з упэўненасьцю ў сабе сказаць – на калені, бабскі народ! Неяк яно так павярнулася, і як жа мяне ганіць за тое, што ў гэтай пануючай атмасфэры я з такой цяжкасьцю і недапушчальным спазьненьнем закрываў гадзіну касы, каб літасьцівы гаспадар мог распачаць гадзіну міністраў.

П. Х.-Т.:

Гадзіна міністраў пачыналася аб адзінаццатай і заканчвалася апоўдні. Не было ніякіх клопатаў са скліканьнем міністраў, бо згодна са звычаем гэтыя саноўнікі ўжо ад рана былі ў палацы, і розныя амбасадары часта скардзіліся, што ня могуць наведаць міністра ў ягоным бюро, каб вырашыць зь ім свае пытаньні, бо сакратар нязьменна адказваў: міністра выклікалі да імпэратара. Факт, што наш ласкавы гаспадар любіў усіх мець навідавоку, любіў, каб усе былі пад рукой. На міністра, які адрываўся ад палацу, глядзелі нядобра, такі міністар ня мог

доўга ўтрымацца на сваёй пасадзе. Але міністры – крый Божа! – зусім і не спрабавалі адрывацца. Той, хто дайшоў да такога гонару, ужо загадзя ведаў прыхільнасьці манарха і пільна стараўся да іх дапасоўвацца. Той, хто хацеў узысьці па прыступках палацу, мусіў спачатку авалодаць нэгатыўнай ведай, гэта значыць, мусіў перадусім ведаць, чаго нельга – яму і ягоным падданым: чаго нельга сказаць ці напісаць, чаго нельга зрабіць, чаго нельга прагледзець ці занядбаць. Толькі з гэтай нэгатыўнай веды нараджалася веда пазытыўная, хоць, можа, ня надта ясная, клапатлівая, бо імпэратарскія фаварыты цьвёрда ступалі па грунце забаронаў, але з надзвычайнай асьцярожнасьцю і нават няпэўнасьцю ўваходзілі на грунт пастулятаў і прапановаў. Тут яны адразу пачыналі аглядацца на дастойнага гаспадара, чакаючы, што ён скажа. А з прычыны таго, што гаспадар наш меў звычку маўчаць, чакаць, адкладаць, яны таксама маўчалі, чакалі, адкладалі. І жыцьцё палацу, хоць і рухавае й гарачкавае, па сутнасьці таксама было поўнае маўчаньня, чаканьня, адкладаньня. Кожны міністар выбіраў такія калідоры, у якіх былі найбольшыя шанцы спаткаць шаноўнага гаспадара і скласьці яму паклон. Асаблівую руплівасьць у выбары гэтых маршрутаў выяўляў такі міністар, якому шапнулі, што на яго пайшоў данос аб неляяльнасьці. Такі міністар ужо цэлыя дні праседжваў у палацы, няспынна шукаючы рабалепнага спатканьня зь міласьцівым гаспадаром, каб сваёй заўсёднай прысутнасьцю паблізу яго даводзіць поўную няслушнасьць і зласьлівасьць даносу. Найасаблівейшы гаспадар меў звычку прымаць кожнага міністра асобна, бо тады выкліканы саноўнік сьмялей даносіў на сваіх калегаў, і дзякуючы гэтаму манарх наш меў магчымасьць лепей арыентавацца ў дзейнасьці апарату імпэрыі. Што праўда, прыманы на аўдыенцыю міністар найбольш ахвотна гаварыў не пра ўласную ўстанову, але пра непарадкі, якія пануюць у суседніх установах, але якраз дзякуючы гэтаму гаспадар наш, размаўляючы з усімі саноўнікамі, урэшце атрымліваў жаданую агульную карціну. Зрэшты, ня мела значэньня, ці якісьці саноўнік на вышыні ў выкананьні сваіх задачаў, ці не, пакуль ён выяўляў непахісную ляяльнасьць. Літасьцівы гаспадар адорваў зычлівасьцю і пратэкцыяй міністраў, якія не вылучаліся вынаходлівасьцю і пранікліваьцю, бо разглядаў іх як элемэнт, які стабілізуе жыцьцё ў імпэрыі, згодна з

наступным прынцыпам: манарх наш, як усім вядома, заўжды быў прыхільнікам рэформаў і разьвіцьця. Зазірні, дарагі дружа, у аўтабіяграфію, прадыктаваную імпэратарам у апошнія гады жыцьця, і ты пераканаесься, што мужны гаспадар змагаўся з барбарствам і цемнатой, якая панавала ў гэтай краіне (*выходзіць у іншы пакой і прыносіць выдадзены ў Лёндане Ullendorrf-ам салідны том пад назвай «My life and Ethiopia's progress» – «Маё жыцьцё і прагрэс Этыёпіі», гартае старонкі і расказвае далей*). Вось, напрыклад, наш гаспадар успамінае, што ўжо ў пачатку сваёй манаршай кар'еры забараніў адсячэньне рук і ног, што было традыцыйным пакараньнем нават за дробныя правіны. Пасьля ён піша, што забараніў надалей падтрымліваць звычай, які палягаў у тым, што чалавек, прызнаны вінаватым у забойстве – а гэта быў толькі прысуд грамады, бо судоў не было, – мусіў быць публічна пакараны сьмерцю праз пасячэньне, прычым пакараньне павінен быў выканаць найбліжэйшы чалец сям'і, гэта значыць, што сын забіваў у гэты спосаб бацьку, маці – сына. Заміж гэтага гаспадар наш уводзіць дзяржаўных катаў, прызначае спэцыяльныя пункты пакараньняў і загадвае, каб сьмяротны прысуд выконваўся агнястрэльнай зброяй. Пасьля: купляе за ўласныя грошы (*гэта ён падкрэсьлівае*) дзьве першыя друкарні і даручае распачаць выданьне першай у гісторыі краіны газэты. Пасьля: адкрывае першы банк. Пасьля: уводзіць у краіне электрычнае сьвятло, сьпярша ў палацы, пазьней у іншых будынках. Пасьля: скасоўвае звычай закоўваць вязьняў у ланцугі і жалезныя калодкі. Адгэтуль вязьняў пільнуюць вартаўнікі, аплачваныя з імпэратарскае казны. Пасьля: выдае дэкрэт, у якім асуджае гандаль нявольнікамі. Пастанаўляе ліквідаваць гэты гандаль да тысяча дзевяцьсот пяцідзясятага году. Пасьля: скасоўвае дэкрэтам звычай, называны ў нас ліебашай. Гэта датычыла выкрываньня злодзеяў. Чараўніцы давалі малым хлопчыкам таемныя зёлкі, і тыя, адурманеныя, ачмурэлыя, кіраваныя надпрыроднай сілай, заходзілі ў які-небудзь дом і паказвалі на злодзея. Выкрытаму, згодна з традыцыяй, адсякалі рукі і ногі. Уяві сабе, дружа, жыцьцё ў краіне, у якой, будучы абсалютна бязьвінным чалавекам, ты ў любы момант можаш быць асуджаны на адсячэньне рук і ног, вось ідзеш сабе вуліцай, хапае цябе за калашыну ачмурэлае дзіця, і натоўп адразу ж пачынае цябе секчы, сядзіш сабе ў

хаце, сьнедаеш, увальваецца п'яны хлопец, выцягваюць цябе на падворак і сякуць; толькі калі ты ўявіш сабе гэтае жыццё, зразумееш глыбіню пералому, які зьдзейсьніў шаноўны гаспадар. А ён далей рэфармуе: скасоўвае прымусовую працу, увозіць першыя аўтамабілі, стварае пошту. Захоўвае пакараньне бізуном у публічных месцах, але асуджае мэтад афарсата. Калі дзесьці здаралася злачынства, сілы аховы парадку атачалі вёску ці мястэчка і мардавалі жыхароў голадам, пакуль хтосьці не пакажа вінаватага. Але адныя пільнавалі іншых, каб ніхто не данёс, бо кожны баяўся, што менавіта яго могуць прызнаць вінаватым, і так пільнуючы, трымаючы адно аднаго, масава паміралі ад голаду. Гэта быў мэтад афарсата. Гаспадар наш асуджаў такую практыку. На жаль, кіруючыся імкненьнем да разьвіцьця, дастойны гаспадар дапусьціў пэўную неасьцярожнасьць. У нашай краіне даўней не было ні публічных школаў, ні ўнівэрсытэту, і таму імпэратар пачаў пасылаць маладых людзей за мяжу, каб яны там набіраліся навукі. Калісьці наш гаспадар сам кіраваў гэтым рухам, выбіраючы маладзёнаў з шляхетных і ляяльных сем'яў, але пазьней – ох, о сучасныя часы, адно боль галаўны ад іх! – такі пачаўся нацiск, такая штурханіна, каб выехаць за мяжу, што літасьцівы гаспадар паступова губляў кантроль над гэтай несьвядомай маніяй і папугайскай модай, якая апанавала моладзь, і насамрэч – усё больш гэтых маладзёнаў выпраўляліся па навуку то ў Эўропу, то ў Амэрыку. І – а як жа іначай! – з гадамі пачаліся турботы. Бо, не раўнуючы чарнакніжнік, гаспадар наш выклікаў надпрыродную і зьнішчальную сілу, якой аказаўся эфэкт канфрантацыі. Гэтыя людзі вярталіся дадому поўныя нядобранадзейных ідэяў, неляяльных паглядаў, шкадлівых думак, неразважных і разбуральных для парадку праектаў, і ледзь агледзеўшыся па імпэрыі, хапаліся за галовы і крычалі – сьвяты Божа, як штосьці такое ўвогуле можа існаваць! Вось табе, дружа, яшчэ адно пацьверджаньне няўдзячнасьці моладзі. З аднаго боку, столькі клопату нашага гаспадара, каб даць ім доступ да ведаў, з другога – адплата ў выглядзе абуральнага крытыканцтва, абразьлівых капрызаў, падрываньня, адпрэчваньня. Лёгка ўявіць сабе горыч, якой гэтыя паклёпнікі напаўнялі нашага манарха. Найгоршае, што гэтыя галапупкі, напханыя чужымі нашым звычаям дзівацтвамі, пачалі ўносіць у імпэрыю якісьці

неспакой, якуюсьці непатрэбную рухавасьць, якоесьці бязладзьдзе, якуюсьці прагу да супраціўных начальству дзеяньняў, і якраз тут дастойнаму гаспадару прыходзілі на дапамогу тыя міністры, якія не вылучаліся вынаходлівасьцю і праніклівасьцю. Не, яны прыходзілі не сьвядома і наўмысна, але, хутчэй, спантанна і міжвольна, але як жа гэта было істотна для захаваньня спакою ў імпэрыі. Бо было дастаткова, каб такі фаварыт дастойнага гаспадара выдаў бяздумны дэкрэт. Дэкрэт моцай свайго аўтарытэту пачынае дзейнічаць, а дзейнічаючы, натуральна, робіць шкоду, выклікае балаган, лямант, масу клопатаў, катастрофу. На шчасьце, гэта бачаць тыя мудрагельныя галапупкі, і ўжо ўяўляючы сабе ўсю фатальнасьць блізкіх наступстваў, кідаюцца на ратунак, бяруцца за выпраўленьне, пачынаюць рамантаваць, латаць, аднаўляць. І вось, заміж згубна марнаваць свае сілы на самавольны рух наперад, заміж ажыцьцяўляць свае непрадказальныя і разбуральныя для парадку фантазіі, нашы буркуны мусяць закасваць рукавы і брацца за аднаўленьне. А працы пры аднаўленьні заўсёды процьма! Вось жа, яны аднаўляюць і аднаўляюць, пасьля абліваюцца, нэрвы сабе расхіствaюць, тут бегаюць, там лётаюць і так забегаюцца, запрацуюцца, закруцяцца, што фантазіі зь іх гарачых галоваў паволі выпарваюцца. А цяпер паглядзім, дружа, уніз. Там ніжэйшыя чыноўнікі імпэрыі таксама якіясьці дэкрэты прымаюць, а грамада корпаецца, лётае і аднаўляе, аднаўляе. Вось у чым палягала стабілізуючая роля вылучаных дастойным гаспадаром фаварытаў. Гэтыя прыдворныя, прымушаючы асьвечаных фантазэраў і неадукаванае грамадзтва займацца аднаўленьнем, зводзілі ўсе нядобранадзейныя парывы да нуля, бо адкуль яшчэ браць сілы на парывы, калі ўся энэргія вычэрпваецца на аднаўленьне? Вось так, дарагі дружа, утрымлівалася блаславёная і богаўгодная раўнавага ў імпэрыі, у якой мудра і літасьціва валадарыў наш найвышэйшы гаспадар. Гадзіна міністраў, аднак, наводзіла на пакорных саноўнікаў трывогу, бо ніводны міністар ня ведаў, навошта канкрэтна яго выклікалі, і калі ягоная прамова не падабалася дастойнаму гаспадару, альбо калі ён адчуваў у ёй якоесьці круцельства, махлярства, наступнага дня ў гадзіну прызначэньняў міністар мог быць зьменены. Зрэшты, гаспадар наш і так меў звычку ўвесь час міністраў перасоўваць і

перасоўваць, і гэта для таго, каб яны нідзе не награвалі сабе месца і не пасьпявалі атачыць сябе натоўпам сваякоў ды землякоў. Шчодры гаспадар хацеў захоўваць выключнае права прызначэньня і павышэньня, таму скоса глядзеў, калі якісьці саноўнік убаку і паціху спрабаваў прызначаць і павышаць. Такая самавольнасьць, якая неадкладна асуджалася, пагражала тым, што ўва ўраўнаважаную шаноўным гаспадаром сыстэму закрадзецца якаясьці нерэгулярнасьць, якаясьці клопатная дыспрапорцыя, і што гаспадару нашаму, заміж аддавацца найвышэйшым справам, давядзецца папраўляць і выраўноўваць.

Б. К.-С.:

Апоўдні, як шатнік імпэратарскага суду, я апранаў на плечы выдатнага гаспадара чорную тогу, якая сягала зямлі, у якой манарх распачынаў гадзіну – да першай папаўдні – найвышэйшага і кончага суду, які на нашай мове называецца чэлот. Гаспадар наш любіў гэтую гадзіну справядлівасьці і, калі быў у сталіцы, ніколі не забываўся на судовы абавязак, нават за кошт іншых, а як жа ж важных, абавязкаў. Згодна з традыцыяй нашых імпэратараў, міласьцівы гаспадар праводзіў гэтую гадзіну стоячы, выслухоўваючы справы і абвяшчаючы выракі. У нашай гісторыі імпэратарскі двор быў вандроўным абозам, які пераяжджаў зь месца на месца, з адной правінцыі ў іншую, у залежнасьці ад данясеньняў імпэратарскай выведкі, задачай якой было высьветліць, у якіх мясьцінах чакаліся добрыя ўраджаі і дзе былі заўважаныя добрыя прыплоды скаціны. У такія блаславёныя месцы прыбывала вандроўная сталіца імпэрыі, і імпэратарскі двор разьбіваў свае незьлічоныя намёты. Пасьля, калі запасы збожжа і мяса ў гэтым жыцьцядайным месцы былі ўжо вычарпаныя, імпэратарскі двор, кіруючыся зьвесткамі паўсюльпрысутнай выведкі, згортваў намёты і пераяжджаў у іншую ўраджайную правінцыю. Нашая сталіца Адыс-Абэба якраз і была апошняй такой стаянкай двара вельміслаўнага імпэратара Мэнэліка, які загадаў пабудаваць на гэтым месцы горад і першы з трох палацаў, якія аздабляюць гэты горад. Яшчэ ў вандроўны пэрыяд адзін з намётаў, чорнага колеру, быў вязьніцай, у якой трымалі людзей, падазраваных у

асабліва небясьпечных для існаваньня манархіі правінах. Тады імпэратар, замкнёны ў залатой клетцы, бо ніводзін сьмяротны ня мог бачыць найясьнейшага аблічча, праводзіў гадзіну суду перад чорным намётам. Наш жа гаспадар выступаў у якасьці найвышэйшага суду ў спэцыяльна для гэтай мэты прызначаным будынку, які прылягаў да галоўнага палацу. Стоячы на ўзвышэньні, літасьцівы гаспадар выслухоўваў справы, як іх прадстаўлялі бакі, і абвяшчаў вырак. Гэта адпавядала працэдуры, усталяванай тры тысячагодзьдзі таму ізраільскім царом Салямонам, нашчадкам якога па простай лініі – як сьцьвярджала канстытуцыйнае права – быў наш шчодры гаспадар. Выракі, якія манарх агалошваў на месцы, былі кончыя і не падлягалі абскарджваньню, а калі выракам было сьмяротнае пакараньне – выконваліся неадкладна. Кара гэтая падала на галовы змоўцаў, якія бязбожна і не лякаючыся анатэмы хацелі захапіць уладу. Але літасьць гаспадара выяўляла сваю зычлівую сілу, як здараўся выпадак, калі – ці то празь няўважлівасьць варты, ці то дзякуючы неверагоднай спрытнасьці – які-небудзь маленькі чалавек апынаўся перад абліччам найвышэйшага судзьдзі і, просячы справядлівасьці, даносіў на натабляў, якія яго прыгняталі. Тады шчодры гаспадар прысуджаў вымову гэтым натаблям, а наступнага дня, у гадзіну касы, загадваў Абу Гану выплаціць пакрыўджанаму багатую міласьціну.

М.:

А трынаццатай гадзіне дастойны гаспадар пакідаў стары палац і накіроўваўся ў юбілейны палац – сваю рэзыдэнцыю – на абед. Імпэратара суправаджалі чальцы найвышэйшай сям'і і запрошаныя да стала саноўнікі. Стары палац хутка пусьцеў, калідоры апаноўвала ціша, вартавыя ўпадалі ў паўдзённую дрымоту.

Ідзе, ідзе

У людзей часта назіраецца страх падзеньня. Аднак падаць

здараецца нават найлепшым прафэсіяналам фігурнага коўзаньня; мы сутыкаемся з падзеньнямі таксама і ў штодзённым жыцьці. Падаць бязбольна трэба ўмець. У чым палягае бязбольнае падзеньне? Гэта кіраванае падзеньне, г. зн. пасьля значнага парушэньня раўнавагі мы скіроўваем цела ў той бок, падзеньне на які будзе найменш балючым. Падаючы, разьнявольваем цягліцы і скурчваемся, хаваючы галаву. Падзеньне паводле апісаных правілаў ня ёсьць небясьпечным. Аднак імкненьне ўнікнуць падзеньня любой цаной часта ёсьць прычынай балесных падзеньняў, якія адбываюцца ў апошнюю хвілю, без падрыхтоўкі.

З. Асінскі, В. Староста.
«Канькабежны спорт і фігурнае коўзаньне»

Зашмат выдаецца законаў, замала даецца прыкладаў.

Сэн-Жуст, «Выбраныя творы».

Ёсьць у дзяржаве асобы, пра якіх нічога не вядома апроч таго, што іх нельга абражаць.

К. Краўс, «Афарызмы».

Прыдворныя ўсіх эпох адчуваюць адну вялізную патрэбу: гаварыць так, каб нічога не сказаць.

Стэндаль, «Расін і Шэксьпір».

І пайшлі за марнасьцю, і змарнелі.

Ерамія 2.5.

Хоць бы яшчэ рабілі штосьці добрае, занадта доўга вы тут сядзіце. Таму я кажу – ідзеце, мы ўжо хочам пазбыцца вас. Напрамілы бог – убірайцеся!

Кромвэль, «Чальцам Парлямэнту,
называнага Доўгатрывалым».

Ф. У.-Х.:

Так, гэта быў шасьцідзясяты год. Страшны год, дружа. Зласьлівы чарвяк завёўся ў здаровым і сакавітым плодзе нашай імпэрыі, і ўсё пакаціласа так фатальна і зьнішчальна, што плод гэты, заміж соку, сплыў крывёю. Спусьцім сьцягі да паловы машты і схілім галовы. Пакладзём руку на сэрца. Сёньня мы ўжо ведаем, што тады мы бачылі пачатак канца і што тое, што адбылося пазьней, было абсалютна немінучым. У той час я служыў шаноўнаму гаспадару як чыноўнік міністэрства цырыманіялу, у дэпартамэнце картэжаў. На працягу ўсяго пяці гадоў маёй пільнай і бездакорнай службы я столькі зазнаў пакутаў, што дашчэнту пасівеў! А ўсё таму, што калі гаспадар наш выяжджаў з замежным візытам ці пакідаў Адыс-Абэбу, каб адзначыць сваёй прысутнасьцю якую-небудзь правінцыю, у палацы пачыналася найбольш зацятая і беспардонная барацьба за месца ў імпэратарскім картэжы. Барацьба гэтая заўсёды адбывалася ў два туры, гэта значыць: у першым нашыя натаблі і вяльможы змагаліся за саму прысутнасьць у картэжы, за ўнясеньне ў сьпіс дэлегацыі, а ў другім – ужо толькі пераможцы адборачнага туру спаборнічалі міжсобку за здабыцьцё адпаведна высокага і годнага месца ў сьвіце. Самы верх картэжу, яго першыя шэрагі, не ствараў для нас, чыноўнікаў, ніякіх цяжкасьцяў, бо тут выбар рабіў выключна літасьцівы гаспадар, а ягоныя рашэньні нам штораз перадаваў ад'ютант імпэратара праз кабінэт прыдворнага цырымоніймайстра. Верх гэты складалі чальцы імпэратарскай сям'і і Кароннай рады, адзначаныя міністры, а таксама тыя саноўнікі, якіх асаблівы гаспадар хацеў лепей трымаць блізка сябе, калі ў яго ўзьнікла было ў дачыненьні да іх падазрэньне, што ў ягоную адсутнасьць яны могуць ладзіць у сталіцы змову. Не было ў нас ускладненьняў таксама і з рабочай, службовай канцоўкай картэжу, у якую ўваходзілі людзі аховы, кухары, падушкавыя, шатнікі, капшуковыя, носьбіты прэзэнтаў, сабачнікі, тронавыя, лёкаі і служкі. Але паміж верхам і канцоўкай існавала чыстае поле, пустое месца ў сьпісе, і менавіта гэтую свабодную прастору імкнуліся апанаваць фаварыты і прыдворныя. Мы, картэжныя, жылі як паміж жорнамі, чакаючы толькі, каторы нас раздушыць. Бо мы павінны былі ўлучаць у сьпіс прапанаваныя прозьвішчы і перасылаць яго вышэй. Таму на нас навальваўся натоўп фаварытаў і атакаваў то просьбамі, то пагрозамі, яны то лямантавалі, то прысягалі адпомсьціць, адзін прасіў зрабіць

ласку, іншы падсоўваў грошы, адзін абяцаў залатыя горы, другі пагражаў даносам. Няспынна званілі заступнікі фаварытаў, і кожны загадваў улучыць у сьпіс свайго абраньніка, і лютаваў пры гэтым, і пагражаў. Але цяжка дзівіцца з заступнікаў, яны ж самі рабілі гэта пад ціскам, бо на іх упарта націскалі нізы, дый яны спаборнічалі міжсобку, бо якое ж было б прыніжэньне, калі б адзін заступнік уціснуў свайго фаварыта ў сьпіс, а другі – не. Так, жорны распачыналі рух, а ў нас, картэжных, сівелі ачмурэлыя галовы. Кожны з магутных заступнікаў мог змалоць нас у пыл, а ці ж была наша віна, што не ўдавалася ўлучыць у картэж палову імпэрыі? А калі ўжо ўсіх неяк удалося ўпіхнуць і сьпіс трохі ўтрэсься, прыгладзіўся, зноў пачыналася валтузьня, ператасоўка, перасоўваньне, выперадкі, новыя звадкі і прэтэнзіі. Бо тыя, хто быў ніжэй, хацелі вышэй, хто быў нумар 43, хацеў быць 26, хто 78, жадаў 32, хто 57, мкнуўся на 29, хто 67, пёр проста на 34, хто 41, пхаўся на 30, хто 26, спадзяваўся на 22, хто 54, падкопваўся пад 46, хто 39, паціху апярэджваў 26, хто 63, караскаўся на 49, і так угару, угару без канца. У палацы кіпеньне, асьляпленьне, па калідорах беганіна, нарады груповак, бо складаецца сьпіс дэлегацыі, і ўвесь двор толькі гэтым і заняты аж да хвілі, калі па салёнах і бюро разыдзецца вестка пра тое, што дастойны гаспадар выслухаў сьпіс, загадаў зрабіць канчатковыя папраўкі і кіўнуў галавой на знак згоды. Цяпер ужо нічога нельга зьмяніць, і кожны ведае, якое яму выпала месца. Лёгка пазнаць паводле хады і маўленьня, хто ўлучаны ў картэж, бо з гэтай нагоды адразу складалася, хоць і кароткачасовая, картэжная герархія, якая пачынала жыць побач з герархіяй допускаў і герархіяй тытулаў, бо палац наш утвараў цэлы пучок, цэлы сноп герархіяў, і калі хтосьці падаў на адным промні, то на іншым захоўваў сваё становішча і ўздымаўся, і такім чынам кожны знаходзіў сваё задавальненьне і напаўняў сябе гордасьцю. Пра таго, хто быў улучаны ў сьпіс, іншыя казалі з подзівам і зайздрасьцю: глядзіце, ён будзе хадзіць у картэжы! А калі гэтае вылучэньне здаралася зь ім некалькі разоў, то гэты саноўнік ставаў аточаным пашанай картэжным вэтэранам. Уся калякартэжная мітусьня гвалтоўна ўзмацнялася, калі гаспадар наш выпраўляўся з замежным візытам, зь якога прывозілі багатыя прэзэнты і пачэсныя ўзнагароды, а якраз тады, у канцы шасьцідзясятага году, імпэратар выпраўляўся зь візытам у Бразылію. У двары

шапталіся, што там будзе шмат бяседаў, закупаў, пажывы, таму такое пачалося спаборніцтва за месца ў картэжы, такая гарачая і хвацкая сутычка, што ніхто не заўважыў, як у самым нутры палацу завязалася страшная змова. Але ці сапраўды ніхто, мой дружа? Пазьней выявілася, што Маканэн Хабтэ-Вальд пранюхаў штосьці яшчэ раней. Пранюхаў, схапіў і данёс. Гэта была дзіўная постаць – нябожчык Маканэн. Міністар, абраньнік, які меў столькі допускаў да манарха, колькі хацеў, сапраўдны ўлюбёнец нашага гаспадара, і адначасна саноўнік, які ніколі ня думаў аб напханьні сваіх кішэняў. Але гаспадар наш, хоць ён і не любіў сьвятых у сваім атачэньні, выбачаў яму гэтую слабасьць, ведаючы, што дзівацкі гэты фаварыт ня мае часу займацца грашыма, бо цалкам апантаны адзінай думкай – як найлепей служыць імпэратару! Маканэн, дружа, быў аскетам улады, ахвярнікам палацу. Ён хадзіў у старой вопратцы, езьдзіў на старым «фальксвагене», жыў у старым доме. Літасьцівы гаспадар любіў усю гэтую простую сям'ю Маканэна, якая паходзіла зь нізоў грамадзтва, і аднаго зь яго братоў, якога звалі Аклілу, прызначыў на пасаду прэм'ера, а іншага, якога звалі Акалу, зрабіў міністрам. Сам Маканэн таксама быў міністрам прамысловасьці і гандлю, але ўстановай гэтай займаўся рэдка і неахвотна. Увесь свой час ён прысьвячаў разбудове сваёй прыватнай сеткі інфарматараў, выдаючы на гэта ўсе грошы, якія ў яго былі. Маканэн стварыў дзяржаву ў дзяржаве, меў сваіх людзей у кожнай установе, ува ўправах, у войску і ў паліцыі. Над зьбіраньнем і ўпарадкаваньнем даносаў ён працаваў дзень і ноч, мала спаў, меў змораны твар і выглядаў, як цень. Ён спальваў сябе гэтай дзейнасьцю, негаваркі, падобны да крата, без паказухі і выхваляньня, шэры, кіслы, схаваны ў паўзмроку, сам, як паўзмрок. Найглыбей ён стараўся пранікнуць у іншыя, канкурэнтныя выведныя сеткі, падазраючы там кінжал і здраду і – як пацьвердзілася цяпер – падазраючы слушна, цалкам паводле прынцыпу нашага гаспадара – калі добра ўнюхацца, то паўсюль сьмярдзіць. Так...

Далей ён апавядае, што ў шафе Маканэна, у прыватнай шафе гэтага фанатычнага калекцыянэра даносаў, раптам пачала пухнуць папка зь імем Гермамэ Нэвай. Дзіўнае жыцьцё ў папак, кажа ён. Ёсьць такія, якія гадамі гібеюць на паліцы, тоненькія і выцьвілыя, як сухое лісьце, замкнёныя, пакрытыя пылам, у

забыцьці чакаюць дня, калі, так ніколі дагэтуль і ня кратаныя, урэшце будуць падраныя і кінутыя ў печ. Гэта папкі людзей ляяльных, якія вялі ўзорнае і адданае імпэратару жыцьцё. Адкрыйма разьдзел «Учынкі»: нічога адмоўнага. Адкрыйма разьдзел «Выказваньні»: аніводнай паперкі. Скажам, ёсьць адзін аркуш, але на ім, на загад шаноўнага гаспадара, міністар пяра напісаў – фатына бэрэ, гэта значыць – мазок пяром, спроба пяра. Гэта значыць, што гаспадар наш палічыў запіс практыкаваньнем маладога працаўніка Маканэна, які яшчэ не навучыўся, калі і на каго можна даносіць. Альбо аркуш ёсьць, але скасаваны, як перакрэсьлены вэксаль. Бывае таксама, што папка, гадамі худая і зжаўцелая, у пэўны момант ажывае, паўстае зь мёртвых, пачынае набіраць вагу, тлусьцее. Такая папка пачынае дрэнна пахнуць. Гэты знаёмы пах, які выходзіць зь месца, дзе была адбытая неляяльнасьць. На гэты пах у Маканэна абвостраны, чуйны нюх. Ён бярэ сьлед, сочыць, узмацняе нагляд. Часта жыцьцё такой папкі, якая пачала расьці і набрала вагу, сканчаецца гэтак жа раптоўна, як і жыцьцё яе галоўнага героя. Абое зьнікаюць – ён са сьвету, а яго папка – з шафы Маканэна. Ёсьць якаясьці адваротная прапарцыйнасьць паміж таўшчынёй папак і людзей. Той, хто, змагаючыся з палацам, танчэ, худзее і марнее, мае шораз таўсьцейшую папку. Той жа, хто настроены ляяльна і пры нашым гаспадару з годнасьцю абрастае дабротамі, мае папку тонкую, як абалонка бурбалкі. Я згадаў, што Маканэн заўважыў, што папка Гермамэ Нэвая раптам пачала пухнуць. Гермамэ паходзіў з шляхетнай, ляяльнай сям'і, і, калі ён скончыў школу, літасьцівы гаспадар паслаў яго на вучобу ў Злучаныя Штаты. Там ён скончыў унівэрсытэт і вярнуўся ў краіну ўва ўзросьце трыццаці гадоў. Ён будзе жыць яшчэ шэсьць гадоў.

А. В.:

Гермамэ! Гермамэ, містэр Рычард, належаў да тых нядобранадзейных людзей, якія, вяртаючыся ў імпэрыю, хапаліся за галаву. Але хапаліся таемна, а навонкі выказвалі ляяльнасьць і казалі тое, што ў палацы ад іх чакалі пачуць. І шаноўны гаспадар – ах, як жа я гэта сёньня яму закідаю! – дазволіў сябе гэтым закалыхаць. Калі Гермамэ стаў перад ім, міласьцівы гаспадар паглядзеў на яго добрымі вачыма і

прызначыў яго губэрнатарам акругі ў паўднёвай правінцыі Сыдама. Там добрая зямля і буйная кава. Пачуўшы пра гэтае прызначэньне, усе ў палацы казалі, што наш усёмагутны ўладар адкрыў перад маладым чалавекам дарогу да найвышэйшых ушанаваньняў. Маючы імпэратарскае блаславеньне, Гермамэ паехаў, і спачатку было ціха. Цяпер яму трэба было толькі цярпліва чакаць – цярплівасьць была вартасьцю, якая ў палацы высока цанілася, – калі літасьцівы гаспадар пакліча яго да сябе і павысіць на ступень вышэй. Але дзе там! Прайшоў нейкі час, з Сыдама пачалі прыяжджаць натаблі. Прыяжджалі і круціліся каля палацу, асьцярожна распытваючы хто кузэнаў, хто знаёмых, ці можна скласьці на губэрнатара данос. Далікатная гэта справа, містэр Рычард, скласьці на свайго начальніка данос! Ня можна так проста з моста стукнуць, наўдачу, бо акажацца, што губэрнатар мае ў палацы моцнага заступніка, а той раззлуецца, назаве натабляў баламутамі і яшчэ насварыцца на іх. Таму яны спачатку паўсловамі, шэптам, потым штораз сьмялей, але ўсё яшчэ нефармальна, толькі так сабе, для падтрыманьня размовы, пачалі паведамляць, што Гермамэ бярэ хабар і за гэты хабар будуе школы. Цяпер уявіце сабе заклапочанасьць гэтых натабляў. Бо зразумела, што губэрнатар зьбірае даніну і ўсе натаблі зьбіраюць даніну. Улада нараджае грошы, так было ад пачатку сьвету. Але тут зьяўляецца ненармальнасьць – губэрнатар аддае даніну на школы. А прыклад зьверху ёсьць загадам для падуладных, гэта значыць, што ўсе натаблі маюць аддаваць сваю даніну на школы! А яшчэ дапусьцім на хвілю ганебную думку і ўявім, што ў іншай правінцыі зьявіцца другі Гермамэ і пачне раздаваць свой хабар. І вось мы ўжо маем бунт натабляў, якія пратэстуюць супраць прынцыпу аддаваньня хабару, і ў выніку – канец імпэрыі. Прыгожая пэрспэктыва – спачатку колькі грошай, а ўрэшце – падзеньне манархіі. О, не! Усе ў палацы сказалі – о, не! І дзіўная справа, містэр Рычард, бо шаноўны гаспадар не сказаў нічога. Выслухаў, але не азваўся ні словам. Маўчаў, гэта значыць, даваў яму яшчэ адзін шанец. Але Гермамэ ўжо ня здолеў устаць на дарогу паслухмянасьці. Праз пэўны час зноў зьявіліся натаблі з Сыдама. Зьявіліся з паведамленьнем, што Гермамэ далёка зайшоў: пачаў раздаваць безьзямельным сялянам абложныя землі, то бок, зрабіў замах на ўласнасьць. Гермамэ выявіўся

камуністам. О, страшная гэта справа, мой ты любачка. Сёньня раздасьць аблогі, заўтра забярэ зямлю ў памешчыкаў, а скончыць імпэратарскімі маёнткамі! Гэтым разам шчодры гаспадар ня мог больш маўчаць. Гермамэ быў выкліканы ў сталіцу на гадзіну прызначэньняў і сасланы губэрнатарам у Джыджыгі, дзе ён ужо ня мог раздаваць земляў, бо гэтую акругу насяляюць толькі качэўнікі. Падчас цырымоніі Гермамэ дазволіў сабе парушэньне, якое павінна было абудзіць у шаноўным гаспадару найвялікшую чуйнасьць – выслухаўшы прызначэньне, ён не пацалаваў манарха ў руку. На жаль

Далей ён сьцьвярджае, што менавіта тады Гермамэ завязаў змову. Ён ненавідзіць гэтага чалавека, але захапляецца ім. Было ў ім штосьці, што прыцягвала іншых. Палымяная вера, дар пераканаьня, адвага, рашучасьць, хуткасьць. Дзякуючы гэтым рысам ягоная постаць вылучалася на тле шэрай, дагодлівай і палахлівай масы згоднікаў і падхалімаў, якія напаўнялі палац. Першай асобай, якую Гермамэ здабыў для сваіх плянаў, быў ягоны старэйшы брат – генэрал Мэнгісту Нэвай, начальнік імпэратарскай гвардыі, афіцэр бясстрашнага тэмпэрамэнту і надзвычайнай мужчынскай прыгажосьці. Затым абодва браты залучылі на свой бок начальніка імпэратарскай паліцыі – генэрала Цыгуе Дыбоў, а неўзабаве пасьля гэтага – начальніка аховы палацу, палкоўніка Воркнэха Гебаеху і іншых людзей з атачэньня імпэратара. Дзеючы ў строгай канспірацыі, змоўнікі стварылі рэвалюцыйную раду, якая на момант замаху налічвала дваццаць чатыры асобы. У бальшыні гэта былі афіцэры адборнай імпэратарскай гвардыі і палацавай выведкі. Найстарэйшым чалавекам у гэтай групе быў Мэнгісту, якому было сорак чатыры гады, але кіраўніком да канца заставаўся малодшы за яго Гермамэ. Ён сьцьвярджае, што Маканэн пачаў штосьці падазраваць і данёс імпэратару. Тады Хайле Сэлас'е выклікаў палкоўніка Воркнэха і спытаўся, ці гэта праўда, але Воркнэх адказаў: нічога падобнага. Воркнэх належаў да асабістых людзей, імпэратар увёў яго наўпрост з грамадзкіх нізоў у салёны палацу і бязьмежна яму верыў, магчыма, гэта быў адзіны чалавек, якому ён сапраўды верыў, бадай, таксама і з прычыны пэўнай псыхічнай выгоды – падазронасьць да ўсіх мучае, трэба камусьці давяраць, бо трэба хоць пры кім адпачываць. Імпэратар

ня даў веры данясеньням Маканэна таксама і таму, што ў той час падазраваў у змове не братоў Нэвай, але саноўніка Эндэлькачэва, у якім пачало выяўляцца пэўнае лібэральнае саслабленьне, зьмяншэньне стараннасьці, маркотнасьць і нібыта ўпадак духу. Застаючыся пры гэтым падазрэньні, імпэратар улучыў Эндэлькачэва ў картэж, каб мець яго навідавоку падчас візыту ў Бразылію. Ён згадвае, што дэталі таго, што адбылося пасьля, знаходзяцца ў паказаньнях генэрала Мэнгісту, складзеных пазьней перад ваенным судом. Па адлёце імпэратара Мэнгісту раздаў пісталеты афіцэрам сваёй гвардыі і загадаў ім чакаць далейшых загадаў. Гэта было ў аўторак, трынаццатага студзеня. Вечарам гэтага дня ў імпэратарскай рэзыдэнцыі Мэнэн сабралася на вячэру імпэратарская сям'я і група найвышэйшых саноўнікаў. Калі яны селі за стол, прыбыў пасланец Мэнгісту зь весткай, што імпэратар падчас падарожжа захварэў, што ён памірае і што ўсіх просяць сабрацца ў палацы, каб асэнсаваць сытуацыю. Пасьля прыбыцьця на месца ўсе былі арыштаваныя. Адначасна афіцэры гвардыі рабілі арышты ў рэзыдэнцыях іншых саноўнікаў. Але як бывае ў такой нэрвовай сытуацыі, пра многіх натабляў забыліся. Колькі чалавек здолелі ўцячы з гораду альбо схавацца ў дамах знаёмых. Апроч таго, бунтаўнікі позна адлучылі тэлефоны, і людзі імпэратара пачалі дамаўляцца і арганізоўвацца. Перадусім, яшчэ той жа ночы, праз брытанскую амбасаду яны паведамілі пра замах імпэратару. Хайле Сэлас'е перапыніў візыт і рушыў у зваротны шлях, але не сьпяшаўся, чакаў, пакуль рэвалюцыя праваліцца. Празь дзень апоўдні найстарэйшы сын імпэратара і наступнік трона Асфа Восэн ад імя паўстанцаў прачытаў па радыё адозву. Асфа Восэн быў чалавекам слабым, млявым, безыдэйны. Паміж ім і бацькам была ўзаемная няпрыязь, шапталі, што імпэратар мае сумневы, ці гэта насамрэч яго сын. Штосьці там не супадала ў датах паміж яго падарожжамі і тэрмінам шчасьлівага нараджэньня ў імпэратаркі першага нашчадка. Пазьней саракашасьцігадовы гаспадар тлумачыўся перад суровым бацькам, кажучы, што бунтаўнікі загадалі яму чытаць адозву, трымаючы пісталет ля яго скроні. «Апошнія некалькі гадоў, – чытаў Асфа Восэн тое, што яму напісаў Гермамэ, – у Этыёпіі панаваў застой. Атмасфэра незадаволенасьці і расчараваньня шторaз больш нарастала сярод сялянаў, гандляроў, чыноўнікаў, у войску і ў паліцыі, сярод студэнцкай моладзі, сярод усяго грамадзтва...

Нідзе не відаць поступу. Гэта ёсьць вынікам таго, што жменька саноўнікаў загрузла ў эгаізьме і нэпатызьме, заміж таго, каб працаваць для агульнага дабра. Народ Этыёпіі доўга чакаў дня, калі настане ліквідацыя беднасьці і адсталасьці, але з усёй безьлічы абяцаньняў ніводнае не было рэалізаванае. Ніводзін іншы народ няздольны на такую цярплівасьць...» Асфа Восэн абвясьціў, што створаны народны ўрад, і паведаміў, што ён ачоліў яго. Аднак няшмат людзей мелі тады радыё, і словы адозвы патанулі бяз рэха. У горадзе было спакойна. Гандаль квітнеў, на вуліцах панаваў звычайны рух і гармідар. Бальшыня людзей ні пра што ня чула, іншыя ня ведалі, што думаць пра ўсю гэтую гісторыю. Для іх гэта была палацавая справа, а палац заўсёды быў недаступны, недасяжны, непранікальны, незразумелы і месьціўся на іншай плянэце. Яшчэ таго ж дня Хайле Сэлас'е даляцеў да Манровіі і ўсталяваў радыйны кантакт са сваім зяцем – генэралам Абіе Абэбэ, губэрнатарам Эрытрэі. Тым часам зяць ужо вёў перамовы з групай генэралаў, якая на базах, што атачалі сталіцу, рыхтавала атаку на бунтаўнікоў. На чале гэтай групы стаяць генэралы Мэрыд Мэнгеша, Асэфа Аена і Кебэдэ Гебрэ, усе пародненыя з імпэратарам. Ён тлумачыць, што бунт усчала гвардыя і што паміж гвардыяй і войскам існаваў востры антаганізм. Гвардыя была асьвечаная і добра аплачваная, а войска цёмнае і беднае. Цяпер генэралы выкарыстоўваюць гэты антаганізм, каб кінуць войска супраць гвардыі. Яны кажуць салдатам – гвардзейцы хочуць улады, каб можна было вас эксплюатаваць. Тое, што яны кажуць, цынічна, але пераконвае войска. Салдаты крычаць – хочам загінуць за імпэратара! Энтузіязм у аддзелах, якія неўзабаве рушаць на сьмерць. Надыходзіць чацьвер, трэці дзень паўстаньня. Палкі, якімі камандуюць ляяльныя генэралы, уваходзяць у прадмесьці сталіцы. Ваганьні ў лягеры бунтаўнікоў. Мэнгісту не загадвае абараняцца, ня хоча праліцьця крыві. У горадзе яшчэ спакойна, рух нармальны. Кружляе самалёт, які раскідвае ўлёткі. На ўлётках словы праклёну, які кінуў на бунтаўнікоў патрыярх Базыліяс, галава царквы, сябар імпэратара. Імпэратар з Манровіі (Лібэрыя) ужо даляцеў да Форт-Ламы (Чад). Атрымлівае ад зяця паведамленьне, што можна прыляцець у Асмару. У Асмары спакой, усе пакорна чакаюць. Але ў імпэратарскім DC-6 псуецца рухавік. Імпэратар вырашае ляцець на трох рухавіках. Апоўдні Мэнгісту прыяжджае ўва

ўнівэрсытэт і сустракаецца са студэнтамі. Паказвае ім кавалак сухога хлеба. Гэта, кажа, мы сёньня далі есьці саноўнікам, каб яны ўведалі, чым харчуецца наш народ. Кажа, вы мусіце нам дапамагчы. У горадзе выбухае страляніна. Пачынаецца бітва за Адыс-Абэбу. На вуліцах гінуць сотні людзей. Пятніца, шаснаццатага студзеня, ёсьць апошнім днём паўстаньня. Ад ранку ідуць баі паміж аддзеламі войска і гвардыі. Папаўдні пачынаецца штурм палацу, у якім абараняецца рэвалюцыйная рада. Палац штурмуе танкавы батальён, якім камандуе зяць імпэратара – капітан Дэрэджы Хайле-Марыяма. Сабакі, здавайцеся! – крычыць капітан зь вежы танка. Падае, прашыты чаргой са станковага кулямёта. Унутры палацу разрываюцца артылерыйскія снарады. Калідоры і пакоі напаўняе грукат, дым і полымя. Далейшая абарона немагчымая. Бунтаўнікі ўрываюцца ў зялёны салён, у якім знаходзяцца арыштаваныя ў аўторак саноўнікі з імпэратарскай сьвіты. Адкрываюць па іх агонь. Гіне васямнаццаць найбліжэйшых людзей імпэратара. Тады правадыры змовы і расьсеяныя аддзелы гвардыі пакідаюць тэрыторыю палацу і адступаюць з гораду ў бок пакрытых эўкаліптавым лесам узгор'яў Энтота. Набліжаецца вечар. Самалёт, у якім ляціць імпэратар, прызямляецца ў Асмары.

А. В.:

О, гэтым судным днём, містэр Рычард, наш ляяльны і пакорны народ прадставіў пераканаўчы доказ адданасьці шаноўнаму гаспадару. Бо калі гэтыя разьбітыя ўшчэнт здраднікі кінулі палац і пачалі ўцякаць у бок блізкага лесу, распаленае нашым патрыярхам грамадзтва рушыла за імі ў пагоню. Ніякіх там танкаў ды гармат, дружа, хто што меў пад рукой, той тое браў і далучаўся да перасьледу. Дручкі, камяні, дзіды і кінжалы, – усё пайшло ўва ўжытак. Людзі вуліцы, якіх літасьцівы гаспадар адорваў гэтак шчодрай міласьцінай, з зацятасьцю і нянавісьцю ўзяліся разьбіваць аблудныя галовы гэтых паклёпнікаў і бунтаўнікоў, якія хацелі забраць у іх Бога і рыхтавалі ім немаведама якое жыцьцё. Бо калі б ня стала нашага гаспадара, хто б даваў ім міласьціну і падбадзёрваў словамі суцяшэньня? А ідучы крывавым сьледам гэтых уцекачоў, горад цягнуў за сабой вёску, і вось такая была карціна, што навакольныя

сяляне, хапаючы, што было пад рукой, хто дручок, хто нож, і кідаючы праклёны на паклёпнікаў, таксама кідаліся ў бой, каб адпомсьціць за зьнявагу, якую зазнаў шчодры гаспадар. Зграі абложаных гвардзейцаў бараніліся ў лясох, пакуль ім хапала боепрыпасаў, але пазьней частка здалася, а іншыя загінулі ад рук салдатаў і грамады. Тры, а можа пяць тысячаў гэтых людзей трапілі ў турмы, а яшчэ столькі ж загінула на радасьць гіенаў і шакалаў, якія нават з далёкіх мясьцінаў зьбягаліся на бяседу ў прыгарадныя лясы. І яшчэ доўга, цэлымі начамі, лясы гэтыя вылі і хіхікалі. А тыя, хто абразіў годнасьць слаўнага гаспадара, пайшлі, дружа, у пекла. Генэрал Дыбоў, напрыклад, той загінуў яшчэ падчас штурму палацу, а ягонае цела чэрнь павесіла перад брамай Першай дывізіі. Пазьней выявілася, што палкоўнік Воркнэх пасьля ўцёкаў з палацу дабраўся да прадмесьця, але там яго атачылі і хацелі ўзяць жыўцом. Але ён, містэр Рычард, ня даўся. Страляў да канца, забіў яшчэ колькі салдатаў, а калі ў яго застаўся апошні набой, усунуў рулю ў рот, стрэліў і ўпаў мёртвы. Ягонае цела павесілі на дрэве перад катэдрай Сьвятога Юр'я. Дзіўная гэта рэч, але гаспадар наш так і не паверыў у здраду Воркнэха. Пазьней шапталі, што ён яшчэ праз шмат месяцаў клікаў у спальню начную прыслугу і загадваў выклікаць палкоўніка. Гаспадар наш прыехаў з Асмары ў Адыс-Абэбу ў суботу вечарам, калі ў горадзе яшчэ было чуваць страляніну, а на плошчах адбываліся экзэкуцыі здраднікаў. На твары манарха было відаць заклапочанасьць, стому і смутак з прычыны зробленай яму крыўды. Ён ехаў у сваім аўтамабілі, сярод калёны танкаў і бронемашынаў. Увесь горад выйшаў, каб скласьці яму пакорныя і ўмольныя ўшанаваньні. Увесь горад кленчыў на зямлі, б'ючы чалом аб брук, і я, таксама стоячы на каленях у гэтым натоўпе, чуў енкі і крыкі жаху, уздыхі і выгукі. Ніхто не адважыўся зірнуць у твар шаноўнаму манарху, а ля брамы палацу князь Каса, хоць ён і не правініўся, бо змагаўся і меў чыстыя рукі, пацалаваў чаравікі імпэратара. Яшчэ той жа ночы наш усёмагутны ўладар загадаў застрэліць сваіх улюбёных ільвоў, якія, заміж бараніць падыходы да палацу, упусьцілі ў яго здраднікаў. А цяпер ты пытаесься пра Гермамэ. Гэты злы дух разам са сваім братам і нейкім капітанам Бае з імпэратарскай гвардыі выбраліся з гораду і хаваліся яшчэ тыдзень. Яны маглі перасоўвацца толькі ўначы, бо за іх адразу ж прызначылі ўзнагароду пяць тысячаў

даляраў, і таму ўсе іх шукалі, бо гэта былі вялікія грошы. Яны спрабавалі дабрацца да поўдня, пэўна, хацелі перайсьці ў Кенію. Але праз тыдзень, калі яны хаваліся ў кустах, ужо колькі дзён бязь ежы, млеючы са смагі, бо яны баяліся зьявіцца ў якой-небудзь вёсцы, каб здабыць харчоў і вады, яны былі аточаныя сялянамі, якія перасьледавалі іх і хацелі іх злавіць. І тады, як паказаў Мэнгісту, Гермамэ вырашыў усё скончыць. Гермамэ, так ён паказаў, зразумеў, што на крок апярэдзіў гісторыю, што пайшоў хутчэй за іншых, а калі хтосьці, ідучы са зброяй у руках, прасунецца на крок наперад за гісторыю, той мусіць загінуць. Вось жа, Гермамэ, калі сяляне ўжо падбягалі, каб іх злавіць, сьпярша стрэліў у Бае, пасьля ў брата, а пасьля застрэліўся сам. Сяляне думалі, што страцілі ўзнагароду, бо ўзнагарода была за ўзятых жыўцом, а тут, дружа, бачаць тры трупы. Аднак забітыя былі толькі Гермамэ і Бае. Мэнгісту ляжаў з тварам, залітым крывёю, але яшчэ жыў. Сяляне сьпешна завезьлі іх у сталіцу і прывезьлі Мэнгісту ў шпіталь. Пра ўсё паведамілі нашаму гаспадару, які, выслухаўшы гэта, сказаў, што хоча бачыць цела Гермамэ. Згодна з гэтым загадам трупы прывезьлі ў палац і кінулі на сходы перад галоўным уваходам. Тады літасьцівы гаспадар выйшаў з палацу, стаяў і доўга глядзеў на мёртвае цела. Маўчаў, задуменны, ні слова, людзі, якія пры ім стаялі, ня чулі, каб ён штосьці сказаў. Пасьля здрыгануўся і пайшоў назад, у глыб будынку, загадаўшы лёкаям зачыніць галоўныя дзьверы. Пазьней я бачыў цела Гермамэ, павешанае на дрэве перад катэдрай Сьвятога Юр'я. Там стаяў натоўп людзей, якія зьдзекаваліся са здраднікаў, пляскалі ў далоні і крычалі непрыстойнасьці. А яшчэ застаўся Мэнгісту. Гэты, у сваю чаргу, выйшаўшы са шпіталю, паўстаў перад ваенным судом. Падчас разьбіраньня ён трымаўся горда і, насуперак палацавым звычаям, не выказваў пакоры ці жаданьня маліць літасьці дастойнага гаспадара. Ён казаў, што не баіцца сьмерці, бо ад моманту, калі ён вырашыў выступіць супраць несправядлівасьці і зрабіць пераварот, ён лічыўся з тым, што загіне. Казаў, што яны хацелі зрабіць рэвалюцыю, і казаў, што ён яе не дачакаўся, але аддасьць кроў, зь якой вырасьце зялёнае дрэва справядлівасьці. Яго павесілі трыццатага сакавіка, на сьвітанку, на галоўным рынку гораду. Разам зь ім павесілі шэсьць іншых гвардзейскіх афіцэраў. Ён ані на каліва ня быў да сябе падобны. Стрэл брата

выбіў яму вока і зьнявечыў увесь твар, які цяпер быў зарослы чорнай ускудлачанай барадой. Другое вока пад ціскам вяроўкі вылезла наверх.

Расказваюць, што ў першыя дні па вяртаньні імпэратара ў палацы панаваў надзвычайны рух. Прыбіральшчыкі шаравалі падлогу, саскрабаючы плямы крыві, якая ўвабралася ў паркет, лёкаі здымалі падраныя і абпаленыя фіранкі, грузавікі вывозілі купы разьбітай мэблі і скрыні пустых гільзаў, шкляры ўстаўлялі новыя шыбы і люстры, муляры тынкавалі вышчарбленыя кулямі сьцены. Паволі зьнікаў спрад гару і пах пораху. Доўга адбываліся ўрачыстыя пахаваньні тых, хто загінуў, да канца захоўваючы ляяльнасьць; тым часам целы паўстанцаў хавалі па начах у невядомых, таемных месцах. Найбольш было выпадковых ахвяраў – падчас вулічных баёў загінулі сотні цікаўных дзяцей, кабет, што ішлі на рынак, мужчынаў, якія ішлі на працу альбо бесклапотна грэліся на сонцы. Страляніна сьціхла, войска патрулявала вуліцы гораду, які са спазьненьнем, ужо па факце, пачынаў перажываць жах і шок. Далей расказваюць, што пачаліся тыдні арыштаў, якія абуджалі паніку, зьнясільваючых дазнаньняў, брутальных допытаў. Панавала няпэўнасьць, страх, людзі шапталіся, пляткарылі, успаміналі падрабязнасьці замаху, дадаючы да іх, хто што мог, па меры сваёй фантазіі і адвагі, зрэшты, дадаючы па кутах, бо ўсякае абмеркаваньне апошніх падзеяў афіцыйна асуджалася, а паліцыя – зь якой ніколі ня варта жартаваць, нават калі яна сама да таго заахвочвае, што ў гэтым выпадку і так ня мела месца – прагнучы ачысьціцца ад падазрэньняў ва ўдзеле ў змове, стала яшчэ больш небясьпечная і працавітая, чым звычайна, дый не бракавала таксама ахвотнікаў, якія дадаткова пастаўлялі камісарыятам перапалоханых кліентаў. Усе чакалі, што зробіць імпэратар і якой будзе ягоная адозва, апроч звароту да запалоханай і заплямленай здрадай сталіцы, які ён абнародаваў адразу па вяртаньні і ў якім ён выказаў свой боль і шкадаваньне да купкі аблудных авечак, якія, легкадумна адарваўшыся ад статку, згубілі дарогу ў камяністай і акрэсьленай крывёю пустэльні.

Г. О.-Э.:

Заўсёды было праявай годнай кары дзёрзкасьці і супраціўных звычаям паводзінаў, калі хтосьці глядзеў імпэратару ў вочы, але цяпер, пасьля таго, што здарылася, нават найбольшы сьмяльчак у палацы не адважыўся б на такое. Усе адчувалі сорам за тое, што дапусьцілі змову, і страх перад справядлівым гневам нашага гаспадара. І гэтая сарамліва-палахлівая немагчымасьць пагляду пачала апаноўваць усіх у дачыненьні да ўсіх, бо спачатку ніхто ня ведаў, у якім ён становішчы, гэта значыць, каго цяпер шаноўны гаспадар прыме, а каго выкіне, чыю ляяльнасьць зацьвердзіць, а чыёй не прызнае, каму дасьць вуха, а каго пакіне без аніводнага допуску, і таму кожны, ні ў кім цяпер ня ўпэўнены, лічыў за лепшае не глядзець нікому ў вочы, і ўва ўсім палацы запанавала неглядзеньне, нябачаньне, у-паркет-утарапленьне, столяў-разгляданьне, на-мыскі-ботаў-пазіраньне, праз-акно-адлятаньне. Калі б я цяпер пачаў прыглядацца да кагосьці, у гэтым адразу абудзілася б падазроная думка-пытаньне – чаму гэта ён так уважліва да мяне прыглядаецца, у чым мяне падазрае, у чым можа мяне абвінаваціць, і каб апярэдзіць маю ўяўную дбайнасьць, гэты чалавек – на якога я цалкам нявінна паглядзеў, з чыстай цікаўнасьці ці забыўшыся – не паверыць у нявіннасьць і цікаўнасьць, але, адчуваючы падазрэньне, адкажа на дбайнасьць звышдбайнасьцю і адразу ж пабяжыць ачышчацца, а як тады можна было ачысьціцца, калі не запэцкаўшы таго, пра каго мы думалі, што ён хоча нас запэцкаць? Так, глядзеньне правакавала і шантажавала, кожны баяўся падняць вочы, каб ня ўбачыць дзесьці ў паветры, у куце, за фіранкай, у шчыліне бліскучага, як кінжал, вока. А яшчэ па ўсім палацы лунала, як грымоты зь цёмнай хмары, гучнае пытаньне, на якое не было адказу: хто правініўся, хто ўдзельнічаў у змове? Уласна кажучы, падазраванымі былі ўсе, і да таго ж падазраваныя слушна, калі нават трое найбліжэйшых і найбольш даверaных людзей нашага гаспадара, якіх ён уважаў за сваіх сыноў і якімі так ганарыўся, прыставілі пісталеты да яго скроні. Мэнгісту, Вокнэх і Дыбоў належалі да той жмені найвышэйшых абраньнікаў, якія ў любы момант мелі допуск да шаноўнага гаспадара, і нават – калі была патрэба – унікальнае права ўваходу ў спальню і абуджэньня яго падчас сну! Цяпер уяві сабе, дружа, зь якім адчуваньнем літасьцівы гаспадар адгэтуль клаўся ў свой ложак, ніколі ня ведаючы, ці прачнецца

наступным ранкам. О, якія ж ганебныя цяжары, якія прыкрасьці і невыгоды нясе ажыцьцяўленьне ўлады! І як мы маглі ратавацца ад падазрэньня? Ад падазрэньня няма ратунку! Любыя паводзіны, любыя ўчынкі толькі паглыбляюць падазрэньне, топяць нас шораз больш. Пачнём апраўдвацца, але дзе там! Адразу пачуем пытаньне: а гэта, сыне, ты так старанна апраўдваесься? Відаць, маеш на сумленьні штосьці, што хацеў бы схаваць. Альбо вырашым выявіць чынную пазыцыю і добрую волю, і адразу пачуем заўвагу – а што гэта ён так стараецца сябе паказаць? Відаць, хоча схаваць свае подласьці, гнюснасьці, думае, як бы затаіцца. І зноў дрэнна, нават яшчэ горш. Прычым – я кажу – усе мы былі падазраваныя, абвінавачваныя, хоць найласкавейшы гаспадар не казаў наўпрост, адкрыта, ані слова, але абвінавачаньне гэтае адчувалася ў ягоных вачах і ў такім пагляданьні на падуладных, што кожны курчыўся, прыпадаў да зямлі і думаў са страхам – на мяне нагаварылі. Паветра зрабілася цяжкое, густое, ціск нізкі, паралізуючая атмасфэра расчараваньня, якіясьці крылы апалі, штосьці трэснула, унутры трэснула. Наш праніклівы гаспадар ведаў, што пасьля такога ўдару частка людзей пачне апускацца, пачне расчароўвацца, рабіцца маркотнымі і маўклівымі, страціць руплівасьць, паддасца ваганьням і пытаньням, сумневам і маруднасьці, аслабленьню і разбэшчаньню, і таму пачаў у палацы чыстку. Гэта не была хуткая і поўная чыстка, бо дастойны гаспадар быў супраць усялякай бязбожнай і галасьлівай гвалтоўнасьці, а хутчэй дазаваная і прадуманая замена, дзеля якой старыя прыдворныя ня мелі спакою і жылі ў сталым страху, і заразом палац адкрываўся для новых людзей. Гэта былі людзі, якія хацелі добра жыць і рабіць кар'еры. Яны наплывалі з усёй краіны, накіроўваныя ў палац даверанымі намесьнікамі імпэратара. Не знаёмыя блізка са сталічнай арыстакратыяй, якая пагарджала імі з прычыны іх нізкага грамадзкага становішча, грубасьці і тапорнага мысьленьня, яны адчувалі страх і няпрыязь да тутэйшых салёнаў. Хутка яны таксама ўтварылі ўласную групоўку, якая трымалася асобы найвыдатнейшага гаспадара. Шчодрая ласка шаноўнага ўладара давала ім пачуцьцё ўсёмагутнасьці, чароўнае, але заразом як жа рызыкоўнае для любога, хто захоча парушыць вячэрнюю атмасфэру арыстакратычнага салёну ці занадта доўга і занадта навязьліва

дражніць таварыства, якое там зьбіраецца. О, трэба вялікая мудрасьць і тактоўнасьць, каб заваяваць салён. Мудрасьць альбо аўтаматы, у чым, дарагі дружа, ты сёньня можаш пераканацца, гледзячы на наша змучанае места. Паступова вось гэтыя асабістыя людзі, абраньнікі нашага гаспадара, пачалі запаўняць установы палацу, насуперак бурчаньню чальцоў Кароннай рады, якія ўважалі новых фаварытаў за людзей трэцяга гатунку, неадпаведных вымогам, якім павінен адпавядаць шчасьлівец, пакліканы на службу ў атачэньні караля каралёў. Аднак гэтае бурчаньне было адно доказам проста непрыстойнай наіўнасьці чальцоў памянёнай рады, якія ўгледжвалі слабасьць у тым, у чым гаспадар наш бачыў акурат сілу, і не маглі зразумець прынцыпу ўзмацненьня празь зьніжэньне, ня памятаючы дыму і агню, які толькі ўчора распалілі тыя, хто здаўна быў узвышаны, але аказаўся аслаблены. Важнай і карыснай рысай новых людзей было і тое, што яны ня мелі ніякіх плямаў у біяграфіі, ніколі ня бралі ўдзелу ў змовах, не цягнулі за сабой вылінялых хвастоў, нічога ня мусілі сарамліва хаваць за падшыўкай, ды што там, яны нават ня ведалі пра змовы, бо адкуль, калі дастойны гаспадар забараніў пісаць гісторыю Этыёпіі? Занадта маладыя і выхаваныя ў далёкай правінцыі, яны не маглі ведаць, што сам гаспадар наш прыйшоў да ўлады дзякуючы змове, калі ў тысяча дзевяцьсот шаснаццатым годзе з дапамогай заходніх амбасадаў зладзіў дзяржаўны пераварот і скінуў законнага наступніка трона Лыджа Іясу. Што перад пагрозай італьянскага ўварваньня ён публічна прысягнуў праліваць кроў за Этыёпію, пасьля чаго, калі тыя ўварваліся, паехаў караблём у Англію і прабавіў час вайны ў спакойным мястэчку Бат. І такі ў ім пазьней утварыўся комплекс у дачыненьні да партызанскіх правадыроў, якія, застаўшыся ў краіне, змагаліся з Італіяй, што калі ён вярнуўся на трон, ён паступова ліквідаваў іх ці аддаляў, заразом узвышаючы калябарантаў. І што сярод іншых такім чынам ён зьнішчыў вялікага правадыра Бэтвадэда Нэгаша, які ў пяцідзясятых гадах выступіў супраць імпэратара і хацеў абвясьціць рэспубліку. Шмат розных здарэньняў прыходзяць мне на памяць, але ў палацы нельга было пра іх размаўляць, а – як я казаў – новыя людзі не маглі іх ведаць, дый ня надта гарачую выяўлялі цікавасьць. І таму, што яны ня мелі даўніх сувязяў, адзіным шанцам іх існаваньня была прывязанасьць да

трона. Іх адзінай астояй – сам імпэратар. Такім чынам найвыдатнейшы гаспадар выклікаў да жыцьця сілу, якая ў апошняе лета яго панаваньня падтрымала падсечаны Германэ імпэратарскі трон.

З. С.-К.:

...і таму, што чыстка працягвалася, кожнага дня, калі набліжалася гадзіна прызначэньняў – а значыць, і звальненьняў, – нас, старых палацавых чыноўнікаў, апаноўвала застольная дрыготка. Кожны сядзеў за сталом і дрыжаў над сваім лёсам, гатовы ўчыніць усё, каб толькі з-пад ягоных лакцей не дасталі гэты прадмет мэблі. Калі адбываўся працэс Мэнгісту, за сталамі панавала боязь, што генэрал пачне цьвердзіць, быццам усе былі ў змове, а нават аддалены ўдзел, нават схаванае і ціхае ўхваленьне сканчалася вяроўкай. Таму калі Мэнгісту, нікога не назваўшы, замоўк аж да дня Апошняга Суду, з-за сталоў вырваўся акрылены ўздых палёгкі. Але на месца страху перад шыбеніцай прыйшоў страх перад уласным, асабістым зьнішчэньнем. Цяпер шчодры гаспадар ужо ня кідаў у сутарэньні, але звычайна пасылаў з палацу дадому, а гэта азначала асуджанасьць на нябыт. Дагэтуль ты быў чалавекам палацу, а значыць, кімсьці важным, вылучаным, меў імя, ты ўплываў і фармаваў, цябе шанавалі і выслухоўвалі, і ўсё гэта давала пачуцьцё існаваньня, прысутнасьці ў сьвеце, паўнаты жыцьця, яго вагі і прыдатнасьці. І вось гаспадар наш выклікае цябе на гадзіну прызначэньняў і назаўжды пасылае дадому. У адну сэкунду ўсё зьнікае, ты перастаеш існаваць. Ніхто ўжо не назаве твайго імя, ніхто ня вылучыць і не ўшануе. Паўторыш тыя ж самыя словы, якія ты казаў учора – але ўчора іх выслухалі з глыбокай пашанай, а сёньня на іх ня зьвернуць увагі. На вуліцы людзі абыякава мінаюць цябе, і ты ўжо ведаеш, што найменшы правінцыйны чыноўнік можа зрабіць табе скандал. Гаспадар наш ператварыў цябе ў слабае, безабароннае дзіця і выпусьціў у зграю шакалаў. Пакажы, што ты можаш! А яшчэ, крый Божа, пачнуць дакопвацца, вынюхваць, скрэбці. Часам я зноў думаю, што, можа, яно й лепей, каб паскрэблі. Бо калі пачнуць скрэбці, можна зноў пачаць існаваць, хай нэгатыўна і вусьцішна, але пачаць існаваць, перастаць тануць,

выставіць галаву на паверхню, каб сказалі: бачце, а гэты яшчэ існуе! У адваротным выпадку што застаецца? Збыткоўнасьць, мізэрнасьць, сумневы ў тым, што жыцьцё было. З гэтай прычыны ў палацы панаваў такі страх перад бездань ню, што кожны стараўся трымацца нашага гаспадара, ня ведаючы яшчэ, што ўвесь двор – што праўда, з годнасьцю і паволі – ссоўваецца на край бездані.

П. М.:

...і па сутнасьці, дружа, ад той хвілі, калі з палацу пайшоў дым, нас пачала ахінаць якаясьці адмоўнасьць. Мне цяжка сфармуляваць, у чым яна палягала, але паўсюль адчувалася адмоўнасьць, паўсюль яе было відаць, на тварах людзей, нібы зьменшаных і пакінутых, безь сьвятла і энэргіі, у тым, што людзі рабілі і як гэта рабілі, таксама была адмоўнасьць, у тым, што казалі, ня кажучы, у іх непрысутным, скурчаным, выключаным быцьці, у іх згаслым існаваньні, у іх караткасяжным, нізкаплянкавым мысьленьні, у іх прысядзібным, малазямельным корпаньні, у іх занядбанасьці і ў засмучанасьці, ува ўсёй навакольнай атмасфэры, ува ўсёй нерухомасьці, нягледзячы на рух, у штодзённай працы, у клімаце, у турботах, ува ўсім адчувалася адмоўнасьць, якая ахінала нас. І хоць імпэратар надалей выдаваў дэкрэты і рабіў захады, рана ўставаў і не спачываў, усё адно ўсё заканчвалася адмоўна, штораз больш адмоўна, бо ад таго дня, калі Гермамэ скончыў жыцьцё, а ягонага брата павесілі на галоўнай плошчы гораду, паміж людзьмі і паміж рэчамі пачалі паўставаць адмоўныя дачыненьні. Людзі нібыта не маглі апанаваць рэчы, якія існавалі-не-існавалі ўласным зласьлівым існаваньнем, якое ўцякала зь людзкіх рук. Зачараваная сіла гэтых рэчаў была такая, што ўсе пачуваліся бязраднымі перад іх самачынным правам зьяўленьня і зьнікненьня і не маглі ані зламаць, ані падпарадкаваць гэтай сваволі. І гэтае пачуцьцё бясьсільнасьці, гэтае сталае прайграваньне, адставаньне ад лепшых, уганяла іх у яшчэ большую адмоўнасьць, у здранцьвелую арніталёгію – у асавеласьць, панурасьць, у курапаткавае хаваньне. Нават размовы змарнелі, страцілі жывасьць і дыханьне. Размовы пачыналіся, але як бы не заканчваліся. Заўсёды даходзілі да

невідочнага, але адчувальнага пункту, за якім наступала маўчаньне, і ў гэтым маўчаньні ўтрымлівалася цьверджаньне, што ўсё ўжо вядомае і яснае, але яснае ў цёмны спосаб, вядомае непазнавальна, уладнае ў сваёй бязраднасьці, і пацьвердзіўшы гэтыя праўды хвілінай маўчаньня, размова зьмяняла кірунак і закранала іншую тэму, нікчэмную, пабочную тэму-адкід. Палац асядаў, гэта адчувалі ўсе мы, вэтэраны шаноўнага гаспадара, якіх лёс ахаваў ад чысткі, адчувалася падзеньне тэмпэратуры, жыцьцё штораз дакладней афармлялася ў рытуалы, але рабілася ўсё больш папяровым, нікчэмным, адмоўным.

Затым ён кажа, што хоць імпэратар лічыў, што сьнежаньскага пераварoту не было, і ніколі не вяртаўся да гэтай тэмы, замах братоў Нэвай выклікаў усё больш разбуральныя для палацу наступствы. Зь цягам часу наступствы гэтага пераварoту не слабелі, але ўзмацняліся, робячыся прычынай далейшых зьменаў у жыцьці двара і імпэрыі. Аднойчы ўражаны, палац ніколі ўжо ня зьведаў сапраўднага, лагоднага спакою. Паступова зьмянялася й сытуацыя ў горадзе. У таемных даносах паліцыі зьявіліся першыя згадкі пра хваляваньні. На шчасьце – як ён кажа – гэта яшчэ не былі хваляваньні вялікага, падрыўнога маштабу, але хутчэй – на пачатку – здрыгваньні, дробныя ваганьні, двухзначныя шолахі, шэпты, хіхіканьні, якаясьці празьмерная ацяжэласьць, расслабленасьць, пасіўнасьць, расхістанасьць, якоесьці пазьбяганьне і адмаўленьне, што выяўлялася ўва ўсім гэтым. Ён прызнае, што на падставе гэтых рапартаў цяжка было рабіць захады для падтрыманьня парадку, бо данясеньні гэтыя былі занадта цьмяныя і нават забаўна нявінныя, яны толькі паведамлялі, што штосьці вісіць у паветры, але выразна не называлі, што і дзе – а куды ж без такога ўдакладненьня паслаць танкі і ў якім кірунку загадаць адкрыць страляніну? Найчасьцей рапарты цьвердзілі, што гэтыя шолахі і шэпты паходзілі з унівэрсытэту – новай і адзінай у гэтай краіне вышэйшай навучальнай установы, у якой, зрэшты, немавед адкуль зьявіліся скептычныя і непрыхільныя адзінкі, гатовыя кідацца абразьлівымі і няспраўджанымі паклёпамі, абы толькі засмуціць імпэратара. Далей ён кажа, што манарх, які, нягледзячы на шаноўны ўзрост, захоўваў зьдзіўляльную для

атачэньня праніклівасьць, лепей за найбліжэйшых яго людзей разумеў, што надыходзяць новыя часіны і што час сабрацца, абнавіцца, паскорыцца і дагнаць. Зраўнацца і нават перагнаць. Так – упарта паўтарае ён – нават перагнаць! Прызнаецца – сёньня пра гэта ўжо можна казаць – што частка палацу паставілася да гэтых амбіцыяў зь няпрыязьзю і бурчэла сама сабе, што заміж паддавацца спакусе ўсялякіх няпэўных навінак і рэформаў лепей было б утаймаваць выяўляныя моладзьдзю замежныя поцягі і зьнішчыць неразважнае меркаваньне, што краіна павінна выглядаць іначай, што краіну трэба зьмяніць. Імпэратар, аднак, ня слухаў ані гэтага арыстакратычнага бурчаньня, ані ўнівэрсытэцкага нараканьня, уважаючы, што ўсялякія крайнасьці шкодныя і супярэчныя прыродзе, і, выяўляючы прыроджаную разважнасьць і празорлівасьць, пашырыў поле сваёй улады і павялічыў увагу да новых абсягаў, што выявілася, напрыклад, ува ўвядзеньні папаўднёвых рэжымных гадзінаў, паміж чацьвертай і сёмай, а менавіта гадзіны разьвіцьця, міжнароднай гадзіны, а таксама вайскова-паліцыйнай гадзіны. Для гэтай жа мэты імпэратар стварыў адпаведныя міністэрствы і ўправы, дэлегатуры, аддзелы, прадстаўніцтвы і камісіі і пасадзіў у іх мноства новых людзей, добра выхаваных, адданых і ляяльных. Палац запоўніла чарговае пакаленьне фаварытаў, якія энэргічна мкнуліся рабіць кар'еру. Гэта быў, успамінае П. М., пачатак шасьцідзясятых гадоў.

П. М.:

Якаясьці манія, дружа, агарнула гэты шалёны і непрадказальны сьвет, манія разьвіцьця. Усе хочуць разьвівацца! Кожны думае, як бы разьвіцца, прычым не звычайна, згодна з законам божым, што чалавек нараджаецца, разьвіваецца і памірае, але разьвіцца нечувана, дынамічна і магутна, разьвіцца так, каб усе захапляліся, зайздросьцілі, абмяркоўвалі, галовамі ківалі. Адкуль гэта ўзялося – невядома. Людзьмі авалодаў нейкі статкавы інстынкт, нейкае прагнае асьляпленьне, бо досыць, каб дзесьці на другім канцы сьвету хтосьці разьвіўся, і адразу ўсе хочуць разьвівацца, адразу напіраюць, штурмуюць, жадаюць, каб іх таксама разьвілі, каб іх узьнялі і зраўналі, і варта, дружа, занядбаць гэтыя галасы, і тут жа маеш бунты,

крыкі, пераваroты, адмаўленьні, расчараваньні і сабатаж. Але ж наша імпэрыя існавала сотні, нават тысячы гадоў бязь яўнага разьвіцьця, і тым ня менш яе ўладароў шанавалі, атачалі боскай славай. І імпэратар Зэра Якаб, і Товадрас, і Ёганэс – усіх атачалі. Каму б прыйшло да галавы ўпасьці перад манархам ніц і маліць, каб той яго разьвіў! Але цяпер сьвет пачаў зьмяняцца, з чаго дастойны гаспадар з прыроджанай беспамылковасьцю здаў сабе справу і ласкава пагадзіўся на гэтае разьвіцьцё, заўважаючы карысьць і чароўнасьць каштоўнай навіны, і таму, што ён заўсёды меў слабасьць да ўсялякага прагрэсу, нават больш за тое – любіў прагрэс, у ім і гэтым разам выразна выявілася добрая прага дзейнасьці і нехаваныя амбіцыі, каб праз гады сыты і ўсьцешаны народ гукнуў з прызнаньнем: гэй, гэта ён нас разьвіў! Вось жа, у гадзіну разьвіцьця – паміж чацьвертай і пятай папаўдні – гаспадар наш выяўляў асаблівую жывасьць і вынаходлівасьць. Ён прымаў карагоды плянавікоў, эканамістаў, фінансістаў, размаўляў, пытаўся, заахвочваў і хваліў. Адныя плянавалі, другія будавалі, ну, словам, пачалося разьвіцьцё не на жарт. Нястомны гаспадар езьдзіў і адкрываў то новы мост, то гмах, то лётнішча, надаючы гэтым аб'ектам сваё імя – мост імя Хайле Сэлас'е ў Агадэне, шпіталь імя Хайле Сэлас'е ў Харэры, заля імя Хайле Сэлас'е ў сталіцы, і так – што паўстала, тое атрымала імя імпэратара. А яшчэ ён нарожныя камяні закладаў, поступ будаўніцтва даглядаў, стужкі пераразаў, ва ўрачыстым запуску трактара ўдзел узяў, і паўсюль, як я казаў, размаўляў, пытаўся, заахвочваў і хваліў. У палацы павесілі мапу разьвіцьця імпэрыі, на якой – калі шаноўны гаспадар націскаў гузік – запальваліся агеньчыкі, стрэлкі, зоркі, кропкі, і ўсе яны мігцелі, зіхацелі, каб саноўнікі маглі пацешыць вока, хоць некаторыя бачылі ў гэтым толькі доказ зьдзівачаньня манарха, але, напрыклад, розныя замежныя дэлегацыі, то афрыканскія, то сусьветныя, яўна атрымлівалі асалоду ад выгляду мапы і, выслухаўшы тлумачэньні імпэратара пра агеньчыкі, стрэлкі, зоркі і кропкі, размаўлялі, пыталіся, заахвочвалі і хвалілі. І ішло б гэта так гадамі, на радасьць слаўнага гаспадара і яго саноўнікаў, калі б ня нашыя ныцікі-студэнты, якія ад часу сьмерці Гермамэ штораз больш пачалі галовы ўздымаць, розныя жахлівыя рэчы балбатаць, неразумна і дужа абразьліва супраць палацу выступаць. Маладзёны гэтыя, заміж выказваць удзячнасьць за

выгоду асьветы, паплылі каламутнымі і здрадлівымі водамі паклёпу і падбухторваньня. На жаль, дружа, гэта сумная праўда, што, не заўважаючы, што гаспадар наш скіраваў імпэрыю на дарогу разьвіцьця, студэнты пачалі закідаць палацу дэмагогію і ашуканства. Пра якое, казалі яны, гаварыць разьвіцьцё, калі беднасьць аж крычыць! Якое ж гэта разьвіцьцё, калі народ прыгнечаны нэндзай, цэлыя правінцыі гінуць з голаду, мала хто мае хоць бы пару ботаў, усяго жменька падданых умее чытаць і пісаць, хто менш-больш сур'ёзна захварэе, памірае, бо няма ні шпіталяў, ні лекараў, наўкола цемра, барбарства, прыніжэньне, прыгнёт, дэспатызм і сатрапія, эксплюатацыя і роспач і так далей у гэтым стылі, дарагі чужынец, закідалі, ачарнялі, і зь цягам часу штораз нахабней, штораз больш дзёрзка і непакорна выступалі супраць прыхарошваньня і падсалоджваньня, карыстаючыся з дабрыні шаноўнага гаспадара, які толькі рэдка загадваў страляць па гэтай узбунтаванай чэрні, якая з кожным годам усё большай а большай масай вывальвалася з брамы ўнівэрсытэту. Урэшце прыйшоў час, калі яны выступілі зь дзёрзкай прыхамацьцю рэфармаваньня. Разьвіцьцё, абвясьцілі яны, немагчымае без рэформаў. Трэба селяніну даць зямлю, скасаваць прывілеі, дэмакратызаваць грамадзтва, ліквідаваць фэўдалізм і вызваліць край з-пад замежнай залежнасьці. З-пад якой такой залежнасьці, пытаюся, калі мы былі незалежныя? Мы былі незалежнай дзяржавай тры тысячы гадоў! Вось такая легкадумная і пустая балбатня. Зрэшты, пытаюся, як рэфармаваць, каб усё не пасыпалася? Як гэта зрушыць, каб не развалілася? Ці хтосьці можа задаць сабе такое пытаньне? Зь іншага боку, адначасна разьвіваць і накарміць таксама цяжка, бо адкуль браць грошы? Ніхто ня бегае па сьвеце і не раскідвае даляраў. Імпэрыя мала вытварае і ня мае чым гандляваць. Дык як напоўніць скарбніцу? Вось праблема, якой наш усёмагутны ўладар займаўся з зычлівым і абачлівым клопатам, надаючы ёй найвышэйшае значэньне, што няспынна выяўлялася падчас міжнароднай гадзіны.

Т.:

Якое ж цудоўнае міжнароднае жыцьцё! Досыць паўспамінаць

нашыя візыты – лётнішчы, вітаньні, кветак-рассыпаньне, у-абдымкі-кіданьне, аркестры, кожная хвіліна адшліфаваная пратаколам, а далей – лімузіны, прыёмы, тосты напісаныя і перакладзеныя, параднасьць і бліск, пахвалы, даверныя размовы, сусьветныя тэмы, этыкет, раскоша, прэзэнты, апартамэнты, урэшце стома, натуральна, пасьля ўсяго дня стома, але якая ж мілая і разьняволеная, якая выкшталцоная і ганаровая, якая дастойная і годная, якая – так! – міжнародная! А наступным днём – адведзіны, дзяцей лашчаньне, падарункаў прыманьне, гарачка, праграма, напяцьце, але прыемнае, паважнае, якое на момант вызваляе ад палацавых клопатаў, адсоўвае айчынныя засмучаньні, дазваляе забыць пра пэтыцыі, групоўкі, змовы, хоць найзычлівейшы гаспадар, ушаноўваны гаспадарамі, асьвятляны фотаўспышкамі, заўсёды дапытваўся пра дэпэшы з паведамленьнямі, што ў імпэрыі, што зь бюджэтам, што ў войску, што ў студэнтаў. Гэтай міжнароднай раскошы даставалася нават мне, які хадзіў у картэжы ўсяго толькі ў якасьці дзясятніка шостага дзясятку, восьмага рангу, дзявятага ўзроўню. Зьвярні ўвагу, дружа, што гаспадар наш асабліва любіў замежныя падарожжы. Ужо ў дваццаць чацьвертым годзе, будучы першым манархам у нашай гісторыі, які пакінуў межы імпэрыі, міласьцівы гаспадар ушанаваў сваім візытам краіны Эўропы. Была ў гэтым нейкая фамільная схільнасьць да падарожжаў, перанятая ад бацькі, нябожчыка князя Маканэна, колькі разоў пасыланага імпэратарам Мэнэлікам за мяжу для перамоваў з урадамі іншых дзяржаваў. Дадам, што нястомны гаспадар наш ніколі не губляў гэтай схільнасьці, і нават, насуперак звычайнаму парадку лёсу, калі пад старасьць людзі ўсё ахвотней застаюцца ўдома, зь цягам часу ўсё больш і больш падарожнічаў, рабіў візыты, наведваў найбольш аддаленыя краіны, да такой ступені забаўляючыся ў гэтых вандраваньнях, што зласьлівыя журналісты з замежнай прэсы называлі яго лятучым амбасадарам уласнага ўраду і пыталіся, калі ён зьбіраецца наведаць сваю імпэрыю! Але ж гэта яшчэ адпаведны момант, дружа, каб разам выказаць шкадаваньне з нагоды недарэчнасьці, нават бурклівасьці іншаземных газэтаў, якія, заміж кіравацца зьбліжэньнем, разуменьнем, гатовыя на любую подласьць і надзвычай ахвотна мяшаюцца ўва ўнутраныя справы. Я цяпер разважаю, чаму шаноўны гаспадар, нягледзячы на цяжар гадоў, які клаўся на

яго сьпіну, усё часьцей і часьцей падарожнічаў, рабіў візыты. Усяму віною гэтая бунтарская пыха братоў Нэвай, якая назаўсёды парушыла лагодны спакой імпэрыі, бязбожна і безадказна тыцнуўшы на яе адсталасьць, недаразьвітасьць. А колькі вышэйпамянёных журналістаў адразу ж гэта падхапілі і нашага гаспадара ачарнілі. А студэнты да гэтага дарваліся і прачыталі, хоць і невядома, як дарваліся, бо найласкавейшы гаспадар цалкам забараніў імпарт усялякіх нагавораў, і пачаліся выступы, крытыка, балбатня пра застой, пра разьвіцьцё. Але гаспадар наш сам адчуваў дух часу і неўзабаве пасьля таго крывавага і ганебнага для імпэрыі бунту наказаў распачаць поўнае разьвіцьцё. А наказаўшы, ня меў іншага выйсьця, як толькі рушыць у вандраваньні ад сталіцы да сталіцы ў пошуках дапамогі, пазыкаў, капіталаў, бо імпэрыя нашая басаногая, худабедная, галадраная. І тут гаспадар наш выявіў сваю перавагу над студэнтамі, даводзячы ім, што можна разьвіваць і не рэфармаваць. А як гэта, спытаеш, дружа, магчыма? А так, што калі здабыць замежны капітал, каб ён будаваў фабрыкі, ніякая рэформа непатрэбная. І калі ласка – рэформаў гаспадар наш не дапусьціў, а фабрыкі будавалі, будавалі, то бок было разьвіцьцё. Досыць праехацца з цэнтру гораду ў бок Дэбрэ Зэйт – стаяць адна пры адной, сучасныя, аўтаматычныя! Але цяпер, калі шаноўны гаспадар ужо скончыў жыцьцё ў так недарэчнай закінутасьці, магу прызнацца, што ў мяне былі таксама і ўласныя думкі на тэму імпэратарскіх падарожжаў і візытаў. Гаспадар наш глядзеў глыбей і праніклівей, чымся хто-кольвек з нас. І гэтак гледзячы, разумеў, што штосьці заканчваецца і што ён занадта стары, каб стрымаць лявіну, якая надыходзіць. Усё больш стары і бясьсільны. Стомлены, вычарпаны. Ён усё больш патрабаваў збаўленьня, палёгкі. І гэтыя візыты былі вызваленьнем, ён мог уздыхнуць, перавесьці дух. Мог пэўны час не чытаць даносаў, ня слухаць рыку маніфэстацыяў і стрэлаў паліцыі, мог пэўны час не глядзець на твары падліз і падхалімаў. Ён ня мусіў, хоць бы адзін дзень ня мусіў разьвязваць неразьвязальнае, папраўляць непапраўнае, аздараўляць невылечнае. У гэтых аддаленых краінах ніхто ня ладзіў супраць яго змоваў, ніхто не вастрыў нажа, ён нікога ня мусіў вешаць. Ён мог спакойна пакласьціся спаць, ведаючы, што ўстане жывы, мог сесьці з прыязным прэзыдэнтам і паразмаўляць зь ім як чалавек з

чалавекам. Вось так, дружа, дазволь мне яшчэ раз захапіцца міжнародным жыццём. Хіба безь яго можна было б зьнесьці цяжар панаваньня? І дзе ж, урэшце, чалавеку шукаць прызнаньня і разуменьня, калі не ў далёкім сьвеце, у чужых краёх, падчас гэтых інтымных размоваў зь іншымі ўладарамі, якія на наш смутак адкажуць спачувальным смуткам, бо самі маюць падобныя клопаты і турботы? Але ўсё гэта таксама не выглядала так, як я тут апавядаю. Бо калі мы ўжо дайшлі да гэтай ступені шчырасьці, прызнаемся, што ў апошнія гады панаваньня нашага дабрадзея посьпехаў было штораз менш, расчараваньняў штораз больш. І нягледзячы на стараньні, манаршых дасягненьняў не прыбывала, а як жа ў сёньняшнім сьвеце абгрунтаваць самога сябе, ня маючы дасягненьняў? Пэўна, можна прыдумляць, у два разы перабольшваць, тлумачыць, але тады адразу падымаюцца падбухторшчыкі і ўзводзяць паклёп, і такое нейкае пачалося падступства і непрыстойнасьць, што хутчэй дадуць веры падбухторшчыкам, чымся словам трона. Вось жа, найвышэйшы гаспадар больш любіў выяжджаць за мяжу, бо там, выступаючы, спрэчкі залагоджваючы, разьвіцьцё рэкамэндуючы, братоў-прэзыдэнтаў на добры шлях настаўляючы, клопат пра лёс народу выказваючы, ён, з аднаго боку, ратаваўся ад пакутлівых айчынных турботаў, зь іншага боку, атрымліваў збавенную кампэнсацыю ў выглядзе найвышэйшай раскошы і зычлівых пахвалаў іншых урадаў і двароў. Бо выпадае памятаць, што гаспадар наш, нягледзячы на цяжар так доўгага жыцьця, нават у хвіліны найбольшых выпрабаваньняў і расчараваньняў ніколі ня кідаў барацьбы і, нягледзячы на гэтае знуджаньне і патрэбу кампэнсацыяў, ані на момант ня думаў адступіцца ад трона, а насупраць, па меры памнажэньня цяжкасьцяў і апазыцыі з асаблівай пільнасьцю выконваў абавязкі вайскова-паліцыйнай гадзіны, падчас якой ён умацоўваў трываласьць імпэрыі і неабходны парадак.

Б. Х.:

Найперш падкрэсьлю, што гаспадар наш, будучы найвышэйшай асобай у імпэрыі, якая стаяла па-над законам – бо, сам становячы адзіную крыніцу закону, ён не падлягаў яго нормам

і вызначэньням, – быў найвышэйшым ува ўсім, што існавала, што было пакліканае да жыцьця Богам ці людзьмі, а значыць, таксама і найвышэйшым галоўнаначальнікам арміі і паліцыі. З абедзьвюх функцыяў вынікаў абавязак асаблівага клопату і ўважлівага нагляду за гэтымі інстытуцыямі, пагатоў што студзеньскія здарэньні далі сьведчаньне ганебнага непарадку, абразьлівага парушэньня субардынацыі і нават блюзьнерскай здрады, якія завяліся ў шэрагах Імпэратарскай гвардыі і ў паліцыі. На шчасьце, аднак, генэралы войска ў гэтай неспадзяванай гадзіне выпрабаваньня давялі сваю ляяльнасьць, умагчыміўшы імпэратару годнае, хоць і балючае вяртаньне ў палац, але ўратаваўшы нашаму гаспадару трон, цяпер яны пачалі дакучаць дабрадзею, дамагаючыся адплаты за гэтую службу. Бо ў войску панавала такая прыземленасьць, што ляяльнасьць пералічалі на грошы і нават чакалі, што шчодры гаспадар з уласнай ініцыятывы будзе ім штораз больш набіваць кішэні, ня памятаючы, што прывілеі карумпуюць, а карупцыя пляміць гонар мундура. І гэтая дзёрзкасьць і нахабства генэралаў арміі перадавалася таксама кіраўнікам паліцыі, якія таксама прагнулі карумпаванымі, прывілеямі абсыпанымі быць, кішэні сабе набіваць. А ўсё таму, што яны бачылі прагрэсуючую слабасьць палацу і спрытна выснавалі, што цяпер яны часта могуць быць патрэбныя нашаму манарху і што ў канцавым выніку яны становяць найнадзейнейшую, а ў крытычных хвілінах – адзіную астою ўсёўладнай улады. Тады абачлівы гаспадар мусіў увесьці вайскова-паліцыйную гадзіну, падчас якой ён раздаваў вышэйшым афіцэрам шчодрыя міласьці і выяўляў клопат пра стан гэтых інстытуцыяў, якія забясьпечвалі парадак і ўнутраную стабілізацыю, блаславёную народам. З дапамогай міласьцівага гаспадара вышэйпамянёныя генэралы наладзілі сабе такое добрае жыцьцё, што ў нашай імпэрыі, у якой жыло трыццаць мільёнаў сялянаў і ўсяго сто тысячаў салдатаў і паліцыянтаў, сялянства атрымлівала толькі адзін адсотак дзяржаўнага бюджэту, а войска і паліцыя – сорак. З гэтай прычыны студэнты мелі чарговую пажыву для пустога разумнічаньня, ачарненьня. Але ці слушна? Гэта ж наш гаспадар стварыў першую ў гісторыі краіны рэгулярную армію, аплачваную з адной, імпэратарскай касы. Перад ім існавала толькі войска, набіранае з паспалітага рушаньня, якое на заклік рушыла з усіх куткоў імпэрыі на поле бітвы, рабуючы па

дарозе што можна было, разараючы спатыканыя вёскі, забіваючы сялянаў, вынішчаючы быдла. Пасьля такіх пераходаў, а ім не было канца, манархія выглядала як журботнае пабоішча, ляжала ў руінах і ніколі не магла ўстаць на ногі. Шаноўны ж гаспадар асуджаў рабаўніцтва, забараніў склікаць паспалітае рушаньне і даверыў ангельцам місію стварэньня сталага войска, што й адбылося пасьля выгнаньня італьянцаў. Дастойны гаспадар душы ня чуў у сваёй арміі, ахвотна прымаў парады і любіў апранаць імпэратарска-маршальскі мундур, аздоблены каляровымі шэрагамі ордэнаў і мэдалёў. Аднак яго імпэратарская вышыня не дазваляла яму занадта падрабязна заглыбляцца ў дэталі жыцьця кашараў і дасьледаваць становішча простага салдата і ніжэйшых афіцэраў, а палацавая машына, якая расшыфроўвала вайсковыя шыфры, відавочна барахліла, бо зь цягам часу высьвятлялася, што імпэратар ня ведаў, што адбываецца за мурамі дывізій, а гэта – на жаль – пазьней фатальна адбілася на лёсах трона і імпэрыі.

П. М.:

...а ў выніку дбаньня нашага дабрадзея пра разьвіцьцё сілаў парадку і ягонай шчодрасьці на гэтай ніве столькі гэтых паліцыянтаў разьвялося ў апошнія гады ягонага панаваньня, столькі паўсюль зьявілася вушэй, якія тырчэлі зь зямлі, прыклейваліся да сьценаў, ляталі ў паветры, віселі на клямках, віжавалі ўва ўстановах, хаваліся ў натоўпе, пільнавалі ў брамах, тоўпіліся на рынках, што людзі – каб бараніцца ад пошасьці даносчыкаў – невядома як, дзе і калі, бяз школаў, бяз курсаў, бяз плытак і слоўнікаў навучыліся другой мовы, хутка, як паліглёты, апанавалі новую мову, засвоілі яе і дасягнулі ў ёй нечуванага ўмельства, так што мы, простыя і неасьвечаныя, раптам сталі дзьвюхмоўным народам. Гэта было вельмі карысна ў жыцьці, нават ратавала жыцьцё, ратавала спакой і дазваляла існаваць. Кожная з моваў мела розную лексыку і розны сэнс, і нават розную граматыку, і тым ня менш усе давалі сабе рады з гэтымі цяжкасьцямі і ўмелі ў належны час выказацца на належнай мове. Адная мова служыла для вонкавага маўленьня, другая – для ўнутранага, першая была

салодкай, а другая – горкай, першая – лагоднай, а другая – хрыплай, адная – высунутай угару, а другая – падціснутая да горла. І ўжо кожны вырашаў паводле раскладу і акалічнасьцяў, ці пэўную мову выцягнуць, ці схаваць, ці паказаць, ці закрыць.

М.:

І падумаць толькі, Вашаць, што пасярод гэтага росквіту, разьвіцьця, пасярод гэтай абвешчанай нашым манархам памыснасьці і дабрабыту раптам выбухае паўстаньне. Як гром зь яснага неба! У палацы зьдзіўленьне, неразуменьне, беганіна, клопатаў процьма, шаноўнага гаспадара пытаньне – адкуль узялося паўстаньне? А як жа нам, слугам пакорным, на гэта адказаць? Усякае можа здарыцца зь людзьмі, а значыць, можа здарыцца і з імпэрыяй, і вось якраз у шэсьцьдзесят восьмым годзе здарылася, што ў правінцыі Годжам сяляне ўзялі ўладу за горла. Усім натаблям гэта здавалася цалкам незразумелым, бо народ жа ў нас мірны, пакорны, набожны, да паўстаньняў зусім ня-схільны, а тут – я кажу – ні села ні пала – бунт! У нашай традыцыі пакора – гэта найважнейшая рэч, і нават дастойны гаспадар, будучы падлеткам, боты свайму бацьку цалаваў. А калі старэйшыя елі, дзеці мусілі стаяць тварам да сьцяны, каб не ахапіла іх бязбожная спакуса зраўнацца з бацькамі. Я ўспамінаю пра гэта, Вашаць, каб ты зразумеў, што калі ўжо ў такой краіне падданыя пачынаюць абурацца, для гэтага мусіць быць якаясьці надзвычайная прычына. Вось жа, тут прызнаем, што гэтай прычынай аказалася пэўная няўклюдная звышстараннасьць міністэрства фінансаў. Гэта былі гады выкананьня загаду на разьвіцьцё, якое прынесла нам столькі засмучэньняў. А чаму засмучэньняў? А таму што гаспадар наш, выступаючы за разьвіцьцё, абуджаў апэтыты і прыхамаці падуладных, а тыя, ахвотна даючы будзіць свае апэтыты, думалі, што разьвіцьцё – гэта прыемнасьці і ласункі, і давай дамагацца стравы і паправы, грошай і дабротаў. А найбольшыя засмучэньні выклікалі посьпехі асьветы, бо большала тых, хто скончыў школу, і іх трэба было расьпіхваць па ўстановах, у выніку чаго бюракратыя разбухала, стала вялізнай і выцягвала з імпэратарскай касы ўсё больш грошай. А як жа чыноўнікаў выганяць, калі гэта найбольш трывалае і ляяльнае апірышча?

Чыноўнік у кутку штосьці абмяркуе, сам сабе пабурчыць, але калі яго заклікаць да парадку – замаўчыць, а калі трэба – устане і падтрымае. І прыдворных таксама няможна гнаць, бо гэта найбліжэйшая палацавая радня. І афіцэраў таксама няможна – бо гэтыя забясьпечвалі спакойнае разьвіцьцё. І вось гэтак у гадзіну касы зьбіралася безьліч людзей, а капшук ужо скурчыўся дашчэнту, бо з кожным днём літасьцівы гаспадар мусіў плаціць за ляяльнасьць шораз большыя грошы. І таму што кошты ляяльнасьці расьлі а расьлі, паўставала пільная патрэба павелічэньня даходаў, і акурат тады міністэрства фінансаў загадала сялянам плаціць новыя падаткі. Сёньня мне ўжо можна сказаць, што гэта было рашэньне выдатнага гаспадара, але што імпэратар як ласкавы дабрадзей ня мог выдаваць прыкрых і непамысных пастановаў, усялякі дэкрэт, які накладаў новы цяжар на плечы народу, выдаваўся пад шыльдай якогасьці міністэрства. Калі народ ня мог зьнесьці гэтага цяжару і пачынаў бунтаваць, шчодры гаспадар лаяў міністэрства і зьмяняў міністра, хоць ніколі не рабіў гэтага адразу, каб не стварыць прыніжальнага ўражаньня, што манарх дазваляе расьперазанаму натоўпу наводзіць парадак у палацы. Хутчэй, наадварот – калі ён меркаваў, што ёсьць патрэба паказаць манаршую ўсёмагутнасьць, ён павышаў найбольш непапулярных саноўнікаў, ставячы іх на высокія пасады, не раўнуючы хацеў сказаць – а вось вам, глядзіце, хто тут напраўду ўладарыць, робячы магчымым немагчымае! – і такім чынам ласкава жартуючы з падуладнымі, шаноўны гаспадар даводзіў сваю сілу і павагу. І вось, Вашаць, з правінцыі Годжам прыходзяць паведамленьні, што сяляне хвалююцца, бунтуюць, зборшчыкам падаткаў галовы разьбіваюць, паліцыянтаў вешаюць, натабляў праганяюць, маёнткі паляць, ураджаі зьбіраюць. Губэрнатар рапартуе, што бунтаўнікі штурмуюць установы, дзе зловяць імпэратарскіх людзей, там на іх сварацца, катуюць, пасьля чвартуюць. Чым даўжэйшая, відаць, пакора, маўчаньне, цяжараў трываньне, тым большая пасьля незычлівасьць і лютасьць. А ў сталіцы ўжо студэнты выступаюць, бунтаўнікоў хваляць, пальцам на двор тыцкаюць, паклёпнічаюць. Добра, што гэтая правінцыя далёка, таму можна было яе адрэзаць, войскам аблажыць, агонь адкрыць, паўстаньне ў крыві патапіць. Але перш чым гэта было зроблена, вялікі страх адчуваўся ў палацы, бо ніколі не вядома, як далёка

разьліецца такі кіпень, і таму абачлівы гаспадар, гледзячы, як хістаецца імпэрыя, найперш паслаў у Годжам карнікаў, каб сялянам галовы паздымаць, але пасьля з увагі на незразумелы супраціў бунтаўнікоў загадаў новыя падаткі адклікаць і насварыўся на міністэрства за згаданую звышстараннасьць. Шаноўны гаспадар лаяў чыноўнікаў, якія не разумелі аднаго простага прынцыпу – прынцыпу другога меха. Бо народ ніколі не абураецца з той прычыны, што нясе цяжкі мех, ніколі не абураецца з прычыны эксплюатацыі, бо ён ня ведае жыцьця без эксплюатацыі, ня ведае, што яно існуе, а як жа можна жадаць чагосьці, чаго няма ў нашай уяве? Народ абурыцца толькі тады, калі раптам адным рухам хтосьці паспрабуе закінуць яму на плечы другі мех. Селянін тады ня вытрымае, упадзе тварам у гразь, але сарвецца і схопіць сякеру. Прычым, Вашаць, ён сякеру схопіць не таму, што гэтага другога меха ён ужо аніяк ня можа зьнесьці, не, ён бы яго зьнёс! Селянін сарвецца, таму што ў яго з гэтай нагоды зьявіцца такое адчуваньне, што, хочучы раптам і нібыта цішком закінуць яму другі мех на плечы, ты спрабаваў яго ашукаць, паставіўся да яго як да бяздумнай жывёлы, растаптаў рэшткі яго патаптанай годнасьці, палічыўшы яго за дурня, які ня бачыць, ня чуе, не разумее. Чалавек хапаецца за сякеру ня дзеля абароны сваёй кішэні, а толькі дзеля абароны сваёй людзкасьці, так, Вашаць, і таму гаспадар наш зганіў чыноўнікаў, якія дзеля ўласнай выгады і фанабэрыі заміж патроху, малымі мяшэчкамі цяжар дадаваць адразу, фанабэрыста цэлы мех на плечы закінуць спрабавалі. Цяпер жа гаспадар наш, каб захаваць у імпэрыі спакой у будучыні, загадаў чыноўнікам рабіць мяшэчкі і толькі па малым мяшэчку ды зь перапынкамі цяжар дадаваць, пільна гледзячы на твары носьбітаў: ці вытрымаюць яшчэ трохі, ці ўжо не, ці яшчэ крышку дакласьці, ці даць перадыхнуць. У гэтым, Вашаць, палягала ўся штука, каб ня так адразу, груба, з ботамі, усьляпую, але літасьціва, клапатліва, па тварах чытаючы, калі можна дакласьці, калі закруціць, а калі адкруціць. І гэтак, датрымліваючыся ўказаньняў манарха, праз пэўны час, калі кроў ужо ўвабралася і вецер разагнаў дым, зноў пачалі чыноўнікі падаткаў дадаваць, але ўжо патроху, паволі, лагодна, асьцярожна, а сяляне ўсё зьнесьлі і не адчувалі абразы.

3. С.-К.:

Вось жа, у год пасьля гэтага паўстаньня ў Годжаме, якое, паказаўшы зацяты і бязьлітасны твар люду, узрушыла палац і нагнала страху вышэйшым саноўнікам – але ня толькі ім, бо і ў нас, шараговых чыноўнікаў, мароз па скуры пайшоў – мяне напаткала асаблівае няшчасьце, бо сын мой, Хайлу, у тыя змрочныя гады студэнт унівэрсытэту, пачаў думаць. Менавіта так, пачаў думаць. Мушу патлумачыць табе, дружа, што думаньне ў тыя часы было дакучлівай невыгодай, нават пакутлівым калецтвам, і натуральна, высокі гаспадар у сваім бесьперапынным клопаце пра дабро і карысьць падуладных ніколі ня кідаў стараньняў абараніць іх ад гэтай невыгоды і калецтва. Навошта ж ім было марнаваць час, які яны павінны былі аддаваць справе разьвіцьця, навошта парушаць свой унутраны спакой і забіваць галаву ўсялякімі нядобранадзейнымі думкамі? Нічога прыстойнага і лагоднага не магло атрымацца з факту, што хтосьці вырашыў думаць ці неабачліва і дзёрзка далучыўся да таварыства тых, хто думаў. І гэткую неасьцярожнасьць, на жаль, зрабіў мой легкадумны сын, што першай заўважыла мая жонка, якой матчын інстынкт падказаў, што над нашым домам зьбіраюцца цяжкія хмары, і якая пэўнага дня сказала мне, што Хайлу хіба пачаў думаць, бо ён яўна пасмутнеў. А тады было так, што тыя, хто аглядаўся па імпэрыі і раздумваў аб тым, што іх атачала, хадзілі смутныя і задуменныя, зь нейкай неспакойнай задумлівасьцю ў паглядзе, нібыта прадчуваючы штосьці неакрэсьленае, невыказнае. Найчасьцей такія твары спатыкаліся сярод студэнтаў, якія – дадамо тут – рабілі нашаму гаспадару ўсё больш непрыемнасьцяў. Нават дзіўна, што паліцыя ня выйшла на гэты сьлед, на гэтую сувязь паміж думаньнем і настроем, бо калі б яна своечасова зрабіла гэтае адкрыцьцё, то магла б лёгка абясшкодзіць памянёных думаньнікаў, якія сваёй вечнай бурклівасьцю, скаргамі і зласьлівай маруднасьцю ў выказваньні задавальненьня столькі засмучэньняў і клопату прыносілі шаноўнаму пану. Імпэратар, аднак, выяўляючы большую кемлівасьць, чым ягоныя паліцыянты, разумеў, што смутак можа схіляць да думаньня, расчараваньня, наплявацельства, апушчанасьці, і таму наказваў ладзіць па ўсёй імпэрыі забавы, пацехі, танцы, сьвяты. Сам дастойны гаспадар загадваў палац

асьвятляць, убогіх частаваў, да весялосьці заахвочваў. А тыя, наеўшыся, натанчыўшыся, гаспадара свайго хвалілі. І гэта трывала гадамі, і так ужо гэтыя пацехі людзям галовы пазатыкалі, пазашпунтоўвалі, што яны, калі сустракаліся, толькі пра забаўляньне гутарылі, сьмехам выбухалі, дзівы ўспаміналі, байкі паўтаралі. Хоць бедната, але сьмехата. Хоць і блага, але брага. Хоць і гола, ды вясёла. Ды толькі тым, хто думаў і бачыў, як усё шарэе, гібее, у гразі качаецца, лішаём пакрываецца, ані да жартаў не было, ані да весялосьці. Пры гэтым яны яшчэ ўсім настрой псавалі, да думаньня іх схіляючы, але іншыя хоць і ня думалі, але мудрэйшыя былі, не давалі сябе ўцягнуць, і калі студэнты балбатаць пачыналі, мітынгаваць, тыя вушы затыкалі і як хутчэй зьнікалі. Бо навошта ведаць, калі лепей ня ведаць? Навошта цяжэй, калі можна лягчэй? Навошта гаварыць, калі лепей памаўчаць? Навошта ўдавацца ў справы імпэрыі, калі ў сваёй хаце столькі справаў, клопатаў? Вось жа, дружа, гледзячы, якой небясьпечнай дарогай рушыць мой сын, я стараўся яго адводзіць, адцягваць, да забавы заахвочваць, на экскурсіі пасылаць, як на мяне, дык ужо лепей бы ён начному жыцьцю аддаўся, чым гэтым пякельным змовам і маніфэстам. Уяві сабе маю засмучанасьць, прыгнечанасьць з таго, што бацька ў палацы, а сын у антыпалацы, што бацька выходзіць на вуліцу, ахоўваны паліцыяй ад уласнага дзіцяці, якое ў шэсьцях ходзіць, каменем цэліць. Я казаў яму: ды супакойся ж ты з гэтым думаньнем, ні да чога яно не даводзіць, кінь думаньне, бярыся за свавольства, паглядзі на іншых, якія мудрых слухаюць, якія яны сьветлыя ходзяць, твары маюць бясхмарныя, сьмехам душацца, забавамі жывуць, а калі ўжо якая заклапочанасьць на іх находзіць, дык толькі як бы сабе кішэнь напхаць, а да такіх турботаў і клопатаў гаспадар заўсёды ласкава ставіцца і пра тое, як бы цяжкую долю аблегчыць, падданых абагрэць, бесьперапынна думае. А як жа, кажа мне Хайлу, можа быць супрацьлегласьць паміж чалавекам, які думае, і чалавекам мудрым, калі ён ня думае, то значыць, што ня мудры. Акурат мудры, кажу, адно што ён думкі ў бясьпечнае месца скіраваў, ува ўтульны куток, у зацішша, а не паміж млынавых колаў, якія з грукатам усё зьнішчаюць, і там свае думкі так убіў, утрамбаваў, што ніхто ня можа дачапіцца, абвінаваціць яго, а ён і сам ужо забыў, дзе яны, і бязь іх навучыўся жыць. Але дзе

там! Хайлу жыў ужо ў іншым сьвеце, бо ў тым часе ўнівэрсытэт, разьмешчаны паблізу палацу, замяніўся ў сапраўдны антыпалац, і толькі адважныя людзі туды заходзілі, бо прастора паміж дваром і вучэльняй усё больш нагадвала поле бітвы, на якім вырашаліся лёсы імпэрыі.

Ён вяртаецца да сьнежаньскіх падзеяў, калі начальнік імпэратарскай гвардыі Мэнгісту Нэвай прыйшоў ува ўнівэрсытэт, каб паказаць студэнтам сухі хлеб, які паўстанцы далі есьці найбліжэйшым людзям манарха. Гэты выпадак быў узрушэньнем, якое студэнты запомнілі назаўсёды. Адзін з найбольш даверaных афіцэраў Х. С. прадстаўляў ім імпэратара – боскую асобу са звышнатуральнымі якасьцямі – як чалавека, які цярпеў у палацы карупцыю, быў абаронцам адсталай сыстэмы і мірыўся з галечай мільёнаў падуладных. Ад таго дня яны пачалі барацьбу, і ўнівэрсытэт ужо ня ведаў спакою. Бурлівы канфлікт паміж палацам і вучэльняй, які трываў амаль чатырнаццаць гадоў, паглынуў дзясяткі ахвяраў і скончыўся толькі са зьвяржэньнем імпэратара. У тыя гады існавалі два партрэты імпэратара. Адзін – вядомы міжнароднаму грамадзкаму меркаваньню – прадстаўляў імпэратара як трохі экзатычнага, але дзельнага манарха, які адзначаўся невычэрпнай энэргіяй, жывым розумам і глыбокай чульлівасьцю, які даў адпор Мусаліні, здабыў імпэрыю і трон, меў амбіцыі разьвіваць сваю дзяржаву і адыгрываць важную ролю ў сьвеце. Другі – фармаваны паступова, спачатку невялікай часткай айчыннай грамадзкай думкі – паказваў манарха як уладара, гатовага рашуча бараніць сваю ўладу, любой цаной, і перадусім як дэмагога і тэатральнага патэрналіста, які словамі і жэстамі прыкрываў прадажнасьць, тупасьць і сэрвілізм кіраўнічай эліты, ім створанай і пешчанай. Абодва гэтыя партрэты, зрэшты, як гэта бывае ў жыцьці, былі праўдзівыя, Х. С. быў складанай асобай, для адных ён быў поўны чароўнасьці, у іншых выклікаў нянавісьць, адныя яго багомілі, іншыя пракліналі. Ён кіраваў краінай, у якой былі вядомыя толькі найбольш брутальныя мэтады барацьбы за ўладу (ці яе ўтрыманьня), у якой вольныя выбары замянялі кінжал і атрута, дыскусію – стрэл і шыбеніца. Ён быў прадуктам гэтай традыцыі, сам практыкаваў яе. І заразом ён разумеў, што ёсьць у гэтым якаясьці немагчымасьць, якаясьці несумяшчальнасьць з новым сьветам. Але ён ня мог зьмяніць сыстэмы, якая трымала яго пры

ўладзе, а ўлада была для яго па-над усім. Адсюль уцёкі ў дэмагогію, у цырыманіял, тронавыя прамовы пра разьвіцьцё – такія пустыя ў гэтым краі гнятучай беднасьці і цемры. Ён быў надзвычай сымпатычнай постацьцю, праніклівым палітыкам, трагічным бацькам, хваравітым скнарам, выракаў нявінных на сьмерць, вінаватых аблашчваў, вось такія капрызы ўлады, лябірынты палацавай палітыкі, двухзначнасьці, цемры, ніхто ў іх не пранікне.

3. С.-К.:

Адразу пасьля паўстаньня ў Годжаме князь Каса хацеў сабраць ляяльных студэнтаў і зрабіць маніфэстацыю ў падтрымку імпэратара. Усё было ўжо гатовае, партрэты і транспаранты, калі дастойны гаспадар даведаўся пра гэта і сувора насварыўся на князя. Ні пра якія маніфэстанцыі не магло быць і мовы. Пачнуць з падтрымкі, а скончаць абразамі! Пачнуць зь віватаў, а пазьней прыйдзецца агонь адкрываць. І калі ласка, дружа, – яшчэ раз шаноўны ўладар давёў сваю вартую подзіву праніклівасьць. Бо ўва ўсеагульным балагане маніфэстацыю ўжо ня здолелі адклікаць. І калі рушыла шэсьце падтрымкі, якое складалася з паліцыянтаў, пераапранутых у студэнтаў, да яго адразу далучылася вялікая збунтаваная студэнцкая маса, і зламысная гэтая чэрнь скіравалася да палацу, і не было іншага выйсьця, як выставіць войска і загадаць навесьці парадак. У злашчаснай сутычцы, якая скончылася кровапраліцьцем, загінуў лідэр студэнтаў – Тылахум Гізаў. І якая ж іронія лёсу, што палегла таксама колькі тых паліцыянтаў, зусім не вінаватых! Я памятаю, што гэта было ў канцы сьнежня шэсьцьдзесят дзявятага году. Назаўтра я перажыў вельмі страшны дзень, бо Хайлу і ўсе ягоныя сябры пайшлі на пахаваньне, і такі натоўп сабраўся каля труны, што зь яго зрабілася новая маніфэстацыя, а нельга ўжо было далей дазваляць сталага хваляваньня, узрушэньня сталіцы, таму дастойны гаспадар паслаў бронемашыны і даў загад на надзвычай жорсткае ўсталяваньне парадку. І ў выніку гэтай надзвычайнай жорсткасьці загінула больш за дваццаць студэнтаў, і не зьлічыць было параненых і арыштаваных. Гаспадар наш загадаў на год закрыць вучэльню, чым уратаваў

жыццьцё многім маладым людзям, бо калі б яны вучыліся, мітынгавалі, на палац наступалі, зноў манарх мусіў бы адказваць дручкамі, стралянінай, кровапраліцьцем.

Распад

Дзіўная рэч, як надзвычай бясьпечна пачуваліся ўсе гэтыя жыхары найвышэйшых і сярэдніх паверхаў грамадзкага гмаху ў момант, калі выбухнула рэвалюцыя; з усёй наіўнасьцю духу яны разглагольствуюць пра цноты люду, пра яго лагоднасьць, адданасьць, пра яго нявінныя забавы, калі над імі ўжо вісіць год дзевяцьсот трэці: камічнае і страшнае гэта відовішча.

Таквіль, «Стары рэжым і рэвалюцыя».

І было там штосьці яшчэ, штосьці невідочнае, якісьці ўладны дух гібелі, які хаваўся ўнутры.

Конрад, «Лорд Джым».

У некаторых жа прыдворных Юстыніяна, якія былі пры ім у Палацы да позьніх гадзінаў, было ўражаньне, што заміж яго яны бачаць чужую здань. Адзін зь іх сьцьвярджаў, што імпэратар раптоўна зрываўся з трона і пачынаў хадзіць па залі (бо ён сапраўды ня мог доўга ўседзець на месцы); раптам галава Юстыніяна зьнікала, але цела далей хадзіла наўкола. Прыдворны, мяркуючы, што яго падманвае зрок, доўгі час стаяў зьбянтэжаны і бязрадны, аднак пасьля, калі галава вярталася на сваё месца на тулаве, са зьдзіўленьнем пераконваўся, што ён зноў бачыць тое, чаго хвілю таму не было.

Пракопі з Цэзарэі, «Сакрэтная гісторыя».

Потым задай сабе пытаньне: дзе ж гэта ўсё цяпер? – Дым, попел, паданьне, альбо нават ужо і паданьнем ня ёсьць.

Марк Аўрэль, «Роздумы».

Нічыя сьвечка не гарыць да самага ранку.

І. Андрыч, «Консулы іх імпэратарскіхвялікасьцяў».

М. С.:

Я шмат гадоў быў мінамётчыкам яснавяльможнага гаспадара. Мінамёт я ставіў паблізу ад месца, дзе літасьцівы гаспадар даваў бяседы для прагных да ежы беднякоў. Калі бяседа канчалася, я выстрэльваў угару сэрыю снарадаў. У момант выбуху з гэтых снарадаў вылятала каляровае воблака, якое, рассыпаючыся, павольна падала на зямлю – гэта былі стракатыя хусткі з выявай імпэратара. Людзі тоўпіліся, штурхаліся, выцягвалі рукі, кожны хацеў вярнуцца дадому, адораны цудоўна спушчаным зь неба партрэтам імпэратара.

А. А:

Ніхто, абсалютна ніхто, дружа, не прадчуваў, што надыходзіць канец. Ці хутчэй, штосьці там прадчувалася, штосьці ў галаве круцілася, але такое няяснае, невыразнае, што быццам увогуле не было ніякага адчуваньня надзвычайнасьці. А ўжо ж даўно блукаў па палацы камэрдынэр, шторaз гасячы якіясьці агні, але зрок да гэтага згасаньня прызвычайваўся, і прыходзіла выгодная ўнутраная згода, што відочна-невідочна так усё мусіць быць пагашанае, зацемненае, паўзмрочна азмрочанае. У дадатак да гэтага ў імпэрыю пракраліся дэмаралізуючыя непарадкі, якія ўсяму палацу рабілі шмат клопатаў, а больш за ўсіх нашаму міністру інфармацыі, спадару Тэсфае Гебрэ-Эгзы, расстралянаму пазьней пануючымі сёньня бунтаўнікамі. Пачалося з таго, што ў семдзесят трэцім годзе, летам, прыехаў да нас журналіст зь лёнданскай тэлевізіі, нейкі Джонатан Дымбэлбі. Гэты тып даўней ужо бываў у імпэрыі, робячы хвалебныя фільмы пра нашага ўсёмагутнага ўладара, і таму нікому да галавы не прыйшло, што такі журналіст, які сьпярша хваліць, асьмеліцца пазьней зганіць, але такая ўжо, відаць, подлая натура гэтых людзей бяз годнасьці й веры. Так ці інакш, гэтым разам Дымбэлбі, заміж паказваць, як наш гаспадар разьвіцьцё даглядае і пра дабрабыт простых людзей клапоціцца, зьнік недзе на поўначы, адкуль нібыта вярнуўся

ўсхваляваны і ўстурбаваны і адразу ж паехаў у Англію. Не мінула і месяца, як з нашай амбасады прыйшло данясеньне, што спадар Дымбэлбі паказаў у лёнданскай тэлевізіі свой фільм пад назвай «Схаваны голад», у якім гэты беспрынцыпны паклёпнік апусьціўся да дэмагагічнай штучкі, паказваючы тысячы людзей, якія паміраюць з голаду, а побач шаноўнага гаспадара, які бяседуе з саноўнікамі, пасьля паказаў дарогі, на якіх ляжаць дзясяткі шкілетаў памерлых ад голаду беднякоў, і адразу ж па гэтым нашыя самалёты, якія прывозяць з Эўропы шампанскае й ікру, тут – цэлае поле канаючых тубыльцаў, там – наш манарх, які падае мяса сваім сабакам са срэбнай місы, і так уперамешку: раскоша – нэндза, багацьце – роспач, карупцыя – сьмерць. У дадатак спадар Дымбэлбі заяўляе, што галадамор выклікаў сьмерць ужо ста, а можа і дзьвюхсот тысячаў людзей і што яшчэ столькі ж могуць у найбліжэйшыя дні падзяліць іх лёс. Паводле данясеньня амбасады, пасьля фільму ў Лёндане выбухнуў вялікі скандал, зьявіліся звароты да парлямэнту, газэты б'юць у звон, дастойнага гаспадара ганьбяць. Тут, дружа, відаць усю безадказнасьць замежнай прэсы, што гадамі, як і спадар Дымбэлбі, манарха нашага хваліла, і раптам, без аніякай нагоды і пачуцьця меры – зганіла. Чаму так? Чаму такая здрада і амаральнасьць? Далей амбасада даносіць, што зь Лёндану вылятае цэлы самалёт эўрапейскіх журналістаў, якія хочуць убачыць галадамор, пазнаць нашую рэчаіснасьць, а таксама высьветліць, куды дзяюцца грошы, якія іхныя ўрады давалі шаноўнаму гаспадару, каб ён разьвіваў, даганяў і пераганяў. То бок, коратка кажучы, умяшаньне ўва ўнутраныя справы імпэрыі! У палацы ўзрушэньне, абурэньне, але слаўны гаспадар загадвае захоўваць спакой і разважнасьць. І вось мы чакаем, якія будуць найвышэйшыя рашэньні. Адразу гучаць галасы, што трэба перадусім адклікаць амбасадара з прычыны такіх прыкрых і трывожных данясеньняў, якія ўносяць столькі неспакою ў жыцьцё палацу. Аднак міністар замежных справаў выступае супраць, аргумэнтуючы тым, што такое адкліканьне напалохае астатніх амбасадараў, якія ўвогуле перастануць даносіць што-кольвек, а мусіць жа дастойны гаспадар ведаць, што пра яго кажуць у розных частках сьвету. Тады азываюцца чальцы Кароннай рады, якія жадаюць самалёт з журналістамі разьвярнуць і ўсёй гэтай блюзьнерскай кодлы ў імпэрыю не

пускаць. Але як жа тут, кажа міністар інфармацыі, не ўпусьціць, яны яшчэ большы крык уздымуць і міласьцівага гаспадара яшчэ горш зганяць. Рада ў раду, вырашылі прапанаваць літасьціваму гаспадару наступнае разьвязаньне: упусьціць, але запярэчыць. Так, сказаць што няма голаду! Трымаць іх у Адыс-Абэбе, паказываць разьвіцьцё, і хай пішуць толькі тое, што ў нашых газэтах здолеюць вычытаць. А прэсу, дружа, мы мелі ляяльную, скажу нават – узорна ляяльную. Праўду кажучы, не было яе шмат, бо на трыццаць зь лішкам мільёнаў падуладных штодзень друкавалася дваццаць пяць тысячаў асобнікаў газэтаў, але гаспадар наш выходзіў з такога прынцыпу, што нават найбольш ляяльнай прэсы не выпадае даваць зашмат, таму што з гэтага можа выпрацавацца навык чытаньня, а тады ўжо толькі крок да навыку думаньня, а вядома ж, якія гэта выклікае невыгоды, расчараваньні, клопаты і засмучэньні. Бо, скажам, штосьці можа быць ляяльна напісанае, але неляяльна прачытанае, хтосьці пачне чытаць ляяльныя рэчы, а пасьля захоча неляяльных, і так пойдзе дарогай, якая яго ад трона будзе аддаляць, ад разьвіцьця адцягваць, да бунту весьці. Не, не, гаспадар наш ня мог дапусьціць такой распусты, такога ўвядзеньня ў аблуду і таму ўвогуле ня быў энтузіястам надмернага чытаньня. Неўзабаве мы перажылі сапраўднае нашэсьце замежных карэспандэнтаў. Я памятаю, што адразу па іх прыезьдзе адбылася прэсавая канфэрэнцыя. Як выглядае, пытаюцца, праблема сьмерці ад голаду, якая косіць людзей? Мне пра гэта нічога не вядома, адказвае міністар інфармацыі, і мушу табе, дружа, сказаць, што ён ня быў далёкі ад праўды. Па-першае, сьмерць ад голаду сотні гадоў была ў нашай імпэрыі рэччу штодзённай і натуральнай, і ніколі нікому да галавы не прыходзіла ўздымаць вэрхал з гэтай нагоды. Наступала засуха, і зямля высыхала, быдла падала, сяляне паміралі – звычайны, згодны з законамі прыроды і адвечны парадак рэчаў. З прычыны гэтай адвечнасьці, нармальнасьці ніводны з натабляў не асьмеліўся б займаць увагу яснавяльможнага гаспадара тым, што хтосьці там у яго памёр з голаду. Натуральна, сам дастойны гаспадар наведваў правінцыі, але ня меў звычаю спыняцца ўва ўбогіх раёнах, дзе панаваў голад, дый, апроч таго, што можна ўбачыць падчас такіх афіцыйных адведзін? Людзі з палацу таксама ў правінцыю ня езьдзілі, бо досыць чалавеку пакінуць палаца, і тут жа на яго напляткараць,

наданосяць, так што калі вернецца, убачыць, што ворагі перасунулі яго бліжэй да бруку. Дык адкуль жа мы маглі ведаць, што на поўначы пануе якісьці надзвычайны голад? Ці можам мы, пытаюцца карэспандэнты, паехаць на поўнач? Няможна, тлумачыць міністар, бо поўна разбойнікаў на дарозе. І зноў мушу сказаць, што ён ня быў далёкі ад праўды, бо апошнім часам даносілі пра памнажэньне ўва ўсёй імпэрыі ўсялякіх збройных нядобранадзейных элемэнтаў, якія хаваліся пры трактах. Пасьля гэтага міністар павёз іх на экскурсію па сталіцы, паказваў ім фабрыкі і нахвальваў разьвіцьцё. Але яны, дзе там – разьвіцьця ня хочуць, ім голад падавай, нічога больш іх не абыходзіць, хочуць мець голад і ўсё! Ну, кажа міністар, голаду вы ня ўбачыце, адкуль жа возьмецца голад, калі разьвіцьцё! Але тут, дружа, новая гісторыя здарылася. Гэтае наша збунтаванае студэнцтва паслала на поўнач сваіх дэлегатаў, а тыя напрывозілі і фатаграфіяў, і страшных гісторый аб тым, як памірае народ, і ўсё гэта цішком, употайкі карэспандэнтам перадалі. І пачаўся скандал, няможна ўжо было казаць, што няма голаду. Зноў карэспандэнты атакуюць, здымкамі размахваюць, пытаюцца, што ўрад у справе голаду зрабіў. Найвышэйшы гаспадар, адказвае ім міністар, надае гэтай справе найвышэйшае значэньне. Але канкрэтна! канкрэтна! – крычыць без аніякай павагі гэты пеклам народжаны зброд. Гаспадар наш, спакойна кажа міністар, у адпаведны час паведаміць, якія яго вялікасьцю плянуюцца пастановы, загады, даручэньні, не міністрам жа вырашаць такія рэчы і вызначаць хаду справаў. Урэшце карэспандэнты паляцелі і голаду блізка ня бачылі. І ўсю гэтую справу, так спакойна і годна адбытую, міністар палічыў посьпехам, прэса ж наша назвала перамогай. Міністар заўсёды неяк так рэчы прэзэнтаваў, што ўсё заканчвалася посьпехам і ўсё было добра, і мы баяліся, што калі б міністра гэтага ня стала, то адразу смуткам павеяла б, што пазьней спраўдзілася, калі мы яго пазбавіліся. Разваж яшчэ, Вашаць, што – паміж намі кажучы – някепска для лепшага парадку і большай пакоры падуладных народ трохі на дыеце патрымаць, пагаладаць прымусіць. Сама наша рэлігія загадвае палову дзён у годзе трымаць строгі пост, а запавет наш кажа, што хто пост парушае, робіць цяжкі грэх і ўвесь пачынае сьмярдзець серай пякельнай. У посны дзень няможна есьці больш за адзін раз, і тое нічога апроч кавалка

праснака з прыправай з карэньняў. А чаму такую суворую рэлігію накінулі нам сьвятыя айцы, загадаўшы ўвесь час цела ўтаймоўваць? А таму, што чалавек паводле натуры ёсьць злой істотай, якую пякельная асалода прымушае паддавацца спакусам, а найперш спакусе непаслухмянасьці, валоданьня і распусты. Бо дзьве прагі буяюць у душы чалавека – прага агрэсіі і прага ашуканства. Калі не дазволіць яму крыўдзіць іншых, ён будзе сабе самому рабіць крыўду, калі не сустрэне нікога, каго можна было б ашукаць, ён сам сябе ў думках ашукае. Салодкі чалавеку хлеб ашуканства, кажа кніга прыпавесьцяў, а потым пяском напаўняецца рот яго. Як жа даць рады з гэтай страшнай істотай, якую ўяўляе сабой чалавек, якой ёсьць усе мы, як жа яе ўтаймаваць і ўціхамірыць? Як раззброіць гэтую шэльму, як яе абясшкодзіць? Ёсьць толькі адзін спосаб зрабіць гэта, дружа, – аслабіць чалавека. Так, забраць у яго сілы, бо, ня маючы іх, ён ня зможа чыніць зла. І якраз пост аслабляе, галаданьне пазбаўляе сілаў. Такая наша амхарская філязофія, і гэтага вучаць нашыя айцы. І ўсё гэта спраўджанае досьведам. Чалавек, які галадае ўсё жыцьцё, ніколі ня будзе бунтаваць. На поўначы не было ніякага бунту. Ніхто там ня ўзьняў ані голасу, ані рукі. Але калі толькі падуладны пачне есьці дасыта, а пасьля ты захочаш забраць у яго місу, ён адразу падымецца на бунт. У галаданьні тая карысьць, што ў галоднага думкі толькі пра хлеб, ён увесь паглынуты думкамі пра ежу, ён выдае на гэта рэшткі сілаў і яму ўжо не стае ні галавы, ні волі шукаць асалоды ў спакусе непаслухмянасьці. Вось падумай, хто зьнішчыў нашу імпэрыю, хто яе разбурыў? Ані тыя, хто меў шмат, ані тыя, хто ня меў нічога, а толькі тыя, хто меў трохі. Так, так, трэба заўсёды сьцерагчыся тых, хто мае трохі, бо гэта найгоршая, найбольш прагная сіла, гэта яны найбольш зацята мкнуцца ўгару.

З. С.-К.:

Вялікае незадавальненьне, нават абурэньне, ганьбаваньне панавалі ў палацы з прычыны гэтай неляяльнасьці эўрапейскіх урадаў, якія дазволілі спадару Дамбэлбі і кампаніі ўзьняць такі вэрхал на тэму галадамору. Частка саноўнікаў выступала за тое, каб надалей адмаўляць усё, але гэта ўжо было немагчыма,

калі сам міністар паведаміў карэспандэнтам, што яснавяльможны гаспадар надае голаду найвышэйшае значэньне. Тады ўжо далей новым шляхам ісьці і клікаць замежных дабрадзеяў на дапамогу! Самі ня маем, хай жа іншыя дадуць, колькі могуць. І не мінула шмат часу, як прыйшлі памысныя весткі. То якіясьці самалёты прыляталі са збожжам, то якіясьці караблі з мукой і цукрам. Прыехалі лекары і місіянэры, людзі з дабрачынных арганізацыяў, студэнты з замежных вучэльняў, а таксама карэспандэнты, якія выдавалі сябе за санітараў. Усе яны рушылі на поўнач, у правінцыі Тыгрэ і Вола, а таксама на ўсход, у Агадэн, дзе, кажуць, цэлыя плямёны гінуць галоднай сьмерцю. У імпэрыі ўсчаўся міжнародны рух! Адразу скажу, што ў палацы не было з гэтай нагоды вялікага задавальненьня, бо заўсёды дрэнна ўпускаць столькі іншаземцаў, бо яны з усяго дзівяцца ды яшчэ й крытыкуюць. І ўяві сабе, містэр Рычард, прадчуваньне не падманула нашых саноўнікаў. Бо калі гэтыя місіянэры, лекары і санітары – апошнія, як я згадаў, былі пераапранутыя карэспандэнты – дабраліся на поўнач, яны ўбачылі, як кажуць, рэч для іх найбольш нечуваную, а менавіта тысячы людзей, якія паміралі з голаду, і побач рынкі і крамы, поўныя харчоў. Ёсьць харчы, ёсьць харчы, кажуць, але быў дрэнны ўраджай, сяляне ўсё сабранае мусілі аддаць паном, і таму ў іх нічога не засталося, а спэкулянты выкарысталі сытуацыю і так падвысілі цэны, што мала хто можа купіць хоць бы жменю збожжа, і адсюль усё няшчасьце. Прыкрая справа, містэр Рычард, бо гэта нашыя натаблі былі тымі спэкулянтамі, а хіба ж можна так называць афіцыйных прадстаўнікоў шаноўнага гаспадара? Афіцыйны і – спэкулянт? Не, не, няможна так казаць! Таму, калі крык гэтых місіянэраў, санітараў дайшоў да сталіцы, у палацы адразу загучалі галасы, якія заклікалі ўсіх гэтых дабрадзеяў, філёзафаў з імпэрыі выдаліць. Але як жа – кажуць іншыя – выдаліць? Немагчыма ж спыніць акцыю супраць голаду, калі літасьцівы гаспадар надае ёй найвышэйшае значэньне! І зноў невядома, што рабіць, выдаліць – дрэнна, пакінуць – таксама дрэнна, нейкая такая запанавала нерашучасьць і няяснасьць, калі раптам новы пярун б'е. Гэтыя санітары, місіянэры ўздымаюць крык, што транспарты з мукой і цукрам да галодных не даходзяць. Штосьці такое адбываецца, кажуць дабрадзеі, што дапамога зьнікае па дарозе, і трэба

высьветліць, куды яна зьнікае, і вось ужо на ўласную руку пачынаюць шнырыць, умешвацца, нос соваць. Зноў выяўляецца, што спэкулянты цэлыя транспарты ў свае склады засылаюць, цэны шрубуюць, кішэні набіваюць. Як гэта выкрылі, цяжка сёньня прасачыць, хіба мусілі адбыцца нейкія ўцечкі. Бо ўсё было так арганізавана, што імпэрыя, натуральна, дапамогу прымае, але разьмеркаваньнем дароў займаецца сама, а куды пойдзе мука і цукар, нікому няможна дазнавацца, бо гэта будзе ўважацца за ўмяшаньне. Аднак тут нашы студэнты ў бой рушаць, выходзяць на вуліцы, ладзяць шэсьці, выкрываюць карупцыю, патрабуюць суду над вінаватымі, ганьба! ганьба! крычаць, канец імпэрыі абвяшчаюць. Паліцыя іх дручкамі лупцуе, арыштоўвае. Крыкі, хваляваньні. У гэтыя дні, містэр Рычард, мой сын Хайлу рэдка дома бываў. Унівэрсытэт ужо быў у стане адкрытай вайны з палацам. Гэтым разам пачалося з зусім мізэрнай справы, з малога, нікчэмнага здарэньня, такога малога, што проста ніякага, што ніхто б яго не заўважыў, ніхто б нават не падумаў, але, відавочна, прыходзяць такія моманты, калі найменшае здарэньне, драбніца дробная, поўнае глупства выклікае рэвалюцыю і распальвае вайну. Таму рацыю меў наш начальнік паліцыі, спадар генэрал Ілма Шыбэшы, калі загадаў шукаць дзіркі ўва ўсім, не ленавацца, а пільна шукаць, дзьмуць на халоднае і заўсёды датрымлівацца прынцыпу, што калі зерне пачынае пускаць расток, належыць адразу, не чакаючы, пакуль ён вырасьце, яго сьцяць. Але і генэрал шукаў, ды, відаць, не знайшоў. А мізэрнае тое здарэньне палягала ў тым, што амэрыканскі корпус міру зладзіў ува ўнівэрсытэце паказ найноўшай моды, хоць усялякія сходы, сустрэчы былі забароненыя. Але ж дастойны гаспадар ня мог забараніць амэрыканцам зрабіць паказ, і гэтую мірную і такую бяскрыўдную імпрэзу студэнты выкарысталі, каб сабраць вялізны натоўп і рушыць на палац. І ад гэтага моманту ўжо не ўдавалася разагнаць іх па дамох, яны ўжо мітынгавалі, зацята і імпэтна штурмавалі, больш ужо не саступалі. А генэрал Шыбэшы з гэтай прычыны валасы на сабе рваў, бо нават яму не прыйшло да галавы, што рэвалюцыя можа пачацца з паказу моды! Але менавіта так гэта ў нас выглядала. Бацьку, кажа мне Хайлу, гэта пачатак вашага канца! Мы так больш жыць ня можам. Мы пакрытыя ганьбай. Гэтая сьмерць поўначы і ашуканства двара пакрылі нас ганьбай. Край тоне ў карупцыі,

людзі паміраюць з голаду, на кожным кроку цемра і барбарства. Нам сорамна за гэтую краіну, кажа, мы саромеемся гэтай краіны. Але, кажа, у нас няма іншай краіны, мы самі мусім выцягнуць яе з гразі. Ваш палац нас перад сьветам скампрамэтаваў, гэты палац ня можа далей існаваць. Мы ведаем, што ў войску неспакойна і ў горадзе неспакойна, і цяпер мы ня можам адступіць. Ня можам далей саромецца. Так, містэр Рычард, у гэтых маладых, шляхетных, але такіх безадказных людзях успадала на вока глыбокае пачуцьцё сораму за стан бацькаўшчыны. Для іх ужо існавала толькі дваццатае стагодзьдзе, а можа, нават гэтае чаканае дваццаць першае стагодзьдзе, у якім запануе блаславёная справядлівасьць. Усё іншае ім ужо не пасавала, ужо раздражняла іх. Яны ня бачылі вакол сябе таго, што хацелі б убачыць. І цяпер, відаць, пастанавілі так сьвет уладкаваць, каб можна было глядзець на яго з задавальненьнем. Эх, маладыя людзі, містэр Рычард, вельмі маладыя людзі!

Т. Л.:

І сярод гэтага галаданьня, місіянэраў і санітараў-крычаньня, студэнтаў-мітынгаваньня, паліцыі-са-студэнтамі-змаганьня дастойны гаспадар наш выправіўся зь візытам у Эрытрэю, дзе быў прыняты сваім унукам, галоўнаначальнікам флёту Эскіндэрам Дэстам, і зьбіраўся адбыць марскую паездку на адміральскім караблі «Этыёпія», адылі завесьці ўдалося толькі адзін рухавік, і вандроўку давялося скасаваць. Гаспадар наш, аднак, перасеў на французскі карабель «Пратэст», на палубе якога вячэру ў яго гонар даў вядомы адмірал з Марсэлю – Іель. Наступнага дня, ужо ў порце Масава, слаўны гаспадар, які з гэтай нагоды ўзьвёў сябе ў чын вялікага адмірала імпэратарскага флёту, пасьвячаў сем кадэтаў у афіцэры ваеннага флёту, павялічваючы такім чынам нашую марскую моц. Там жа ён прызначыў гэтых няшчасных натабляў з поўначы, якіх місіянэры ды санітары абвінавачвалі ў спэкуляцыі і абкраданьні ахвяраў голаду, на высокія пасады, каб давесьці іх невінаватасьць і ўціхамірыць замежнае пляткараньне, ачарненьне. Вось жа, усё нібыта прасоўвалася, разьвівалася памысна і прыхільна і ў найвышэйшай ступені

ўдала і лаяльна, імпэрыя расла і нават – як падкрэсьліваў наш гаспадар – квітнела, калі раптам прыходзіць паведамленьне, што гэтыя замежныя дабрадзеі, якія ўзялі на сябе няўдзячную задачу накарміць наш ненаедны люд, узбунтаваліся і затрымліваюць пастаўкі: з той прычыны, што наш міністар фінансаў, спадар Елма Дэрэза, каб узбагаціць імпэратарскую скарбніцу, загадаў дабрадзеям плаціць за ўсякую дапамогу высокія мыты. Хочаце дапамагаць, кажа міністар, дапамагайце, але вы мусіце за гэта заплаціць! А яны кажуць, як плаціць?! за дапамогу, якую мы даем, яшчэ і плаціць? А так, кажа міністар, такія правілы. Як гэта – кажа міністар – хочаце так дапамагаць, каб імпэрыя нічога з гэтага ня мела? І тут разам зь міністрам наша прэса голас уздымае і збунтаваных дабрадзеяў дакарае, што яны, дапамогу затрымліваючы, народ наш на жахі нэндзы і галодную сьмерць выракаюць, супраць імпэратара выступаюць, ува ўнутраныя справы ўмешваюцца. А ўжо, дружа, пайшла вестка, што паўмільёна людзей з голаду памерла, што нашыя газэты адразу на ганебны рахунак гэтых бясслаўных місіянэраў, санітараў запісалі. І тут жа манэўр, які палягаў у тым, што наш урад памянёных альтруістаў абвінавацiў у галадаморы, спадар Гебрэ-Эгзы ацаніў як посьпех, што ў адзін голас пацьвердзілі ўсе нашы газэты. І ў гэты час, калі столькі гаварылі і пісалі пра новы посьпех, шаноўны гаспадар, пакінуўшы гасьцінную палубу французскага карабля, вярнуўся ў сталіцу, вітаны, як заўжды, пакорна і ўдзячна, і тым ня менш – сёньня мне можна гэта сказаць – у гэтай пакорнасьці адчувалася ўжо пэўная няяснасьць, якаясьці невыразная двухзначнасьць, якаясьці – скажам так – пакорная непакорнасьць, дый удзячнасьць ужо не выяўлялася старанна, хутчэй нават стрымана і буркліва, так, сапраўды, удзячнасьць выказвалі, але якая ж гэта была пасіўная, якая млявая, якая няўдзячная ўдзячнасьць! І гэтым разам – а як жа! – калі праяжджаў картэж, людзі падалі ніц, але куды ім было да ранейшага паданьня! Калісьці, дружа, гэта было паданьне-ўпаданьне, у-пыл, у-попел-ператварэньне, у-дрыжыках, у-трымценьні-ляжаньне, увесь гэты вулічны люд у нішто замяняўся, рукі выцягваў, літасьці маліў. А цяпер? Пэўна ж, падалі, але неяк так без жыцьця, сонна, быццам нехаця, па звычцы, для сьвятога спакою, павольна, ляніва, папросту адмоўна. Так, падалі адмоўна, ніяк, крывадушна, выглядала, што падалі, а ў глыбіні душы стаялі, нібыта ляжалі, але ў

думках сядзелі; нібыта поўная пакорнасьць, але ў сэрцах упартасьць. Аднак ніхто ў картэжы гэтага не заўважаў, а калі б нават заўважыў пэўную млявасьць і маруднасьць падуладных, то нікому пра гэта не сказаў бы, таму што любое выказваньне сумнеўных думак сутыкалася ў палацы з дрэнным прыёмам, бо саноўнікі, як правіла, мелі мала часу, а калі ў кагосьці зьяўляўся сумнеў, усе мусілі адкладаць убок іншыя заняткі і як хутчэй брацца за расьсейваньне, разьвейваньне гэтага сумневу, каб зьнішчыць яго дашчэнту, а таго, каго ахапілі сумневы і слабасьць, падбадзёрыць і ўмацаваць. Вярнуўшыся ў палац, шаноўны гаспадар прыняў данос ад міністра гандлю – Кетэмы Іфры, які абвінаваціў міністра фінансаў у тым, што той, накладаючы высокія мыты, выклікаў спыненьне дапамогі ахвярам голаду. Аднак наш усёмагутны ўладар ані словам ня зганіў спадара Елмы Дэрэзы, нават відаць было задавальненьне на манаршым твары, бо гаспадар наш заўсёды непрыязна глядзеў на гэтую дапамогу, таму што ўвесь той розгалас, які ёй спадарожнічаў, усё гэта ўздыханьне, галавой ківаньне з нагоды няшчасных ахвяраў галадамору псавала пачцівы і прывабны вобраз імпэрыі, якой нішто не замінала ісьці шляхам разьвіцьця і даганяць і нават пераганяць. Таму ніякай дапамогі, падтрымкі ўжо не патрабавалася, а гэтым ахвярам галадамору павінна было хапіць таго, што літасьцівы гаспадар наш асабіста надаў найвышэйшае значэньне гэтай праблеме, што ўжо было асаблівым стаўленьнем да іх лёсу, нават вышэйшым за найвышэйшае, і давала падуладным супакаяльную і ўмацавальную надзею, што калі б ні зьявілася ў іх жыцьці нейкая гнятлівая бяда, нейкія турботы, якія выклікаюць скаргі, слаўны гаспадар дадасьць ім так патрэбнага духу, а менавіта надаўшы гэтай бядзе ці турботам найвышэйшае значэньне.

Д.:

Апошні год! Так, але хто ж мог тады прадбачыць, што гэты семдзесят чацьверты год будзе нашым апошнім годам? Так, адчувалася якаясьці туманнасьць, якаясьці цьмяная адметная няўдаласьць, якаясьці нават адмоўнасьць, ды ў паветры неяк так то цяжка, то нэрвова, то напяцьце, то друзласьць, то разьвіднее, то пацямнее, але каб з гэтага так раптам проста ў

бездань? І ўсё? І няма? І вось ужо глядзіце, а палацу ня бачыце. Шукаеце яго і не знаходзіце. Пытаецеся, і ніхто вам не адкажа, дзе ён. А пачалося – уласна кажучы, ідзецца пра тое, што гэта столькі разоў пачыналася, але не заканчвалася, столькі было пачаткаў і ніводнага кончага фіналу, і праз гэтае бясконцае пачынаньне, праз такую колькасьць пачаткаў без канца ўзьнікла ў душы прызвычаеньне, суцяшэньне, што заўсёды выкруцімся, вытрымаем, што не аддамо таго, што маем, бо найгоршае ператрываем. Але ўрэшце гэта прызвычаеньне аказалася аблудай. Вось жа, у сьнежні памянёнага году генэрал Бэлета Абэбэ, паехаўшы на інспэкцыю ў Агадэн, спыніўся ў Годэ, у тамтэйшых кашарах. Назаўтра ў палац прыходзіць нечуваная навіна – генэрал арыштаваны салдатамі, якія прымушаюць яго харчавацца тым, што ім даюць есьці. Ежа, відавочна, такая кепская, што ўзьнікае асьцярога, што генэрал расхварэецца і памрэ. Імпэратар пасылае дэсантны аддзел сваёй гвардыі, які вызваляе генэрала і адвозіць яго ў шпіталь. Цяпер, мой любачка, павінен быў бы выбухнуць скандал, бо ўсёмагутны ўладар у вайскова-паліцыйную гадзіну ўсю ўвагу прысьвячаў арміі, увесь час павышаў вайсковыя заробкі і павялічваў вайсковы бюджэт, і раптам высьвятляецца, што ўсе падвышэньні панове генэралы клалі ў кішэнь, зьбіраючы вялікія багацьці. Адылі імпэратар ніводнага генэрала не пакараў, а тых салдат з Годэ загадаў распусьціць, разагнаць. Пасьля гэтага прыкрага і вартага забыцьця інцыдэнту, які сьведчыў пра пэўную несубардынацыю ў войску – а мы мелі найбольшую армію ў чорнай Афрыцы, прадмет нехаванай гордасьці найясьнейшага гаспадара, – запанаваў спакой, але запанаваў толькі на кароткі час, бо празь месяц прыходзіць у палац новае паведамленьне, таксама нечуванае! У паўднёвай правінцыі Сыдама, у гарнізоне Нэгеле салдаты абвяшчаюць бунт і арыштоўваюць вышэйшых афіцэраў. Пачалося з таго, што ў гэтай трапічнай мясьціне высахлі салдацкія студні, а афіцэры забаранілі салдатам браць ваду са сваёй студні. Салдаты ад смагі ашалелі і ўсчалі паўстаньне. Ужо і туды трэба было б выслаць дэсант імпэратарскіх гвардзейцаў, каб уціхамірылі, утаймавалі, але напомню табе, мой любачка, што гэта той страшны і такі незразумелы месяц люты, калі ў самой сталіцы адбываюцца здарэньні такога раптоўнага і падрыўнога характару, што ўсе забыліся пра тую непаслухмяную салдатню,

якая ў далёкім Нэгеле, дарваўшыся да афіцэрскай студні, абпіваецца вадой. Куды там, калі выпала заняцца здушэньнем бунту, які выбухнуў зусім блізка ад нашага палацу. Якой жа дзіўнай была прычына гвалтоўнага хваляваньня, якое апанавала вуліцу! Міністар гандлю ўсяго толькі падвысіў цану бэнзіну. У адказ таксоўшчыкі адразу пачынаюць страйк. Наступнага дня страйкуюць ужо й настаўнікі. Адначасна на вуліцу выходзяць ліцэісты, якія нападаюць на гарадзкія аўтобусы і паляць іх, а аўтобуснае таварыства, дазвольце нагадаць, было ўласнасьцю дастойнага гаспадара. Паліцыя намагаецца ўтаймаваць гэтыя выбрыкі, хапае пяць ліцэістаў і для пацехі скочвае іх з узгорку, страляючы па хлопцах, якія куляюцца па схіле, зь іх трое паміраюць на месцы, а двое цяжка параненыя. Па гэтым здарэньні надыходзяць судныя дні, бязладзьдзе, роспач і абразьлівасьць! У падтрымку ліцэістаў рушаць шэсьцем студэнты, у якіх ужо не навука і ўдзячная пільнасьць у галаве, а толькі як бы паўсюль нос соваць ды непакорна падкопваць. Цяпер яны валяць проста на палац, таму паліцыя страляе, дручкамі іх лупцуе, арыштоўвае, сабакамі цкуе, але нічога не дапамагае, і вось, каб непакорных уціхамірыць, залагодзіць, літасьцівы гаспадар загадвае скасаваць павышэньне цаны на бэнзін. Але што з таго, калі вуліца ня хоча супакойвацца! Да гэтага ўсяго, як гром зь яснага неба, прыходзіць вестка, што ў Эрытрэі ўзбунтавалася Другая дывізія. Яны займаюць Асмару, арыштоўваюць свайго генэрала, садзяць пад замок губэрнатара правінцыі і абвяшчаюць праз радыё бязбожную адозву. Жадаюць справядлівасьці, павышэньня заробкаў і людзкіх пахаваньняў. У Эрытрэі цяжка, любачка, там войска змагаецца з партызанамі, мноства народу гіне, таму здаўна існавала праблема пахаваньня, а менавіта, каб абмежаваць надмерныя кошты вайны, права на пахаваньне мелі толькі афіцэры, тады як целы звычайных салдатаў пакідалі гіенам і сьцярвятнікам, і менавіта гэтая няроўнасьць выклікала цяперашні бунт. Наступнага дня да бунтаўнікоў далучаецца ваенны флёт, а яго галоўнаначальнік, унук імпэратара, уцякае ў Джыбуці. Вялікая прыкрасьць, што чалец найвышэйшай сям'і мусіць ратавацца такім непачцівым, ганебным чынам! Але лявіна, любачка, коціцца далей, бо ўжо ў той самы дзень усчынае бунт авіяцыя, самалёты лятаюць над горадам, і ходзяць плёткі, што яны скідаюць бомбы. Наступным

жа днём бунтаваць пачынае нашая найвялікшая і найважнейшая Чацьвертая дывізія, якая адразу атачае сталіцу, жадае павышэньня заробкаў і патрабуе аддаць пад суд міністраў і іншых саноўнікаў, якія, як кажуць узлаваныя салдаты, брыдка загрузьлі ў карупцыі і павінныя стаць каля ганебнага слупа. Ну, калі ўжо Чацьвертая дывізія запалала, гэта значыць, што агонь ужо каля палацу і трэба хутка ратавацца. Таму той жа ночы наш шчодры гаспадар абвяшчае павышэньне салдацкіх заробкаў, каб яны вярнуліся ў кашары, і загадвае ім захоўваць спакой і лагоднасьць. Сам жа, клапоцячыся пра лепшы выгляд двара, загадвае прэм'еру Аклілу падаць у адстаўку разам з усім урадам, а гэтае пакараньне мусіла дацца яму зь цяжкасьцю, бо Аклілу, хоць грамадзкасьць яго не любіла і ганіла, усё-ткі быў вялікім улюбёнцам і гадаванцам імпэратара. Адначасна гаспадар наш прызначыў на пасаду прэм'ера саноўніка Эндэлькачэва, які меў рэпутацыю асобы лібэральнай, выкшталцонай і красамоўнай.

Н. Л. Э.:

Я ў той час выконваў функцыі тытулярнага чыноўніка аддзелу разьлікаў у бюро вялікага камэргера двара. З прычыны зьмены ўраду ў нас была процьма працы, бо наш аддзел займаўся наглядам за выкананьнем інструкцыяў імпэратара што да прынцыпаў, чарговасьці і колькасьці згадваньня паасобных саноўнікаў і натабляў. Справай гэтай мусіў асабіста займацца наш гаспадар, бо кожны саноўнік хацеў, каб яго заўжды згадвалі, прычым як мага бліжэй да імя ўсёмагутнага ўладара, і ўвесь час былі сваркі, зайздрасьць і інтрыгі вакол таго, каго згадалі, а каго не, колькі разоў і на якім месцы. І хоць мы мелі строгія інструкцыі трона і дакладна акрэсьленыя нормы што да таго, каго і як часта можна згадваць, такая ўжо панавала сквапнасьць і адвольнасьць, што на нас, звычайных чыноўнікаў, саноўнікі ціснулі, каб іх дзесьці там без чаргі і звыш нормы згадаць. Згадай мяне, згадай, кажа то адзін, то другі, а калі табе штосьці будзе трэба, можаш на мяне разьлічваць. І як жа зьдзіўляцца, што ў нас узьнікала спакуса то таго, то гэтага звыш ліміту згадаць і здабыць сабе высокага заступніка. Аднак рызыка была вялікая, бо праціўнікі пільнавалі адно аднаго,

лічылі, хто колькі разоў быў згаданы, і калі выкрывалі нейкае перавышэньне, адразу ішлі з даносам да шаноўнага гаспадара, а той альбо караў, альбо супакойваў. Урэшце вялікі камэргер выдаў загад увесьці для саноўнікаў карты згадваньня, запісваць там, колькі разоў кожны быў згаданы, і штомесяц падаваць справаздачы, на падставе якіх дастойны гаспадар выдаваў дадатковыя інструкцыі, каму ўбавіць, а каму дадаць. А цяпер нам трэба было зьнішчыць карты ўсяго кабінэту Аклілу і ўвесьці новыя карты. Тут на нас асаблівы ціск пачаўся, бо новыя міністры зь вялікім імпэтам дамагаліся, каб іх згадвалі, і кожны стараўся то ў прыёме ўдзел узяць, то ў іншай урачыстасьці, каб яго з гэтай нагоды згадалі. Я ж, адразу пасьля зьмены кабінэту, аказаўся на бруку, бо з прычыны незразумелага і такога недапушчальнага зацямненьня розуму адзін раз не згадаў новага міністра двара, спадара Яханэса Кіданэ, а той так раззлаваўся, што, нягледзячы на мае просьбы зьлітавацца, загадаў мяне выгнаць.

сакавік-красавік-травень

С.:

Ня трэба табе тлумачыць, дружа, што мы палі ахвярай д'ябальскай змовы. Калі б ня гэта, палац прастаяў бы яшчэ тысячу гадоў, бо ніводзін палац не развальваецца сам па сабе. Але таго, што я ведаю сёньня, я ня ведаў учора, калі нас несла да згубы, а мы ў аглушэньні, асьляпленьні, у пякельным учадзеньні, верачы ў сваю моц, самі сябе ўзвышаючы, ня бачылі канца! Усе шэсьцямі ходзяць: студэнты, работнікі, мусульмане, усе правоў жадаюць, страйкуюць, мітынгуюць, урад ганьбяць. Прыходзіць паведамленьне пра мяцеж у Трэцяй дывізіі, якая стаіць у Агадэне. Цяпер у нас ужо ўсё войска ўзбунтаванае, супраць улады настроенае, толькі імпэратарская гвардыя яшчэ захоўвае ляяльнасьць. З прычыны гэтай нахабнай анархіі і паклёпніцкай агітацыі, якая выходзіць па-за ўсялякія межы дапушчальнага, у палацы пачынаецца шаптаньне, саноўнікаў перагляданьне, у паглядах немае пытаньне – што цяпер будзе? што рабіць? Увесь прыдушаны, прыгнечаны двор напоўніўся шэптам, тут шу-шу, там шу-шу, ніхто ўжо нічога ня робіць,

толькі па калідорах соваюцца, па салёнах зьбіраюцца і паціху штосьці абмяркоўваюць, дыскутуюць, на народ сварацца. І такое нарастала паміж палацам і вуліцай узаемнае ганьбаваньне, абвінавачваньне, зайздрасьць і незычлівасьць, якая ўсё атручвала. Я б сказаў, што паволі, паволі ў палацы ўтвараюцца тры фракцыі. Першая – гэта людзі кратавыя, заўзятая і непадатлівая групоўка, якая дамагаецца навядзеньня парадку і настойвае на тым, каб арыштаваць падбухторшчыкаў, пасадзіць за краты бунтаўнікоў, біць дручкамі і вешаць. На чале гэтай фракцыі дачка імпэратара – Тэнэнэ Ворк, шасьцідзесяцідвухгадовая дама, вечна злая і бязьлітасная, якая заўсёды папракала шаноўнага гаспадара ягонай дабрынёй. У другой фракцыі групуюцца людзі сталовыя – гэта групоўка лібэралаў, людзей слабых і да таго ж схільных да філязофіі, якія ўважаюць, што трэба запрасіць бунтаўнікоў за стол і паразмаўляць, выслухаць, што яны кажуць, і штосьці ў імпэрыі зьмяніць і паправіць. Тут найгучнейшы голас мае князь Мікаэль Імру, адкрыты розум, натура, схільная да ўступак, ён шмат бываў у сьвеце, ведаў разьвітыя краіны. Нарэшце, трэцюю фракцыю складаюць людзі коркавыя – якіх, я б сказаў, у палацы найбольш. Гэтыя нічога ня думаюць, але лічаць, што хваля падзеяў будзе несьці іх, як корак па вадзе, і ўрэшце ўсё неяк наладзіцца, а яны памысна даплывуць да гасьціннага порту. І калі двор ужо падзяліўся на кратавых, сталовых і коркавых, кожная групоўка пачала выказваць свае меркаваньні, але выказваць патаемна і нават падпольна, бо ясны гаспадар не любіў ніякіх фракцыяў, таму што не цярпеў балбатні, ціску і ўсялякага настойваньня, якое парушала спакой. А з той прычыны, што гэтыя фракцыі ўтварыліся і пачалі міжсобку змагацца, сварыцца, кіпцюры паказваць, рукамі размахваць, усё ў палацы на хвілю ажыла, даўная бадзёрасьць вярнулася, па-свойску зрабілася.

Л. К.:

У той час гаспадар наш з усё большай цяжкасьцю падымаўся ўжо з ложка. Ён дрэнна спаў альбо ўвогуле цэлую ноч ня спаў, а пасьля драмаў на працягу дня. Нам ён нічога не казаў, нават падчас ежы ў атачэньні сям'і – зрэшты, сам ён ужо амаль нічога

ня еў – таксама мала гаварыў, усё больш маўчаў. Толькі ў гадзіну даносаў ён ажыўляўся, бо ягоныя людзі цікавыя цяпер прыносілі весткі, кажучы, што ў Чацьвертай дывізіі завязалася таемная змова афіцэраў, якія маюць агентаў ува ўсіх гарнізонах і ў паліцыі ўсёй імпэрыі, але хто ўдзельнічае ў гэтай змове, даносчыкі сказаць не маглі, у такой вялікай таямніцы тады ўсё трымалася. Шаноўны гаспадар, казалі пазьней даносчыкі, ахвотна іх слухаў, адылі ніякіх загадаў не даваў, а слухаючы, сам ні пра што не пытаўся. Іх зьдзіўляла таксама, што нічога з гэтых даносаў не выходзіла: слаўны гаспадар, заміж даваць загады на арышты і вешаньне, хадзіў па садзе, карміў пантэры, птушкам зерне сыпаў і ўвесь час маўчаў. А калі настала сярэдзіна красавіка, сярод бесьперапынных вулічных хваляваньняў гаспадар наш загадаў зладзіць у палацы ўрачыстасьць з нагоды абвяшчэньня свайго наступніка. У вялікай тронавай залі сабраліся саноўнікі і натаблі, чакаючы і перашэптваючыся аб тым, каго імпэратар прызначыць сваім пераемнікам – а гэта была навіна, бо дагэтуль гаспадар наш усялякія чуткі, плёткі што да пераемнасьці трона заўсёды асуджаў і ганіў. Цяпер жа, быўшы гэтым у найвышэйшай ступені ўзрушаны, так што ледзь чуваць было ягоны дрыготкі і ціхі голас, найласкавейшы гаспадар абвясьціў, што, зважаючы на свой паважны век і штораз часьцейшыя заклікі назваць свайго пераемніка, ён прызначае – па сваім пабожным сконе – наступнікам трона свайго ўнука Зэру Якоба. Гэты дваццацігадовы маладзён тады навучаўся ў Оксфардзе, адасланы з краіны пэўны час таму дзеля таго, што, ведучы тут занадта свавольнае жыцьцё, прыносіў расчараваньні свайму бацьку князю Асьфе Восэну, адзінаму ўжо сыну імпэратара, які, аднак, быў назаўсёды скуты паралюшам і знаходзіўся ў жэнэўскім шпіталі. І хоць такая была воля нашага гаспадара, старыя саноўнікі і сівыя чальцы Кароннай рады пачалі шаптаць і нават употайкі пратэставаць, кажучы, што пад такім малакасосам служыць ня будуць, бо гэта было б прыніжэньнем і абразай для іх паважнага веку і шматлікіх заслуг. Тут жа пачала фармавацца фракцыя праціўнікаў пераемнасьці, якая раздумвала, як бы пасадзіць на трон дачку імпэратара, гэтую кратавую даму – Тэнэнэ Ворк. І адразу зьявілася іншая фракцыя, якая хацела ўзьвесьці на трон іншага ўнука імпэратара – князя Маканэна, які ў той час навучаўся ў

Амэрыцы, у афіцэрскай школе. І вось, дружа, пасярод гэтых раптам узьніклых інтрыг вакол пераемнасьці трона, празь якія ўвесь двор паглынулі такія шалёныя спрэчкі, што ніхто ўжо ня думаў аб тым, што адбываецца ў імпэрыі, хоць бы нават на найбліжэйшых да палацу вуліцах, цалкам неспадзявана, так усіх зьдзівіўшы, ну як жа нечакана! у горад уваходзіць войска і ўначы арыштоўвае ўсіх міністраў даўняга ўраду Аклілу, пад замок бяруць нават самога Аклілу, а таксама дзьвесьце генэралаў і вышэйшых афіцэраў, вядомых надзвычайнай лаяльнасьцю да імпэратара, якая ніколі ня ставілася пад сумнеў. Ніхто яшчэ не пасьпеў апрытомнець ад шоку пасьля гэтага небывалага здарэньня, як прыходзіць вестка, што змоўнікі арыштавалі начальніка генэральнага штабу, генэрала Асэфу Аену, найбольш лаяльнага да імпэратара чалавека, які ўратаваў яму трон падчас сьнежаньскіх падзеяў, зьнішчыўшы групу братоў Нэвай і разграміўшы імпэратарскую гвардыю. У палацы пануе страх, трывога, зьбянтэжанасьць, прыгнечанасьць. Кратавыя ціснуць на імпэратара, каб ён штосьці зрабіў, загадаў адбіць арыштаваных, разагнаць студэнтаў, а змоўнікаў павесіць. Літасьцівы гаспадар усе парады выслухоўвае, падтаквае, суцяшае. А сталовыя кажуць, што гэта апошні момант, каб сесьці за стол, змоўнікаў угаварыць, імпэрыю паправіць, палепшыць. І гэтых найшляхетнейшы гаспадар выслухоўвае, падтакваючы, суцяшаючы. Дні мінаюць, а змоўнікі то таго, то гэтага з палацу забіраюць, арыштоўваюць. Тады зноў кратавая дама выдатнаму гаспадару дакучае, што ён, маўляў, лаяльных саноўнікаў не бароніць. Але відаць, дружа, так ужо ёсьць, што чым большую лаяльнасьць хтосьці выяўляе, тым больш ён пад удар падстаўляецца, бо калі яго якаясьці фракцыя прыцісьне, гаспадар яго бяз слова кіне, але княжна, відаць, гэтага не разумела, бо на абарону лаяльных уставала. А быў ужо травень, то бок самы час прыводзіць да прысягі кабінэт прэм'ера Маканэна. Але імпэратарскі пратакол паведамляе, што цяжка будзе іх да прысягі прывесьці, бо палова міністраў альбо ўжо арыштаваная, альбо за мяжу ўцякла, альбо так у палац і не зьявілася. Самога ж прэм'ера студэнты выклікаюць, камянямі яго закідваюць, бо Маканэн ніколі ня ўмеў выклікаць да сябе прыхільнасьць. Адразу ж пасьля павышэньня неяк яго разьдзьмула, штосьці там унутры так паднялося, што ён

разбухнуў, павялічыўся, а зрок так угару скіраваўся і закаламуціўся, што ён нікога не пазнаваў, нікога да сябе блізка не падпускаў, нікому не дазваляў з сабой па-свойску пагутарыць. Якаясьці вышэйшая сіла перасоўвала яго па калідорах, заводзіла яго ў салёны, куды ён уваходзіў і адкуль выходзіў недаступны, недасяжны. А дзесьці зьявіўшыся, ён пачынаў набажэнства вакол сябе і да сябе, а іншыя ўжо яго падтрымлівалі, заахвочвалі, распалялі сваім пакланеньнем, пакорнасьцю. Ужо тады было вядома, што Маканэн не ўтрымаецца доўга, бо яго не хацелі ані салдаты, ані студэнты. Ня памятаю, ці адбылося ўрэшце гэтае прывядзеньне да прысягі, бо шораз якогасьці зь яго міністраў пад замок саджалі. Ты мусіш ведаць, дружа, што хітрасьць нашых змоўнікаў была надзвычайная. Калі яны кагосьці арыштоўвалі, то адразу абвяшчалі, што робяць гэта ад імя імпэратара, і падкрэсьлівалі сваю ляяльнасьць да нашага гаспадара, чым рабілі яму вялікую радасьць, бо калі Тэнэнэ Ворк прыходзіла да бацькі сварыцца на войска, той яе асуджаў, хвалячы вернасьць і адданасьць сваёй арміі, новы доказ чаго ён неўзабаве атрымаў, калі ў пачатку траўня ваенныя вэтэраны зладзілі перад палацам маніфэстацыю ляяльнасьці, выгукаючы лёзунгі ў гонар вялікага гаспадара, а дастойны манарх, выйшаўшы на балькон, дзякаваў арміі за яе нязломную ляяльнасьць і зычыў далейшай памыснасьці і посьпехаў.

чэрвень-ліпень

У. З.-В.:

У палацы прыгнечанасьць, рукі апускаюцца, трывожнае чаканьне, што будзе заўтра, і тут раптам гаспадар наш склікае дарадцаў, закідае ім, што яны на разьвіцьцё забываюцца, і так іх насварыўшы, абвяшчае, што будзем ставіць плаціны на Ніле. Якія плаціны ставіць, бурчаць самі сабе зьбянтэжаныя дарадцы, калі правінцыі галадаюць, народ хвалюецца, сталовыя шэпчуць, што трэба імпэрыю паправіць, афіцэры змову ладзяць, натабляў арыштоўваюць. І адразу па калідорах чуваць непакорныя нараканьні, што лепей было б нашых галадоўнікаў падтрымаць, а ад гэтых плацінаў адмовіцца. На гэта міністар

фінансаў тлумачыць, што калі паставіць памянёныя плаціны, можна будзе ваду на палі пусьціць, і тады такі ўраджай можна будзе атрымаць, што і галадоўнікаў больш ня будзе. Ну так, наракаюць тыя, хто наракаў, але колькі ж гэта гадоў трэба, каб плаціны паставіць, тым часам народ з голаду памрэ. Не памрэ, тлумачыць міністар фінансаў, дагэтуль не памёр, значыць і цяпер не памрэ. А калі, кажа, мы гэтых плацінаў не паставім, то як жа тады дагонім, перагонім? Але з кім жа нам ганяцца, наракаюць тыя, хто наракаў. Як з кім? кажа міністар фінансаў, з Эгіптам. Але Эгіпет, любачка, багацейшы за нас, і тое не з уласнай кішэні плаціны ставіў, а мы адкуль грошы возьмем на нашы плаціны? Тут міністар раззлаваўся на тых, хто сумняваўся, наракаў, і пачаў ім даводзіць, якая важная гэта справа – займацца разьвіцьцём, і што калі мы гэных плацінаў не паставім, ніякага разьвіцьця ня будзе, тады як гаспадар наш наказаў, каб мы ўсе бесьперапынна разьвіваліся, ні хвіліны не спачываючы, сэрца, душу аддаючы. І тут жа міністар інфармацыі абвясьціў пастанову шаноўнага гаспадара новым посьпехам, і я нават памятаю, што ў вокамгненьне ў сталіцы паразьвешвалі такі лёзунг: як паставім мы плаціны, будзе дабрабыт у краіне, хай паклёпнікі цікуюць – разьвіцьця не загамуюць! Адылі гэтая справа так разьюшыла афіцэраў-змоўнікаў, што імпэратарскую раду, створаную найясьнейшым гаспадаром для нагляду за будаўніцтвам гэтых плацінаў, яны колькі дзён пазьней узялі пад арышт, заявіўшы, што з гэтага толькі яшчэ большая карупцыя магла б атрымацца і яшчэ горшае галаданьне народу. Я ж заўсёды меркаваў, што гэты ўчынак афіцэраў мусіў нашаму гаспадару асаблівую прыкрасьць зрабіць, таму што, адчуваючы, што гады ўсё большым цяжарам кладуцца на яго плечы, ён хацеў пакінуць па сабе ўнушальны манумэнт, які б ува ўсіх будзіў подзіў, каб яшчэ праз шмат гадоў кожны, каму б пашчасьціла дабрацца да імпэратарскіх плацінаў, мог закрычаць – глядзеце, хіба толькі сам імпэратар здольны быў такія цуды ўзьвесьці, цэлыя горы ўпоперак ракі паставіць! А калі іначай зрабіць, прыслухацца да шаптаньняў, нараканьняў, што лепей накарміць галодных, чым ставіць плаціны, то галодныя тыя, хоць і наеўшыся, усё адно калісьці памерлі б, не пакінуўшы ніякага сьледу ні па сабе, ні па нашым гаспадару.

Доўга раздумвае, ці імпэратар ужо тады думаў пра свой сыход. Ён жа прызначыў наступніка трона і загадаў будаваць сабе вечны помнік у выглядзе гэтых плацінаў на Ніле (да чаго ж марнатраўная задума з увагі на іншыя, пільныя патрэбы імпэрыі!). Аднак мяркуе, што ход быў пра штосьці іншае. Прызначаючы наступнікам трона зусім маладога ўнука, імпэратар хацеў пакараць свайго сына за няслаўную ролю, якую той адыграў у сьнежаньскіх падзеях шасьцідзясятага году. Даючы загад на будаваньне плацінаў на Ніле, імпэратар хацеў давесьці сьвету, што імпэрыя расьце і квітнее, а ўсялякія нагаворы пра беднасьць і карупцыю – гэта толькі зласьлівая балбатня ворагаў манархіі. Кажа, што ў сапраўднасьці думка аб сыходзе была абсалютна чужая натуры імпэратара, які разглядаў дзяржаву як свой асабісты твор і верыў, што з сыходам ягонай асобы гэтая краіна разваліцца і зьнікне. Хіба ж мог ён зьнішчыць уласны твор? І апроч таго, пакідаючы муры палацу, добраахвотна падставіцца пад удары ворагаў, якія толькі гэтага й чакалі? Не, ні пра які сыход не магло быць мовы, насупраць, пасьля кароткіх прыступаў старэчай дэпрэсіі імпэратар як бы ўваскрасаў, ажываў, узбадзёрваўся, і нават відаць было на яго старым твары гордасьць за тое, што ён такі спраўны, прытомны і ўладны. Прыйшоў чэрвень – месяц, калі змоўнікі, канчаткова ўзмацніўшыся, аднавілі свае хітрыя атакі на палац. Гэтая ўсёзьнішчальная хітрасьць палягала ў тым, што ўсё разбурэньне сыстэмы яны рабілі зь імем імпэратара на вуснах, нібыта выконваючы ягоную волю і пакорна зьдзяйсьняючы яго думкі. Цяпер яны, заяўляючы, што робяць гэта ад імя імпэратара, стварылі камісію для дасьледаваньня карупцыі сярод саноўнікаў, падлічвалі іх рахункі, зямельныя ўладаньні і ўсе іншыя багацьці. Людзей палацу агарнуў жах, бо ў беднай краіне, у якой крыніцай багацьця ёсьць не эфэктыўная вытворчасьць, але надзвычайныя прывілеі, ніводны саноўнік ня мог мець чыстага сумленьня. Баязьлівейшыя думалі ўцячы за мяжу, але вайскоўцы закрылі лётнішча і ўвялі забарону выезду з краіны. Пачалася новая хваля арыштаў, кожнай ночы зьнікалі людзі палацу, двор усё больш пусьцеў. Вялікае ўзрушэньне выклікала навіна аб арышце князя Асратэ Касы, які ўзначальваў Каронную раду і быў другой пасьля імпэратара асобай манархіі. У вязьніцы апынуўся таксама міністар замежных справаў Мінас'е Хайле і больш за сто іншых саноўнікаў. У той жа час

войска заняла радыёстанцыю і ўпершыню абвясьціла, што на чале руху абнаўленьня стаіць каардынацыйны камітэт узброеных сілаў і паліцыі, які дзейнічаў – як яны надалей сьцьвярджалі – ад імя імпэратара.

К.:

Цэлы сьвет, дружа, устаў на галаву, і ўсё таму, што дзіўныя знакі зьявіліся на небе. Месяц і Юпітэр, перабываючы на сёмым і дванаццатым месцах, заміж схіляцца ў кірунку трыкутніка, пачыналі злавесна ўтвараць фігуру квадрата. З гэтай прычыны індусы, якія пры двары тлумачылі знакі, адразу з палацу ўцяклі, пэўна, таму, што баяліся шаноўнага гаспадара нядобрай варажбой раззлаваць. Але княжна Тэнэнэ Ворк, мусіць, надалей з гэтымі індусамі мела сустрэчы, бо бегала ўзрушаная па палацы і намаўляла старога гаспадара, каб ён арыштоўваць ды вешаць загадаў. Астатнія кратавыя таксама націскалі і ўжо нават на каленях дастойнага гаспадара малілі, каб ён змоўнікаў спыніць, за краты кінуць загадаў. Адылі якое ж было іх аняменьне, якое неразуменьне, калі яны ўбачылі, што слаўны гаспадар цяпер пачаў увесь час у вайсковым мундуры хадзіць, ордэнамі зьвінець, булаву насіць, нібы хочучы паказаць, што ён надалей сваёй арміяй камандуе, на чале стаіць і загады выдае! Нічога, што гэтая армія супраць палацу выступае, так, выступае, але пад яго кіраўніцтвам, верная, ляяльная армія, якая ўсё робіць ад імя імпэратара! Узбунтаваліся? так, але ўзбунтаваліся ляяльна! Вось жа, дружа, шаноўны гаспадар хацеў панаваць над усім, нават калі быў бунт – панаваць над бунтам, панаваць над паўстаньнем, хоць бы нават тое паўстаньне супраць яго ўласнага панаваньня скіравана было. Кратавыя бурчаць, што якоесьці зацямненьне розуму гаспадара нашага агарнула, калі ён зразумець ня можа, што такім чынам ён сваім уласным падзеньнем кіруе. Але літасьцівы гаспадар, нікога ня слухаючы, прымае ў палацы дэлегацыю гэнага камітэту, які па-амхарску называўся «Дэрг», замыкаецца ў сваім кабінэце і давай з гэтымі змоўнікамі раіцца! І тут, дружа, з сорамам табе прызнаюся, што ў той самы момант у калідорах можна было пачуць бязбожнае і абуральнае шаптаньне, быццам бы дастойны гаспадар, мусіць, звар'яцеў, бо

ў дэлегацыі той былі звычайныя капралы і сэржанты, а хіба ж можна было падумаць, каб найясьнейшы гаспадар сеў за адзін стол з вайскоўцамі такіх нізкіх чыноў! Цяжка зараз сказаць, аб чым гаспадар наш з гэтымі людзьмі раіўся, але адразу пасьля гэтага пачаліся новыя арышты, а палац яшчэ больш абязьлюдзеў. Пасадзілі пад замок князя Мэсьфіна Шылешы, а гэта быў вялікі гаспадар, які меў уласную армію, цяпер, аднак, раззброеную. Пасадзілі пад замок князя Ворку Сэлас'е, які меў нязьмерныя зямельныя ўладаньні. Арыштавалі зяця імпэратара, генэрала Абіе Абэбэ, міністра абароны. Урэшце арыштавалі прэм'ера Эндэлькачэва і колькі яго міністраў. Цяпер ужо штодня кагосьці арыштоўвалі, увесь час паўтараючы, што ад імя імпэратара. Кратавая дама за бацькам хадзіла, настойвала, каб ён цьвёрдасьць паказаў. Бацьку, казала, устань і пакажы цьвёрдасьць! Але, шчыра кажучы, якую ж у такім паважным веку цьвёрдасьць паказаць можна? Гаспадар наш ужо толькі мяккасьцю мог паслугоўвацца і давёў сваю вялікую мудрасьць, калі, заміж каб спрабаваць здушыць супраціў цьвёрдасьцю, ён, хутчэй, прымірэнчую мяккасьць выяўляў, каб у такі спосаб змоўнікаў улагодзіць. А чым больш гэтая дама цьвёрдасьці патрабавала, з тым большай злосьцю яна на мяккасьць глядзела, і нішто не магло яе ўціхамірыць, нэрвы ёй супакоіць. Але літасьцівы гаспадар ніколі ў гнеў не ўпадаў, насупраць, заўсёды гэтую кабету хваліў, суцяшаў, падбадзёрваў. Цяпер змоўнікі ўсё часьцей у палац прыходзілі, а гаспадар наш іх прымаў, выслухоўваў, хваліў за ляяльнасьць, заахвочваў. З гэтай прычыны найбольшую радасьць сталовыя выказвалі, увесь час заклікаючы за стол сядаць, імпэрыю папраўляць, жаданьні бунтаўнікоў выконваць. І кожны раз, калі сталовыя маніфэст у такім духу прапаноўвалі, слаўны наш гаспадар хваліў іх за ляяльнасьць, суцяшаў і заахвочваў. Але і сталовых войска ўжо папатрапала, так што і іх галасы ўсё слабей чуваць было. У гэты час салёны, калідоры, ганкі і дзядзінцы з кожным днём усё больш пусьцелі, і неяк ніхто бараніць палац ня браўся. Ніхто ня крыкнуў, што трэба брамы зачыніць і зброю выставіць. Людзі паглядалі адно на аднаго, думаючы: а можа яго возьмуць, а мяне пакінуць? А калі шум супраць бунтаўнікоў уздыму, адразу мяне пасадзяць, а іншых у спакоі пакінуць? Лепей ціха сядзець і нічога ня ведаць. Лепей не скакаць, каб пасьля ня плакаць. Лепей не гукаць, каб не шкадаваць. Толькі

часам усе да гаспадара хадзілі, пытаючыся, што рабіць, а ўсёмагутны ўладар скаргі нашы выслухоўваў, хваліў і заахвочваў. Пазьней, аднак, усё цяжэй было атрымаць аўдыенцыю, бо дастойны гаспадар, стомлены ўжо выслухоўваньнем такой колькасьці скаргаў – увесь час толькі нараканьні, патрабаваньні і даносы, – найахвотней прымаў амбасадараў іншых краінаў і ўсялякіх замежных пасланьнікаў, бо тыя прыносілі яму палёгку, хвалячы яго, суцяшаючы, падбадзёрваючы. Гэтыя амбасадары, а таксама змоўнікі былі апошнімі людзьмі, зь якімі гаспадар наш перад сваім сыходам размаўляў, і згодна пацьвердзілі, што бачылі яго ў добрым здароўі і ў цьвярозым розуме.

Д.:

Рэшта кратавых, якая яшчэ ў палацы заставалася, па калідорах хадзіла, да дзеяньня заклікала. Трэба рушыць, казалі, у атаку пераходзіць, супраць бунтаўнікоў выступіць, іначай сумна ўсё скончыцца, зьнікне. Але як перайсьці ў атаку, калі ўвесь двор у абароне засеў, як жа можна даць рады, калі такая бязраднасьць, як жа слухаць сталовых, якія да зьмен заклікаюць, калі яны ня кажуць, што зьмяніць і дзе ўзяць сілы для гэтага? Усе зьмены маглі зыходзіць толькі ад манарха, вымагалі яго згоды і падтрымкі, бо іначай яны ставалі здрадай і сустракалі асуджэньне. Тое ж самае з усякімі міласьцямі – толькі гаспадар наш мог іх раздаваць, і калі хто чагосьці ад трона не атрымаў, то іншым спосабам дасягнуць гэтага ня мог. Таму засмучанасьць панавала сярод прыдворных – калі гаспадара нашага ня стане, хто будзе іх ласкамі адорваць і іх маёмасьць памнажаць? І так тады хацелася ў нашым абложаным, аблаяным палацы пасіўнасьць пераламаць, з чымсьці годным выступіць, думкай бліснуць, жыцьцяздольнасьць выявіць! Хто яшчэ быў здольны, хадзіў па калідорах, лоб моршчыў, думку гэтую шукаў, галаву сабе ламаў, пакуль урэшце не нарадзілася такая ідэя, што трэба гадавіну адсьвяткаваць! А што ж гэта за думка, пачалі крычаць сталовыя, гадавінай зараз займацца, калі гэта апошні момант, каб за стол сядаць, імпэрыю ратаваць, папраўляць! Але коркавыя палічылі, што гэта будзе годная праява жыцьцяздольнасьці, якая выкліча павагу сярод

падуладных, і давай гэтую гадавіну ладзіць, бяседу для бедных гатаваць. Нагодай жа, дружа, было тое, што гаспадар наш скончыў восемдзесят другі год жыцьця, хаця студэнты, якія ў старызьне нейкай корпацца пачалі, адразу вэрхал усчалі, маўляў, гэта ня восемдзесят, а дзевяноста другі год, бо, крычалі яны, гаспадар наш калісьці гадоў сабе ўбавіў. Але яд студэнцкі ня мог атруціць гэтага сьвята, якое міністар інфармацыі, будучы яшчэ нейкім цудам на волі, адразу ацаніў як посьпех і найлепшы прыклад гармоніі і ляяльнасьці. Ніякія перашкоды ня ў стане былі перамагчы гэтага міністра, бо ён быў такі кемлівы, што ў найбольшай страце ўмеў згледзець карысьць, і ўсё ў яго было так спрытна павёрнута, што ў паразе ён бачыў перамогу, у няшчасьці – шчасьце, у беднасьці – заможнасьць, у няўдачы – посьпех. І калі б ня гэтае паварочваньне, як жа можна было б тое сумнае сьвята цудоўным назваць? У той дзень падаў халодны дождж і слаўся туман, калі гаспадар наш выйшаў на балькон палацу прачытаць тронавую прамову. Побач зь ім на бальконе стаяла толькі змоклая, прыгнечаная жменька саноўнікаў, бо рэшта ўжо была пад арыштам альбо ўцякла са сталіцы. Ніякага натоўпу не было, толькі служба двара і трохі салдат з імпэратарскай гвардыі, якія стаялі на ўскрайку дзядзінцу, што зеўраў пусткай. Шаноўны гаспадар наш выказаў спачуваньне правінцыям, якія галадаюць, і сказаў, што будзе рабіць усё магчымае, каб імпэрыя магла надалей плённа разьвівацца. Ён таксама дзякаваў арміі за ляяльнасьць, хваліў сваіх падданых, заахвочваў і зычыў усім посьпехаў. Але гаварыў ён ужо так ціха, што праз шум дажджу ледзь чуваць было асобныя словы. І ведай, дружа, што ўсё гэта я забяру з сабой у магілу, бо я ўсё яшчэ чую, як голас нашага гаспадара ўсё больш яму здраджвае, і бачу, як па яго старым твары сплываюць сьлёзы. І тады, так, тады я ўпершыню падумаў, што ўсё канчаецца ўжо напраўду. Што ў той дажджлівы дзень адыходзіць цэлае жыцьцё, халодны і ліпкі туман накрывае нас, а Месяц і Юпітэр, стоячы на сёмым і дванаццатым месцах, утвараюць фігуру квадрата.

Увесь гэты час – а гэта лета семдзесят чацьвертага году – ідзе вялікая гульня двух спрытных і хітрых партнэраў – старога імпэратара і маладых афіцэраў з «Дэргу». З боку афіцэраў гэта

гульня падыходу, яны стараюцца аблажыць старога манарха ў ягоным бярлогу – палацы. А з боку імпэратара? Ягоны плян вельмі тонкі, але пачакайма, праз хвілю мы ўведаем і яго задуму. А пазасталыя асобы? Іншыя ўдзельнікі гэтай захапляльнай і драматычнай гульні, уцягнутыя ў яе хадой падзеяў, няшмат разумеюць з таго, што адбываецца. Саноўнікі і фаварыты гойсаюць па калідорах палацу, бязрадныя і спалоханыя. Памятайма, што палац быў сядзібай пасрэднасьцяў, зборышчам людзей другасных, а такія ў хвіліны крызісу заўжды губляюць галаву і стараюцца толькі ўратаваць уласную скуру. Пасрэднасьць у такія моманты вельмі небясьпечная, бо, адчуваючы пагрозу, яна робіцца бязьлітаснай. Гэта акурат тыя кратавыя, якіх не стае на штосьці большае, як адразу распачаць страляніну і кровапраліцьце: іх асьляпляе страх і нянавісьць, а да дзеяньня падштурхоўваюць найніжэйшыя сілы – подласьць, зацяты эгаізм, страх перад стратай прывілеяў і ганьбай. Дыялёг з гэтымі людзьмі немагчымы, пазбаўлены сэнсу. Другую групу становяць сталовыя – людзі добрай волі, але паводле натуры пасіўныя, расхлябаныя, падатлівыя і няздольныя выйсьці па-за схемы палацавага мысьленьня. Гэтых найбольш б'юць, з усіх бакоў б'юць, адсоўваюць і зьнішчаюць, бо яны спрабуюць рухацца ўва ўжо конча расколатай сытуацыі, у якой два скрайнія праціўнікі – кратавыя і паўстанцы – ужо ня хочуць іх паслуг, з той прычыны, што памкненьнем скрайнасьцяў ёсьць сутычка, а не замірэньне. Вось жа, сталовыя таксама нічога не разумеюць і ня значаць, іх таксама перарасла і адсунула ў бок гісторыя. Пра коркавых няма чаго сказаць, гэтыя плывуць туды, куды іх цягне плынь, гэта касяк тактычнай малечы, якую нясе, цягне ўва ўсіх кірунках, якая стараецца, намагаецца хоць як-небудзь выжыць. Вось фаўна палацу, супраць якой выступае група маладых афіцэраў – спрытных, разумных людзей, амбітных разгарачаных патрыётаў, сьведамых страшнага становішча бацькаўшчыны, дурасьці і бязраднасьці эліты, карупцыі і разбэшчанасьці, беднасьці і прыніжальнай залежнасьці краіны ад мацнейшых дзяржаваў. Яны самі, будучы часткай імпэратарскай арміі, належаць да ніжэйшых слаёў эліты, яны таксама карысталіся прывілеямі, і да змаганьня іх падштурхоўвае не галеча, якой яны беспасярэдне не адчуваюць, але пачуцьцё сораму і маральнай адказнасьці. Яны маюць зброю і вырашаюць выкарыстаць яе напоўніцу. Змова завязваецца ў штабе Чацьвертай дывізіі,

кашары якой знаходзяцца ў прадмесьцях Адыс-Абэбы, зрэшты, досыць блізка ад палацу імпэратара. Група змоўнікаў доўгі час дзейнічае ў максымальна шчыльнай канспірацыі – нават дробная, алюзійная ўцечка магла б прывесьці да рэпрэсіяў і сьмяротнай кары. Паступова змова пранікае ў іншыя гарнізоны, а пазьней – у шэрагі паліцыі. Здарэньнем, якое паскорыла канфрантацыю з палацам, была трагедыя галадамору ў паўночных правінцыях краіны. Звычайна кажуць, што прычынай масавых сьмерцяў ад голаду ёсьць пэрыядычныя засухі, якія спрычыняюцца да неўраджаю. Гэты погляд прадстаўляюць эліты краінаў, што галадаюць. Аднак ён няслушны. Прычынай голаду найчасьцей ёсьць несправядлівае ці няправільнае разьмеркаваньне запасаў, нацыянальнай маёмасьці. У Этыёпіі было шмат зерня, але яно было схаванае багатырамі, а пасьля выкінутае на рынак па падвойных цэнах, не даступных для сялянства і гарадзкой беднаты. Падаюць лічбу, якая сягае соцень тысячаў людзей, якія памерлі проста побач з поўнымі збожжа сьвірнамі. На загад мясцовых натабляў паліцыя дабівала цэлыя грамады яшчэ жывых чалавечых шкілетаў. Гэтая сытуацыя скрайняй крыўды, жаху, роспачнага абсурду стае сыгналам для выступу афіцэраў-падпольшчыкаў. Бунт адну за адной ахоплівае ўсе дывізіі, а менавіта армія была галоўным апірышчам імпэратарскай улады. Пасьля кароткага пэрыяду ашаламленьня, зьдзіўленьня і ваганьняў Х. С. пачынае здаваць сабе справу з таго, што ён губляе найважнейшы інструмэнт улады. Спачатку група «Дэрг» дзейнічае ўпоцемках, яны хаваюцца ў падпольлі, не вядомыя іншым, яны самі ня ведаюць, наколькі вялікая частка арміі стане на іх бок. Таму яны мусяць дзейнічаць асьцярожна, прасоўвацца крадком, употайкі, крок за крокам. За імі студэнты і работнікі – гэта важна, але бальшыня генэралітэту і вышэйшых афіцэраў супраць падпольшчыкаў, а генэралітэт надалей камандуе, выдае загады. Крок за крокам – вось тактыка гэтай рэвалюцыі, накінутая сытуацыяй. Калі б яны выступілі адкрыта і адразу, дэзарыентаваная частка арміі, ня ведаючы, пра што ідзецца, магла б адмовіць ім у падтрымцы ці нават іх зьнішчыць. Паўтарылася б драма шасьцідзясятага году, калі войска страляла ў войска, а палац дзякуючы гэтаму праіснаваў яшчэ трынаццаць гадоў. Зрэшты, у самім «Дэргу» таксама няма адзінства – так, усе хочуць зьнішчыць палац, хочуць зьмяніць анахранічную, вычарпаную, бязрадна гібеючую сыстэму, але

трываюць спрэчкі аб тым, што зрабіць з асобай імпэратара. Імпэратар стварыў вакол сябе міт, сілу і жывучасьць якога не было як спраўдзіць. Ён быў папулярнай у сьвеце, поўнай асабістага шарму, паўсюдна шанаванай постацьцю. Апроч таго, ён быў галавой царквы, абраньнікам Бога, уладаром душ. Падняць на яго руку? Гэта заўсёды заканчвалася праклёнам і шыбеніцай. Гэтыя хлопцы з «Дэргу» сапраўды былі людзьмі вялікай адвагі. І ў якойсьці ступені – адчайнымі людзьмі, бо пазьней яны ўспамінаюць, што, вырашаючы выступіць супраць імпэратара, ня верылі ў свой посьпех. Можа быць, Х. С. штосьці ведаў пра сумневы і разьбежнасьці, якія разьдзіралі «Дэрг», урэшце, ён меў надзвычай разьвітую выведную сетку. Але можа быць, што ён кіраваўся толькі інстынктам, сваім праніклівым тактычным пачуцьцём, вялікім досьведам? А калі было іначай? Калі ён папросту не адчуваў у сабе сілаў для далейшай барацьбы? Здаецца, што ён адзін ува ўсім палацы разумеў, што хвалі, якая паднялася гэтым разам, ён ужо ня можа супрацьстаяць. Усё рассыпалася, у яго былі пустыя рукі. Таму ён пачынае саступаць, больш за тое – перастае кіраваць. Ён стварае бачнасьць свайго існаваньня, але найбліжэйшыя ведаюць, што ў сапраўднасьці ён нічога ня робіць, ня дзейнічае. Ягонае атачэньне зьбітае з панталыку гэтай бязьдзейнасьцю, яно губляецца ў здагадках. То адна, то другая фракцыя прадстаўляе яму абсалютна процілеглыя аргумэнты, а ён усіх з аднолькавай увагай слухае, падтаквае, усіх хваліць, суцяшае, заахвочвае. Ён пускае падзеі на самацёк – узвышаны, аддалены, замкнёны, выключаны, як быццам ён рухаецца ўжо ў іншым вымярэньні, у іншым часе. Быць можа, ён хоча ўстаць па-над канфліктам, каб даць дарогу новым сілам, якіх ён усё адно ня можа стрымаць? Можа, ён разьлічвае, што ўзамен за гэтую паслугу яны пазьней ушануюць, прымуць яго? У любым разе, застаўшыся адзін, ён, стары, якому няшмат засталося жыць, ужо ня будзе для іх небясьпечны. Значыць, ён хоча застацца? Ацалець? Пакуль вайскоўцы пачынаюць з дробных правакацыяў: арыштоўваюць па абвінавачаньні ў карупцыі колькі звольненых міністраў ураду Аклілу. Неспакойна чакаюць рэакцыі імпэратара. Але Х. С. маўчыць. Гэта значыць, што ход удаўся, першы крок быў зроблены. Асьмялеўшы, яны ідуць далей – адгэтуль тактыка паступовага дэмантажу эліты, павольнага, але руплівага спустошваньня палацу пушчаная ў рух. Саноўнікі, натаблі зьнікаюць адзін за адным: пасіўныя, бязвольныя,

чакаючы сваёй чаргі. Пасьля ўсе яны спатыкаюцца пад арыштам у Чацьвертай дывізіі, у гэтым новым, асаблівым, няўтульным антыпалацы. Перад брамай кашараў, проста каля каляінаў чыгункі Адыс-Абэба-Джыбуці, якія праходзяць у гэтым месцы, стаіць даўгі шэраг шыкоўных лімузінаў: гэта княжны, жонкі міністраў, генэралаў, усхваляваныя і напалоханыя, прывозяць сваім мужам і братам – вязьням новага парадку – ежу і вопратку. На гэтыя сцэны лупіць вочы натоўп узрушаных і зьдзіўленых разявак: вуліца яшчэ ня ведае, што насамрэч адбываецца, гэта яшчэ не дайшло да яе. Імпэратар усё яшчэ ў палацы, а афіцэры працягваюць кіраваць у штабе дывізіі, абдумваюць наступныя крокі. Вялікая гульня працягваецца, але набліжаецца яе апошні акт.

жнівень-верасень

М. В.-І.:

І вось пасярод прыгнечанасьці, здушанасьці, якая напаўняла палац, ахінала прыдворных панурым смуткам, раптам прыяжджаюць швэдзкія дактары, якіх слаўны гаспадар даўно яшчэ паклікаў з Эўропы і якія ў выніку нейкай незразумелай затрымкі прыбылі толькі цяпер, каб праводзіць у нашым двары заняткі гімнастыкай. Заўваж, дружа, што ўжо тады ўсё ў руінах ляжала, а хто са сьвіты яшчэ пад арыштам не сядзеў, усё адно ні дня, ні гадзіны сваёй ня ведаў і толькі бачком, крадком калідорамі соваўся, каб афіцэрам на вочы ня трапіць, бо яны цяпер хапалі, замыкалі, нікому ўцячы не давалі. А тут маеш – сярод усёй гэтай аблавы, гэтага паляваньня, даводзіцца гімнастыкай займацца! Хто ж здольны зараз якойсьці гімнастыкай займацца, калі гэта апошні момант, каб за стол сядаць, імпэрыю папраўляць, дарабляць, спраўнай рабіць! Але такая ўжо была воля нашага гаспадара, а таксама ўсёй Кароннай рады, каб усе людзі двара пра здароўе сваё дбайна клапаціліся, дабротамі прыроды багата карысталіся, колькі трэба ў выгодах і дастатку адпачывалі, добрым паветрам дыхалі, а найлепей – замежным, і ашчаджаць на гэтым грошы літасьцівы гаспадар наш забараняў, шматкроць паўтараючы, што жыцьцё людзей палаца ёсьць найвялікшым скарбам імпэрыі і найвышэйшай каштоўнасьцю манархіі. І ў гэтым духу

гаспадар наш даўно яшчэ такі дэкрэт выдаў, што мы мусім гэтай гімнастыкай займацца, і не скасаваў яго з прычыны паноўнага гармідару і ўсё большых клопатаў, і нам давялося – апошнім, хто заставаўся ў палацы, – раніцай на гімнастыку станавіцца і, рукамі, нагамі махаючы, найвялікшы скарб імпэрыі да гнуткасьці, спрытнасьці прымушаць. Убачыўшы, што насуперак нахабным захопнікам, якія паволі авалодвалі палацум, гімнастыка прагрэсуе, міністар інфармацыі ацаніў гэта як посьпех і падбадзёрлівы доказ непарушнай еднасьці нашага двара. Яшчэ ў памянёным дэкрэце загадвалася, што калі хтосьці, выконваючы дзяржаўныя абавязкі, хоць бы трохі ператоміцца, адразу павінен перадышку браць, у выгоднае, утульнае месца паехаць, там адпачываць, удыхаць і выдыхаць ці нават, у вопратку простую ўбраўшыся і паспалітым стаўшы, да самой прыроды набліжацца. А калі хтосьці пра адпачынак забываўся ці з прычыны надта руплівай службы яго закідваў, таго шаноўны гаспадар ганіў, дый іншыя прыдворныя нагадвалі, каб скарбу імпэрыі не марнаваў і найкаштоўнейшую нацыянальную каштоўнасьць ашчаджаў. Але як жа цяпер можна было да прыроды набліжацца і адпачываць, калі афіцэры нікога з палацу не выпускалі, а калі хтосьці крадком дадому ўцякаў, там яго падпільноўвалі і пад арышт бралі? А найгоршая рэч, якая вынікала з памянёнай гімнастыкі, палягала ў тым, што калі група прыдворных у якімсьці салёне зьбіралася і там рукамі, нагамі махала, адразу змоўнікі заходзілі і ўсіх пад арышт гналі. Іх дні зьлічаныя, а яны гімнастыкай займаюцца! – сьмяяліся афіцэры, даходзячы да такога дзёрзкага зьдзеку. І гэта ўжо было найлепшым доказам таго, што афіцэры ніякіх каштоўнасьцяў не шануюць і супраць імпэрыі выступаюць, чым нават швэдзкія дактары засмучаныя былі, бо кантракты згубілі, хоць і радаваліся, што жыцьцё захавалі. А каб бунтаўнікі ўсіх за адзін раз не забралі, вялікі камэргер двара хітры выкрут прыдумаў, загадаўшы займацца гімнастыкай толькі ў малых групках, і тады, калі адныя афіцэрам трапяцца – іншыя ацалеюць і, ператрываўшы найгоршае, палац у сваім уладаньні ўтрымаюць. Адылі, дарагі дружа, нават гэты спрытны і хітры манэўр урэшце ня надта дапамог, бо бунт ужо да вялікай дзёрзкасьці дайшоў, палац наш заўзята атакуючы і з надзвычайнай зласьлівасьцю цкуючы. Настаў жнівень, то бок пачаліся апошнія тыдні панаваньня

нашага ўсёмагутнага ўладара. Але ці слушна я выбіраю словы, кажучы пра яго панаваньне ў гэтыя апошнія ўжо дні заняпаду? Магчыма, цяжэй за ўсё вызначыць, дзе праходзіць мяжа паміж панаваньнем сапраўдныя, такім, якому ўсё паддаецца, панаваньнем, якое стварае сьвет альбо зьнішчае сьвет; дзе ёсьць гэтая мяжа паміж панаваньнем жывым, вялікім, хоць і страшным, і бачнасьцю панаваньня, пустой пантамімай уладараньня, выкананьнем ролі статыста для самога сябе, усяго толькі выкананьнем ролі, нябачаньнем сьвету, нячуцьцем, толькі ўгляданьнем у сябе. А яшчэ цяжэй сказаць, у які момант пачынаецца гэты пераход ад усёмагутнасьці да немачы, ад памыснасьці да няфарту, ад бліску да паціны. І ніхто ў палацы ня быў здольны адчуць гэтага, бо ўсе мелі нейкі такі зрок, што да самага канца ў немачы бачылі ўсёмагутнасьць, у няфарце – памыснасьць, у паціне – бліск. І нават калі б хтосьці меў іншы пагляд, хіба ж мог бы ён, не паддаючы сваю галаву небясьпецы, прыпасьці да нашага манарха і сказаць: любачка, ты немачны, няшчасьце на цябе насоўваецца, пацінай ты пакрываесься! Так, у гэтым палацы была такая бяда, што праўду туды не пускалі, а пасьля, перш чым людзі апрытомнелі, іх ужо пад арышт узялі. Гэта таму, дружа, што ў кожным усё было зручна перагароджанае, разьдзеленае: бачаньне ад думаньня, думаньне ад маўленьня, і ў чалавеку ўжо не было такога месца, дзе б гэтыя тры сутнасьці маглі спаткацца і азвацца чутным голасам. Але на мой пагляд, дружа, нашыя няшчасьці пачаліся тады, калі слаўны гаспадар дазволіў студэнтам сабрацца на тым паказе моды і тым самым даў ім нагоду сабраць натоўп і пачаць маніфэстацыю, з чаго ўжо нарадзіўся вось гэты звадніцкі рух. А ўся памылка была ў тым, што ня трэба было дапускаць ніякага руху, таму што мы маглі існаваць толькі ў нерухомасьці, таму што чым больш нерухомая нерухомасьць, тым даўжэйшае і трывалейшае нашае існаваньне. І дзіўныя былі дзеяньні нашага гаспадара, бо ён сам лепей за ўсіх ведаў гэтую праўду, пра што можна было меркаваць хоць бы з таго, што яго ўлюбёным каменем быў мармур. Мармур жа зь яго маўклівай, нерухомай, старанна адпаліраванай паверхняй увасабляў мару дастойнага гаспадара аб тым, каб усё наўкола было такім жа нерухомым і маўклівым, гэтак жа гладкім, роўна абрэзаным, на стагодзьдзі вызначаным, усталяваным, веліч аздабляльным.

А. Г.:

Вы мусіце ведаць, містэр Рычард, што тады, у пачатку жніўня, унутраны выгляд палацу ўжо страціў усю сваю годнасьць і ўражальную паважнасьць. Такі запанаваў балаган, што рэштка чыноўнікаў цырыманіялу, якая яшчэ заставалася, не магла навесьці ніякага парадку. Гэтае бязладзьдзе таму ўзьнікла, што палац стаў апошнім месцам прытулку для саноўнікаў і натабляў, якія зьяжджаліся сюды з усёй сталіцы і нават з усёй імпэрыі, спадзеючыся, што побач з гаспадаром нашым яны будуць у большай бясьпецы, што імпэратар іх уратуе і выклапача ім свабоду ў дзёрзкіх афіцэраў. Цяпер саноўнікі і фаварыты ўсіх рангаў, ступеняў і катэгорыяў без аніякай пашаны да сваіх высокіх пасадаў і тытулаў покатам спалі на дыванах, на канапах і фатэлях, накрываючыся парт'ерамі і фіранкамі, з чаго ўвесь час узьнікалі сваркі і звадкі, бо частка людзей не давала фіранкі з вокнаў здымаць, маўляў, палац зацямняць трэба, бо збунтаваная авіяцыя можа ўсіх бомбамі закідаць, на што іншыя з гневам адказвалі, што ня могуць заснуць, не накрываючыся, а трэба прызнаць, што ночы былі надзвычай халодныя, таму нягледзячы ні на што фіранкі з вокнаў усё ж сьцягвалі і імі накрываліся. Адылі сваркі гэтыя і ўзаемныя лаянкі былі ўжо пустыя, бо афіцэры хутка ўсіх мірылі, забіраючы іх пад арышт, дзе рассвараныя саноўнікі ні на якія пакрывалы разьлічваць не маглі. У гэтыя дні, штодня раніцай, патрулі Чацьвертай дывізіі прыяжджалі ў палац, збунтаваныя афіцэры выходзілі з машынаў і загадвалі саноўнікам сабрацца ў тронавай залі. Сход саноўнікаў! сход саноўнікаў у тронавай залі! неслася па калідорах гуканьне чыноўнікаў цырыманіялу, якія ў той час служылі ўжо афіцэрам. На гэтае гуканьне частка саноўнікаў хавалася па кутах, але рэшта, загорнутая ў тыя парт'еры, фіранкі, зьяўлялася на месца сходу. Тады спадары афіцэры зачытвалі сьпіс і названых саноўнікаў забіралі пад арышт. Але спачатку колькі адбывала – столькі прыбывала, бо хоць штодзень з палацу пад арышт забіралі, увесь час новыя саноўнікі прыбывалі, думаючы, што палац ёсьць самым надзейным месцам і што шаноўны гаспадар іх ад афіцэрскай дзёрзкасьці абароніць. Трэба прызнаць, містэр Рычард, што слаўны гаспадар наш, цяпер заўсёды ў мундур

апрануты, часам у парадны мундур, цырыманіяльны, часам у палявы, баявы, у якім ён быў звычайна манэўры назіраў, заходзіў у салёны, дзе асавелыя, спалоханыя саноўнікі ляжалі на дыванах, сядзелі на канапах, распытваючы адзін аднаго, што зь імі будзе, калі скончыцца чаканьне, і там іх суцяшаў, заахвочваў, памыснасьці зычыў, найвялікшую ўвагу ўдзяляў, з асабістым клопатам да іх ставіўся. Адылі, калі ён у калідоры патруль афіцэраў спатыкаў, то іх таксама заахвочваў, памыснасьці зычыў і, дзякуючы арміі за ляяльнасьць, выказваную ў дачыненьні да яго, запэўніваў, што справы войска ёсьць прадметам яго асабістага клопату. На што кратавыя са злосьцю і ядам гаспадару нашаму шапталі, што афіцэраў вешаць трэба, бо яны імпэрыю зьнішчылі, што літасьцівы манарх таксама з увагай слухаў, заахвочваў, памыснасьці зычыў і, дзякуючы за ляяльнасьць, падкрэсьліваў, што вельмі высока іх цэніць. І гэтую нястомную рухавасьць шаноўнага гаспадара, якой ён спрычыняўся да агульнай памыснасьці, ніколі не ашчаджаючы парадаў і ўказаньняў, спадар Гебрэ-Эгзы ацаніў як посьпех, убачыўшы ў ёй доказ жывучасьці нашай манархіі. На жаль, гэтымі сваімі посьпехамі міністар так ужо афіцэраў раззлаваў, што яны яго пад арышт забралі і больш яму гаварыць не далі. Прызнаюся вам, містэр Рычард, што ў якасьці чыноўніка міністэрства забесьпячэньня палацу ў той апошні месяц я зазнаваў найчарнейшыя дні, бо немагчыма было вызначыць асабовы склад нашага двара, колькасьць саноўнікаў штодзень зьмянялася: адныя прыбывалі, прасьлізгвалі ў палац, спадзеючыся там уратавацца, іншых афіцэры пад арышт бралі, а часта бывала і так, што хтосьці ўначы прасьлізнуў, а апоўдні яго ўжо забралі, і з гэтай прычыны я ня ведаў, колькі харчоў браць са складоў; таму часам ежы не хапала, і тады саноўнікі крычаць пачыналі, што міністэрства ўжо ў змове з бунтаўнікамі і хоча іх голадам замарыць, а, зноў жа, калі ежы лішак быў, афіцэры ганілі мяне за тое, што марнатраўства ў двары пануе, так што я зьбіраўся ў адстаўку падаць, але жэст аказаўся збыткоўным, бо і так нас усіх з палацу павыганялі.

І. І.:

Нас была ўжо толькі жменька, якая чакала кончага і найстрашнейшага выраку, калі – хвала Богу! – зьявіўся праменьчык надзеі ў асобе мэцэнатаў, якія ўрэшце, пасьля доўгіх абмеркаваньняў, падрыхтавалі праект зьменаў канстытуцыі і прыйшлі да нашага гаспадара з гэтым праектам, які грунтаваўся на тым, каб ператварыць нашу адзінаўладную імпэрыю ў канстытуцыйную манархію, зрабіць моцны ўрад, а шаноўнаму гаспадару пакінуць столькі ўлады, колькі яе маюць брытанскія каралі. Тады дастойныя панове за чытаньне праекту ўзяліся, падзеленыя на малыя групы і схаваныя ў сукрытых месцах, бо калі б афіцэры вялікую грамаду заўважылі, то пасадзілі б яе пад арышт. На жаль, дружа, прачытаўшы гэты праект, кратавыя адразу ў апазыцыю сталі, кажучы, што абсалютную манархію трэба ўтрымаць, усю ўладу, якую ў правінцыях мелі натаблі, – захаваць, а гэтыя выдумкі пра канстытуцыйную манархію на ўзор заняпалай брытанскай імпэрыі – кінуць у агонь. Тут, аднак, сталовыя пачалі на кратавых кідацца, кажучы, што гэта апошні момант, каб імпэрыю на канстытуцыйны шлях скіраваць, дарабіць, страўнай зрабіць. І так сварачыся, пайшлі да міласьцівага гаспадара, які якраз дэлегацыю мэцэнатаў прымаў, у дэталі гэнага праекту з асаблівай увагай заглыбляўся, высока гэтую ідэю ацэньваючы, а цяпер, выслухаўшы прэтэнзіі, якія прадставілі кратавыя, і лісьлівасьці, якія выказалі сталовыя, усіх пахваліў, заахвоціў і пазычыў памыснасьці. Аднак хтосьці, мусіць, ужо зьлётаў да афіцэраў з даносам, бо як толькі мэцэнаты з імпэратарскага кабінэту выйшлі, адразу вайскоўцаў спаткалі, а тыя ў іх праект забралі, дадому ісьці загадалі і забаранілі больш у палац прыходзіць. А дзіўна гэтае бытаваньне ўнутры палацу выглядала, быццам бы толькі само ў сабе і для сябе існуючае, бо калі ў якасьці чыноўніка палацавай пошты я выяжджаў у места, то бачыў там звычайнае жыцьцё, па вуліцах машыны езьдзілі, дзеці зь мячом гулялі, на рынку людзі прадавалі, куплялі, старыя сядзелі й гаманілі, а я кожны дзень пераходзіў з аднаго сьвету ў другі, з аднаго быту – у іншы, сам ужо ня ведаючы, каторы рэальны, і адчуваючы толькі тое, што досыць было выйсьці ў места, убачыць людзей, якія ідуць вуліцай, занятыя сваім клопатам, і я адразу губляў увесь палац з вачэй, палац кудысьці зьнікаў, нібыта яго не існавала, я нават баяўся, што калі вярнуся зь места, яго ўжо ня будзе.

Э.:

Апошнія дні ён быў у палацы ўжо адзін, афіцэры пакінулі пры ім толькі старога камэрдынэра ягонай спальні. Відавочна, у «Дэргу» ўзяла перавагу тая група, якая хацела закрыць палац і зрынуць імпэратара. Прозьвішчы гэтых афіцэраў у той час былі невядомыя, не абвяшчаліся, яны да канца дзейнічалі ў поўнай канспірацыі. Цяпер толькі кажуць, што гэтай групай кіраваў малады маёр, якога звалі Мэнгісту Хайле-Марыям. Там былі яшчэ іншыя афіцэры, але сёньня яны ўжо не жывуць. Я памятаю, як гэты чалавек прыяжджаў у палац капітанам. Ягоная маці служыла ў палацы. Не магу сказаць, дзякуючы каму яму ўдалося скончыць афіцэрскую школу. Худы, дробны, заўсёды ўнутрана напяты, але вытрыманы, ува ўсякім разе, такое ён рабіў уражаньне. Ён дасканала ведаў структуру двара, добра ведаў, хто ёсьць кім, каго і калі арыштаваць, каб палац перастаў дзейнічаць, каб ён страціў уладу і сілу, каб ён замяніўся ў збыткоўны макет, які – як ты сёньня можаш убачыць – стаіць пакінуты і гібее. Дзесьці ў першыя дні жніўня ў «Дэргу», мусіць, былі прынятыя кончыя рашэньні. Камітэт вайскоўцаў – гэты самы «Дэрг» – складаўся з ста дваццаці дэлегатаў, выбраных на сходах дывізіяў і гарнізонаў. Яны мелі сьпіс пяціста саноўнікаў і прыдворных, якіх паступова арыштоўвалі, ствараючы вакол імпэратара ўсё большую пустку, пакуль урэшце ён не застаўся ў палацы адзін. Апошнюю групу, ужо з найбліжэйшага атачэньня імпэратара, пасадзілі пад арышт у сярэдзіне жніўня. Яны забралі тады начальніка аховы імпэратара, палкоўніка Тасэва Ваё, ад'ютанта нашага манарха, генэрала Асэфу Дэмісіе, галоўнаначальніка імпэратарскай гвардыі – генэрала Тадэсэ Лему, асабістага сакратара Х. С. – Салямона Гебрэ-Марыяма, прэм'ера Эндэлькачэва, міністра найвышэйшых прывілеяў – Адмасу Рэту і яшчэ чалавек з дваццаць іншых. Адначасна яны распусьцілі Каронную раду і іншыя інстытуцыі, падпарадкаваныя беспасярэдне імпэратару. Ад гэтага моманту яны пачалі праводзіць падрабязную рэвізію ўсіх установаў палацу. Найбольш кампрамэтуючыя дакумэнты яны знайшлі ўва ўправе найвышэйшых прывілеяў, гэта было тым лацьвей, што Адмасу Рэта сам зь вялікай руплівасьцю пачаў усё выдаваць. Калісьці прывілеі разьмяркоўваў толькі

сам манарх асабіста, але па меры прагрэсуючага заняпаду імпэрыі рвацтва і зьдзірства сярод натабляў так вырасла, што Х. С. быў ужо ня ў стане ўсё кантраляваць і часткова перадаў разьмеркаваньне прывілеяў у рукі Адмасу Рэты. Апошні, аднак, ня меў той геніяльнай памяці, якой валодаў імпэратар, якому нічога ня трэба было запісваць, і таму вёў дакладныя сьпісы раздачы зямлі, дамоў, прадпрыемстваў, валюты і ўсялякіх іншых падарункаў, якія атрымлівалі саноўнікі. Усё гэта цяпер трапіла ў рукі вайскоўцаў, якія адразу пачалі вялікую прапагандысцкую кампанію што да карупцыі ў палацы, агалошваючы гэтыя надзвычай кампрамэтуючыя дакумэнты. Такім чынам яны выклікалі сярод насельніцтва настроі гневу і нянавісьці, пачаліся маніфэстацыі, вуліца прагнула шыбеніцаў, ствараўся клімат жаху і апакаліпсісу. Нават добра было, што ўрэшце вайскоўцы ўсіх нас з палацу выгналі, можа быць, дзякуючы гэтаму я захаваў жыцьцё.

Т. В.:

Прызнаюся табе, любачка, што я ўжо даўно ведаў, што справы ідуць да горшага, таму што бачыў, як сябе паводзяць спадары саноўнікі, якія кожны раз, калі зьбіраліся чорныя хмары, адразу ў грамаду зьбіваліся, міжсобку гаманілі, адзін аднаго пераконвалі, адзін аднаму падтаквалі і ўжо нават нас, прыслугу, пра навіны зь места не пыталі, бо баяліся пачуць страшныя весткі, зрэшты, навошта ж ужо было пытацца, калі ўсё адно нічога нельга было зрабіць, усё развальвалася. У гэты час коркавыя іншых суцяшалі, маўляў, калі ў нас цяпер паралюш, то і добра – гэтак мы ў палацы найдаўжэй утрымаемся, бо прырода паралюшу такая, што ён мае найбольшую ўстойлівасьць, сваім цяжарам усялякі рух пераможа, пакорны люд у дрымоце ўтрымае, так што нам, бадай, удасца перавекаваць, абы толькі ў самы час, там, дзе трэба, саступаць, ліхога не дражніць, а нават яму патураць. Так бы, пэўна, і было, як панове коркавыя казалі, калі б ня гэтая зацятасьць афіцэраў, гэтыя руплівыя хапуны, якія яны ў палацы чынілі, вялікія вышчарбы, якія яны ў шэрагах саноўнікаў рабілі, пакуль увесь двор ня вычысьцілі, так што нікога ўжо ў ім не засталося, толькі слаўны гаспадар наш са сваім апошнім

прыслужнікам.

Найцяжэй было знайсьці гэтага чалавека, які, такі ж стары, як і яго гаспадар, жыве цяпер у такім забыцьці, што шмат людзей, якіх я пытаў пра яго, пацепвалі плячыма, сьцьвярджаючы, што ён даўно памёр. Ён служыў імпэратару да апошняга дня, гэта значыць да той хвілі, калі вайскоўцы вывезьлі манарха з палацу, а яму сказалі забраць свае рэчы і ісьці дадому. У другой палове жніўня афіцэры затрымліваюць апошніх людзей з атачэньня Х. С. Яны пакуль яшчэ не чапаюць імпэратара, бо ім трэба час, каб падрыхтаваць да гэтага грамадзкую думку: горад павінен разумець, чаму яны зрынаюць манарха. Афіцэры здаюць сабе справу з таго, чым ёсьць магічнае мысьленьне люду і якія небясьпекі яно ў сабе хавае. Магічнасьць гэтага мысьленьня палягае ў тым, што асоба найвышэйшага надзяляецца – часта несьвядома – рысамі боскасьці. Найвышэйшы ёсьць найлепшым, мудрым і шляхетным, беззаганным і ласкавым. Гэта толькі саноўнікі дрэнныя, усякая бяда – іх справа. Ба, ды калі б найвышэйшы ведаў, што ягоныя людзі вырабляюць, ён адразу паправіў бы зло, адразу жыцьцё стала б лепшае! На жаль, гэтыя хітрыя нікчэмнасьці ўсё ўтойваюць ад свайго гаспадара і таму паўсюль столькі вусьцішы, таму жыцьцё так цяжка зносіць, таму яно такое нізкае і няшчаснае. Магічнасьць гэтага мысьленьня палягае ў тым, што, у сапраўднасьці, у адзінаўладнай сыстэме менавіта гэты найвышэйшы ёсьць першай прычынай усяго, што адбываецца. Ён дасканала ўсё ведае, а нават калі чагосьці ня ведае, то толькі таму, што ня хоча ведаць, таму, што яму гэта нявыгадна. Не было ніякай выпадковасьці ў тым, што атачэньне імпэратара ў бальшыні складалася зь людзей подлых і тупых. Подласьць і тупасьць былі ўмовай узвышэньня, паводле гэтага крытэру манарх падбіраў сваіх фаварытаў, за гэта ён іх узнагароджваў, прывілеямі адорваў. Ніводнага кроку ў палацы не было зроблена, ніводнага слова не было прамоўлена безь ягонага ведама і згоды. Усе гаварылі ягоным голасам, нават калі розныя рэчы гаварылі, бо і сам ён гаварыў розныя рэчы. Іначай быць не магло, бо ўмовай знаходжаньня ў атачэньні імпэратара было вызнаваньне культу імпэратара, а той, хто гэты культ вызнаваў слабей, страчваў руплівасьць – губляў месца, выпадаў, зьнікаў. Х. С. жыў сярод

сваіх ценяў, ягоная сьвіта была памножаным ценем манарха. Кім былі спадары Аклілу, Гебрэ-Эгзы, Адмасу Рэта апроч таго, што яны былі міністрамі Х. С.? Яны былі нікім апроч таго, што былі міністрамі Х. С. Але менавіта такіх людзей імпэратар хацеў мець каля сябе, толькі яны маглі спаталяць яго пыху, яго любоў да сябе, яго страсьць да сцэны і люстра, да жэсту і п'едэстала. І вось цяпер афіцэры сустракаюцца сам-насам з імпэратарам, стаяць перад ім вочы ў вочы, пачынаецца апошняя сутычка. Прыйшла хвіліна, калі ўсе ўжо мусяць зьняць маскі і паказаць свае твары. Гэтыя дзеяньні суправаджаюцца непакоем і напяцьцем, бо паміж бакамі ўтвараюцца новыя дачыненьні, яны пераходзяць у невядомую сытуацыю. Імпэратар ня можа нічога здабыць, але ён яшчэ можа абараняцца, абараняцца безабароннасьцю, бязьдзейнасьцю, толькі тым, што ён ёсьць, правам гаспадара палацу, правам даўнасьці, а таксама тым, што ён зрабіў незвычайную паслугу – ён жа маўчаў, калі бунтаўнікі абвяшчалі, што робяць рэвалюцыю ад яго імя, ён ніколі не пратэставаў, не крычаў, што гэта хлусьня, і менавіта гэтая камэдыя ляяльнасьці, якую месяцамі гралі вайскоўцы, вырашальным чынам аблегчыла ім задачу. Афіцэры, аднак, вырашаюць ісьці далей, ісьці да канца: хочуць зьняць маску з боства. У грамадзтве, так прыгнечаным беднасьцю, нястачаю і няшчасьцямі, як этыёпскае, нішто так не кранае ўявы, нішто не выклікае большага гневу, абурэньня і нянавісьці, чым карціна карупцыі і прывілеяў эліты. Нават няўмелы і бяздарны ўрад, калі б ён толькі захоўваў спартанскі лад жыцьця, мог бы існаваць гадамі, аточаны прызнаньнем люду. Бо ў прынцыпе стаўленьне людзей да палацу, як правіла, пачцівае і паблажлівае. Але ўсякая талеранцыя мае свае межы, якія саманадзейны, фанабэрысты палац лёгка і часта пераступае. І тады настрой вуліцы гвалтоўна зьмяняецца з паслухмянага на непакорны, зь цярплівага – на мяцежны. Але вось надыходзіць момант, калі афіцэры вырашаюць агаліць Караля Каралёў, выпатрашыць яго кішэні, адкрыць і паказаць людзям таемныя сховы ў кабінэце імпэратара. У гэты самы час стары Х. С., якога шораз шчыльней абкладваюць, блукае па вымерлым палацы ў таварыстве свайго камэрдынэра Л. М.

Л. М.:

Дык вось, Вашаць, калі ўжо апошніх спадароў саноўнікаў забіралі, з розных кутоў, закуткоў іх выцягваючы, у грузавікі запрашаючы, адзін з афіцэраў кажа мне, каб я з дастойным гаспадаром заставаўся і, як заўжды было, усякія паслугі яму чыніў, і гэта сказаўшы, разам зь іншымі афіцэрамі паехаў. Я адразу пайшоў у найвышэйшы кабінэт, каб выслухаць волю майго ўсёмагутнага гаспадара, адылі нікога там не знайшоў, і далей калідорамі ідучы і разважаючы, куды ж мой гаспадар быў пайшоў, бачу, што ён стаіць у галоўнай прывітальнай залі і глядзіць, як салдаты зь яго гвардыі свае рэчы зьбіраюць, заплечнікі пакуюць і да выйсьця рыхтуюцца. Як жа гэта так, думаю, сыходзяць з рэчамі, гаспадара нашага без аніякай абароны пакідаюць, калі ў горадзе столькі зладзейства ўсякага і хваляваньняў разнастайных? Пытаюся іх тады: а вы што, шаноўныя, зусім сыходзіце? Зусім, кажуць, але пост пры браме застаецца, так што калі які саноўнік захоча ў палац пранікнуць, яго ўжо тыя зловяць. А я бачу, што дастойны гаспадар стаіць, глядзіць, ані слова ня кажа. Тады яны паклон нашаму гаспадару складаюць і са сваім клункамі сыходзяць, а яснавяльможны гаспадар глядзіць ім усьлед моўчкі, а пасьля вяртаецца ў свой кабінэт без адзінага слова.

На жаль, аповед Л. М. бязладны, стары ня можа скласьці свае вобразы, пяражываньні і ўражаньні ў зьвязнае цэлае. Бацьку, ну ўспомні дакладна! – настойвае Тэфэра Гебрэвольд. (Ён называе Л. М. бацькам з прычыны яго ўзросту, а не сваяцтва.) Вось жа, Л. М. памятае, напрыклад, наступную сцэну: аднойчы ён застаў імпэратара ў салёне, той стаяў і глядзеў у акно. Л. М. падышоў і таксама зірнуў у акно: убачыў, што ў палацавым садзе пасьвяцца каровы. Відавочна, места ўжо аббегла вестка, што палац будуць закрываць, і праз гэта пастухі асьмеліліся да таго, што прыгналі ў сад быдла. Хтосьці, мусіць, сказаў ім, што імпэратар ужо ня важны і можна дзяліцца яго маёмасьцю, прынамсі, дзяліцца палацавай травой, якая стала ўласнасьцю народу. Імпэратар цяпер аддаўся доўгім мэдытацыям («яго індусы калісьці гэтага вучылі, на адной назе стаяць казалі, нават дыхаць забаранялі, казалі вочы заплюшчваць»). Нерухомы, ён гадзінамі мэдытаваў у сваім кабінэце (мэдытаваў, – задумваецца камэрдынэр, – а можа, драмаў), Л. М. не

асьмельваўся ўваходзіць і перашкаджаць. Усё яшчэ трываў сэзон дажджоў, цэлымі днямі ліло, дрэвы стаялі ў вадзе, ранкі былі туманныя, ночы халодныя. Х. С. надалей хадзіў у мундуры, на які накідваў цёплы ваўняны плашч. Яны ўставалі як і раней, як шмат гадоў – на досьвітку, і ішлі ў палацавую капліцу, дзе Л. М. уголас чытаў шораз іншыя фрагмэнты Кнігі Песьняў:
«Госпадзе! – як пабольшала ворагаў маіх! як многа іх на мяне паўстае!» «Умацуй мае крокі на дарогах Сваіх, хай ногі мае не пахіснуцца». «Не пакідай мяне; бо засмучаньне блізкае; бо няма каму ўратаваць». *Пасьля Х. С. сыходзіў у свой кабінэт, сядзеў там за вялікім сталом, на якім стаяла больш за дзясятак тэлефонаў. Аднак усе яны маўчалі, можа, былі адключаныя. Л. М. сядзеў пад дзьвярыма, чакаў, ці не азавецца званок, які выклікаў яго ў кабінэт, каб атрымаць якое-небудзь даручэньне ад манарха.*

Л. М.

Але, Вашаць, тымі днямі толькі спадары афіцэры з розных нагодаў заходзілі, сьпярша да мяне прыходзілі, каб я пра іх візыт слаўнаму гаспадару паведаміў, пасьля ўваходзілі ў кабінэт, а там гаспадар наш рассаджваў іх у выгодныя фатэлі. Гэтыя афіцэры тады заяву зачытвалі, у якой яны дамагаліся, каб шчодры гаспадар грошы аддаў, якія, маўляў, ён за пяцьдзясят гадоў незаконна прыўласьціў, разьмяшчаючы іх па розных сусьветных банках, а таксама хаваючы іх у самім палацы ды ў дамах саноўнікаў і натабляў. А ўсё гэта, маўляў, аддаць трэба, бо гэта ўласнасьць народу, з крыві і поту якога тыя грошы ўзяліся. Якія ж грошы, літасьцівы гаспадар кажа, мы ніякіх грошай ня мелі, усё на разьвіцьцё ішло, каб даганяць і пераганяць, і разьвіцьцё гэтае было абвешчана посьпехам. Якое там разьвіцьцё, афіцэры крычаць, усё гэта пустая дэмагогія, дымавая заслона, кажуць, каб двор мог узбагачацца! І адразу з фатэляў устаюць і дыван вялікі, пэрсыдзкі, з падлогі ўздымаюць, а там пад усім дыванам скруткі даляраў шчыльна паўтыканыя, аж падлога зялёнай здавалася. Яны тут жа тыя даляры ў прысутнасьці шаноўнага гаспадара сэржантам пералічыць і запісаць загадалі і ў нацыяналізацыю забралі. Але яны адразу зьехалі, а тады дастойны гаспадар наш мяне ў

кабінэт паклікаў і грошы, якія ён у стале трымаў, паміж кніжкамі схаваць загадаў. А скажу вам, што гаспадар наш, які называўся нашчадкам караля Салямона, меў вялікі збор Сьвятога Пісаньня, на ўсе мовы сьвету перакладзенага, во туды мы грошы і паўтыкалі. Але спадары афіцэры, о-о-о! гэта былі спрытныя скуралупы! Наступнага дня прыходзяць, заяву зачытваюць, звароту грошай патрабуюць, бо, як яны кажуць, трэба мукі для галадоўнікаў купіць. Адылі гаспадар наш, за сталом седзячы, ні слова ня кажа, пустыя шуфляды паказвае. Тут афіцэры з фатэляў падрываюцца, шафы з кніжкамі адкрываюць, з усіх Бібліяў даляры вытрасаюць, а сэржанты лічаць, запісваюць, у нацыяналізацыю забіраюць. Гэта ўсё мала, кажуць афіцэры, трэба рэшту грошай аддаць, то бок тыя, якія ў швайцарскіх і ангельскіх банках на прыватных рахунках нашага гаспадара ляжаць, якія на паўмільярда даляраў, а можа і больш, ацэньваюцца. Тут яны літасьцівага гаспадара намаўляюць, каб ён адпаведныя чэкі падпісаў, і такім чынам, кажуць, гэтыя грошы маюць быць вернутыя народу. Ды адкуль жа столькі грошай, шаноўны гаспадар пытае, калі ён грошы толькі на лячэньне хворага сына, які ў швайцарскім шпіталі ляжыць, перасылаў. Ладныя ж гэта грошы, адказваюць, і ўжо ўголас чытаюць ліст са швайцарскай амбасады, у якім напісана, што шчодры гаспадар наш у тамтэйшых банках на сваіх рахунках сто мільёнаў даляраў мае. Так вось яны спрачаюцца, пакуль дастойны гаспадар у мэдытацыю не ўпадае, вочы заплюшчвае, дыхаць перастае, тады афіцэры з кабінэту выходзяць, але абяцаюць вярнуцца. А калі гэтыя абдзіральнікі гаспадара нашага зьяжджалі, у палацы ціша наставала, але гэтая ціша нядобрая была, бо тады крыкі, галас з вуліцы чуваць было, бо ў горадзе маніфэстацыі розныя хадзілі, галота ўсялякая швэндалася, гаспадара нашага праклінала, злодзеем яго называла, на дрэве вешаць хацела. Ашуканец, аддай нам нашыя грошы! крычалі, альбо таксама – павесіць імпэратара! скандавалі. Тады я стараўся ў палацы ўсе вокны пазачыняць, каб гэтыя непрыстойныя і паклёпніцкія крыкі да вушэй шаноўнага гаспадара не даходзілі, крыві яму не каламуцілі. А яшчэ адразу ў капліцу гаспадара майго праводзіў, якая ў найбольш зацішным месцы была, і там, каб гэты блюзьнерскі вэрхал заглушыць, словы прарокаў яму ўголас чытаў. «Ня ўсе словы, якія кажуць людзі, бяры да сэрца твайго; і хай цябе не

абыходзіць, хоць бы і слуга твой ліхасловіў». «Гэта – поўная пустата, дзея аблуды; у час наведаньня іх яны зьнікнуць». «Успомні, Госпадзе, што над намі зьдзейсьнілася; паглядзі, падзівіся на паганьбеньне нашае. Аціхла радасьць сэрца нашага: карагоды нашыя ў енк абярнуліся. Упаў вянок з галавы нашай; ад гэтага вось зьнемаглося нашае сэрца; ад гэтага нашыя вочы зацьміліся». «Як паблякла золата, як зьмянілася золата высакароднае! камяні сьвяцілішча рассыпаны па ўсіх ростанях. Тыя, што елі салодкае, млеюць на вуліцах; а тыя, каго спавівалі ў пурпуры, на сьметніках сьпяць». «Ты бачыш усю помсьлівасьць іхную, усе намыслы іхныя супраць мяне; Ты чуеш, Госпадзе, лаянку іхную! Ты чуеш словы тых, што паўстаюць на мяне; я для іх – песьня. Укінулі жыцьцё маё ў яму і закідалі мяне камянямі». І так, Вашаць, гэта слухаючы, стары гаспадар у дрымоту ўпадаў, так я яго і пакідаў, ідучы ў сваё памяшканьне, каб радыё паслухаць, бо ў тыя дні радыё ўжо адзінай сувязьзю было, якая паміж палацам і імпэрыяй засталася.

Усе тады слухалі радыё, а тыя нямногія, хто мог сабе дазволіць купіць тэлевізар (ён надалей застаецца ў гэтай краіне сымбалем найвялікшай раскошы), глядзелі тэлевізію. У той час, на зломе жніўня і верасьня, кожны дзень прыносіў шчодрую порцыю выкрыцьцяў пра жыцьцё палацу і імпэратара. Сыпаліся лічбы і прозьвішчы, нумары банкаўскіх рахункаў, назвы маёнткаў і прыватных фірмаў. Паказвалі дамы натабляў, назьбіранае там багацьце, зьмесьцівы таемных сховаў, купы ювэлірных вырабаў. Часта гучаў голас міністра найвышэйшых прывілеяў – Адмасу Рэты, які, адказваючы на пытаньні камісіі для расьсьледаваньня карупцыі, казаў, які з саноўнікаў што і калі атрымаў, дзе і на якую суму. Цяжкасьць, аднак, палягала ў тым, што не было як усталяваць выразную мяжу паміж бюджэтам краіны і прыватнай скарбніцай імпэратара, усё тут было расплывістае, няяснае, двухзначнае. За ўрадавыя грошы саноўнікі будавалі сабе палацы, куплялі маёнткі, езьдзілі за мяжу. Найбольшыя багацьці назьбіраў імпэратар. Па меры таго, як большаў ягоны век, расла ягоная сквапнасьць, ягоная старэчая, жаласьлівая прагнасьць. Можна было б казаць пра гэта з сумам і паблажлівасьцю, калі б ня той факт, што Х. С. забіраў зь дзяржаўнай касы мільёны,

робячы – ён і ягоныя людзі – гэтае драпежніцтва сярод цьвінтароў памерлых ад голаду людзей, цьвінтароў, якія было відаць з вокнаў палацу. У канцы жніўня вайскоўцы абвяшчаюць дэкрэт аб нацыяналізацыі ўсіх палацаў імпэратара. Іх было пятнаццаць. Такі ж самы лёс напаткаў прыватныя прадпрыемствы Х. С., у тым ліку – бровар імя Сьвятога Юр'я, гарадзкую аўтобусную кампанію ў Адыс-Абэбе, фабрыку мінэральных водаў у Амба. Затым афіцэры складаюць імпэратару візыты і вядуць зь ім доўгія размовы, настойваючы, каб ён забраў з замежных банкаў свае грошы і перадаў іх у скарбніцу дзяржавы. Праўдападобна, ніколі ня будзе вядома, якую дакладна суму імпэратар трымаў на сваіх рахунках. У прапагандысцкіх выступах казалі пра чатыры мільярды даляраў, але гэта выглядае на грубае перабольшаньне. Хутчэй, ішлося пра колькі соцень мільёнаў. Намаганьні вайскоўцаў скончыліся няўдачай: імпэратар гэтых грошай ураду ня даў, яны да сёньня застаюцца ў замежных банках. Аднаго дня, успамінае Л. М., у палац прыйшлі афіцэры і сказалі, што вечарам тэлевізія пакажа фільм, які Х. С. павінен паглядзець. Камэрдынэр перадаў гэтую вестку імпэратару. Манарх ахвотна пагадзіўся выканаць волю сваёй арміі. Вечарам ён сеў у фатэль перад тэлевізарам, пачалася праграма. Паказвалі дакумэнтальны фільм Джонатана Дымбэлбі «Схаваны голад». Л. М. запэўнівае, што імпэратар паглядзеў фільм да канца, пасьля аддаўся мэдытацыі. Той ночы з адзінаццатага на дванаццатае верасьня слуга і ягоны гаспадар – двое старых у пакінутым палацы – ня спалі, бо гэта была навагодняя ноч, паводле этыёпскага календара пачынаўся Новы год. З гэтай нагоды Л. М. расставіў у палацы ліхтары, запаліў сьвечкі. Пад ранак яны пачулі шум маторaў і скрыгат танкавых тракаў па асфальце. Пасьля настала ціша. А шостай пад палац пад'ехалі вайсковыя аўтамабілі. Трое афіцэраў у палявых мундурах накіраваліся ў кабінэт, у якім імпэратар быў ад сьвітанку. Там, пасьля ўступных паклонаў, адзін зь іх зачытаў яму акт дэтранізацыі. (Тэкст, апублікаваны пазьней у прэсе і прачытаны праз радыё, гучаў наступным чынам: «Нягледзячы на тое, што народ у добрай веры разглядаў трон як сымбаль еднасьці, Хайле Сэлас'е I выкарыстаў аўтарытэт, годнасьць і гонар трона для сваіх асабістых мэтаў. У выніку краіна апынулася ў стане беднасьці і заняпаду. Апроч таго, 82-гадовы манарх, з увагі на ўзрост, ня ў стане выконваць свае

абавязкі. У зьвязку з гэтым Яго Імпэратарская Вялікасьць Хайле Сэлас'е I з дванаццатага верасьня тысяча дзевяцьсот семдзесят чацьвертага году пазбаўляецца трона, а ўладу пераймае Часовы вайсковы камітэт. Этыёпія перадусім!») Імпэратар, стоячы, уважліва выслухаў словы афіцэра, пасьля выказаў усім падзяку, сказаў, што армія ніколі не падманвала ўскладаных на яе спадзяваньняў, і дадаў, што калі рэвалюцыя добрая для народу, то ён за рэвалюцыю і ня будзе супраціўляцца дэтранізацыі. У такім выпадку, сказаў афіцэр (ён быў у рангу маёра), прашу Вашу Імпэратарскую Вялікасьць пайсьці за намі! Куды? спытаў Х. С. У бясьпечнае месца, патлумачыў маёр. Ваша Імпэратарская Вялікасьць убачыць. Усе выйшлі з палацу. Пры пад'езьдзе стаяў зялёны «фольксваген». За стырном сядзеў афіцэр, які адчыніў дзьверкі і прытрымаў пярэдняе сядзеньне, каб імпэратар мог сесьці ўсярэдзіну. Як жа! жахнуўся Х. С., я маю ехаць на гэтым? Гэта быў той раніцай адзіны ягоны жэст пратэсту. Аднак пасьля ён замаўчаў і ўсеўся ў глыбіні машыны. «Фольксваген» рушыў за джыпам, у якім ехалі ўзброеныя салдаты, такі ж джып ехаў ззаду. Яшчэ не было сёмай, усё яшчэ дзейнічала камэнданцкая гадзіна, таму яны ехалі пустымі вуліцамі. Імпэратар вітаў жэстам рукі тых нешматлікіх людзей, якія сустракаліся па дарозе. Урэшце калёна зьнікла ў браме кашараў Чацвертай дывізіі. На загад афіцэраў Л. М. спакаваў у палацы свае рэчы, пасьля чаго з клункам за плячыма выйшаў на вуліцу. Спыніў таксоўку і папрасіў адвезьці яго дадому на Джымма-Роўд. Тэфэра Гебрэвольд апавядае, што ў той жа дзень апоўдні прыехалі двое паручнікаў і зачынілі палац на ключ. Адзін зь іх паклаў ключ у кішэнь, яны селі ў джып і паехалі. Два танкі, якія былі прыехалі пад браму палацу ноччу і якія на працягу дня людзі абсыпалі кветкамі, вярнуліся на сваю базу.

Этыёпія.

Хайле Сэлас'е надалей верыць, што ён – імпэратар Этыёпіі.

Адыс-Абэба, сёмага лютага тысяча дзевяцьсот семдзесят пятага (Агенцтва «France Presse»). – Хайле Сэлас'е бавіць апошнія месяцы жыцьця ў атачэньні сваіх салдат у памяшканьнях старога палацу Мэнэліка, што месьціцца на ўзгорках Адыс-Абэбы.

Паводле паведамленьняў відавочцаў, гэтыя салдаты – як за найлепшых часоў імпэрыі – надалей складаюць паклоны каралю каралёў. Дзякуючы гэтым жэстам, як паведаміў прадстаўнік міжнароднай арганізацыі дапамогі, які склаў яму візыт і наведаў іншых вязьняў, якія знаходзяцца ў палацы, Хайле Сэлас'е працягвае верыць, што ён – імпэратар Этыёпіі.

Нэгус знаходзіцца ў добрым здароўі, пачаў шмат чытаць – нягледзячы на свае гады, ён чытае без акуляраў – і час ад часу дае парады салдатам, якія яго ахоўваюць. Варта дадаць, што гэтых салдатаў зьмяняюць штотыдзень, бо стары манарх захаваў свой талент пераконваньня. Як і ў даўнія часы, кожны дзень былога імпэратара ўзяты ў рамкі непарушнай праграмы і праходзіць згодна з пратаколам.

Кароль каралёў устае на досьвітку, затым удзельнічае ў ранішняй імшы, а пазьней занураецца ў чытаньне. Часам пытаецца пра навіны што да хады рэвалюцыі. Былы ўсёмагутны ўладар дагэтуль паўтарае тое ж, што заявіў у дзень сваёй дэтранізацыі: «Калі рэвалюцыя добрая для народу, я за рэвалюцыю».

У былым кабінэце імпэратара, за колькі мэтраў ад будынку, дзе знаходзіцца Хайле Сэлас'е, дзесяць кіраўнікоў «Дэргу» няспынна абмяркоўваюць справу абароны рэвалюцыі, бо ў зьвязку з пачаткам вайны ў Эрытрэі паўсталі новыя небясьпекі. Побач замкнёныя ў клетках ільвы імпэратара страшным рыкам дамагаюцца штодзённай порцыі мяса.

З другога боку старога палацу, паблізу будынку, занятага Хайле Сэлас'е, знаходзяцца іншыя памяшканьні колішняга двара, дзе ў сутарэньнях сядзяць пад арыштам вяльможы, саноўнікі і натаблі, чакаючы свайго далейшага лёсу.

«The Ethiopian Herald»:

Адыс-Абэба, дваццаць восьмага жніўня тысяча дзевяцьсот семдзесят пятага (ENA). – Учора памёр былы імпэратар Этыёпіі – Хайле Сэлас'е I. Прычынай скону была недастатковасьць

кровазвароту.

З польскай пераклаў Алесь Пяткевіч
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (45) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

пдз выбары • крытыка • эсэістыка • аналітыка • палеміка • **літаратура**

[image] [image] [image]

Аляксандар Ірванец Дзень Перамогі

АЛЯКСАНДАР ІРВАНЕЦ (нар. 1961) – украінскі празаік, паэт, драматург. На пачатку 1990-х – разам зь Віктарам Небаракам і Юр’ем Андруховічам сябар групы «Бу-Ба-Бу». Жыве ў Ірпені пад Кіевам. Ягоныя творы перакладаліся на, як ён сказаў, – шматзначна падтакнуў Марка, пасьля чаго ён дапіў сваё піва. Зірнуўшы ў пусты кухаль, ён раптам мовы. Дуў прапанову. – Слухай, а як наконт таго, каб палірнуць?

– Што палірнуць? – Ян, заглыблены ў сваю выкрывальна, хваласьпеўную прамову ў гонар паэзіі, не адразу зловіў перамену тэмы. – А, палірнуць? Чаму б і не?

Была пятніца, восьмага траўня. Наплываў ясны пагодлівы вечар, сьвежы і зорны. Марка зь Янам сядзелі пад парасонамі вулічнай кавярні, дапіваючы па трэцім кухлі піва.

Яны пасябравалі параўнаўча нядаўна – трохі болей за год, на паседжаньні літаратурнай студыі пры рэдакцыі гарадзкой моладзевай газэты. Абодва выявіліся прыхільнікамі паэзіі, вось і зараз, прысёрбваючы піва, вялі тую самую нескончоную размову, што доўжылася паміж імі ўжо цэлы год.

– Ну добра, украінскай літаратуры няма. Усе тыя тынны-сасюры даўно павыміралі. Дый што яны пісалі?! – запальна пытаўся Ян. – Другое дзела расейская літаратура. Асабліва – паэзія.

У пажарнай часьці, дзе Марка зарабляў свой хлеб нарэшце мастаком-афармляльнікам, якраз сёньня далі прэмію квартал. Марка пасьпеў ужо купіць у пэнсіянэра калі вакуум томік Тэкерэя ў добрым стане і таму пачуваўся вызваленым ад абавязку несьці дахаты і рэшту грошай. Жонцы заўсёды можна сказаць, што прэмію зрэзалі. З гэтае прычыны ён узмахнуў паклікаў афіцыянта ды рашуча замовіў пляшку партвейну.

Калі густая чырвоная вадкасьць соладка і павольна цацякла па страваводах, Ян зрабіў спробу вярнуцца да ранейшае тэмы.

– Але і ў расейскай паэзіі ня так усё проста. Вось я, напрыклад, цаню Іосіфа больш за ўсіх тых жэняў, андрушаў і робэртаў, разам узятых. Занадта шмат яны пра чырвоныя сьцягі пісалі.

Марка, ня маючы пярэчаньняў (дый ахвоты лезьці ў спрэчку), толькі кіўнуў і другі раз прыклаўся да шклянкі, дзе прадбачліва пакінуў на два пальцы віна. А Ян акурат тым часам (часам Маркавага глытка) неспадзявана й раптоўна згубіў нітку размовы. Ён паглядзеў на пляшку такім запытальна-ўмольным позіркам, які цяжка было не зразумець, і калі Марка плюхнуў зь яе ў шклянкі, Ян хуценька схапіў сваю, паднёс да вуснаў, але замест выпіць зьнячэўку прамовіў:

– Скажы мне, адкуль яны бяруцца?

– Хто – яны? – не зразумеў Марка. – Паэты?

– Ды не. Вэтэраны, – прыцішыў голас да шэпту Ян.

– Як гэта – адкуль? – ня цяміў Марка.

– Зараз растлумачу, – паабяцаў Ян, чаркнуўшыся зь сябрам. Яны выпілі, перавялі дых, і Ян працягваў: – Еду я сёньня ўраньні ў бібліятэку, а ў тралейбус на Тэатральным пляцы заходзіць вэтэран. Невялічкі такі сівы дзядок, ордэнаў на ім вось так, – Ян правёў рабром далоні па таліі ніжэй за стальніцу, там, дзе Марка і ня ўбачыў, адно мог здагадацца. – І ён так уладна, так жорстка абвёў нас усіх, хто ехаў у тым тралейбусе, вачыма: «Ану, хто тут мне месца саступіць?» – што адразу трое ці чацьвёра ўсталі. Ён тады сеў, яшчэ раз нас усіх позіркам

перакладзеныя на за першы беларускую мову. Ўладзімера Архіпаў. Апошняя публікацыя А. Ірванца па беларуску – п'еса «Маленькая п'еса пра здраду для адной акторкі» («Дзеяслоў», № 13).

акінуў ды паехаў сабе…

– Ну і што тут цябе зьдзіўляе? – запытаўся Марка і зноў плюхнуў у шклянкі. – Заўтра ж гэты, Дзень Перамогі.

– Але! – Ян перайшоў ужо на ціхі шэпт, хоць, апрача іх, у радыюсе мэтраў дзесяці не было ніводнага наведніка, адно воддаль маячыў у дзьвярах пануры афіцыянт. – У тым і ўся загадка. Скажы, чаму іх не відаць у іншы час, увесь год? Ні ўлетку, ні ўвосень, ні ўзімку?

– Цікава… – Марка задуменна паглядзеў у шклянку і даліў яшчэ патрошку, спачатку сабе, потым сябру. – Калі шчыра, дык я таксама калісьці пра гэта думаў. Ну, будзьма!

Гэтым разам партвэйн пайшоў плаўна й нячутна, пакінуўшы адно гаркаватую слодыч у горле. Скаўтнуўшы асцу, Марка працягваў:

– Як мне было гадоў дзесяць-дванаццаць, да нас у школу іх часьцяком прыводзілі, ну гэтых, вэтэранаў. Я тады думаў: «Калі стану дарослым, яны ўжо ўсе паўміраюць, і маё пакаленьне будзе ганарыцца, што бачыла яшчэ жывых удзельнікаў той вайны».

Ян паглядзеў на Марку ва ўпор і нэрвова гігікнуў. Марка, нібыта зразумеўшы, кіўнуў.

– Мне ўжо сорак два, а я кожны год бачу іх у траўні на парадах. І яшчэ праз год буду бачыць, і праз два, і празь пяць. Некалі мне проста здавалася, а цяпер я перакананы – пражыву сваё жыцьцё, памру, а яны на сваіх парадах усё будуць хадзіць і хадзіць.

Запала маўчаньне. Ян заміж адказу працягнуў руку цераз стол і сам разьліў рэшткі віна. Сябры, нібы па камандзе, узьнялі шклянкі і зрабілі глыток. Ян ажно закерхаўся – словы лезьлі з горла насустрач трунку.

– Слухай, а табе ніколі не здавалася… Мо яны ўжо і напраўду памерлі?

Марка падняў вочы.

– А давай праверым…

* * *

Сябры разьлічыліся – гэта значыць разьлічыўся Марка. Ян выняў быў з кішэні пяцёрку, але старэйшы таварыш уладным рухам рукі спыніў яго: кінь! Ён даў маркотнаму афіцыянту пяцідзясятку і, каб было бяз рэшты, паказаў на пляшку каньяку мясцовага разьліву, якая самоцілася ў шкляным бары сярод гарэлак і партвэйнаў:

– А гэта нам з сабой. І пару бутэрбродаў, тых, зь селядцом.

Могілкі ў іхнім горадзе былі не далёка і ня блізка. Марка зь Янам перабеглі вуліцу, ускочылі ў пусты, ці не апошні, тралейбус, не прабіваючы квіткоў, перайшлі пяць або шэсьць прыпынкаў. Яны выйшлі ў змрок, які ўвачавідкі гусьцеў, перасеклі яшчэ дзьве вуліцы зь пераважна прыватнай забудовай. Жалезная брамка, што служыла бакавым уваходам на могілкі, аказалася адчыненая – яна адно ціхенька рыпнула, калі сябры пераадолелі яе і спыніліся.

– Ну і што цяпер? – запытаўся Ян здушаным голасам.

Як быццам у адказ, недзе ў прыватным сэктары хрыпата азваўся певень. Ягоны крык ня ўзьняўся ўгору і ня быў падхоплены іншымі пеўнямі. Дый ці былі на гэтай гарадзкой вуліцы іншыя пеўні?

Марка прымружыў вочы, паправіў акуляры і, прыціскаючы да грудзей пляшку, рушыў уперад вузкай сьцежкаю паміж магілаў. Ян, баязьліва горбячыся й азіраючыся, пабрыў сьледам.

Хвілінаў празь дзесяць яны апынуліся на цэнтральнай алеі, параўнаўча шырокай і асьветленай двума слабенькімі бледнымі ліхтарамі. Сюды, на алею, таксама выходзілі магілы, але яны былі прыветнейшыя, чым там, у глыбіні кладоў. Ахайна абкапаныя, дагледжаныя, зь вянкамі і жывымі кветкамі

ў бутэльках з-пад кефіру ды ў маянэзных слоічках.

– Тут ляжаць дастойныя людзі, – прамармытаў Марка, кіруючыся бліжэй да сьвятла. Паўз магілы двух мэраў, чые чорныя гранітныя галовы сурова ўглядаліся ў цемру з дарагіх пастамэнтаў, паўз магілу дырэктара тэатру і галоўнага лекара гарадзкога шпіталю сябры нарэшце выйшлі да лавачкі, што сіратліва прыткнулася пад далёкім ліхтаром. Разгледзеўшыся й змахнуўшы з дошак невідочны пыл, Марка сеў, зацісnуўшы паміж каленяў пляшку. Алюміневая закрутка тройчы затрашчала ў ягоных пальцах.

– Пі, – працягнуў ён пляшку Яну. Той узяў, зрабіў глыток, скрывеліўся.

– Ну як? Нармальны? Ці палёны? – Марка, не чакаючы адказу, забраў пляшку і зрабіў адразу два вялікія глыткі. – Нармальны! Г-гу!..

Дзесьці за дрэвамі, у нябачным адсюль прыватным сэктары, завыў сабака. Ян спалохана азірнуўся і ўцягнуў голаў у плечы.

Марка падбадзёрліва ляпнуў сябра па плячы і раптам замёр. Паблізу пачуўся дзіўны, незразумелы гук. Гэта быў скрыгат, але ня гучны і рэзкі, а глыбокі, як быццам прыглушаны слоем нечага мяккага. Ваты? Ці – зямлі?

Сябры інстынктыўна прыгнуліся, прыціснуліся адзін да аднаго і павярнулі галовы ў той бок. Спачатку нічога не было відаць, аднак потым у цямрэчы за магіламі ўдалося разгледзець нейкі хаатычны, адрывісты рух.

Гэта быў стары мужчына зь зеленаватым тварам і рэдзенькімі валасамі на чэрапе, апрануты ў форму падпалкоўніка з чырвонымі пятліцамі танкіста. Левая рука вісела ў яго ўздоўж цела амаль нерухома, але правай падпалкоўнік даволі спрытна абтрапаў з кіцеля наліплую зямлю. Худыя й тонкія пальцы былі закрапаныя воскам, што прыліп да пазногцяў.

– Эй, рабята! – ён з-за магільнай агароджы памахаў Марку зь Янам усё тою ж правай рукой. – З наступаюшчым празьнічкам

вас!

– Дзякуй… вас таксама… – прамармытаў Марка. Ян, далучаючыся, кіўнуў.

– Тут нашых нікаго ня відзелі? – пацікавіўся падпалкоўнік, гледзячы глыбока запалымі вачыма, нібы і не на іх, а некуды ў глыбіню цемры. У адказ Марка толькі пацiснуў плячыма.

– Ну ладна… – вайсковец павярнуўся і, далей атрасаючыся, пацёгся паміж магіламі кудысьці ўлева. Сябры праводзілі яго позіркамі, усё яшчэ не даючы веры вачам. Ян дробна-дробна цакатаў зубамі. Марка паднёс яму да рота пляшку і ўліў глыток каньяку. Ян адно ўдзячна кіўнуў і абхапіў свае локці далонямі. Яго калаціла дробная дрыготка.

Далей уздоўж алеі адна з цэнтральных магілаў таксама заскрыгатала, глуха і невыразна. Падпалкоўнік прысьпешыў у той бок хаду. І якраз своечасова – з-пад пліты павольна паднялася высокая, станістая постаць у мундзіры з шырокімі лямпасамі і вялікімі залатымі зоркамі на пагонах.

– Таварышч генерал! – падскочыў да яго танкіст, уздымаючы ўгору неслухмяную правую руку. – Падпалкоўнік Панкратаў на таржэсьцьвеннае пастраеніе прыбыў первым!

– Вольна! – мармытнуў генэрал, атрасаючы мундзір. – Не сьпяшыце, падпалкоўнік. Хаця усердзіе пахвальнае.

Абодва вайскоўцы выйшлі на цэнтральную алею. Цяпер было відаць, што зямля прыліпла ня толькі да кіцеляў, але і да штаноў – генэралавых, дыхтоўных, зь лямпасамі, і падпалкоўнікавых, вузейшых і сьціплейшых. Чаравікі ў абодвух таксама былі забруджаныя, хоць і не гразёю, а пылам. Таму сьпярша генэрал, а за ім і падпалкоўнік асьцярожна патупалі нагамі.

– Бач… ты не памыліўся… – прашаптаў Марка і прагна каўтануў з пляшкі. Ян працягнуў дрыготкую руку і, абліваючыся, зрабіў свой доўгі глыток.

А глухаватае скрыгатаньне ўжо неслася з розных бакоў, здалёк і зблізку. То тут, то там гупала аб дол каменная пліта і з-пад яе паднімалася чарговая постаць у мундзіры.

Нябожчыкі падцягваліся да генэрала й падпалкоўніка, рапартавалі аб прыбыцьці, а потым працягвалі атрасацца, пакрысе шыхтуючыся ўздоўж алеі ў ня вельмі роўную калёну. Ян з Маркам незварушна сядзелі на лавачцы. Ды на іх ня надта і зважалі. Размовы, што вялі нябожчыкі міжсобку, перапляталіся ў шырокае і не зусім зразумелае палатно:

– Ох харашо як вакруг!.. Вясна, усё пазелянела! Нядарам вясной пабеду дабылі!

– Ты, што лі, яе дабываў? Да табе ж у сорак пятам чатырнаццаць лет стукнула, Іван Міронавіч! Ты ж ваенруком усю жызнь праработаў у школе, пацаноў вучыў працівагаз адзяваць!

– Ну і што, і эта тожа нада! Гатовіў будушчых зашчытнікаў. Ці вы што проціў імееце, Міхаіл Пятровіч? Ілі я вінават, што ад вас малодшы?

– О, глядзі, Сямёнаўна вылезла! Ты ж наша падруга баявая, і маць, і сястра, і жана! – паміж магільных агароджаў прабіралася, накульгваючы, старэнькая бабуля ў доўгай чорнай спадніцы і плюшавай жакетцы, на якой трыма шэрагамі тырчэлі ордэнскія плянкі. – А дзе ж самі награды твае? Дзецям у насьледзтва аставіла?

Сямёнаўна спынілася, абаперлася на весьніцы каля адной з магілаў і прашамкала:

– Да награды мае Віцька, унук младшы, яшчэ ў дзевяноста первам вывез у эту Польшу, каторую мы з вамі, Пятровіч, асвабаждалі, і там зьмяняў на часы электронныя, кітайскага праізводзтва.

– Да вы што? Вот негадзяй! І як так можна!.. – абураны, разьвёў рукамі Пятровіч. Ад рэзкага руху адна рука ў яго ненатуральна перагнулася ў локці навонкі, і ён ашчадна засунуў яе ў кішэню

кіцеля.

А Сямёнаўна, шчэмячыся вузкімі праходамі між магілаў, тлумачыла:

– Дык ён жа тых часоў прывёз тады нямерана, цэлыя два мяшкі. З тымі часамі паўгораду хадзіла. І це тры кіоскі на базары, якія ён січас дзержыць, яны ад тых часоў пачаліся. То разьве ж мне жалка?

Марка здрыгануўся і асьцярожліва перавёў позірк на свой гадзіньнік. «Casio» паказваў палову на трэцюю. Ян, прыхінуўшыся да сябравага пляча, ужо не трымцеў, а сядзеў у нейкім здранцьвеньні. Марка сіламоц расчапіў яму зубы і ўліў туды колькі грамаў каньяку. Па тым, што на Янавым гарляку таргануўся коўцік, было зразумела: жыцьцё ў целе яшчэ кволіцца. Марка ашчадна паднёс пляшку да вуснаў і адпіў сам.

Тым часам Пятровіч выйшаў на сьвятло і выявіўся тоўстым і пляшывым маёрам-сувязістам. Ён паглядзеў у бок Маркі зь Янам і быццам бы сам сабе, але досыць голасна прамовіў:

– А ў ніх жа тут зараз есьць магазіны і кіоскі эці, як іх… кругласутачныя! Чуеш, Сямёнаўна, а твой унук часам не такім кіоскам заведуе?

– Не, ён куртачкамі і штанамі таргуе, – ужо зусім побач адгукнулася Сямёнаўна. – У яго ўначы закрыта.

– А-а-а, і то праўда… – Пятровіч відавочна ўзьбіўся на блізкую й важную для сябе тэму. – Да і дзенег гэтых, саўраменных, наўрад лі ў каго найдзёш. Яны ж, радня, перад тым, як хараніць, усе карманы абшараць!..

Той, каго ён называў Міронавічам, невысокі вузкаплечы нябожчык у форме няпэўнага роду войскаў з пагонамі старшага лейтэнанта, стоячы трохі воддаль, разьвёў рукамі ды паціснуў плячыма. Гэтыя рухі атрымаліся нязграбна-драўлянымі, аднак Пятровіч мяняць тэму не хацеў.

– Вот у нас пару лет назад тут вылез учасьнік Акцябарскай

рэвалюцыі. Яму ў наябры паложана, але ён дзень перапутаў ці, можа, і нарошна. Яно ж прыятней вясной вылезьці. Так у яго, слыш, Міроныч, у яго ў падкладцы пінжака залатыя царскія пяцёркі зашыты аказаліся. Ну, я табе скажу, мы тагда гульнулі!.. – летуценна гнуў сваё Пятровіч, пакрысе, крок за крокам, набліжаючыся да лавачкі. Марка прытуліў Яна да сябе, і той ад жаху апусьціў голаў, гледзячы проста пад ногі, у цемру, ледзь разбаўленую бледным ліхтарным сьвятлом.

Пятровіч неяк бокам, нізка і дробна перастаўляючы ногі, нібыта ішоў на пратэзах, чыкіляў да ліхтара. Ян роспачна застагнаў, а Марка схаваў пляшку з каньяком пад куртку.

– Вот слышце, маладыя людзі, – здалёк пачаў Пятровіч, спыніўшыся мэтраў за пяць ад іх. – Скока зараз бутылка водкі стоіць? У эціх вашых, новых дзеньгах?

Марка з паўхвіліны счакаў. Нябожчык зрабіў у іхнім кірунку яшчэ тры крокі, і не адказаць ужо было немагчыма. Намагаючыся, каб голас не трымцеў, Марка прашаптаў:

– Ды грыўні тры-чатыры…

– Ё-ёй… Дарагавата… – Пятровіч быў ужо за пару крокаў. – Прэжнія разы былі і па дзьве, і па паўтары грыўні. Што ж гэта такое, што ўсё даражае?

Марка зь Янам маўчалі. Пятровіч таксама спыніўся й быццам задумаўся, вырашаючы нейкую складаную задачу. Потым зрабіў ячшчэ два-тры дробненькія крокі ды пачаў сваёй правай рукою ці то мацаць, ці то масіраваць грудзі – леваруч, там, дзе сэрца.

«Можа, яму блага? – мільганула ў галаве ў Маркі, ды гэтую думку імгненна захінула іншая: – Але як гэта мерцьвяку можа быць блага?» А Пятровіч, пакуль тое, палез пад адварот кіцеля і пачаў там нязграбна шнарыць.

– Слушайце, маладыя людзі… – ён калупаўся за пазухай, і Марку рабілася страшна ад самой думкі пра тое, што Пятровіч зараз можа адтуль дастаць. – А вот вы можаце даць мне эці

самыя чатыры-пяць грывень… не за бясплатна… а вот за эта, напрымер.

Ён выцягнуў руку з-за пазухі – там не было нічога. Але той самай рукой ён зьняў з грудзей ордэн Чырвонай Зоркі і працягнуў яго Яну, адначасова прыкручваючы двума нягнуткімі пальцамі на «хвосьцік» круглую мэталёвую заглушку, якую і адшпільваў так доўга з адвароту кіцеля.

– Ордэн. Ён гаразда дарожэ стоіць.

Ян, быццам загіпнатызаваны, глядзеў на пяціканцовую мэталёвую зорку, пакрытую чырвонай эмальлю, потым узяў яе левай рукою, беражліва, двума пальцамі. У той самы час правую далонь ён засунуў у кішэню штаноў і здабыў адтуль пяцёрку – тую самую, якой спрабаваў разьлічыцца ў бары і якую ўладным рухам вярнуў яму Марка.

– Вось. Вазьміце.

Мярцьвяк працягнуў сваю выпетраную далонь, і Ян паклаў туды банкноту, хутка-хутка, яшчэ й адхапіўшы сваю руку, каб выпадкам не дакранулася плоць да плоці. Пятровіч заўважыў і ўсьміхнуўся вузкімі, амаль нерухомымі вуснамі:

– Ня нада, ня нада баяцца…

Ён схаваў пяцёрку ў кішэню і, павольна разьвярнуўшыся, пашкандыбаў па алеі.

А нябожчыкаў тым часам прыбывала й прыбывала, іхняя шматгалосая размова ўжо разьлягалася па-над усімі кладамі.

– Сматры-сматры, Манцюк паказаўся! Ах ты, тля бандэраўская! Ты ж первых два года вайны ў паліцаях служыў ілі там у лясу сядзеў. А патом, кагда нашы прыйшлі, так ты, как ні ў чом ні бывала, прысаедзініўся! Ану, прачся назад, зараза, а то закапаем утарой раз!..

– О, Лазар Майсеевіч паявіўся. Ты што ж, за ўсю жызьнь так вышэй маёра і не даслужыўся? Пятая графа памяшала?

Той, каго назвалі Лазарам Майсеевічам, выглядаў яшчэ амаль жывым – відаць, яго пахавалі ня так даўно. У яго быў прыгнечаны выраз твару са стуленымі вуснамі ды вялікім, хоць і не крукаватым носам. Маёрскі мундзір сядзеў на ім неяк недарэчна, але ён, абцягнуўшы яго, упэўнена папраставаў на алею, туды, дзе стаяў генэрал. Высока паднімаючы ногі, якія, здавалася, зусім не згіналіся ў каленях, Лазар Майсеевіч адрапартаваў пра сваё прыбыцьцё, а затым, далікатна ўзяўшы генэрала пад локаць, адвёў яго ўбок, бліжэй да ліхтара. Марка ўслухаўся і пачуў досыць гучнае шамканьне:

– Слышце, таварышч генерал… Тут нада рашыць адзін вапрос. Я ж эта, нядаўна, так сказаць, пераход савяршыў.

– Што-што? – не зразумеў генэрал.

– Ну, помер то есьць.

– А-а-а. Ну і што ж? – генэрал размаўляў неахвотна, відавочна дэманструючы жаданьне вярнуцца да больш прыемных абавязкаў. Недалёка ўжо тоўпілася з паўтузіна новых нябожчыкаў, якія, падымаючыся на дыбачкі, пазіралі ў бок постаці зь лямпасамі. – Давай быстрэй, Майсеевіч!

– Так штоб быстрэй, то эта… – сумеўся Лазар, – нужна ваша помашч…

– Какая яшчэ помашч? – скрывіўся генэрал.

– Вы ж з эцім, зь цяперашнім прадсядацелем гарсавета, як эта ано… з мэрам, вы ж зь нім знакомы? Он жа ў вас у ваенкамаце замясьціцелем начынаў? Так уродзе?

– Не замясьціцелем, а камсоргам! Не цяні, Майсеевіч! Кажы, што нада!

– Так вот… – Майсеевіч відавочна ня ўмеў «не цягнуць», – я ж калі помер… мы ж в очарадзі стаялі… на кварціру.

– У цябе ж была кварціра, трохкомнатная! На бульвары герояў Сталінграда, з улучшанай планіроўкай!.. – усё больш уквелена хрыпеў генэрал.

– Ой, да кагда эта! – Лазар паднёс рукі да грудзей. – Посьле этага я два раза зьяжджаў. Та кварціра старшай дочке асталась. А пасьледнее ўрэмя я жыў з унучкай, у двухкомнатнай хрушчоўке.

– І што? – у генэрала яўна сканчалася цярпеньне.

– Да эта ж… Як я помер, акурат перад дваццаць трэцім феўраля, то мы ўсе ждалі, што нам ордзер прынясуць, на новую кватэру. Чэраз эта ажыданіе мяне радныя яшчэ дзьве нядзелі не харанілі. Фу, стыдна сказаць, усю хату ім праваняў…

– Ну і што з этага? – генэрал ужо крычаў, не хаваючы раздражненьня. – Ты радзіш, наканец, чаго ты хочаш?

– Ой, тока ня нада на мяне крычаць! – Лазар Майсеевіч таксама адважыўся падвысіць голас. – Я вас тока папрасіць хацеў, штоб вы днём, посьле парада, есьлі прадставіцца случай, напомнілі пра этот вапрос прадсядацелю. Бо маі так і асталіс у той хрушчоўке. Пахлапочыце, таварышч генерал?

Генэрал выхапіў локаць з Майсеевічавых пальцаў, рэзка крутануўся на абцасах і, не адказаўшы, хутка, наколькі мог, рушыў да новапрыбылых нябожчыкаў, якія чакалі яго на алеі воддаль. Адышоўшы крокаў на дзесяць, ён азірнуўся на Лазара, што самотна застыў, трымаючы сагнутую ў локці руку, якая толькі што разьвіталася з рукавом суразмоўцы. У генэралавым позірку зьмяшаліся пагарда й шкадоба, а з паўраскрытага пустога рота даляцела кароткае й глухое: «Ладна!.. Пасмотрым».

Марка зь Янам пасьпелі трохі апамятацца і нават украдня глынулі з пляшкі, якую дзеля гэтага мусілі нахіляць ужо вельмі высока. Марка зноў схаваў пляшку пад паху, за куртку, і своечасова, бо па алеі да іх набліжаліся падпалкоўнік Панкратаў і маёр Пятровіч, які сьціскаў у правай руцэ атрыманую ад Яна пяцёрку.

– Тут за пару кварталаў есьць вагончык кругласутачны… – Пятровіч паціраў ад радасьці рукі. – Там і затаварымся. Хоць мярзаўчыка якога-небудзь, штоб вкус ва рту напомніць.

Праўда, таварышч падпалкоўнік?

Падпалкоўнік зьлёгку кіўнуў, відавочна думаючы пра нешта сваё. Потым спыніўся так рэзка, што Пятровіч, які ішоў побач, спатыкнуўся і ледзь ня грымнуўся на дол. – Што такое, таварышч падпалкоўнік?

– Есьць адно дзельца… – шматзначна прабубнеў пад нос Панкратаў.

– Што за дзельца? Пасрэдзі ночы…

Падпалкоўнік павярнуўся да Пятровіча і амаль усутыч спадылба паглядзеў на яго.

– Тут пад горадам, за рэчкай, маі танкісты ляжат. На краю балота, чатыры экіпажа. У сорак трэцім тут у нас бой был аснавацельны.

– Ага… – працягнуў Пятровіч, відочна ня маючы чаго сказаць, а толькі каб падтрымаць дыялёг.

– Так вот я січас выйду с табой, а патом пабягу туда, за рэчку.

– Зачэм? – Пятровіч усё ж прыдумаў, як яму прадоўжыць размову. Ён вырашыў задаваць пытаньні, што самі сабой вынікалі з пачутага.

– А зацем! Оні ж тожэ павылазілі.

– І што?

– А то! – падпалкоўнік пачынаў злавацца, бо суразмоўца-назола патрапляў сваімі пытаньнямі зусім ня ў тэму. – Оні ж там не ў парадках пахаронены. Шлемафоны абгарэлыя, у аднаго паўгалавы зьнясло, у другога ног нету па калені. Я ж не магу пазволіць, штоб і ані на парад папёрліс!

– А, ну да, правільна… – Пятровіч са сваёю тактыкай зноў трапіў у тупік.

– Сам знаю, што правільна. Да вот нада мне іх как-та

удзяржаць. Да скажу ім, што нет нікакога парада, што новая ўласьць паадмяняла. А ты міня падаждзёш, возле таго сваяго лабаза… Дабро?..

Яны паціху пашкандыбалі далей, нават не паварочваючы галоў у бок Маркі і Яна. Тыя, у сваю чаргу, зрабілі выгляд, што іх няма ні на лавачцы, ні наагул у прыродзе – затаілі дыханьне і не зварухнулі ніводнай часткаю цела, улучна з валаскамі ў ноздрах. Толькі калі дзьве постаці расталі ў цемры за галоўнаю брамай, Марка перавёў дух і працягнуў Яну пляшку, выняўшы яе з-за пазухі. Там яшчэ ацалела грамаў сто каньяку, а гадзіньнік паказваў ужо дваццаць пяць хвілінаў на чацьвёртую.

– Хутка сьвітаньне… – прашаптаў Марка Яну ў самае вуха.

– Ня так яно й хутка, – адказаў той, круцячы пляшку, дзе пітва амаль не засталося.

Удалечыні генэрал прымаў рапарты аб прыбыцьці ад усё новых нябожчыкаў у розных мундзірах. Сярод іх трапляліся і постаці ў цывільным, з ордэнамі, а радзей з ордэнскімі плянкамі на левым баку запалых і нерухомых грудзей.

Марка падняў пляшку над разяўленым ротам і трымаў яе, аж пакуль на язык ня ўпалі трынаццатая й чатырнаццатая кроплі.

– Усё. Больш і алькашы не здабываюць.

Ён ашчадна паставіў пляшку ў цемру пад лаўку, а потым адкаціў яе пяткаю далей.

– Можа, патроху зьліняем? – Ян паглядзеў цераз плячо на Марку. – Пераканаліся ўжо, што яны ўсё ж ёсьць. Значыць, не, што іх усё ж няма. Цьху, зусім заблытаўся. – Ён спрабаваў усьміхнуцца, але адно скрывіў рот. Страх у ягоных вачах нікуды ня зьнік.

Марка мацней сьціснуў плячо малодшага таварыша. Алькаголь абсалютна ня дзейнічаў – думкі былі ясныя і выразныя.

– Можна і ліняць. Але я б яшчэ трохі пасядзеў. Калі ты ня супраць. Хачу пабачыць… – ён асёкся, заўважыўшы, як з-за

помнікаў намагаецца дапасьці да алеі нябожчык, якому перад сьмерцю, напэўна, няўдала зрабілі апэрацыю. Галава і левая рука ў яго па чарзе адвальваліся; праваю ён прыладжваў згубленую частку цела назад, але прытрымаць ня мог, бо тады адпадала штосьці іншае. Калі ён дабраўся да генэрала і, дакладваючы, выпрастаўся, то левую руку паклаў сабе пад ногі, бо справіцца зь ёю ўжо ніякім чынам ня мог. Адрапартаваўшы, нябожчык падняў левую руку, але, відаць, стаміўшыся яе прытуляць, проста зацісnуў пад пахаю правай. Галаву пры гэтым ён трымаў нерухома і адышоў асьцярожна, амаль што на дыбачках.

– Што ты сабраўся пабачыць? – Ян хацеў, каб Марка закончыў папярэднюю фразу. Ён трохі ачуняў ад страху, прынамсі, вызваліў плячо з-пад Маркавага локця і ўладкаваўся на лавачцы больш вольна.

– Ну, гэта, як у амэрыканскіх фільмах, калі ўранку ўзыходзіць сонца, і ўсе… усе яны пад яго промнямі… пачынаюць дымець, а тады зьнікаюць, памятаеш? – Марка, не зважаючы ні на што, хацеў заставацца дасьледнікам да канца. – Богведама, ці патрапім яшчэ калі нешта падобнае ўбачыць.

Ян кіўнуў, хоць было відаць, што найбольш ахвотна ён даў бы зараз на ўсю моц лататы, каб апынуцца як мага далей ад гэтае лавачкі і ад кладоў.

– Добра, пасядзім яшчэ крыху.

Недзе ў прыватным сэктары падаў голас той самы невідочны певень – глуха й самотна.

* * *

Пад раніцу, як пачало днець, нашы сябры ўжо важылі носам табаку. Яны прахапіліся толькі пры зьяўленьні падпалкоўніка Панкратава, што цягнуў на сабе Пятровіча. Той, несумненна, пасьпеў купіць даўно жаданую чакушку і нават прыняць яе на душу. Каля лавачкі, дзе сядзелі Ян з Маркам, падпалкоўнік

прыстоіў адпачыць. Пятровіч апрытомнеў і пачаў прапаноўваць яшчэ адзін свой ордэн за пару грыўняў «на закуску».

– Вось, вазьміце. – Ян раптам успомніў пра два лусьцікі зь селядцом, якія яны захапілі з сабою ў кавярні, і дрыготкай рукою дастаў з кішэні пакунак. Лусьцікі, праўда, зьляпіліся ў адзін, але Пятровіча гэта не зьбянтэжыла, і ён узяўся жаваць «закуску», нават не разгортваючы. Падпалкоўнік амаль нячутна мацюкнуўся скрозь зубы і пацягнуў маёра ў бок шыхтаваньня.

Сонца паднялося ня хутка і не павольна – якраз так, як і павінна ўзыходзіць у вясновую пагодную раніцу. Яго чырвоныя промні, паступова ператвараючыся ў залатыя, сьлізганулі па вяршалінах таполяў, якія абступалі могілкі, потым дацягнуліся ніжэй, да зямлі. Але дзіўна – ніхто зь нябожчыкаў не задыміўся, ня ўпаў, не спалохаўся. Усе яны, засяроджана ўзьняўшы галовы, слухалі каманды генэрала.

– Ты бачыш, – толькі і здолеў прамовіць Марка.

А мерцьвякі тым часам, не сьпяшаючыся, сшыхтаваліся ў калёну па трое і рушылі ў кірунку да галоўнай брамы. Уражаныя й прыгаломшаныя, глядзелі нашы сябры на гэтую працэсію. Уперадзе ішлі генэрал з падпалкоўнікам, а за імі – усе астатнія, хоць і не ў нагу, аднак даволі зладжана. У апошнім шэрагу двое вэтэранаў у цывільным вялі пад рукі Сямёнаўну, што выявілася тут адзінай жанчынаю. Пятровіч пагойдваўся зьлева направа ды сплёўваў абрыўкі сурвэткі, у якую быў загорнуты лусьцік зь селядцом.

Зарыпела жалезная брама, і калёна, выліўшыся з могілак вонкі, павярнула налева, у бок цэнтру, рухаючыся па бязьлюдным у гэты час цэнтральным праспэкце.

Калі Марка зь Янам ачомаліся – а здарылася гэта хвілінаў праз дваццаць – яны падняліся з лавачкі і паціху пакіравалі тудысама, да галоўнага выхаду з кладоў. Размаўляць было цяжка дый не хацелася. Па залітым ранішнім сонцам праспэкце ехала жоўтая «Волга» з папярочным клятчастым грабеньчыкам.

– Таксі! – Марка махнуў рукой, і аўто, гайданууўшыся пустым

багажнікам, спынілася.

– С празьнікам, мужыкі! Куда ехаць? – таксіст высунуўся з кабіны ў прачыненае акенца.

– У цэнтар… – Марка па-ранейшаму пачуваўся, нібы ў сьне. Вусны варушыліся павольна, быццам ватныя або плястылінавыя.

– А дзеньгі есьць? – недаверліва прымружыў вока таксіст. – А то вы што-та слішкам на бамжэй пахожы!

Марка дацягнуўся да кішэні і зь зьдзіўленьнем намацаў там усяго адну банкноту. Выцягнуўшы яе, ён убачыў, што гэта дзьвесьце грыўняў.

– Ну не, у міня з такіх здачы ня будзет!.. – закапрызіў таксіст.

І тут Ян рашуча рвануў на сябе дзьверцы з боку пасажыра, рэзка плюхнуўся на сядзеньне і ўпэўненым рухам працягнуў таксісту ордэн Чырвонай Зоркі.

– На прасьпект Пабеды! – амаль што пракрычаў ён. – Трогай, паехалі!..

Пераклаў з украінскай Уладзімер Арлоў

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 5 (45) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (45) - 2006**

[image]

[image]

[image]

5[image][image]2006
"да 3 бары "
гісторыя

[image] [image] [image]

Да гісторыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады: агляд крыніцаў.

[1] У назвах лацінічных дакумэнтаў захоўваецца правапіс арыгіналу.
[2] Гл.: Цётка. Выбраныя творы. Мінск, 2001. С. 312.
[3] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху: Выбраныя творы. Менск, 2003. С. 172.
[4] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 171–172.

Працяг. Пачатак у № 4.

III

Важнаю крыніцаю для гісторыка БСГ зьяўляюцца яе праклямацыі: звароты, улёткі, адозвы і г. д. Яны адлюстроўваюць і разьвіваюць праграмныя дакумэнты партыі і дапамагаюць паўней зразумець яе тактыку.

У сваёй працы «ППС у стасунку да беларускага рэвалюцыйнага руху ў 1902–1906 гадах» д-р Юры Туронак піша, што «ў 1905 г. БСГ выдала больш за 20 адозваў». На сёньня мне вядомыя 18 улётак. У заплянаванай кнізе «БСГ у дакумэнтах і матэрыялах» публікуюцца 14 зь іх[1]:

1) «Цараво жніво»;
2) «Што такое канстытуцыя»;
3) «Першы мужыцкі зьезд»;
4) «Да ўсіх работнікаў і работніц дваровых, да ўсіх дзеравенскіх людзей на туташняй зямлі Беларускай»;

5) «Да ўсіх работнікаў і работніц Вілейскай бальніцы»;
6) «Далоў цараву «думу»!»;
7) «Да салдатаў!»;
8) «Braty chryscjanie!»;
9) «Carawa «Duma»;
10) «Беларускі Красьцьянскі Саюз»;
11) «Czym car ratujecca»;
12) «За свабоду!»;
13) «Таварышы работнікі!»;
14) «Czyrwony znak».

Асобнаю ўлёткаю выпушчаны таксама «Нарыс праграму Беларускай Сацыялістычнай Грамады», які будзе зьмешчаны ў першым разьдзеле кнігі.

Апрача таго, у пералік наўмысна ня ўключаныя ўлёткі зь вершамі Цёткі, бо гэтыя творы паэткі даволі лёгка знайсьці.

Колькасьць і наклад улётак зь вершамі Цёткі да гэтага часу ня высьветлены, і гэта наўрад ці ўдасца высьветліць. Паводле сьведчаньняў А. Бурбіса ды Ф. Стацкевіча, а таксама публікацыі ў «Белорусском движении» Ф. Турука, улёткамі былі выдадзены тры вершы Цёткі: «Хрэст на свабоду», «Мора (Рэвалюцыя народная)» і «Пад штандарам».

1. **«Хрэст на свабоду»** (кастрычнік 1905-га). Як піша А. Луцкевіч, «Хрэст на свабоду» друкаваўся ў дзясятках тысячаў экзэмпляраў, ды ня толькі Б. Р. Грамадой, але і эльэсдэкамі ды пэпээсамі». Праўдзівасьць гэтае інфармацыі пацьвярджаецца іншымі аўтарамі і аб'ектыўнымі матэрыяламі. В. Коўтун паведамляе, што ў друкарні ЛСДП гэтая ўлётка друкавалася ананімна лацінкаю і кірыліцаю накладам 3 000 асобнікаў[2]. І сапраўды, у НАРБ (Ф. 325. Воп. 1. Адз. захав. 26) маецца асобнік улёткі «Хрэст на свабоду» з пазнакаю «LSDP», але без паказу накладу.

2. **«Мора (Рэвалюцыя народная)»**. Верш напісаны ў дні Ўсерасейскага кастрычніцкага палітычнага страйку. Выдадзены лацінкаю і кірыліцаю. Як сьведчыць Ф. Стацкевіч, улётка друкавалася ў Віленскай друкарні ППС.

3. **«Пад штандарам»**. Інфармацыю пра тое, што гэты верш быў надрукаваны Другім краёвым камітэтам БСГ кірыліцаю, падае А. Луцкевіч[3]. Як паведамляе В. Коўтун, верш быў надрукаваны камітэтам БСГ у Вільні і лацінкаю. Пра абставіны напісаньня гэтага вершу і ягонага друкаваньня паведамляе Ф. Стацкевіч у сваіх успамінах «Зь мінуўшчыны беларускага руху».

Калі гаворка ідзе пра ўлёткі БСГ, трэба мець на ўвазе, што кожная зь іх, як правіла, выдавалася кірыліцаю і лацінкаю. Акрамя таго, некаторыя ўлёткі выходзілі і на іншых мовах. Так, праграма БСГ, як сьведчыць Антон Луцкевіч, выдадзена на беларускай, габрэйскай, польскай і расейскай мовах (два апошнія выданьні яшчэ ня выяўленыя).

У 1905 г. грамадаўцы друкавалі свае выданьні ў друкарні ППС у Вільні. Як успамінае А. Луцкевіч, карысталіся яны і паслугамі друкарні РСДРП. У пэпээсаўскай друкарні на Бакшце працаваў Ф. Стацкевіч. Увесну 1905 г. ён быў накіраваны партыяй на вучобу ў Кракаў. Там працаваў як наборшчык ва ўнівэрсытэцкай друкарні. Вярнуўшыся з Польшчы, па дамоўленасьці паміж БСГ і ППС паступіў на працу ў пэпээсаўскую друкарню. Як піша Ф. Стацкевіч, «за маю помач Грамада атрымлівала права выдаваць свае адозвы і іншыя друкі». 1 сакавіка 1906 г. партыйны друкар пераехаў у Менск і тут заснаваў падпольную друкарню на вул. Гандлёвай.

Зь пералічаных тут праклямацыяў БСГ, акрамя ўлётак зь вершамі Цёткі, апублікаваныя былі: «Нарыс праграмы Беларускай Сацыялістычнай Грамады», «Цараво жніво», «Што такое канстытуцыя», «Першы мужыцкі зьезд», «Да ўсіх работнікаў і работніц дваровых, да усіх дзеравенскіх людзей на туташняй зямлі Беларускай», «Да салдатаў!», «Braty chryscjanie!», «Carawa «Duma» – у кнізе «Сацыялістычны рух на Беларусі ў праклямацыях 1905 году»; «Да ўсіх работнікаў і работніц Вілейскай бальніцы», «Далоў цараву «думу»!», «Чым цар ратуецца», «За свабоду!», «Таварышы работнікі!» – у кнізе выбраных твораў Цёткі (2001).

У 1930-х гг. А. Луцкевіч паведамляў, якія ўлёткі захоўваюцца ў архіве Польскай сацыялістычнай партыі (пазьней – архіў Польскай аб'яднанай рабочай партыі) і якія – у бібліятэцы імя

Эўстахі і Эмілііі Ўрублеўскіх (цяпер Цэнтральная бібліятэка Літоўскай акадэміі навук)[4]. Усе ўлёткі 1905 г., што захоўваліся ў бібліятэцы Ўрублеўскіх, цяпер вядомыя і апублікаваныя або, як «Беларускі Красцьянскі Саюз», публікуюцца тут. Публікуецца тут і ўлётка «Czyrwony znak», пра якую маецца згадка ў кнізе «Белорусское движение». Як відаць, твор гэты – песьня. Застаецца высьветліць, ці ня ёсьць ён перакладам і хто яго аўтар або магчымы перакладчык.

Трэба памятаць, што ў 1944 г. НКВД перавезла ў Менск значную частку фондаў Беларускага музэю імя Івана Луцкевіча. У НАРБ цяпер захоўваюцца чатыры праклямацыі БСГ – «Першы мужыцкі зъезд» (Ф. 325. Воп. 1. Адз. захав. 26. Арк. 4), «Беларускі Красцьянскі Саюз» (Арк. 5–6), «Czym car ratujecca» (Арк. 1), «Czyrwony znak» (Арк. 8), – а таксама праклямацыя «Царская гаспадарка», якую друкаваў Круг беларускай народнай прасьветы і якую распаўсюджвалі БРГ і БСГ.

Дасюль гаворка ішла пра друкі БСГ 1905 г. Аднак выпуск літаратуры пачаўся ў 1902 г. Гэта была, як піша ў артыкуле «З гісторыі беларускага выдавецкага руху ў 1902–1905 гадах» Ю. Туронак, польскамоўная адозва БРП «Да інтэлігенцыі». Выдавецкая праца партыі вялася і ў 1904 г., і ў 1906–1907 гг.

Антон Луцкевіч згадваў, што таму несумленнаму чалавеку, які прысабечыў партыйныя дакумэнты, былі аддадзеныя на перахоў «усе грамадаўскія друкі за час існаваньня партыі (па 10 экзэмпляраў)». Ня выключана, што некаторыя зь іх зьніклі навечна. Затое мажліва, што захаваліся антываенныя ўлёткі з чатырма і двума подпісамі, якія, паводле А. Луцкевіча, знаходзіліся ў архіве ППС. У працы «ППС у стасунку да беларускага рэвалюцыйнага руху ў 1902–1906 гадах» д-р Ю. Туронак паведаміў, што ў былым архіве польскіх сацыялістаў маюцца адозва «Таварышы» на беларускай, латыскай, літоўскай і польскай мовах з подпісамі ППС, БРГ, а таксама літоўскай і латвійскай сацыял-дэмакратычных партыяў (сакавік 1904 г.) і адозва «Брацьця Мужыкі» (лета 1904 г.) на польскай і беларускай мовах, падпісаная ППС і БРГ.

З улікам паведамленьняў А. Луцкевіча і Ю. Туронка, а таксама зьвестак, што ўтрымліваюцца ва ўспамінах і артыкулах Зігмаса

Ангарэціса, Міхася Біча, Аляксандра Бурбіса, Хведара Імшэніка, Антона Луцкевіча, Фэлікса Стацкевіча, Юр'я Туронка і Аляксандра Шлюбскага, якія (апрача артыкулаў М. Біча і Х. Імшэніка) цалкам або часткова будуць зьмешчаныя ў кнізе «БСГ у дакумэнтах і матэрыялах», нам вядомыя назвы або зьмест 15 улётак БРГ і БСГ 1904, 1906 і 1907 гг. Акрамя праклямацыяў «Таварышы!» і «Брацьця Мужыкі», астатнія пакуль што не ўдалося выявіць у архівах. Вось іх пералік.

Назва або зьмест улёткі	Хто паведамляе пра яе
«Таварышы!» (на чатырох мовах)	Ю. Туронак, М. Біч
«Брацьця мужыкі» (на дзьвюх мовах)	Ю. Туронак, М. Біч
Да мужыкоў, што возяць дровы на Тальку і Мар'іну Горку	А. Бурбіс
Зьвернутая да сялянаў, якія вазілі каменьне для будаўніцтва шашы	А. Шлюбскі
«Што такое свабода»	А. Бурбіс
«Якая карысьць народу з выбарнага правіцяльства»	З. Ангарэціс (паводле Ю. Туронка, гэта ўлётка Сацыялістычнай Партыі Белай Русі)
«Як рабіць забастоўку»	А. Бурбіс, А. Луцкевіч
«Як рабіць забастоўку» (палітоўску)	З. Ангарэціс
«Ці старчыць дзеля ўсіх зямлі»	А. Бурбіс
«Як мужыку палепшыць сваё жыцьцё»	Х. Імшэнік
«Таварышчы!»	А. Луцкевіч
Аб канфэрэнцыі БСГ 3—4 чэрвеня 1906 году (парасейску)	А. Луцкевіч
«Праўда аб забастоўцы»	А. Луцкевіч
Выбарская адозва дэпутатаў I Дзяржаўнай Думы	Ф. Стацкевіч
Першамайская адозва 1907 г.	Ф. Стацкевіч

IV

Трэці разьдзел укладзенае кнігі павінны складьці артыкулы, якія мелі калі не дырэктыўны, дык праграмны характар. Гэта выключна працы А. Луцкевіча: «Наш шлях», «Плян работы», «Пуцяводная ідэя», «Кудой ісьці?» і «Адвечная пропасьць».

Артыкул «Наш шлях» друкаваўся ў трэцім сшытку «Маладое Беларусі» (1913), у «Беларускім календары на 1914 год» і кнізе А. Луцкевіча «Да гісторыі баларускага руху». У перакладзе на ангельскую ён зьмешчаны ў кнізе «Byelorussian Statehood: Reader and Bibliography», якую выдалі Вітаўт і Зора Кіпелі (Нью-Ёрк: Беларускі Інстытут Навукі і Мастацтва, 1988).

Канкрэтызацыяй праграмы дзеяньняў БСГ у галіне культурна-асьветнай быў «Плян работы», складзены ў 1913-м ці на пачатку 1914 г. Гэты тэкст публікаваўся ў «Беларускім гістарычным часопісе» (1998. № 2) і ў кнізе «Да гісторыі беларускага руху». Можна думаць, што «Плян работы» быў рэфэратам А. Луцкевіча на адной з штогадовых сустрэчаў дзеячаў беларускага руху, якія пад прэтэкстам Купальля ладзіліся ў Вільні[5].

Як ведама, перад першаю сусьветнаю вайной у беларускім руху пачала афармляцца правая плынь, прадстаўленая нацыяналістамі, да якіх належаў Вацлаў Ластоўскі, і хрысьціянскай дэмакратыяй, якая пачала гуртавацца вакол заснаванае ў 1913 г. газэты «Bieiarus». Левыя (перш за ўсё А. Луцкевіч) вялі зь імі палемыку. Першым артыкулам у гэтым шэрагу і была «Пуцяводная ідэя», апублікаваная ў «Нашай Ніве» 20 сакавіка 1914 г. Пішучы, што «ад шырокага дэмакратычнага беларускага руху аддзяляюцца маленькія ручайкі», Луцкевіч падкрэсьлівае, што гэтыя «ручайкі» «ўжо *не захопліваюць усяго жыцьця* нашага працоўнага народу», што не названыя ім па імені нацыяналісты, «ганяючыся за чыста нацыянальнымі ідэаламі, ня бачаць сьлёз і гора працоўнага народу, ня чуюць таго крыку, што рвецца з набалелых грудзей гаротніка: «хлеба!..».

Як вынікае з наступнага артыкулу – «Кудой ісьці?»[6], – на Купальле 1914 г. адбылася канфэрэнцыя беларускіх дзеячаў у

[5] Да гісторыі беларускага руху… С. 162.

[6] Наша Ніва. 1914. 26 чэрвеня.

Вільні, якая не абышлася бяз вуснае палемікі з правымі. Луцкевіч зноў адстойвае прыярытэт сацыяльнага і піша: «Ці можа тварыць тая многамільённая грамада беларускіх сялян, каторая акуратна з дня ды на дзень недаядае? Ці могуць разьвівацца сьветлыя думкі ў галаве людзей, што пасьля непасільнай работы на ральлі ад сьвету да ночы маюць адно жаданьне: паесьці ды заснуць?» Ведама, барацьба за вызваленьне павінна ўключаць змаганьне і за сацыяльныя, за грамадзянскія свабоды, але «...для адраджэньня народу трэба ня толькі здабываць для яго волю – грамадзянскія правы: гэтага мала. Трэба, каб народ мог *з тых правоў карыстаць*, не губляючы сіл адно толькі дзеля куска хлеба. Трэба зрабіць яму *лягчэйшыя змаганьні за хлеб*». Праграма вядомая, яна выкладзеная ў артыкуле «Наш шлях»: ствараць каапэратывы, спажывецкія, крэдытныя таварыствы, вучыць сялянаў новым спосабам вядзеньня гаспадаркі і г. д. «Трэба *галоднага накарміць, цёмнага асьвяціць*. Трэба, каб беларус-гаротнік стаў вольным *чалавекам*. Толькі тады ўвесь беларускі народ – усе тыя восем мільёнаў – здолеюць жыць шырэйшым жыцьцём, разьвіваць розум і g пагодлівы вечар, сьвежы і зор- душу і захаваныя ў іх здольнасьці. Толькі тады пачне разьвівацца папраўдзе нацыянальная – усенародная – культура, тая культура, што мае вагу і для культуры сусьветнай».

І апошні зь перадваенных палемічных артыкулаў – «Адвечная пропасьць» (Наша Ніва, 1914, 17 ліпеня). Цэнзура прапускае словы А. Луцкевіча пра «змаганьне і нянавісьць між рабочым і гаспадаром яго», пра «змаганьне працы з капіталам», пра ідэал пралетарыяту (працоўнай беднаты ў тэрміналёгіі БСГ) «завясьці новы лад на сьвеце, пры каторым кожын, хто працуе, даставаў бы ўвесь прыбытак, які ад яго працы будзе». А побач з барацьбой пралетарыяту, піша аўтар, «ідзе другое змаганьне: змаганьне *за зямлю*». І таму «...беларускі рух ня можа абмяжоўвацца адно толькі пытаньнямі аб нацыянальных правох, аб правох роднай мовы, роднай культуры: зь ім неразрыўна лучыцца *справа сялянская і справа работніцкая*».

Мусіць, ня трэба даводзіць, што такія ідэі мог выказваць толькі сацыял-дэмакрат, марксіст. Але менавіта гэтыя ідэі БСГ цягам дзясяткаў гадоў замоўчваліся бальшавіцкаю і

нацыяналістычнаю гістарыяграфіяй[7].

А. Луцкевіч быў артадаксальным марксістам. Для яго сацыялістычная рэвалюцыя – «вынік закончанае *гаспадарчае эвалюцыі*»[8]. Ён ня верыць у бальшавіцкі сацыяльны экспэрымэнт, дапускае, што гэты экспэрымэнт правіліцца, але тым ня менш вітае новую эканамічную палітыку і ўнутры гэтым выкладае ў артыкуле «Места і вёска»[9] сутнасьць зямельнай праграмы БСГ. Гэты артыкул публікуецца тут як дадатак. Яго добра было б супаставіць з Луцкевічавым артыкулам «Program agrarny», што публікаваўся ў № 46 «Gazety Wileńskiej» за 13 (26) красавіка 1906 г. Гэта, як пісаў аўтар, «ёсьць адзінае шырэйшае выясьненьне зямельнае праграмы Беларускае Сацыялістычнае Грамады (у стацьці яна названа літарамі «BSH»), прынятае на Другім партыйным Зьезьдзе ў канцы 1905 году»[10]. Гэтага артыкулу я пакуль што ня маю.

[7] Пра бальшавіцкай сацыялістычнай гістарыяграфіі гл. Сідарэвіч А. Пасьляслоўе ў Кіраўніца. 2000. № 11–12.

[8] Луцкевіч А. Вялікі экспэрымэнтатар // Наша Ніва. 2005. 21 студзеня.

[9] Гл.: Змаганьне. 1923. 18 лістапада.

[10] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху… С. 172.

[11] Друкуюцца з захаваньнем правапісу і пунктуаціі арыгіналу.

ДАДАТКІ

№ 1

БЕЛАРУСКИ КРЕСТЬЯНСКИ СОЮЗ

Мужыки гинуць ад безправія, беднаты и цемноты; для таго, каб вывесци з гетой доли трэба перемениць увесь парадак у гасударстви, без гэтаго дабра для мужыкоу не будзе. Цяпер усе: и шляхта, и купцы, и работники заявляюць, яких им трэба гасударственных парадкоу. Пара и мужыком громко и смело начаць гаварыць аб сваих патрэбах, аб тым, як пярамяниць государственный парадок, каб памоч мужыцкой бядзе. Мы радзим, каб аб гетым пастанауляць прыговоры на сельских и волосных сходах и собраннях, як тут будзе паказана. Абсудзице усе, што у гетым приговоры патрэбуетса и кали на то будзе ваш саглас, то пастанавице таки прыговор и у сябе. Ужо много сельских обществ зрабили такіе прыговоры. Трэба, каб заговорыли усе мужыки. Годзе ужо маучаць; пара нам ужо прыпомниць, што мы такіе же людзи як и усе, што мы так само маем голос.

Комитет Беларускаго Крестьянскаго Союза.

ПРЫГОВОР

Мы, тут падписаушыеся, крестьяне (такого то сельскаго общества, волости, уезда и губерніи) собраушись такого-то числа на сход или собраніе и абсудзиушы сваю цяжкую долю, пастановили што пры цяперашним гасударственным парадку не може быць ніякой направы у нашей доли. Каб направиць дзело трэба, каб государством правили не чыноуники, а выборные ад усяго народа, которые ведаюць нашы патрэбы и патраплюць нам памоч. Тая государственная дума, што дау манифест, гэтому не поможе. Выборы да яе робяцса не па справедливосци. Усякіи чыноуники будуць пярешкадзаць выборам и ни адзин добры человек не пападзе у гэту думу. Уся сила у гэтой думи астанецса у руках чыноуникоу и ад гэтакой думы карысци для народу ніякой не будзе. Парадзиушыся меж собой мы усе як адзин пастанавили.

1) Тая государственная дума, што абецана манифестом 17 окцября, нам не патрэбна и своих выборных у такую думу мы выбираць не будзем.

2) Будзем счытаць сваими непрыяцелями тых, хто пайдуць у гэту думу.

3) На сам перэд патрэбно нам Учредительное Собраніе (Констытуцыйны Сход) выбраное всеобщими, прамыми, для усих роуными выбарами пры закрытой падачы голосоу. Гэто значыць, што выборных ад народу павинен выбираць весь народ, мужыки и кабеты, багатые и бедные ад двадцаци гадоу на роуных правах. Выборы павинны быць прамые, каб кожны челавек падавау свой голос ад себя, а не праз выборщыкоу. Выборы павинны быць закрытой падачэй голосоу, каб нихто не ведау, за каго я падаю свой голос, каб не баялися людзе даваць свой голос за таго, каго яны хочуць. Палиція, земскіе и волостное начальство не павинны мешацса у выбары, а трэба нам выбираць свои комитеты па волосцях, каб выборы правадзилися па справедливости без ашуканства.

4) На учредительном Собранію мы постановим:

а) Закрапиць наусягды свабоду слова, сходоу, совесци, друку, союзов, непрыкосновенности личносци и жилищ обецаные манифестом 17 окцябра, катораго цяпер правительство не хоче спауняць.

б) У Учредительном Србранію мы пастановим, што правительство у гасударстви будзе з выбраных ад народу представителёу, каторым даецса писаць и пастанауляць законы, назначать налоги, глядзець и праверяць, каб грошы з гасударственнаго казначейства шли на то, на што пастанавиу народ, каб их не крали чыноуники. Министры и усе чыноуники павинны даваць адчот народным выборным аб тым, што яны робяць. А проч народных выборных ніякая другая уласць не може адмениць тых законоу, што напишуць и пастановяць народные выборные.

в) Для таго, каб народ не гинул з голоду ад недастатка зямли и каб не было гэтакой несправедливосци як цяпер, што у аднаго надта шмат зямли, а у другого и сусим нема, мы праз своих выборных пастановим, каб уся зямля, казенная, удзельная, монастырская, царковная, косцельная, усе фольварки и маёнтки, лесы, рэки и возера перашли до усяго народа, до усей націи. А землёю будзе пользоваца той, хто сам з своею сямьёю будзе працаваць каля яе.

г) Яким парадком уси земли пяройдуць у руки народа, гэта павинны прыдумаць па справедливосци народные выборные кожнаго краю. И для таго нам патрэба поуное самоупрауленне (автономія) беларускаго краю з краевой думой (сеймом) у Вильни, выбраной таким способом, як раней показано.

5) Трэба адмяниць усе саслоуя, каб не было ни шляхты, не мещан, ни мужыкоу, а каб усе были только граждане и для усих быу роуны закон.

6) Волосное прауленне трэба пярэмениць; на волосных сходах павинен мець голос усякій, хто жыве у волости. Волость павинна мець право для своей патрэбы налагаць падатки на усих, хто жыве у волости, на багатых больш, на беднейшых меней. Усе людзи у волости павинны выбираць «должностных лиц» и сами постанауляць свои справы, а

земских начальникоу сусим не трэба, бо яны тольки шкодзяць народу.

7) Трэба пастанавиць адзин падаток падаходны, значытса чым кто багатшы, тым большы павинен плациць падаток, чым беднейшы, меньшы, а усе «косвенные» налоги и акцызы на спички, на сахар, на газу трэба скасаваць, бо пры них выходзиць, што сам беднейшы человек плациць найбольшы падаток. А «выкупных плацежей за землю ужо болей сусим плациць не будзем, бо па нашему щоту дауно ужо выплацили.

8) Усе дзеци, хлопцы и дзеучата павинны учыцса на казенны щот. У нас у Беларуси у народных школах учыць павинны па беларуску, так як мы гаворым, каб дзеци усе добра могли зразумець и научыцса.

9) Трэба, каб сейчас же выпусцили з цюрмы усих тых, што сидзяць за народну свободу, за земельные безпарадки и за такіе самые требованія, як мы цяпер пишем и сейчас адмяниць смертную кару сусим и наусягды.

Каб дабицса таких законоу, як мы тут пастанавили, мы уже тут падписаушыеся прыступаем к Беларускому крестьянскому союзу, каторы належиць до Всеросейского крестянскаго союза. Мы пастановляем, што уси разом мы будзем дабивацса своих прау, а цяпер мы выбираем своими уполнамоченными таких-то.

Прымечание: Прысылаць копію прыговора па почци.

Адрас: Москва, Рождественка, дом Хлудовой. Техническое общество, в отдел сельско-хозяйственной техники.

№ 2

CZYRWONY ZNAK

Krou naszu ljuć dauno uże katy,
Lje horki slozy kożny z nas,
Nadydzie chutko dzień zapłaty,

Pany, sudzić my budziem was!
Pany, sudzić my budziem was!

Hej że uraz, hej że uraz hukniemo:
Nasz znak lapocze pad chmarami;
Niesie jon sudu hrom, lepszych dzion
Nadzieju naszu adnu!
Jak krou pad niebam czyrwanieje -
Z krywawoj pracy wyras jon!
Z krywawoj pracy wyras jon!

Chocz złydni choczuć, noczki dzieci,
Parwanu nitku znou zwiazać,
U truchu usio licho satruchleje,
Dabro że budzie wiek trywać!
Dabro że budzie wiek trywać!

Hej że uraz, hej że uraz hukniemo: i t. d.

Stary paradok pachiliusia,
Upadzie - hetaż nam żyćcio!
Supolna budzie tady praca,
Supolno budzie i żniwo!
Supolno budzie i żniwo!

Hej że uraz, hej że uraz hukniemo: i t. d.

Braty, chaj kożny paspieszaje -
Adnoż nam dumać i rabić!
Chto reczku bystru zatrymaje?!
Skul siłu hetaku dabyć?!
Skul siłu hetaku dabyć?!

Won zdzircou, won cara z panami!
Chaj zhinie pouny kryudy świet!
Paradok nowy zrobim sami -
Nie budzie kryudy tam ni bied!
Nie budzie kryudy tam ni bied!

Hej że uraz, hej że uraz hukniemo: і t. d.

№ 3

Антон ЛУЦКЕВІЧ
МЕСТА І ВЁСКА

Нядаўна ў аднэй з беларускіх газет была надрукована дужа цікавая стацьця, якая адзначае вельмі важны ідэалягічны працэс, што адбываецца ў радавых рэспубліках. Справа ў тым, што тамака – на грунце ўтварэньня сыстэмы радаў, якія кіруюць усенькім жыцьцём на мясцох, адбываецца аб'яднаньне мястовага пралетарыяту з сялянскімі працоўнымі масамі.

Працэс гэты і адбіваецца – на ідэалёгіі сацыялістычных партыяў, якія у быўшай Расейскай дзяржаве дзяліліся на два варожыя сабе абозы: *марксістаўскі* (с.-д.), апіраўшыся выключна на пралетарыяце местаў, і *народніцкі* (эсэраўскі), які шукаў апоры пераважна ў сялянскіх масах. І кожын з гэтых вечна калаціўшыхся між сабой кірункаў імкнуўся падчыніць вёску – месту, ці, наадварот, места – вёсцы. Цяпер жа, на грунце пераходу ўлады ў радавых рэспубліках у рукі работнікаў і сялянства, ужо няма гутаркі аб падчыненьні адных адным, а выяўляецца каапэрацыя, супрацоўніцтва гэтых, на пагляд, такіх розных стыхіяў, – і гэтак чэзьне падстава дзеля падзелу б. расейскіх (ці «ўсерасейскіх») сацыялістычных кірункаў. Тое, што да вайны і апошняе расейскае рэвалюцыі і адны і другія называлі «гарэзіяй», цяпер аказываецца зусім натуральным і нікога ня дзівіць.

У сувязі з гэтым цікава адзначыць, што першымі спаміж сацыялістаў колішняе Расеі, якія асьмеліліся абаперці сваю

праграму на такім аб'яднаньні мястовага пралетарыяту і працоўнага сялянства, былі *беларускія сацыялісты*. Болей таго: былі беларусы-марксісты, тая група, што залажыла ў пачатку дзевяцісотых гадоў (1903 г.) першую беларускую палітычную партыю пад назовам «Беларуская Рэвалюцыйная Грамада», зьмяніўшую ў 1905 годзе на партыйным зьезьдзе ў Менску сваё імя на «Беларускую Сацыялістычную Грамаду»[12].

Разважаньні «грамадаўцаў», выклікаўшыя тады абурэньне як расейскіх с.-д., так і с.-р., былі прыблізна гэткія. Стоячы на грунце Марксавае ідэалёгіі, «грамадаўцы» імкнуліся даць назву рэалізацыі тых лёзунгаў, што аддалі б у рукі працоўных усе прылады да працы, якія, знаходзячыся ў сучасных капіталістычных гаспадарствах у руках уласьніцкіх, ператвараюць Працу ў няволю Капіталу. За такую прыладу да працы, за такі «варыянт» «грамадаўцы» уважалі і зямлю і дзеля гэтага імкнуліся да нацыяналізацыі ўсіх зямельных абшараў з перадачай іх у індывідуальнае карыстаньне сялян-зямляробаў на правах, зусім блізкіх да ўласнасьці: выключаўся толькі гандаль зямлёю, зямля не павінна была зьяўляцца «таварам», ды гэтак выключаўся і новай «пачатнай» канцэнтрацыі зямлі ў рукі адзінак. Замест эсэраўскае «працоўнае» нормы (эсэры сулілі сялянам гэтулькі зямлі, сколькі гаспадар сам можа вырабіць) праектавалася стварэньне дробных фэрм, арганізаваных наводле «вытворчае» нормы – значыць, такое, пры якой сяляне-хлебаробы маглі бы даваць хлеб на рынак, забясьпечываць хлебам места ў замену за вырабы фабрык. Бачучы ў эвалюцыі зямельных адносін імкненьне не да канцэнтрацыі, а да раздрабненьня зямлі, «грамадаўцы» ў такой зямельнай рэформе бачылі гаспадарчы поступ, які, паводле Маркса, зьяўляецца апраўданьнем сацыялістычных імкненьняў ува ўсіх галінах вытворчасьці. І вось, клічучы мястовы пралетарыят да падтрыманьня магутнага, стыхійнага імкненьня сялянства да зямлі, «грамадаўцы» гэтым маніліся пабудаваць той «залаты мост», які злучыў бы работнікаў і сялян-хлебаробаў на аснове ўзаемнага падтрыманьня гэтых двух *вытворчых* клясаў, на пагляд, такіх розных, але аб'яднаных супольнай мэтай барацьбы: мэтай пераходу ў рукі працуючых як фабрык, так і зямлі.

[12] Гл. пра гэта ніжэй.

[13] У XXIV разьдзеле I тому «Капіталу» («Гістарычная тэндэнцыя назапашваньня капіталу») К. Маркс паводзіў, што та мэты разьвіцьця капіталізму сярэдняя і дробная ўласнасьць пагляданая/ вышэйняцца буйною і такім чынам адбываецца ня канцэнтрацыя ў руках нямногіх. Як відаць, А. Дунікевіч ды іншы беларускія сацыялісты скептычна ставіліся да гэтае вывады К. Маркса, шмат у чым абвергнутае Эдуардам Бэрнштайнам.

Паўтараем, гэта была «гарэзія» як з пункту гледжання расейскіх с.-д., так і з пункту гледжаньня с.-р. Эсдэкі бачылі тут падтрыманьне сярод сялянства варожага пралетарыяту «ўласьніцкага» пачуцьця і супярэчнасьць з тэорыяй «канцэнтрацыі», абавязковай ня толькі для прамысловасьці, але і для зямлі[13]. Эсэры йзноў думалі, што можна зразу «завясьці сацыялізм» на зямлі дарогай прымусу (гэты прымус, як мы бачылі ў радавых рэспубліках, зусім не дае вынікаў!), разьвіваючы аджыўшы ўжо даўно свой век пражытак вялікарускае «абшчыны».

Тое, што цяпер робіцца ў радавых рэспубліках, паказуе, што Беларуская Сацыялістычная Грамада не прапаведывала «гарэзіі», а была мо больш дальнавідна, чым другія...

Падрыхтоўка да друку і камэнтары Анатоля Сідарэвіча
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/07/14**
[image]

МІКОЛА НІКАЛАЕЎ (нар. у 1955 годзе ў Шчучыне) – загадчык аддзелу рэдкіх кніг Расейскай нацыянальнай бібліятэкі, Санкт-Пецярбург. Доктар гістарычных навук. Яго навуковая і публікацыя ў «ARCHE» – палепшылася. Гісторыкі паведамілі грамадству шмат пра якіх таленавітых і адданых сыноў нашае Радзімы. Надыпа ча літаратараў – расплюшчыць вочы сучаснікам на асабістасці лёсу славутых продкаў і іх характары. З тым, каб мы ведалі і палюбілі і паставілі сабе за ўзор і нават за ідэал, а як найменш – ведалі б пра сумненні і пакуты, здзяйсненні і няўдачы, мары і расчараванні сваіх герояў. За справу ўзяўся літаратар Вітаўт Чаропка, і неўзабаве на паліцах кнігарань з'явіцца кніжка «Лёсы ў гісторыі».

Старонка пісьменніка
Старонка гаспадара
Пагаварыць з гаспадаром
Каментарыі (2004, № 1).

* Аўтар не зусім мае рацыю. Фанетычны прынцып у гатым выпадку, згодна з сучаснымі афіцыйна прынятымі правіламі, працце тады, калі назва, ад якой утвараецца прыметнік, паходзіць са славянскіх моваў (*прыпушкі*, але *узбекскі*). У выпадку з горадам Трокі гэта, відавочна, спрэчна, таму ў

Чаропка, Вітаўт. *Лёсы ў гісторыі.* – Мінск: Беларусь, 2005. – 559 с.: іл.

Падрыхтаваная выдавецтвам «Беларусь», яго тоўстая кніжка

Старэйшыя памятаюць, наколькі маленькі быў спіс імёнаў гістарычных дзеячаў, якіх у савецкія часы ведаў выпускнік сярэдняй школы. Нават гістарычны факультэт пединстытута, на жаль, вельмі няшмат дадаваў да гэтага спісу (а магілёўскі пединстытут яшчэ і ствараў у галовах блытаніну, як відаць па сённяшніх выступленнях аднаго з найлепшых яго выпускнікоў).

Пасля ўзнікнення незалежнай беларускай дзяржавы сітуацыя

Энцыклапедыі гісторыі Беларусі. Т. 1. Кн. 1. А–Б / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2005. – 576 с. : іл. – ISBN 985-11-0326-1 (Т. 1. Кн. 1). – ISBN 985-11-0325-3 (Т. 1). – ISBN 985-11-0324-5 (Энцыклапедыі гісторыі Беларусі). – ISBN 985-11-0323-7

(с. 192, 193, 195). У выніку не вельмі дасведчаны чытач можа падумаць, што гаворка ідзе пра розных асоб. Калі рэдактары прынялі сумнеўнае, на наш погляд, рашэнне пісаць прозвішча друкара-немца Схёнфэлс (с. 198), а не Шонфэльс (арыгінальнае «Schönfels»), гэта яшчэ можна неяк зразумець, але калі расійскага пасла ў Польшчы Ота Магнуса фон Штакельберга яны разам з аўтарам называюць або Стаукелберг (с. 353), або Стацкелберг (с. 345), то з гэтым ужо пагадзіцца катэгарычна нельга. Увогуле, хочацца запытацца аўтара і выдаўцоў: вы адну і тую ж асобу называеце па-рознаму, каб чытача заблытаць, ці вам проста ўсё роўна? Але ж чытачу не ўсё роўна, якое было прозвішча шляхціча – «Гамрат» ці «Гармат» (на с. 103 ужываюцца абодва варыянты), як нам зваць знакамітага генерал-лейтэнанта – Мілаіл Вяльгорскі (так на с. 405) ці Міхал Валегорскі (так на с. 376)? А кароннага канцлера лічыць Замоўскім ці ўсё ж Замойскім (с. 203)? А славутага прыродазнаўцу як звалі – Жак Жылібер (с. 343) ці Жан Жыльбер (с. 335)? Прозвішча кракаўскага ваяводы-мяцежніка «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» піша «Зэбжыдоўскі» – навошта перарабляць яго ў «Жабрыдоўскага» (с. 204)? Пра прычыну наўмыснага і яўнага выкарыстання паланізмаў (Катаржына, замест Кацярына, Шымон замест Сымон ці Ваўжынец замест Лаўрэн) ужо і запытацца няёмка. Застаецца толькі меркаваць, што гэта рэверанс у бок збеларуселых палякаў. Як і напісанне прозвішча «Прзецлаўскі» замест Пшэцлаўскі (с. 468). Аднак «Цяраспаль» (с. 381) – гэта ўсё ж такі Цярэспаль («Тэрэсполь», калі на мясцовай гаворцы) – успомнім, што ад гэтага населенага пункта называюцца Цярэспальскія вароты Берасцейскай крэпасці. А мітрапаліта Пацея звалі не Ігнатам (як на с. 223 і 225), а Іпатам, альбо Іпаціем.

Аднак жа вернемся да почату асобаў – у кнізе сапраўды сабраныя біяграмы тых, пра каго жыхар Беларусі павінен ведаць. Можна было б дадаваць, але адняць – нікога. Хаця часам, захапіўшыся пераказам біяграфіі славутага героя, аўтар забывае сказаць пра яго паслядоўную антыбеларускую пазіцыю. Гэта датычыць таго ж Тадэвуша Касцюшкі, які лічыў патрэбнымі і неадкладнымі прымусовыя меры па паланізацыі беларускага сялянства.

Для характарыстыкі некаторых са сваіх герояў аўтар суадносіць славутыя персаналіі з часам. Леў Сапега «…ішоў наперадзе свайго часу», Іосіф Руцкі «…з'яўляецца чалавекам будучыні», Казіміра Семяновіча «…геній апярэдзіў час», а ў Антонія Тызенгаўза «…галоўная віна была ў тым, што ён нарадзіўся не ў свой час», – аднак гэтага малавата, каб назваць такі падыход аўтарскай канцэпцыяй, уласным адлікам, сваім поглядам на падзеі і асобы. У тэкстах асобных біяграм мы часта сустракаем паспешлівасць, недаказанасць або той умоўны лад, якога гісторыя, як вядома, не любіць. Напрыклад, з тэксту на с. 110 чытач-непрафесіянал не зразумее, чаму Глінскі меў права пасылаць да Забярэзінскага па авёс каралеўскім коням, на с. 35 не растлумачана, хто такі Вайдыла, за якога Ягайла аддаў Кейстутаву сястру, і чаму гэты шлюб абразіў троцкага князя. Вітаўт Чаропка, у якога не адняць літвінскага патрыятызму, не звярнуў увагі на таго адзінага Ягелона, які пахаваны на Радзіме, не знайшоў магчымасці паразважаць над комплексам непаўнавартасці, што ахапіў палякаў пасля таго, як над гэтым народам запанавала цалкам літвінская дынастыя (хаця між іншым адзначыў, што каралева Ядвіга памерла бяздзетная і Ягелоны – гэта дзеці літвінкі Софіі Гальшанскай).

Кніга Вітаўта Чаропкі напісана ў наш час, для нашых сучаснікаў – пакалення, зменена га, калі не сказаць разбэшчанага, тэлевізарам, кіно, відэа… Каб сучаснік не адкінуў «Лёсы ў гісторыі» пасля першых жа радкоў, мова кнігі павінна быць адшліфавана да максімальнай лёгкасці чытання, факты і думкі заключаны ў ясна зразумелыя вобразы. Чаму ж асобныя навелы-біяграмы так цяжка чытаюцца? Можа, таму што ніхто не ўзяў на сябе цяжар перачытаць і ўдумацца ў сутнасць такіх, напрыклад, выразаў: «А 14 чэрвеня на рацэ Ведрашы каля Дарагабужа быў разбіты Канстанцінам Астрожскім перадавы трохтысячны атрад гетмана. Сам гетман і шмат важных паноў апынуліся ў палоне» (с. 92). Канстанцін Астрожскі быў геніяльны ваяр, але каб сам сябе разбіў і ўзяў у палон?!. Гэта вам не сучасны футбольны гол у свае вароты!

Расказаўшы чытачам аб тым, як ажаніліся (спачатку таемна, а потым атрымалі публічнае прызнанне) кароль Жыгімонт Аўгуст і прыгажуня Барбара Радзівіл, Вітаўт Чаропка раптам

піша ніжэй: «…Станіслаў Ажахоўскі быў асабістым непрыяцелям Радзівілаў, калі адгаварыў Жыгімонта Аўгуста ад шлюбу з Барбарай Радзівіл» (с. 153). Гэта, хутчэй за ўсё, не няведанне аўтарам гісторыі: «проста» замест слова «адгаворваў» напісалася «адгаварыў». А сэнс? Сэнс змяніўся! Тут паважаны Вітаўт Чаропка ўшчыльную наблізіўся да гісторыка Аляксандра Лукашэнкі, які ў прамове перад трэцім усебеларускім народным сходам пераблытаў Францыска Скарыну з Янкам Купалам і з высокай трыбуны тлумачыў, што наш першадрукар «жыў і працаваў у Піцеры».

Часам недастаткова глыбокія веды аўтара-літаратара і адсутнасць гісторыка-рэдактара перашкаджаюць праўдзе. Ведае, напрыклад, В. Чаропка пра тое, што продкі Мамонічаў былі магілёўскія купцы, і піша: «Выдалі яго (Статут ВКЛ. – **М. Н.**) у віленскай друкарні магілёўскіх мяшчан Кузьмы і Лукаша Мамонічаў» (с. 215). Мана! Лукаш і Кузьма Мамонічы былі віленскія мяшчане, жылі ў Вільні ў сваіх дамах і былі нават членамі гарадскога самакіравання, што для мяшчан іншых гарадоў было немагчымым. Або ведае В. Чаропка пра магчымасць аднаму дэпутату сарваць сойм і піша: «…пасол… сарваў сойм, выкрыкнуўшы фатальнае для Рэчы Паспалітай «Ліберум вета» (свабода забароны)» (с. 266). Не зусім так. Выкрыкнуць дастаткова было адно слова «Veto!» – «Забараняю!». І права дазваляла – пастанова не прымалася. Калі сучасны пісьменнік не ўлічвае гістарычных рэалій, здараюцца казусы, накшталт такога: «З Варшавы на чале палка ўланаў прыбыў біскуп Юзаф Красоўскі» (с. 347). На чале палка можа быць палкоўнік ці іншы вайсковец, але не святар-япіскап! Здараюцца і большыя недарэчнасці, да прыкладу: «Патрэбны былі паўстанцы Прусіі для стабілізацыі ўнутранага становішча ў Расіі, а таму іх выпусцілі на волю» (с. 465). Чаму гэта Прусія так дбала пра Расію?

А яшчэ ў кнізе Вітаўта Чаропкі і выдавецтва «Беларусь» чытач сустрэнецца з рэчамі зусім не зразумелымі, напрыклад, пры характарыстыцы Казіміра Ягайлавіча. «Быў праўдападобны» (с. 86) – гэта як? Або: Ягайла «…нёс цяжар караля» (с. 65) – гэта што? Або: «…ніколі б палякі не пагадзіліся даць Княству колвек самастойнасці» (с. 179) – хочацца запытаць у паважаных

выдаўцоў і аўтара: «колвек» – гэта колькі? Апісваючы рэліквіі, якія знаходзіліся ў крыжы Ефрасінні Полацкай, В. Чаропка называе «кроплі Хрыста» (с. 8) – гэта што за аптэка? Як цытата з Нямцэвіча падаецца «…пекальная заўзятасць Масквы на Польшчу» – (с. 348), але што гэта значыць? Можа «пякельная», ад «пекла»?

Адсутнасць рэдагавання прывяла да з'яўлення на старонках кнігі войска ў 11 мільёнаў 261 тысячу жаўнераў (с. 267) – не было ў Януша Радзівіла такога войска! А вось яшчэ пра войска: «Са сваім нешматлікім, але сапраўды вялікім войскам Хадкевіч…» (с. 230). Дык якое яно было на самай справе, Хадкевічава войска, – вялікае ці нешматлікае?

Пісьменнік павінен ведаць мову, на якой піша, а рэдактар – бачыць недарэчнасці, якія пісьменнік уключыў у мову свайго твора, і па магчымасці выправіць і ўзгадніць іх. У кнізе В. Чаропкі гэтага не зроблена. І таму чытач сустракае замест «гонар» слова «чэсць» (с. 73), замест «уздыхнуў з палёгкай» – «уздыхнуў аблегчана» (с. 74), замест «прыкладаўся да чаркі» – «прымаў трунак» (с. 188). Таксама «абклалі» замест «узялі ў аблогу» (с. 42), «друкарскі станок» (с. 159) замест «друкарскага варштата», «самалічна» (с. 354) замест «асабіста», «браня» (с. 523) замест «зброя». «Віхура» з жаночага роду трасфармавалася ў мужчынскі: «…Яна трапіла ў віхур падзей» (с. 118). А зборнік «Ліманар», які Спірыдон Собаль надрукаваў у 1628 годзе, – у «Лімінор» (с. 277).

Больш, чым хацелася б, звычайных памылак (lapsus calami), якія лёгка можна выправіць пры ўважлівым чытанні: патрэт (с. 239) на партрэт, Крозы (с. 235, 237) на Крожы, Смеленск (с. 45) на Смаленск, Vietuti (с. 399) на Virtuti і г. д.

Часам адчуваецца, што аўтар і яго рэдактары не вельмі добра ведаюць значэнне ўжытага слова. Прыкладам: «былі ўзведзены шанцы» (с. 359) і на той жа старонцы «капаліся шанцы». Слова «шанцы» ў значэнні, якое мае на ўвазе В. Чаропка, сучасная беларуская мова не ўжывае, салдаты беларускага войска капаюць хады злучэння і акопы, але ўзводзяць умацаванні, насыпы, брустверы (хаця і з дапамогай «шанцавага інструменту»). А вось яшчэ адна вайсковая сітуацыя з «Лёсаў у

гісторыі»: «…Сіротка прымаў удзел ва няўдалай аблозе Улы зімой…» (с. 187) – правільна не «ва аблозе», а «ў аблозе». Недасведчаны чытач запытае: чаму подзвігі Хадкевіча ў Вільні ўслаўляў «…вядомы казначэй…» (с. 233)? Думаецца, што тут аўтар і рэдактары не здужалі перакласці на беларускую мову польскае «казнадзей» – «прапаведнік». Вось і з'явіўся немаведама якога казначэйства «казначэй».

Нязграбныя выразы, накшталт «Краіна нібыта апынулася пад акупацыяй» (с. 399), і тут жа аб Ясінскім, які для вярбоўкі паўстанцаў «выкарыстоўваў… і масонскія ложы, і картачны дом», не спрыяюць прыемнаму чытанню, а яўныя ляпсусы ад чытання адрываюць і выклікаюць смех. Чаго варта такое:

«На шчасце Казіміра, ён неўзабаве памёр» (с. 81);

«Траўгут… атрымаў загад ісці на Валынь, каб падтрымаць там тутэйшых паўстанцаў» (с. 492);

«Эмігранцкія колы абкружылі Дамейку і цягалі па розных мерапрыемствах…» (с. 455).

Часам стылістычныя памылкі мяжуюць з дазволеным, збіваюць увесь аповед на нізкі стыль:

«Ён сам… хацеў… праз дачку ўлазіць ва ўнутраныя справы Вялікага княства Літоўскага» (с. 89, пра маскоўскага князя Івана III);

«…не гандляваў ён сваім сумленнем дзеля сытнага карыта» (с. 440, пра Адама Міцкевіча).

Выглядае на тое, што свайго чытача В. Чаропка разам з выдавецтвам «Беларусь» бачыць у той жа пазіцыі, якую яны прыпісалі Сімяону Полацкаму: «Вось каму можна… прадаць «ума излишки» (с. 283). Тады чаму я назваў гэтыя заўвагі «Папялушка выдавецтва «Беларусь»? Ды таму, што кніга Вітаўта Чаропкі не такая ўжо благая. І калі яе першае выданне разглядаць як чарнавік, падрыхтоўчае да наступных, палепшаных перавыданняў, то апранутая ў добрую моўную і вобразную адзежку прыгажуня – гісторыя Беларусі яшчэ

падорыць радасць сустрэчы з яе выдатнымі асобамі – нашымі продкамі. Шкада толькі, што Міністэрства інфармацыі Беларусі фінансавала выданне чарнавіка, а не кнігі, даведзенай да дасканаласці.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/07/15**
[image]